# Пімен Панчанка

*Пімен Панчанка*

*Збор твораў*

# Пімен Панчанка

*збор твораў у чатырох тамах*

# Пімен Панчанка

*том*

*другі*

*вершы*

*паэма*

*(1946—1962 гг.)*

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1981

Бел 2
П 16

П $\frac{70403-031}{М 302(05)-81}$ падпіснае 4702120200

© Афармленне. Выдавецтва
«Мастацкая літаратура», 1981.

# I

## НА РУІНАХ

Не жоўтыя клёны,
Не зоры мяне ўсхвалявалі,—
Чырвоныя хвалі,
Руінаў чырвоныя хвалі.

У цэнтры сталіцы
Ляжыць акіян анямелы,
І замець сняжынак,
Як пена, на ім накіпела...

З маленства — пагібель Памнеі,
Як азбука жаху.
Везувія злосцю шалёнай
Палохаў нас захад.

Цяпер нас не здзівіш
Пампеяй і гневам вулканаў:
На вуліцах мінскіх
Кіпелі жалеза і камень.

І мы не затым
Па руінах ішлі да Берліна,
Каб горад быў мёртвым.
Дайшлі — каб жыццё тут бурліла.

Бо гэткая наша зямля —
Быць мёртвай не хоча.
За домам адноўлены дом
Растуць днём і ноччу.

І, выклаўшы новы паверх,
Мы дзівімся самі:
Навокал муры устаюць
Чароўнымі снамі,

Якія мы снілі калісь
На досвітку шэрым
Ад Мінска за тысячу вёрст
У дымных траншэях.

*1946*

## ПАСЛЯ ДЭМАБІЛІЗАЦЫІ

Я люблю блукаць па вузкіх
Мінскіх вуліцах вясной,
Калі пахне беларускай
І таполяй і сасной.

Сонца латае руіны.
Ботаў стук. Шыпенне шын.
Пешаходаў ручаіны,
Рэкі гулкія машын...

Я іду, бывалы воін,
Памужнелы і худы,
Шчэ не звыклы да спакойнай,
Да цывільнае хады.

Углядаюся у вочы,
Вочы добрыя людзей,
І чамусьці з кожным хочаш
Прывітацца: «Добры дзень!»

Нібы з імі жыў я недзе
Ці то гутарыў да дня,
Нібы ўсе — мае суседзі,
Нібы ўсе — мая радня.

І бывае, выпадкова
Падасі хлапцу руку,
Хоць раней ты з ім ніколі
Не страчаўся на вяку.

І заўжды абавязкова
Ёсць знаёмыя у нас —
Ці то лекар, ці то повар,
Ці то ротны старшына,

Ці валдайскі край туманны,
Ці разбіты нейкі дот...
Год спатканняў нечаканых,
Сорак шосты мірны год!

*1946*

# ПЕРШАЯ ЦІШЫНЯ

**(Ноч у Нясвіжскім замку)**

1

Пачыналася гэта ноч
Грозным гулам стагодніх паркаў.
Пачыналася гэта ноч
Стогнам белых снягоў над аркай.

Цёмны вецер над замкам кружыў,
Паграджаючы сцюжай жалезу,
І у роспачы на крыжы
Голы курчыўся Езус.

А у замку гарэлі агні,
Ціха радыё-скрыпкі гралі.
Запаведнікам цішыні
Ахрысцілі гэты кут ці раем.

Цішыня! Вельмі многа гадоў я
Сярод грукату і агню
Усё шукаў, здабываў яе доўга,
Сваю першую цішыню.

І знаходзіў не раз і зноўку
Аддаваў яе людзям другім.
Сам ішоў з неразлучнай вінтоўкай
На чужацкія берагі,

Каб выходзілі людзі і пожні
Насустрэчу мірнаму дню.
Я хацеў яе ўзяць апошнім,
Сваю першую цішыню.

Недарэмна пяецца песня,
Як вяртаецца князь з вайны...
Радзівілаўскі замак. Несвіж.
Дываны. Дываны. Дываны.

Не суровыя рыцары ў латах
Сустракаюць князя свайго,

А вясёлыя нашы дзяўчаты
Усміхаюцца: я іх госць.

Вось пакой мой, прасторны і чысты,
Сядзь у крэсла і адпачні.
Над табою гарань урачыста
Мяккім светам электраагні.

Адпачну... Толькі вось прыгадаю
Я адну франтавую ноч,
Што загінула ў зорных далях,
Што была так даўно, так даўно.

2

І была гэта ноч
На адной з выпадковых мясцін.
Не пытайцеся назвы:
Дарог і паселішчаў лівень
Прашуміць і заціхне,
А ў сэрцы ўсяго не змясціць —
І стаяў прада мною тады
Дваццаць пяты мой жнівень.

Ён зарыўся па вушы ў траву
І па вочы жытам зарос,
Ён глядзеў, як ляцеў журавель
Над нямой ад здзіўлення бярозай,—
Як рухавым крылом
Цень па поплаў атрос,
І паплыў гэты цень
Па атавах,
Зажынаючы росы.

І адразу на плечы мае
Навалілася цёмная ноч,
Зоркі ў сэрца нацэлілі
Сінія вострыя джалы,
І апошні праменьчык зары
Туманы прагна выпілі з воч,
Засмакталі мяне,
І душа аж зайшлася ад жалю.

Да вайны не лічыў я
Ніколі шчаслівых гадзін,
А тады, як жабрак,
Я напоўніў пакораю вочы:
Дайце з гэтаю ноччу
Пабыць мне адзін на адзін,
З гэтай жнівеньскай ноччу,
З гэтай самаю страшнаю ноччу.

Я да нетраў яе таямніц
Неадкладна дабрацца хачу
Па сцяжынцы блакітнай,
Што высцеліць месяц надногі.
Можа, мне ўпершыню у жыцці
Давядзецца сягоння пачуць,
Як адлётваюць кветкі
У вырай па зорных дарогах.

І, здавалася, вось:
Толькі момант,
Адзін толькі рух —
І вайна ўжо легенда,
На зямлі цішыня і на моры.
Раптам гук я пачуў —
Быццам грыз тупарылы вяпрук
У захмарных дубровах
Жалуды пазалочаных зорак.

Узнялі два пражэктары
Ў неба сівыя мячы,
Ноч тугі і надзеяў
Пасеклі на дробныя часткі.
Сэрца, ты мяне падвяло,
Годзе трызніць, цяпер памаўчы:
Ты хацела знайсці ў цішыні
Вельмі лёгкае шчасце.

Ты хацела забыць
Кулямётаў суровы пагляд,
Прыхінуцца да зорак
І песні ружовыя выткаць.
Ноч адпомсціла нам —
У зарніцах увесь далягляд,
Па драпежніку б'юць
Трапяткія зенiткі.

Пакуль будзе драпежнік
Над нашай зямлёй завываць,
Не глядзіце вы, зоркі,
Ў мае бессаромныя вочы.
Перш раўцi у атаках,
Перш дзяцей і жанок ратаваць,
А пасля — цішыня
І блакітныя цёплыя ночы.

3

Прабачайце, якія зеніткі?
Гэта трызніцца ўсё у сне.
За акном у сівыя світкі
Апранае таполі снег.

Толькі чый гэта, чый гэта погляд
Так трывожыць зараз мяне?
Азірнуўся — і рыфмы заглохлі:
Пекнай пані партрэт на сцяне.

Як жа гэта я не заўважыў
Вас, шаноўнейшая княгіня?
Толькі бліснулі вочы вашы —
І, здалося, спакой мой гіне.

Прыгаством захацелі аплесці?
Старажытная хітрасць жанчын!
Не спакусіце. Я, нарэшце,
З гэтай ноччу адзін на адзін.

А княгіня, відаць, прадрогла,
У самоце чакаючы ранак:
Па славутаму метаду Гогаля
Выйшла з рамак.

Падышла і стала за крэслам,
Углядаецца на паперу
І на рыфмы мае атрэсла
Тры агністыя перлы.

Шэпча горача і жалобна:
«У мяне адзінота, гора.
Усё цьмяна, нудна і дробна.
Можа ты са мной пагаворыш?»

Ад падобнае прапановы
Стала прыкра: пані сваволіць...
Што мне вашае гора, панове!
Я свайго за вайну меў даволі.

4

Не ведаю, дзе вас і хто вас цешыў,
Не ведаю, хто вас тады суцяшаў,
А я ж без гранат, без куль, без сцежак
У несвіжскім парку галодны ляжаў.

А танкі варожыя злева і справа,
Над замкам на крыллях вісіць бяда.
Пляснe — і кропка. Кепскія справы.
І замка шкада, і сябе шкада.

А можа плюнуць з высокай пагардай
На чорны, брухаты нямецкі танк?
Папрасіць у лёса казырную карту,
Сэрца залажыць і пайсці ва-банк?

Што ты, што ты, карцёжнік шалёны! —
Зямля жахнулася: трэба жыць.
Схапіла ў абдымкі рукамі зялёнымі
І загадала: ляжы, ляжы.

І, тарганууўшыся ўстаць раз пяты,
Зразумеў я тады, што такое гора.
Адзін на ўвесь свет. Галодны. Распяты.
Да зямлі прыкуты цвікамі зорак.

5

Схамянулася княгіня:
«Мне настрой такі знаёмы.
Вецер скардзіцца і плача,
Б'е у шыбы чорны снег.
Ані гукаў паланезу,
Ані шэпатаў гарачых,
Не звіняць з віном бакалы,
Як святочныя званы.
Разбрыліся афіцэры,

Што ў маім гасцілі замку,
Па пізіпах італьянскіх,
Па ангельскіх гарадах.
Толькі я вось тут распята,
Да сцяны прыкута белай.
Слухаць хлопскія размовы
Асудзіў мяне пан бог».

6

Што вы мне загаварваеце зубы?
Мае ўспаміны не для вашых вушэй.
Не ваш я суцяшальнік,
І не ваш я любы,
З гэткімі размовамі
Папрашу: цішэй!
І вачмі не зыркайце:
Рыцараў у латах
Вам не дагукацца —
Крычы ці не крычы.
Цяпер тут санаторыя,
І жыхары ў палатах —
Старшыні выканкомаў,
Манцёры і ўрачы.
Тут спяць, адпачываюць
Нашчадкі тых асілкаў,
Што замак збудавалі
Для вас у даўні час.
Тут гояць свае раны
Героі-партызаны,
Якія каля Несвіжа
Хадзілі ў бой не раз...
Я думаў, вы, княгіня,
Цяпер у Аргенціне
Ці ў Лондане туманным
Гандлюеце.
А вы
Хворых тут трывожыце,
Па начах галосіце
Голасам савы.
Я забараняю вам
Над замкам кружыцца,
Вецер падбухторваць
Выць і свістаць.

З вамі мне ў пакоі
У адным не ўжыцца,
Папрашу у рамкі.
Пачало світаць...

7

Як ударыў промень першы
У паркетную падлогу,
Як ён выплеснуў на верхы
Вёдры сонца залатога,—

Я устаў усхваляваны,
Нібы вызвалены вязень.
Што мне Мар'я з Кастэлянаў,
Хоць яна і жонка князя!

Што мне цёмныя паданні
Старажытнасці магнацкай!
І навошта мне за зданню
Тых паданняў сёння гнацца?

Не хачу ў такім пакоі
Цішынёй настроі калечыць,
Пазіраць, як прада мною
Падхалімнічаюць рэчы.

Шафа рукі расстаўляе
І скрыпіць: давай шынельку.
Крэсла сесці запрашае
На узор вясёлы пейкі.

Дываны найлепшай кветкай
Пад нагу імкнуцца легчы.
Не хачу паслугі гэткай
Ад такіх раскошных рэчаў.

Я прывык пісаць і сесці
За сталом бацькоўскім грубым.
На услон кляновы сесці
Мне было заўсёды люба.

Не таму, што не па сэрцу
Мне багатыя харомы,

Але толькі там сагрэцца
Нам ільга, калі здаецца
Гэты хорам родным домам.

Вунь ляжыць мая краіна
За акном, як на абрусе.
Абгарэлыя руіны —
Гэта раны Беларусі.

Не магу я парадніцца
З цішынёй старых палатаў:
У зямлянках дзецям сніцца
Казка — сонечная хата.

Цішыні няма на свеце,
Вельмі шмат на свеце працы.
Дык склікай сябрыню, вецер,
Будаваць свае палацы,

Дзе б кажыная драбніца
Нам пра наша гаварыла,
Каб сівая навальніца
Сцен ніколі не размыла,

Каб жылося там багата,
Як ва ўсім савецкім краі,
Каб цягнула нас дахаты
З райскіх земляў, нават з раю.

*1946*

## ГІМНАСЦЁРКА

З маленькаю латкай і локцем працёртым
Вісіць у кутку на цвіку гімнасцёрка —
Мая франтавая рэліквія.
З табой мы зазналі нямала нягодаў:
У дождж і завею — паходы, паходы,
Сутычкі і бітвы вялікія.

З бавоўны звычайнай, звычайна пашыта.
Чаму ж гэтак цёпла было мне, скажы ты?

«Расла і цвіла я на родных палетках
І шчодра паіла сцяблінны і кветкі
Гарачае сонца Радзімы».

Хрыпела зямля, задыхаліся зоры.
Праз пекла прайшоў я і выжыў, а вораг
Засыпаны жвірам.

«Калі мяне пралі, калі мяне ткалі,
Дзяўчаты спявалі, ад сэрца жадалі,
Каб ты перамог
І з вялікіх дарог
Вярнуўся жывы і здаровы».

Я быў за мяжою, я розпае бачыў:
Багацце і гора, папоў і жабрачак.
Ды толькі заўсёды і ўсюды тужыў я
Па родных нябёсах, нашто мне чужыя!
Аддаў бы я край самы райскі і дзіўны
За цень ад сасны на далёкай Радзіме.

«Чыясьці матуля па сыне тужыла,
Калі апоўначы мяне яна шыла,
Слязой апаліла, цябе благаславіла
На вернасць».

*1946*

* *

Аб вясёлым цёплым доме,
Аб вясновых кветках першых,
Аб суседзях невядомых
Напісаць хачу я вершы.

Як напоўняцца кватэры
Маладымі галасамі,
Светлым сонцам, змрокам шэрым,
Пахам смажанага сала.

Дом з радзінамі, з каханнем,
З добрым смехам, з дробнай сваркай,
З невялікімі грахамі
Камунальнай гаспадаркі.

Дом, дзе ўбачыў я праз вокны
Не маленькі цесны дворык,
А прастор зямны шырокі,
Па якім сумуюць зоры.

*1946*

## НАША СЛАВА

*Камандзе акіянскага*
*парахода «Мінск»*

Па марах, акіянах,
шчэ гарачых ад выбухаў мін,
Рэжа воды сівыя
параход з гордай назваю «Мінск».
Зазубрылі на памяць
хвалі морскія гэта імя,
Сто разоў рэкі зорныя
стромкія мачты абмылі.
Як ён смела імчыцца!
Як велічна трубы дымяць!
За кармой застаюцца
да пены загнаныя мілі.

Хай у трумах ляжыць
груз цывільны —
бавоўна і хлеб,
А сустрэнецца крэйсер,
што замежнай бранёй ганарыцца,—
Узнімае свой сцяг,
прывітанне з павагаю шле
Слову — Мінск,
славе — Мінск,
партызанскай бясстрашнай сталіцы.
Гэта слова чытаюць
нарвежац, кітаец, індус
У паўночных фіёрдах
пад нябёсамі тропікаў душных;

І пытаюць матросаў
пра нашу лясную вайну,
І вітаюць матросаў,
як самых адважных і мужных.
Хоць бянтэжацца трохі матросы,
бо многія з іх
Не былі ў Беларусі,
не хадзілі ў засады начамі,—

Славу нашай рэспублікі,
што здабыта ў баях агнявых,
Берагуць, як святыню,
называюць сябе:
мы — мінчане!

Сёння ў порце далёкім,
дзе ўсіх караблёў не злічыць,
Ахрышчоных імёнамі
розных сталіцаў і прынцаў,
Яснай зоркай гарыць,
партызанскай легендай гучыць
Слова — Мінск,
слава — Мінск,
беларуская наша сталіца.

*1946*

## ПАРТЫЗАНСКАЯ ДЗЯЛЯНКА

Ляжаць упокат зваленыя сосны,
Галлё і друз паскіданы ў лаўжы.
Густой смалы сплываюць капяжы
На дурнап'ян, распараны і млосны.

Ляжаць ствалы у кропельках смалы
Пасля тралёўкі без апраткі грубай,
Нібы іх вымылі старанна лесарубы,
Як мыюць мацеры сваіх дзяцей малых.

Ляжаць, прынаўшы долу галавой,
І слухаюць — ці не рыпяць калёсы,
Ці хутка пасланцы вакольных вёсак
Па іх прыедуць, забяруць з сабой.

Бо, пэўна, лёс звязаў навек людзей
З хваінамі, вось з гэтаю дзялянкай;
Краці бярно — аб справах партызанскіх,
Як залатое рэха, загудзе.

З бярвення звонкага брыгады зрубяць хаты,
З зямлянак перасяліцца народ,
І сосны зноў прыкрыюць ад нягод
Старых сяброў, як і ў гады расплаты.

*

Згубіўся ў далях рып калёс,
Дзялянка апусцела,
І не відаць ужо пябёс,
Што на галлі віселі.

Які прастор! Здалёк стаяць
Чатыры сценкі бору,
І неяк дзіўна пазіраць
На гэты светлы хорам.

Калі ж па звычцы заляціць
Сюды малая сойка,

Убачыць — сонца залаціць
Адну ўсяго сасонку.

Яна стаіць адна, адна
Зялёным манументам.
Чаму накінута яна
Людзьмі, з якою мэтай?

Мо каля гэтае сасны,
Пад партызанскім сцягам,
Радзімы верныя сыны
Прыносілі прысягу?

Мо зліталіся над ёй
За прыгажосць і веліч,
Каб на галлі густым вясной
Легенды зазвінелі?

Ці то загадана ёй быць
Настаўніцай лясною;
Сасонкі новыя расціць
Пад мірнаю зарою

Ды навучаць сваю сям'ю
Не гнуцца, не хіліцца
У час, калі маланкі б'юць
І вьюць навальніцы.

*1946*

## КІНАМЕХАНІК

Прыямней няма на свеце працы —
У калгасы праз лясы імчацца,
Праляцець маланкай на машыне
Каля пахкай, свежай канюшыны,
Паспытаць салодкіх, буйных вішань
І расклейваць з дзетварой афішы,
А пазней, калі надыдзе ноч,
Весела круціць сваё кіно.
Хоць яшчэ няма ў калгасе клуба
І экран вісіць на смольным зрубе,
Маладзік глядзіць на апарат,—
Кожнаму карціну бачыць люба,
Кожны госцю гэтакаму рад.
Хто на лаву сеў, а хто на бёрны,
Хто на ліпу ўзлез, а хто на плот.
Тут сабраўся наш усё адборны
Краю партызанскага народ.
І калі які кінагерой
Пасылае ў злыдняў куляў рой
І бяжыць, бяжыць разбіты вораг,—
Воплескавы гром калыша зоры.
«Ну якраз,— гавораць,— так у нас
У брыгадзе біўся Ананас...»
Скончана кіно, завуць у хату:
Стол накрыты смачна і багата.
На пачатак стравы — чарка горкай,
На прыправу — добрая гаворка:
«Вось каб зараз гэтак мы рабілі
Дружна, як калісь фашыстаў білі»,—
Так сусед суседа папікае,
І пайшла дыскусія такая,—
Высыпай на стол капшук махры:
З госцем можна быць і да зары.
Старшыні даюць, вядома, ў косці
(Ім трапляе болей ад усіх),
А пасля пытаюцца у госця:
Горш ці лепш у тых, суседзяў іх.
Тут механік крышачку развáжа,
Гаспадыні ветла дзякуй скажа

І за соль, вядома, і за хлеб.
«Хаты добра рубяць людзі вашы,
А суседзі, прабачайце, лепш».
А калі зусім патоне хата
Ў сінім дыме, вось тады якраз
Спрэчка пачынаецца пра атам
(Ёсць у іх — дык, значыць, ёсць і ў нас!).
А дзяўчатам іншае карціць:
Добра б з хлопцам дружбу закруціць,
І, вядома, з гэткаю умовай,
Каб глядзець штодня кіно дармова.
Ну нікому, як кінамеханіку,
Не шанцуе ў дружбе і каханні.
Хлопцы за цябе стаяць гарой,
Для дзяўчат найпершы ты герой,
І усе нявесты ў сельсавеце
Маюць кінамайстра на прыкмеце.
І нарэшце рэшт, у заключэнне —
Добры сон на свежым пахкім сене.

*1946*

# СУСТРЭЧА З ВІЛЬНЯЙ

1

Працуеш, спрачаешся, ходзіш, жывеш,
Стаіш у чарзе за пайком
І раптам няскончаным кідаеш верш
І свой абыдзённы дом.
Захопіш блакнот, папяросы, ручнік,
Ускочыш на грузавік;
Пакінуўшы цень у люстэрках вітрын,
Мінуўшы ніўныя ларкі,
Нырнеш з галавой у густыя вятры,
У мора бяроз і ракіт.
І стане адразу душа маладзей,
І сэрца заб'е гарачэй.
І, ўбачыўшы першы наіўны ручэй,
Адчуеш сябе шчаслівейшым з людзей.
Дарога ляжыць для цябе аднаго.
І сонца гарыць для цябе аднаго.
Ты весела дзівішся кветцы малой,
Як літары першай у школе,
І пэцкаеш пальцы салодкай смалой,
Сарваўшы галіну з таполі.
Прасторна, зялёна і хораша так,
Што ты, маладосцю багаты,
Глядзіш абы-як на раструшчаны танк
І з хваляваннем на новыя хаты.
Не шкода ні сіл, ні крыві, ні гадоў,
Што недзе на фронце пакінуў,
Абы толькі бачыць між ніў і садоў
Вось гэткай шчаслівай краіну.
Імчышся па звону сякер і бяроз,
Па травах, расе, палавіпню,—
Пакуль разматае клубок доўгіх вёрст
Твой шофер маўклівы і скажа: «Прывёз!»
І ты апынешся у Вільні.

2

Уражанням гэткім ніколі не выліняць,
Як зорам не выліняць і праменням.
Даволі сказаць мне, што бачыў я ў Вільні —
І шапкі вы здымеце ад захаплення.

Тут збеглася многа дарог і стагоддзяў,
Трагедый, і славы, і ярасных спрэчак.
Тут нашы народы — суседзі знаходзяць
Свае успаміны і прадзедаў рэчы.

Вось дом, дзе Мамоніч наладзіў друкарню.
Тут «Наша Ніва» цвіла. Вунь «Лукішкі»,
Дзе ў песні падзеї белананскія карнікі
Кулямі білі з турэмнае вышкі.

Вось плошча, якая адна памятае
Апошні удар Кастусёвага сэрца.
Вось Вострая Брама, па казцы — святая,
А там Вілія пад мастамі нясецца.

Над ёю, як нейкаму богу падзяка,
Гара з Гедымінавым замкам ўзнялася.
Сюды на экскурсію Коласаў дзядзька
Ў мінулым стагоддзі, як я зараз, лазіў.

Слядоў тут нямала пакінуў народ наш,
І кожны у Вільню ўлюбёны па праву —
Літоўцы завуць яе песняю роднай,
Сваёю сталіцай, і сэрцам, і славай.

Не будзем спрачацца за камні і вежы:
Мы звязаны дружбай і доляй супольнай.
Аб нашай і вашай пішу свае вершы,
Аб Вільні вялікай, бяссмертнай і вольнай.

Стаў родным і будзе да скону гадоў мне
І воблік яе незабыўны і колер.
Я здолеў бы выдумаць горад цудоўней,
Але вось такі, прызнаюся, ніколі.

3

Ледзь занімаецца зара,
Гудкі яшчэ маўчаць.
Я ўстаў і вырашыў: пара
Мне Вільню вывучаць...

Гадзін пятнаццаць вывучаў.
Ды крыўдна за адно,
Што горад з раніцы пачаў
Вадзіць мяне за нос.

Як толькі спадзяваўся: ну,
Тут, пэўна, цудаў шмат,—
Мне Вільня ставіла сцяну —
Гані хутчэй назад.

Калі ж я думаў: тут нуда,
Зноў нейкая сцяна,
Якую шыр, якую даль
Паказвала яна.

Як прыгажуня, накрысе
Свой раскрывала твар
І абяцала: шчэ не ўсе
Табе паднесла ў дар

Свае я цуды. Сам бяры,
Не злуй і не гаруй...
Ляпей за ўсё відаць з гары —
Палезу на гару.

Мінуўшы тысячы аркад,
Дзе рэха, нібы гром,
Убачыў: пеніцца рака.
Выдатны вадаём!

Над ёй гара. Узлез. Вось тут
Жыў знаны Гедымін.
Ну й будаваў. Сцяна — з вярсту
Утоўшч. Нібы ад мін

Ці бомбаў думаў захаваць
Мінуўшчыну сваю.

На вежы, што зусюль відаць,
Як Гедымін, стаю.

А навакол такі прастор!
Ды разбірае злосць:
Касцёлаў, цэркваў, поўна, сто
На дзвесце вуліц ёсць.

І хоць няма да іх мне спраў,
Але глядзі, не злазь —
Дзе Пётра I будаваў,
А дзе літоўскі князь.

Вунь Трохкрыжовая гара.
І як ты ні кружы —
На ёй пад промнямі гарацьь
Дакладна тры крыжы.

Гатычных вежаў не злічыць,
Таму й здалося мне,
Што Вільня мірна, ціха спіць
Ў гісторыі на дне.

Але ўсё гэта толькі зман
І мімалётны сон:
Растаў мінуўшчыны туман
Пад сонцам нашых дзён.

Ярко адполькава гарыць
Над Вільняй і Масквой.
Мае літоўскія сябры
Абновяць горад свой...

Ну, думаў, вывучыў дарэшт,
Ды трапіў у Закрэт.
І Вільня з гэтых слаўных мест
Раскрыла зноў сакрэт.

Такіх магутных гонкіх хвой
Нямнога на зямлі.
Адна дастала галавой
Да сонца. І плылі

(Я падлічыў) сто дзесяць хмар
Паміж яе галля.

Раскошы гэтакай няма,
Відаць, і ў караля.

Бо з ласкі шчодрае зямлі
Тут кожны атрымаў
Па сто хваін, па дзесяць ліп,
Па мору чыстых траў.

Рака імкнецца у прасцяг,
Свідруючы віры.
І я убачыў зноўку сцяг
На Замкавай гары.

А Вільня нейкі ўжо другі
Паказвала свой бок,
Яшчэ больш слаўны, дарагі.
Прыгожа, далібог!

Глядзіш і верыш: на зямлі,
Усім скептыкам на злосць,
Мадагаскар і Самалі
Абавязкова ёсць.

4

Вулка вузкая, крывая,
Запалоненая бэзам.
Тут вільнянка пражывае.
Значыць, стой, машына. Злезу.

Гэтак чыста, гэтак ціха,
Чынна, сонна, старажытна,
Хоць ты рухайся на цыпках,
Грукнуць ботам сцеражыся.

Хмель на сценах. Бэз калматы
Мірна свеціць на гародах.
Тут бы нашым добрым маткам
Дажываць сівыя годы.

Толькі мне не зразумела
(На цябе ледзь не абураи),
Як сюды ты залацела
Са сваёй натурай бурнай.

Мне б у дзверы стукнуць моцна,
Каб хутчэй ты з хаты выйшла,
Толькі боязна спалохаць
Старамоднае зацішша.

А сустрэўшыся са мною,
Ты зламала ўсе законы
Праспаватага спакою,
Ідылічнасці зялёнай.

Ці ад слоў тваіх гарэзных,
Ці ад выразаў дасціпных —
Праяспелі вочы бэзу,
Хаты ў цень адбеглі сціпла.

Уступіла месца зорам
Па сваёй ахвоце сонца.
Загадала ноч: у горах
Салаўям спяваць бясконца...

Я не знаю, ці кахаю.
Пэўна, не. Але тады
Паблукаў я побліз раю
Першы раз за ўсе гады.

Мне б сказаць табе той ноччу
Нешта шчырае да мукі;
Цалаваць да болю вочы,
Вусны піць і лашчыць рукі.

Ды таму, што месяц таяў
Вельмі соладка ў тумане
І былі усе дэталі
Запазычаны з раманаў,

А пейзаж начы класічнай
Выхваляўся добрым густам,—
Па сваёй звычайнай звычцы
Гарадзіў я толькі глупства.

Нам, напэўна, не спаткацца,
Ды яно і не патрэбна.
Толькі душны пах акацый,
Сонны шолах ліп і вербаў

Адгукнецца, знаць, у вершах
Невыразнаю тугою...
Быць табе з другім і лепшым,
Быць мне з горшаю, з другою.

5

Я сто гадоў не ездзіў на рамізніках
І думаў: яны здадзены ў музей.
Ды давялося вось: мяне вязе
Кульгавы конь, якому сена трызніцца.

Вазніца, хваравіты і стары,
Змрок сцёбае ляніва чорнай пугай.
Ледзь-ледзь падзьме —
і сыпяць белым пухам
Каштаны на скупыя ліхтары.

А Вільня спіць. Падковы гулка цокаюць.
І мне здаецца, быццам еду я
Ў той даўні век, калі яшчэ Баян
Пускаў пад зоры стаю песняў-сокалаў.

6

Не трымаю у сакрэце
(Кроў хвалюецца у жылах):
Над Віллёю у Закрэце
Мне цыганка зваражыла,

Быццам я дзяўчыне нейкай
Абяцаў багацця рэкі,
А па справе — ручаіны
Я не вырыў для дзяўчыны.

І цяпер дзяўчына тая
Па грыбы ў адчаі ходзіць.
Далібог, не памятаю
Я аб гэтакай прыгодзе.

Наманіла ты, цыганка,
Пра мяне. У кожным разе,
Я надобнай абяцанкай
Шчэ нікога не абразіў.

І навошта казкі тыя
Плесці мне? З якою мэтай?
Што мне горы залатыя?
Што мне рэкі дыяментаў?

Не імкнуўся я ніколі
За багаццем хіжа гнацца.
Усяго ў мяне даволі:
Цэлы свет — маё багацце.

А як сыдуцца дарогі
З той, адной, у добры ранак,—
Пасцялю я ёй пад ногі
Пер'е райскае маланак.

Я аддам святло ёй зораў,
Салаўіны голас лесу,
Пах язміну, цвет чабору
Ды ў прыдачу — кайстру песень.

7

Аб гэтым вясноваю ноччу прысніцца,
Пракоціцца ў памяці песенным рэхам.
На віленскі бэз, на віры, на званіцы
Цярушацца зоры рубінавым снегам.

Мне заўтра на золаку зноў у дарогу.
Пара адпачыць, ды чамусьці не спіцца.
Праўдзіваю думай, няяснай трывогай
Хацеў бы я, Вільня, з табой падзяліцца.

Заўсёды, як гляне даўніна сівая
У вочы, нібыта настаўнік суровы,
Свой сэнс першародны тады набываюць
І фарбы, і гукі, пачуцці і словы.

Мне дзён не ставала зрабіць справаздачу,
А тут я падумаў: як зроблена мала.
Прайшла маладосць вадаспадам гарачым,
Гады прашумелі нястрымным абвалам.

Я шчодры і буду такім да магілы,
І ўсё ж адчуваю: бясконца ўсім вінен.

Ці ўдасца стварыць мне, паклаўшы ўсе сілы,
На радасць людзей хоць маленькую Вільню?

Шчэ многа пабачыць мне суджана свету,
Але застанешся ты ў сэрцы адзінаї —
Затканая зорамі, лісцем і цветам,
Пявучая Вільня — літоўскае дзіва.

*1946*

## ВЕЧНЫЯ СЛОВЫ

Можа гэта казка ці паданне
Нашай фантастычнае зямлі...
Паміж стэпаў у стагоддзях даўніх
Скіфы легендарныя жылі.

Там былі і здрайцы, і героі.
Палявалі, сеялі палі,
Лаяліся лаянкай старою
І не менш, як мы, віна пілі.

Вечарам, калі на месяц мутны
Вылі старажытныя ваўкі,
Мудрыя вялі размову мудра,
Дурні — як і ў кожныя вякі.

Слоў раі пад зоры адляталі,
Гаслі, нібы іскры ўпачы,
Іх прасторы дзікія глыталі
І глушыла ветрам далячынь.

Толькі кажуць: не знікаюць словы,
Лётаюць заўсёды над зямлёй;
І людзьмі пахованыя мовы
Над табою кружаць, нада мной.

І часамі ў стэпах анямелых,
Калі толькі ты ды цішыня,—
Нечакана і незразумела
Мёртвыя размовы зноў звіняць.

Ты пачуеш плач, іржанне коней,
Спеў дзяўчат і ваяўнічы крык.
І калі ты чутае запомніш,
Зможаш неадкрытае адкрыць.

І з урыўка злоўленага сказа
Зробяць розум твой і пачуццё
Чалавечай праўдай, а не казкай
Скіфскае далёкае жыццё.

*1946*

* *

Я тэмы для вершаў старанна вышукваў,
Пра шчасце людское я хітра выпытваў,
Слухмянымі рыфмамі звонка выстукваў
Пра гора і радасць, пра грозныя бітвы.

І мне уяўлялася: слова намацаў я,
Што сцежку пасцеле пад ногі прарока —
І рынуцца зоры і сэрцы юнацкія
У маё неспакойнае сіняе вока.

І раптам вось гэта аднекуль нахлынула
Такая туга, такая самоцішча,
Што станеш наўмысля пад цёмнымі
ліўнямі —
І не, не крануць, анічуць не замочышся;

Што прымешся здзеквацца над пялёсткамі,
З прыязнасці кпіць і над вершамі цвіліцца,
А тая ўсё болей і болей захлёствае,
Няма куды ёй ні прарвацца, ні выліцца.

Такая туга, што не знойдзеш і месца.
Ну, хоць бы адна да вясёласці кладачка!
Нібыта сядзіш адзінокі на месяцы
І слухаеш нудную мудрасць дакладчыка.

І вось, калі думкі нахлынулі роем,
Што я ўжо да радасці не даеду,—
Здарылася дзіўнае з гэтым настроем:
Я сам не заўважыў, як знік ён без следу.

Ці то бліскавіца яго спапяліла,
Ці хваля з духмянага поплаву змыла,
Ці то у вачах ён патонуў дзяўчыны,—
Шукаць не хачу, дый не трэба, прычыны...

Са мною ты побач. Сусвет заспакоены.
І зноўку так добра, так шчыра навокал.
І зноўку вясёлай зарою напоена
Маё неспакойнае сіняе вока.

*1946*

* *

Я стукнуў тры разы
У дзверы. Ты маўчыш.
Напэўна, заглушыў
Мой ветлы стук пярун.

Каб ля цябе пабыць,
Я гэтак бег. Мяне
Імкнуліся прабіць
Сто тысяч стрэл дажджу.

Прытворшчыца! Няўжо
Такі твой моцны сон,
Што залатых нажоў
Не бачыш гнеўны бляск?

А мо за нейкі грэх
Ці памылковы крок
Усім сябрам на смех
Загад дала дажджу,

Каб пугамі ён сек
Мяне каля дзвярэй,
Пакуль не папрашу
Пакорна я: «Даруй».

*1946*

* *

Сябры, я сягоння па сінім золаку
У парку ля Свіслачы ціхай хадзіў.
Маленькім ліхтарыкам ззяла зорка
І мне асвяціла мільёны дзіў.

Я глянуў на ліпу, пасля на камень —
Мой позірк імгненна да іх прыліп,
Як прыліпалі пагляды вякамі
Да гэтых каменняў, да гэтых ліп.

Ім трэба быць мудрымі, гэтым прадметам:
Глядзяць і слухаюць сотні гадоў.
Тут дум напластована, нібы пад следам
Маім,—
Напластавана розных слядоў...

А ў Свіслачы вербы старанна мылі
На тоўстых нагах вузлаватыя пальцы.
На вербах чорныя птушкі вілі
Нешта накшталт палацаў.

Не стаў я падглядваць за прыватным
Жыццём незнаёмых птушак,
Бо ў небе ўспыхнула шмат барвcovатых
З жоўтым адценнем стужак.

І раптам убачыў я на кары
Надпіс загадкавы «Аня».
І сумна мне стала чамусьці, сябры,
Ад гэтага знаку кахання.

А потым, як сонца перарасло
Мяне і святочную арку,
Пачуў я нямала здзіўляючых слоў
Аднекуль з глыбіняў парку.

Раса апала на дно травы,
І птушкі замоўклі ў трывозе:
Мёртвы Шаляпін спяваў, як жывы,
«Уніз ды па матухне-Волзе».

*1946*

## АТАМ

Сёння многа размаўляюць
Пра цешчу ці свата.
У чарзе і на працы,
На кожнай з дарог
Пра яго аднаго,
Пра расшчэплены атам —
Нечуваны,
Сакрэтны,
Магутны, як бог.

Перуны закладалі
У бомбы цяжкія,
Адлівалі гарматы
Па сотні пудоў,
Вынаходзілі толы, тэрміты,
Якія
Разбівалі дашчэнту
Муры гарадоў.

Раптам нейкі мізэрны,
Нябачны,
Глыбінны
Выйшаў атам на свет
І сказаў: «Я ўладар!»
І адразу суменіся
Бомбы і міны,
Як зямлю скалануў
Яго першы удар.

Грозны атам усюды —
Праслаўім навуку! —
Мы пранізаны ім
З галавы і да ног.
Зразумелымі сталі
Мне розныя штукі,
Нават выбухі гневу
У нашых жанок.

Я гляджу на трамвай,
Што грукоча і бразгае,

І нязлосна кажу:
Хутка, брацє трамвай,
Мы два атамы супем табе,—
І будзь ласкаў,
Век хадзі па здароўе
І сіл не губляй!

Бачу дым пад заводам
Цяжкі, пачарнелы —
Навіпою аблокі
Парадваць гатоў:
Хутка змыецца копаць
З блакітнага неба,
Будзе чыста і ўтульна
Праз колькі гадоў.

Хай пакуль яшчэ нам
Жыць нялёгка часамі,
Драбяза бытавых
Непаладкаў грызе.
Я на рэчы з бензінам,
Вуголлем,
Дрывамі
Пазіраю сягоння,
Нібы на музей.

Можа я і не спаў бы
Начамі спакойна,
Можа думаў бы хвіляй:
«Загіне зямля»,
Можа сніў бы
Пра новыя
Страшныя войны,
Каб не чуў я ўпэўнены
Голас Крамля.

Атам наш!
У рэактарах ён
І ў сэрцах.
Ён жыве для жыцця,
Не для чорнае смерці.
Гэты волат касмічны
Цяпер прыручоны.

Чэсць табе,
Чалавек!
Слава мудрым вучоным!

Апусціце
Задзёртыя біўні,
Гарматы!
На зямлі вырастае
На поўны свой рост
Наш магутны
Савецкі расшчэплены атам —
Наша сіла, і зброя,
І будучы лёс.

*3.11.1946*

## СОРАК ГОД

*Якубу Коласу*

Сорак год —
гэта сорак удараў званоў,
Што на працу і бітвы
народ беларускі будзілі.
Гэта сорак садоў,
што прынеслі багата пладоў
Дарагой Радзіме.
Дык давайце ўспомнім
маленства далёкія дні —
Смольны корч на камінку,
на ўслончыку бацька з лапцямі,
Томік вершаў паэта
і роднае школы агні...
Так са Сцёпкам выходзілі
ўсе на прасторы жыцця мы.
Заіграе музыка Сымон,
стане свет прыгажэй і ярчэй,
І магутнай ракою
здаецца звычайны ручэй.
А як клікне «Да помсты!»
з Палесся адважны Талаш,—
Мы ляцім у сасоннік
рабіць партызанскі шалаш.
Кнігі Коласа нам
і калыскай, і школай былі
І па новай зямлі
нас у сённяшні дзень прывялі.
Песні Коласа нас
навучылі Радзіму любіць,
Родны край бараніць,
лютых ворагаў біць,
Ненавідзець мінуўшыя здані,
Навучылі чытаць цёмных пушчаў паданні,
Разумець мову зор
І напевы азёр,
Хваляў нёманскіх звон,
Велiч сённяшніх дзён

*1946*

## ТРЫ МОРЫ

Вы знаеце, пэўна,
пра два велізарныя моры:
Адно — дзе аблокі плывуць,
дзе месяц і спелыя зоры,
Дзе хмары маланкі снуюць
і нараджаюцца снегапады,
Дзе буйнае сонца гарыць
блакіту і травам на радасць.
А мора другое —
шуміць пада мною.
Там пены мігценне,
Птушыныя цені,
І рыб'і дарогі,
І хваляў трывогі.
А ёсць яшчэ трэцяе мора
між морам сапраўдным і небам.
І гэтае, трэцяе, самае дзіўнае,— я
І ты, мой таварыш,—
тварэц самалётаў і хлеба.
Хай славіцца век, чалавек,
бязмежная веліч твая!
Што ў гэтых прасторах вады?
Птушыныя цені ды рыбы нямыя,
Ды часам гарачая хваля
на бераг каралі намые.
І што мне нябёсы,
якія штодня вас так цешаць!
Арлы пралятуць —
на небе не знойдзеш і сцежак,
А хмара хутчэй праглынае
іх крылляў напружаны шолах.
І попелу нават няма
ад маланак вясёлых.
А я багацей.
У мяне —
і крыллі арла,
і прага ляцець у свет дальні,
і горды арліны пагляд,
і гнеў бліскавіц незгасальны.

Калі ж не разліўся я небам,
ці морам,
ці нават ракою,—
Я гэткімі быць не жадаю,
патрэбы не маю такое.
Шумець не хачу аднастайна,
цвісці не хачу бледным цветам.
Я быць не хачу нават рэдкай
зблудзіўшай гарачай каметай:
Ёй гінуць ля нейкіх сузор'яў.
Мне ж свяцяць вялікія мэты
На нашай зямлі неспакойнай,
у нетрах таемных сусвету.

*Кастрычнік, 1946*

## Я ГАЛАСУЮ

Калі ў маё сэрца часта
Пастукае гэты дзень
І мне дадуць на ўчастку
Выбарчы бюлетэнь,—
Я прабачэння адразу
Ў камісіі папрашу
І некалькі шчырых сказаў
На бюлетні напішу:
«Здабыты у грозных бітвах,
Я голас свой аддаю
За мужную, працавітую
Радзіму тваю і маю.
Хай славіцца і красуе
Наш родны Савецкі лад!
Я за цябе галасую,
Мой будучы дэпутат,—
Каб беларускімі трактамі
Жыта лілося ракой,
Каб беларускія трактары
Гулі над кожнай ракой.
Каб мінскія аўтамабілі
Па ўсіх дарогах трубілі,
Каб людзі жылі багата,
Каб песні цвілі па лугах,
Каб лепшай хвалой дэпутату
Гучала: «Народны слуга».

*1947*

## ПРЫСЯГА

Аднагодкі Кастрычніка!
Станьма сягоння пад сцягі.
Прынясём словы ўдзячнасці,
Словы святое прысягі.

Спавівала Радзіма нас
Рэвалюцыі светлымі зорамі,
Надзяляла Радзіма
Здабытымі кроўю прасторамі,
Калыхала Радзіма,
Прыкрыўшы найлепшымі сэрцамі,
Навучала Радзіма нас,
Каб не баяліся смерці мы.
Галадала сама —
Мы не ведалі чорнага голаду,
Замярзала сама —
Захінала ў шынель нас ад холаду.
Ад калыскі адданыя,
За яе мы цудоўней не ведаем:
Яе справай жывём,
Яе шчасцем, і гневам, і бедамі.
Калі мы падраслі —
Не давала Радзіма заседзецца,
Да утульных пярын,
Да канеечных спраў прысуседзіцца.
Расчыніла Радзіма
Далягляды навокал такія нам —
Аж займаецца дух:
Ад Камчаткі да Брэста, да Кіева,
Ад таемнага атама
Да сузор'евай навісі,
Ад любві акіянскай
Да вулканнай нянавісці.
Волі, смеласці, сілы
Радзіма дала нам багата,
Іх не зломяць ніколі
Ніякімі карамі каты.
Тры жыцці пражывём —
І ўсё ж мы цябе не аддзякуем,

Твая праца і ласка
Не ўмесцяцца ў мерку ніякую.
Мы жыццём прысягаем,
Што ў семнаццатым годзе дала ты нам,
Збудаваць камунізм,
Зберагчы ад навалы заклятае.
Ён ідзе, камунізм!
Гэта свята не за гарамі.
Трэба, кожны каб з нас
Сёння чэсна сябе запытаў:
«Ці зрабіў я, што мог?
Ці усё я Радзіме аддаў?»,
Каб прыйсці ў камунізм
Яго першымі жыхарамі.

*1947*

## НАШ НОВЫ СВЕТ

«Мы наш, мы новы свет збудуем!» —
Спявалі нашыя бацькі,
Калі за волю маладую
Ішлі на ворага ў штыкі.

Вось ляжыць гэты свет
  Ад Сахаліна да Сана,
Майскім ліўнем абмыты,
  Сінім небам накрыты як след.
Ён такі яшчэ новы, вясновы,
  Што дзівімся самі,
Ён такі ужо мудры і грозны,
  Што дзівіцца свет.
А прасторы якія!
  Сонца ўзыдзе з-за выспаў Курыльскіх
І пакуль дапłыве
    Да зялёных гуцульскіх Карпат —
І мільёны гектараў
  Зааруць за Дняпром трактарысты,
На Палессі узнімуцца
  Тысячы сонечных хат.
Ад калыскі у нас
  Пра Радзіму — найлепшыя думы.
За граніцу трапялі —
  Задыхаліся песні ад суму,
Венскі лес нам не мог
  Заслаціць беларускага гаю.
Родны край,
  Я цудоўней не ведаю роднага краю!
Бо тут кожны завод і калгас
  Рукамі уласнымі створаны
І кожнае поле
  Для нашага шчасця заворана.
Мы ў Радзіму прасякнуты
  Верай такою вялікаю,
Мы такі баявы
  І працоўны прайшлі з ёю пуць:
Сотню рэк пракапаць
  У пустыні сягоння паклікае,—

Заўтра сотні ў пустыні
        Праменістых рэк працякуць!
Сёння майскае сонца
        Гарыць пераможна і ясна
На чырвоных сцягах,
        На нашых чырвоных сцягах.
Паспрабуй, пагасі іх —
        Яны, баявыя, не гаснуць,
Толькі клічуць наперад,
        Азараючы полымем шлях.

*1947*

## НА РАДЫЯТАРЫ — ЗУБР

Зубр — цар Белавежы,
Хіб — з галаву Казбека!
Так прывыклі сцвярджаць спрадвеку.
Ды і сам ён да царскае славы прывык,
Старажытнейшы бык.
І ў Маскве, і ў Баку, і ў Ташкенце
Пытаюць сябры:
«Як жывуць-пажываюць там вашы зубры?
Засталося іх, кажуць,
Ці то сем, ці то восем.
Паглядзець бы на іх».—
«Калі ласка,
Мы ў госці вас просім!»
Мы паедзем на ўскраіну Мінска
Да Аўтаграда
Паглядзець найвялікшае ў свеце
Зубрынае стада.
Не зуброў капыты
Будуць біць па карэнні у лесе,
Малаты
Будуць бухаць па зыркім жалезе.
Вы пабачыце мінскія аўтамабілі.
Партызаны былыя
Іх на радасць народа зрабілі.
Вы пабачыце тое,
Чаго мы ніколі не мелі,
Вы пацісьнеце рукі рабочым
За працу, за подзвігаў веліч.
Там на вашых вачах збяруць
І матор, і сярэбраны радыятар,
Да яго па малому зубру
Прыпаяюць старанна дзяўчаты.
Гэта марка завода.
Зубрыная сіла.
Што там сіла! Мо сто, а то й дзвесце!
Можна ўсіх жыхароў Белавежы
На машыне адной перавезці.
Будзе кожнае ранне
Зубрыны той статак

З працавітым рыканнем
Выходзіць з варот Аўтаграда.
Каб на ўсіх дарогах трубіць
Пра машынную сілу краіны.
Каб і шпалы і збожжа вазіць,
І дзядзькоў на кірмаш падкінуць.
Мы па гэтай машыне паедзем
На экскурсію ў Белавежу,
Каб гасцям паказаць
І сапраўдных зуброў як належыць.

*1947*

## ПОМНІК

Даўно мінулі дні атак.
На узбярэжжы Нёмна
Стаіць падбіты грозны танк —
Святы суровы помнік.

Як песню дзён былой вайны,
Як славу чалавечую,
Яго узнялі валуны
На векавыя плечы.

Пад звон пчаліных ніў і паш
Вартуе, урачысты,
Свой бессмяротны экіпаж —
Магілу трох танкістаў.

За край наш біліся яны,
І ў чэсць іх вольны Нёман
Узгадаваў тры яліны
Ў цёмна-зялёных шлёмах.

Стаіць сталёвы велікан,
Упёрся ў захад біўнем.
Штогод мацней гартуюць танк
І перуны, і ліўні.

Дажджы зялёныя шумяць,
Маланкі гром красае.
Героя кожнага імя
Услых вятры чытаюць.

Загляне промень залаты
У чорную прабоіну —
Тры месцы журацца пустых
Па трох адважных воінах.

Яшчэ відзён там на брані
Малы партрэт дзявочы.
З прапахлай дымам цішыні
Глядзяць жывыя вочы.

І твар адкрыты малады,
Каса — як залатая.
Як і калі прыйшла сюды
Калгасніца з Алтая?

Пра гэта кажа надпіс нам
На дошчачцы мядзянай,
Што танк магутны — дар байцам
Ад Русавай Таццяны.

У дні вайны радзіўся ён.
Ягоны кожны атам
Нагрэты працай цяжкіх дзён,
Нянавісцю да катаў.

Яго руплівым днём вясны
Рабілі на Урале.
Яе пачуцці, думы, сны
У сталь майстры ўкавалі.

Ўкавалі ласку і любоў
І веру ў перамогу.
Яна сама яго на бой
Праводзіла ў дарогу.

І дзесь пад Вязьмай у бары
Сказалі тры танкісты:
«Быць першымі ў баі, сябры,
Клянёмся урачыста!»

*

Над помнікам вятры шумяць.
А воддаль, пад гарою,
Калгас раскінуўся
Імя
Загінуўшых герояў.

За зрубам зруб, за дахам дах
На папялішчы горкім
Растуць.
Наўкол — смалісты пах
І хлебны пах уборкі.

І адчувае сябе танк
Калгасным абаронцам...
Плыве ў паднёманскіх кустах
Затомленае сонца.

І вось патопула.
Лясы
Зарою апавіты.
Ля танка плешчуць каласы,
Цяжкія хвалі жыта.

Чароўны час!
Здаецца, вось
Па мураве і красках
Сюды у ззянні сініх рос
На цыпках прыйдзе казка.

І бачыць танк:
Са збажыны
Выходзіць казка тая,
Што выпраўляла ў дні вайны
Яго на фронт з Алтая.

І твар адкрыты, мапады,
Ды толькі ў вочах смутак.
Прыйшла, прысела ля вады,
Сарвала мяту-руту.

І думала яна аб іх
Пад сумны звон калосся,
Аб трох сваіх сябрах, якіх
Сустрэць не давялося.

Глядзела, як агні гараць
Трывожна навакола...
Нялёгка зорам паміраць
На піках чорных ёлак.

Яны шчэ просяцца ў нябёс:
Пакіньце нас, мы будзем
Святлом жывіць празрыстасць рос,
Гарэць на радасць людзям.

Яны чапляюцца за тын
Барвовымі шматкамі
І абяцаюць залатым
Зрабіць пат кожны камень.

Яны па Нёманава дно
Ныраюць у адчаі,
Ляцець імкнуцца ўслед за днём
На крыллях белых чаек.

Але бязлітасная ноч
Зару змывае з красак...
Скацілася слязінка з воч
Залатакосай казкі.

А ёй шапталі валуны,
Як тут глушылі катаў,
Як білі гнеўна перуны
З уральскае гарматы.

І ўжо ірвалася стралой
Ў Нямеччыну дарога,
І вось пад гэтаю зарой
Ішла іх перамога

І ўперад клікала.
Але
Скасіла смерць харобрых...
Каля магіл — зара і лес,
Нібыта сцяг жалобны.

Апошні водбліск дня пагас,
Мігцяць сузор'і роем,
І крочыць казка у калгас
Загінуўшых герояў.

*

Не, у надпёманскіх краях
Не паміраюць зоры!
На ўвесь свой вогненны размах
Гарыць зара над борам.

Прасторная, як акіян,
І свежая, як радасць.
Пад ёй і песня, і баян —
Ідзе ў палі брыгада.

Радзіўся новы руппы дзень —
Ад рос, ад сонца яркі.
Плыве ў расе крылаты цень
Алтайскае жняяркі.

І надпіс шчыра кажа нам
На дошчачцы мядзянай:
«Маім братам — беларусам
Ад Русавай Тацяны».

А вунь яна й сама ідзе —
З палёў алтайскіх госця.
Яе вітаюць — добры дзень! —
І сэрцы, і калоссе.

Бо парадніласся навек
Яна з зямлёю нашай,
З красой палёў, з блакітам рэк,
З бяссмерцем экіпажа,

Які ля нёманскіх бяроз
Са славаю загінуў
За наш адзіны добры лёс —
Савецкую краіну.

*1947*

## УРАДЖАЙ 47 ГОДА

Калі ты бачыш па шляхах
Вазы са збожжам у мяхах,
Двухстапудовым, залатым,
Чытаеш рапартаў радкі,
Што будуць жыць і жыць вякі,—
Скажы: хвала і слава тым,
Хто слова даў, палі араў,
Начэй нямала недаспаў,
Раллі тугія камякі
Зрабіў рукой мякчэй мукі.
Як бітву выйграў — помні век —
За хлеб савецкі чалавек...
Дужэла жыта, бульба ўслед,
Агонь зялёны — на ўвесь свет.
Ды сонца глебу сцерла ў пыл,
І пылу рыжыя слупы
Таптаді нівы. Хлебны сок
Сох. І нагою на пясок
Не ступіш: пройме, нібы жар.
А трэба ж, трэба ураджай!
Ад спёкі трэскалася глеба:
Барометры у змове з небам.
Калі ж змялела і рака,
Прачнуўся гром і зарыкаў,
Званілі з Гомельшчыны: дождж!
Званілі з Гродзеншчыны: дождж!
Зямлю і ўпоперак і ўдоўж
Гаіў чаканы цёплы дождж.
Як збажына шугаць пайшла,—
Краіна песняй ажыла:
Ты будзеш мець, Радзіма, хлеб!
Ты будзеш жыць, Радзіма, лепш!
Даўно у нас не пелі так,
Даўно у нас не жалі так —
Такіх не бачылі атак.
Плылі жняяркі і сярпы,
Шарагаваліся снапы.
Замлелі рукі? Пацярпі.

Гул малацілак на таках,
Па ўсёй краіне хлебны пах.
Калгасны подзвіг, слава, чэсць
У элеватары цячэ.
Ад гэтых рэчак залатых
Зноў паляцелі ў Крэмль лісты,
Дзе зерне кожнае лягло,
Як літара, ў калоссе слоў.

*1947*

## ЗАРАЧАНСКІ МУЗЕЙ

Часта, вольны ад спраў,
Я ў музейныя залы заходзіў,
Пехатой вандраваў
Па былых адгрымеўшых стагоддзях —

Ад кастроў палавецкіх
Да набегаў нямецкіх,
Ад кітайскага бога Путая
Да сучаснага лёсу Кітая.

Бачыў я каралёў і цароў
У залочаных рамах.
Бачыў: кроў змагароў,
Як жывая, сачылася з ранаў.

Бачыў многія дзіўныя рэчы
І у Мінску сваім, і ў Маскве я.
А такога, як тут, у Зарэччы,
Анідзе я не бачыў музея.

Каля школы — прасторная хата
З бурштыновых бярвенняў.
Сонца шчодрае там экспанаты
Залівае праменнем.

Я хадзіў і нібыта ліставў
Летапіс гістарычны калгаса.
Тлумачэнні дырэктар даваў —
Вучань сёмага класа.

Гэта ўсё ён з сябрамі сабраў.
Ля ўвахода у першую залу
На саху мне хлапец паказаў,
Як на нейкага іхтыязаўра.

Пазіралі са стэндаў на нас
Зарачанскія справы і з'явы.
Тут ад першай заявы ў калгас
Да апошняй знойдзеш заявы.

Фотаздымкаў — па паўсцяны,
Партызанскія гнеўныя годы.
Зарачанцы, бацькі і сыны,
І ва ўсіх на грудзях — ўзнагароды.

Вось майстры ураджаю.
Я іх
На палетках бачыў учора.
Фотаздымкаў музейных сваіх
Ім, здаровым такім, трохі сорам.

Калі шмат нерастрачаных сіл —
У музей, хоць і свой, неахвота.
Хай на твар лепш цярушыцца пыл,
Чым на гэтыя фота.

А дырэктар не згодзен ніяк,
Калі вырашыць што, аблюбуе:
«То гісторыя,— кажа,— не я,
Фота вашых асоб патрабуе».

Сноп ля снопа стаіць па чарзе,
Год ад году — вышэй, каласісцей.
А далей пераходзіць музей
Праз акно у зялёнае лісце.

А далей — стрэхі новыя хат.
І здалося ў часіну мне тую,
Што расчынены вокны не ў сад,
А у будучыню залатую.

*1947*

## РАДЗІМА

Гутарак наслухаўшыся розных
Пра радзіму ды пра белы свет,
Я, малы, узлазіў на бярозу,
Краявід — на цэлы сельсавет.

Навакола — круглая, як донца,
Цёплая калгасная зямля.
І сваё бягомельскае сонца
Ля мяне плыло паміж галля.

Год на год лажыўся. Я падроставаў.
На бярозе той — зарубак след.
І хацеў ляцець за сонцам проста.
Каюся: цягнула ў белы свет.

Зазірнуць хацелася за дзіўны,
Барам акаймлёны, далягляд.
Дзе яна канчаецца, радзіма?
Што за ёй? Які такі там лад?

І хоць ведаў прымаўку я мудрую:
«Добра там, дзе нас няма», але ж
Чаго варта назва — Брамапутра!
Як гучыць — Парыж, Неапаль, Льеж!

А калі радзіма разлілася,
Выйшла ў гневе з родных берагоў,
Паў-Еўропы ў бітвах я аблазіў,
Азію ледзь-ледзь не абышоў.

Дым баёў вятрамі быў развеяны.
Азірнуўся: дзе ж Еўропа? Дзе?
Прабачайце, гэта штось музейнае!
Нават крыўдна стала за людзей.

Гнуцца за капейку ў тры пагібелі?
За скарынку рукі цалаваць?
Гэтак гордасць з чалавека выбіць!
Гэтак сэрцы брудам апляваць!

Па радзіме сум пахлынуў востры.
Як жа дыхаць тут і чым тут жыць?
І прасілі ціха людзі простыя:
«Пра сваю краіну раскажы».

Як гарэлі вочы іх! Як прагнулі!
Горды, расказаць я ім быў рад
Пра калгасы, пра асушку багнаў,
Пра славуты горад Ленінград.

Дома часам шчасця не прыкмеціш,
А ў чужых краінах я пазнаў,
Што няма нідзе на белым свеце,
Як у нас, такіх вялікіх спраў;

І такіх пявучых, чыстых рэчак,
І такіх палеткаў і бароў,
Гэткіх мужных сэрцаў чалавечых,
Гэткіх найадданейшых сяброў.

Людзі з праяснелымі вачыма
І з надзеяй пакідалі нас.
Не канчалася мяжой радзіма,
З намі ўсюды крочыла яна.

Ёй няма нідзе канца і краю,
Дзе ні стань — зусюль яна відна.
Здрадніка усюды пакарае,
Вернага усюды падтрымае,
Бо такая на зямлі адна!

*1947*

## НА ПУЛКАЎСКІХ ВЫШЫНЯХ

На Пулкаўскіх вышынях — цішыня.
Героі спяць у могілках-акопах.
Тут у пустыя трубы тэлескопаў
Глядзіць сузор'е сіняе да дня.
Яно прывыкла бачыць штопачы
Праз шкло — жывое вока астранома,
Якому звычкі зор усіх вядомы
І таямніцу можна даручыць.
Сузор'е пад руінамі вісіць
Самотнае. І хто раскажа зорам,
Што быў тут вораг, што імкнуўся вораг
Не толькі вока — шчасце пагасіць.
Героі спяць. Мо перад смерцю ім
Хацелася і цішыні, і зораў
На тым мерыдыяне, за каторы
Яны палеглі. Чэсць і слава ім!
А днём тут — цесляры і кавалі.
Славуты дом адродзяць ленінградцы,
І хутка, хутка зоры загарацца...
У воку астранома, як калісь.

*1947*

## НА КАНЦЭРЦЕ ХОРУ Р. ШЫРМЫ

На хвіліну заплюшчы вочы —
Ціха-ціха сасна задрыжыць,
І журботны голас дзявочы
Над табой пачынае кружыць.

Потым хлынуць у цёмную залу
Вадаспады лістоў і зарніц,
Сініх рэчак цёплыя хвалі,
Звон наднёманскіх навальніц.

А пасля басавітыя громы
Прагрукочуць, як гінуў «Вараг»,
Горды, мужны, непакароны,
У сляпых акіянскіх вірах.

І калі утаймуюцца людзі,
Змоўкнуць воплескаў перуны,—
Зноўку сэрца твае разбудзіць
Гул вясёлы цымбальнай струны.

Дык хутчэй жа расплюшчы вочы:
У «Лявонісе» — пазірні —
Трапяткія вясёлкі сарочак
І віхор каляровых спадніц.

Ці ў маленства вярнуўся, ці ў сне я?
Тут да болю мне роднае ўсё.
Так скакаць могуць толькі жнеі
І касцы з беларускіх сёл.

*1947*

## ТЫМ, ХТО ЗА АКІЯНАМ

За круглым сталом не сядзець мне ніколі:
Западта гарачы з мяне дыпламат.
І ўсё ж устрымацца не ў сілах я болей,
Бо крыўды у сэрцы настоена шмат.

Заткнуць, можа, вушы, пачнуць прытварацца...
Нічога!
І так, я наконт рэпарацый.

Дзе былі вы ў той час? —
Ці то сонца вас грэла,
Ці якое сузор'е над вамі плыло?
23 чэрвеня
Наша хата гарэла,
Хіба ў вас там пажару відаць не было?

Я магілу капаў пад задымленым небам
І яе, сваё першае шчасце, хаваў.
Вы ж кахалі таксама, відаць, калі-небудзь?
Не кахалі,— спытайце таго, хто кахаў.

Сотні вёрст пехатою ішла мая маці
На усход, абы толькі ад злыдня ўцячы,
Сумавала, сівела у бежанскай хаце.
Можа зможаце вы ёй жыццё падтачыць?

Я паўгода ляжаў у балоце пад Русай.
Гэта, верце, не Ніца...
Не таму, што спагад
Я прашу, а таму, што тады ў Беларусі
Рабаваў, абжыраўся, распуснічаў гад.

Сотні чорных бяссонніц... Поту горкага колькі!
Многа бачыў я мёртвых, многа дыму глынуў.
Я у целе нашу тры гарачых асколкі,
Мне яны не даюць забываць пра вайну.

Я чатыры найлепшых гады маладосці
У траншэях пакінуў. А мог... Шмат бы мог.

І штыком, што затлеўся ад гневу і злосці,
Гадаў біў.
Мір здабыў.
Перамог.

Нашы нівы наскрозь здратаваны металам,
Яшчэ доўга звінецьмуць аб сталь лемяхі.
І бывала, што зерне там не прарастала,
Адзывалася звонам, як стогнам глухім.

Я таму патрабую:
Плаці за ўсё, вораг!
Каб не клаўся па Нёман ад «юнкерса» цень,
Каб ніколі у нас беларускія зоры
Не глядзелі у вочы забітых дзяцей.

*1947*

## УРОК ГЕАГРАФІІ

Любіў геаграфію я. На занятках
Настаўнік казаў: «Прасвідруйце наскрозь
Зямлю, каб праходзіла земная вось,—
Убачыце амерыканскія пяткі».

Пакінуўшы дома кужэльныя ранцы,
Мы горача спрэчку ля рэчкі вялі:
«Ну як гэта ходзяць амерыканцы
Галовамі ўніз?» — Зразумець не маглі.

Не верыў я. Часта падобныя доследы
Рабіў і ледзь-ледзь галавы не скруціў.
Хоць змыты даўно ўжо наіўных гадоў сляды,
Ды ўспомніў,— настаўнік тады не хлусіў.

Сягоння ў Амерыцы грозяцца сцерці
Зямлю нашу родную атамнай смерцю.

Ліхвярскімі доларамі засупонілі,
Хлуснёй закілзалі з Нью-Йорка тузы
Турэцкія горы, залівы Японіі,
І Чэрчыля плечы, і Херстаў язык.

Ды ёсць яшчэ простых людзей мільярды.
Ці хочацца ім за банкіраў у бой?
Прабітыя сэрцы не вылечыш лярдам,
Бляшанкай тушонкі не купіш любоў.

Не страшны нам выгукі печалавечыя.
Мы чулі такія калісьці з Нямеччыны.
Мы бачылі нелюдзяў. Дзе яны, нелюдзі?
А наша Радзіма далей і далей ідзе

Дарогаю праўды — у камунізм.
А тыя, што ходзяць галовамі ўніз
І атамнай злосцю паветра атручваюць,—
Галовы паскручваюць.

*1947*

## ЛІСТ У НЬЮ-ЙОРК

*Джону Сміту, майму аднагодку*

Гэй за акіянам!
Джон! Здарова, дружа!
Што ты парабляеш?
Дзе ты кружыш?

На якім там авеню ці стрыце
Сустракаеш свой ты юбілей?
І табе і мне сягоння трыццаць.
Віншаванні шлю табе!
Але...

Помніш пра сустрэчу у Іране?
Зоры тэгеранскія свяцілі як!
Я табе — пра нашых партызанаў,
Ты мне — пра дэсанты у Сіцыліі.
Помніш, Джон, ты першы мне пакляўся,
Што навек па зброі мы сябры.
Ты на памяць даў мне Мікі Маўса,
Я — з пілоткі зорку падарыў.

Мы фашыстаў лаялі са злосцю.
Абяцалі — друг да друга ў госці.
Што нам акіян, хоць і Вялікі!
Ноч...
Прыёмнік...
Двух мы — я і Мікі.
Я па хвалях плаваю.
Хачу
Голас нью-йоркскі твой пачуць.

Што за чорт!
Куды цябе заціскалі?
Хоць стаўляй ты дыбам валасы:
І басяць, і тэпарацьь, і піскаюць
Атамныя галасы.

Вось табе і ў госці!
Не, не верыцца,

Каб сягоння ты ў сваёй Амерыцы
Трызніў аб грабежніцкай вайне,
Атамную ладзіў на мяне;

Каб адзін аднаму неслі гібель,
Каб ізноў і дым, і гром, і кроў;
Каб давілі танкамі магілы
Нашых аднагодкаў і сяброў.

Што яны ў вас — з глуздам ці прыдуркі?
Шмат было ўсяго, пара і знаць:
Атамнымі бомбамі і туркамі
Нас не запалохаць, не зламаць.

Ты не з тою падыходзіш меркай
Да народа нашага, Амерыка!

Людзі мы занятыя. Закончылі
Пасяўную... Росцім ураджай.
Мінск будуем. Зброяй не грукочам мы,
Дык і нам, васпан, не пагражай.

Мы на варце. Што і як на свеце
Бачыць гераічны мой народ...
Мікі Маўсаў дараць, здэцца, дзецям?
Мы не дзеці. Нам па трыццаць год.

*1937*

## БІТВА

Няспынна, нястомна, сурова і грозна
Вялікая бітва вядзецца за лёс наш.

Ды толькі не чутна грымотаў гарматаў,
І вочы не есць дым пажарышчаў горкіх...
Ваююць савецкія дыпламаты
За акіянам у залах Нью-Йорка.

А ў залах тых чынна. Манішкі і фракі...
Не верце у чыннасць! Вось доларам бразнуць —
І зноўку на мір наш пачнуцца атакі,
І нечыя фракі у брудзе пагразнуць.

Расставілі насткі і рыюць падкопы
Пад нашае шчасце, пад волю Еўропы.

Найміты плююць на народнае права,
А баязліўцы — у горах паправак.

Нацэліліся рэпрадуктары ўсюды
У сэрцы людскія, і людзі трывожна
Глядзяць з хваляваннем, чакаюць прысуду —
Хто бітву прайграе, а хто пераможа.

І вось наш пасол у бой кідае сілу —
Суровую бальшавіцкую праўду.
Яна нам свяціла і злыдняў касіла
Ля сцен Ленінграда, ля сцен Сталінграда.

І з простых людзей яго дзякуе кожны.
Збірайце, магнаты, прыслужнікаў трупы:

Прыкуты маланкамі слоў пераможных
Падпальшчыкі войнаў да чорнага слупа.

І толькі ў газетах прамоў іх астанкі
Чарнеюць, нібыта разбітыя танкі.

*1948*

## БЕЛАРУСІ

Мне здаецца, з першым промнем сонечным
Я цябе пазнаў і палюбіў
Гэткай маладой, прыгожай, сённяшняй
У разліве неабдымных ніў;

З пушчамі, з бярозавымі трактамі,
З гулам самалётаў над зямлёй,
З працавітай песняй дужых трактароў,
З яснай электрычнаю зарой.

Ты ўздымаеш сёння, урачыстая,
Нібы трыццаць сонцаў, трыццаць год,—
Мужная душой і сэрцам чыстая,
Вызнаўшая тысячы нягод:

Білі куляй, спакушалі хутарам,
Палыновай путалі мяжой,
Пагражалі бомбай і атрутаю,
Раз'ядалі здрадніцкай іржой.

Песняры прадажныя гнусавілі,
Стан твой прыбіралі ў васількі...
Ты ж адважна з нараджэння самага
Ў будучыя стукала вякі.

Маладыя сілы ты патроіла
У гады, калі вайна гула.
Нібы лісцем, гільзамі патроннымі
Ўся ты зацярушана была.

І сягоння, ў сцягі апавітая,
Ты ў нябачнай славе і красе.
Гордай, баявой і працавітаю,
Ганарымся мы табой усе.

*1948*

## НА ПОЛЬСКА-ЧЭХАСЛАВАЦКАЙ МЯЖЫ

Старыя Татры з году ў год дзівіліся
І не маглі сказаць суседзям тым,
Што сэрцы іх адным пачуццем біліся,
Што па крыві даўно яны браты.

Што дыхалі адным суседзі водарам,
Адной зарой іх пебасхіл палаў,
І сонца, што ўзнімалася над Одэрам,
Дзяліла ім праменні папалам.

Ды недарма вадзілі з Польшчы ў Чэхію,
Ў Славакію мы танкі ў час вайны.
Ды недарма збаўленнем і уцехаю
І будучым назвалі нас яны.

Дзе з боем мы прайшлі шляхамі ратнымі,
Наш след не затаптаўся, не астыў.
І на мяжу паміж дзвюх земляў братніх мы
Паклалі непарушныя масты.

На тых мастах сягоння давялося ім
Упершыню сустрэцца на вяку,
Бажэна абнялася з польскай Зосяю,
І Стась пацісnуў Здэнэку руку.

Я ведаю, ніколі Мая гэткага
Не бачылі там Татры за вякі,
Дзе дружба, мары, сонца, песні з кветкамі
Спляліся у святочныя вянкі.

Каб справаю і славай парадніцца
У гэты дзень братэрства і надзей,
Не толькі там адкрылася граніца —
Там сэрцы ўсе адкрыліся ў людзей.

*1948*

* *

Калі нельга многа — хоць бы трохі
Паблукаць бы мне па ўсёй зямлі,
Каб усе шырокія дарогі
Пылам вандраванняў замялі.

Толькі не запудлівым турыстам.
Знаю: на зямлі баі гудуць.
Знаю: у Афінах камуністаў
На расстрэл сягоння павядуць.

Джунглі Інданезіі! Малайя!
Не магу я сном спакойным спаць:
Людзі за свабоду паміраюць,
Радавым хачу ў рады іх стаць.

Да суровых земляў шматпакутных
Я хачу прапесці праз драты
Промні зор крамлёўскіх пяцікутных,
Нашую любоў да вас, браты.

Не па нечай волі. Па загаду
Сэрца —
            я жадаю з вамі быць,
Каб сустрэцца, разлічыцца з гадам,
Што на фронце не паспеў дабіць;

Каб у горах Грэцыі арліных
Расказаць пра грозны наступ наш,
Як ішлі на Вену і Берлін мы,
Баявы правесці інструктаж.

І з баёў вярнуўшыся гарачых,
Ад якіх планета ўся дрыжыць,
Песнямі замест справаздачы
Аб усім народу далажыць.

*1948*

* *

Праедзь альбо прайдзі
Ад Кушкі да Ямала,
Геаграфічных дзіў
Убачыш ты нямала.

Даведку дам, калі
Куды далей паедзеш:
Цэйлон ёсць на зямлі
І Чылі існуе дзесь.

Сланяюцца слапы
У джунглях на Цэйлоне,
Цэйлонскі чаї яны,
Знаць, возяць і па сёння.

Усё, як і вучыў,
Там ёсць: брытанцы, кобры.
А што у гэтым Чылі,
Сам не знаю добра.

А ў рэшце рэшт скажу,
Што раджу гэта жартам.
Нам ехаць за мяжу
Турыстамі не варта:

Захочаш прывітаць,
Як чалавека, негра,
Пачнуць там якатаць
І выць — вітацца нельга!

І вось канфлікт. Ізноў
Турботы дыпламатам.
Ану іх да багоў!
І ў неграў будзе свята.

Я веру: прыйдзе час,
І там народ сурова,

Як пскалі у нас,
Прысуду скажа слова.

І мы пад гул вятроў
Па акіянах мірных
Паедзем да сяброў
І ў Афрыку і ў Бірму.

*1948*

* *

Над Бугам грымяць і грымяць цягнікі,
І сіняя плынь пагранічнага Буга,
Не гасячы зор трапяткіх агнькі,
То ворага твар адбівае, то друга.

Ваўчыныя вочы замежных пралаз
Не знойдуць ні шчылін, ні нор, ні адтулін
У нашыя справы, у сэрцы да нас;
Ім здасца квітнеючы край наш няўтульным.

А другу, што ў працы ці ў бітвах змарнеў
На дальняй Суматры ці ў Грэцыі горнай,—
Як светлую кнігу, жыццё разгарне
Наш край пагранічны, шчаслівы і горды.

Зірне на яго не музеем вайны,
Не выстаўкай «юнкерсаў» збітых і «тыграў»,
Дыхне на яго не агнём навальніц,
Не ветрам журботным з руінаў і выгараў,

А песняй зялёнай высокіх бароў,
Спавітых зарою, абмытых расою,
Красою узнятых з руінаў муроў
І простай і мужнай людскою красою.

Павее ад нашых палёў залатых
Не казкай, а шчасцем сапраўдным, вялізным.
І друг усім сэрцам адчуе ў той міг,
Што ён узышоў на парог камунізма.

*1948*

## СВОЙ ГОРАД

Вайна, вайна! Гул апошніх боек...
Гадзіны заціхшых вятроў і зарніц...
Свае гарады ўспаміналі з любоўю
Салдаты, стаміўшыся ад заграніц.

Дзе гэта? У Будапешце ці Вене
Ты марыў, таварыш, пра дзень і час,
Як прыйдзеш дамоў на праспект Руставелі
І скінеш ранец паходны з пляча?

І ты, мой дружа, таксама ведаў:
Заціхне на плошчах берлінскіх бой —
І зноў ты сустрэнешся з коннікам медным
І знойдзеш родны дом над Нявой.

Я рад за вас быў. Я вам не зайздросціў.
І вы суцяшэннямі не абражалі мяне.
Казалі: «Чакай, прыедзем у госці
У слаўны Мінск, як вайна міне».

Хоць ведалі: некуды покуль ехаць,
Ведалі: зор трапяткія раі,
Што ззялі над нашым пятым паверхам,
Спусціліся ўніз, да самых руін.

Шчасліва, хлопцы! А я, каб і каменя
Не засталося ад Мінска, сюды
Вярнуўся ўсё роўна б, каб сваімі рукамі
Падмуркі класці, садзіць сады.

Сто мірных дажджоў адзвінела. Зноўку
Па мінскіх плошчах ідзе вясна.
Будуецца Ляхаўка і Камароўка,
Пяе над пілою тугая сасна.

У горах друзу — машын рыканне.
У рыжым пыле — муляраў галасы.
На свежыя сцены кідае ранне
Фарбы сонечнае красы.

Гучаць маторы: добрая справа
Цэглу пасіць і бетон мясіць!
Добрая справа здабыць сабе права
Званне «мінчанін» горда насіць!

Ведаю: ёсць гарады на свеце,
Якія захвалены аж да дзір.
Мы Мінск не горшы за іх нашым дзецям
У спадчыну аддадзім.

Такі, дзе сэрцу не будзе цесна,
Такі, дзе падружаць сады і муры,
Дзе самыя лепшыя нашы песні
Не будуць змаўкаць ад зары да зары.

*1948*

## АФІЦЭРЫ ЗАПАСА

Мы пагоны даўно знялі,
Мы цяпер афіцэры запаса,
Хоць свае шынялі
Апранаем на працу часам.
Хто хацеў
Пасля доўгіх дарог адпачыць,
Той даўно адпачыў.
Каму трэба было залячыць
Свае раны,—
                    даўно залячыў.
І расказана тысячу раз
За святочнаю чаркай гасцям,
Як праз дым
                    да рэйхстага нас
Вёў чырвоны гвардзейскі сцяг.
Падраслі нашы дочкі й сыны,
Што народжаны
                    ў часе вайны.
І сягоння
                    пра мужнасць бацькоў
Па складах чытаюць яны.
І у кожнага з нас па стале
Цэлы пачак лістоў ляжыць —
То былыя салдаты рады
Нам пра справы свае далажыць.
Не адступіць нідзе франтавік,
Нам пад сілу любая з работ.
Знаем мы,
                    што вядзе улік
Нашым подзвігам мірным народ:
Добры вырасціў ураджай —
Выйграў
                    новы суровы бой,
Вынаходствам парадаваў краі —
Чэсць і слава ізноў з табой.
А калі хто адстаў, ці заныў,
Ці у дробязных справах паграз,—
Не ўратуюць таго ардэны,

Спіша час
Сапраўды ў запас.
Толькі мы не такі народ,
Нам пад сілу любая з работ!
У абозе нас не шукай:
Не збіраемся мы ў запас.
Пасылай на пярэдні край,
Дарагая Радзіма, нас!

*1948*

* *

Палотны беляць на росах чыстых
І ясным сонцам абагравають,
Пад песні ціхія урачыста
Дзяўчаты шоўкам іх вышываюць.

Я знаю гэта майстэрства матак,
Заўжды дзівіўся з узораў дзіўных.
Па ручніку, што з роднаї хаты,
Мы пазнавалі сваю радзіму.

А сёння лёс куды б ні кінуў,—
Пазнаць усюды мне будзе міла
Аўтамашыны маёй краіны
З зубром жалезным, з зубрынай сілай.

А ля глыбокіх тугіх баразнаў,
Што недзе трактар адверне плугам,
Успомню гоман я мінскіх соснаў,
Пазнаю ўсюды майстэрства друга.

Пазнаю край свой па звонкіх песнях,
Якія склалі у нас паэты,
Па словах мужных, праўдзівых, чэсных
Паслоў народных на сходах свету.

Яшчэ пазнаю свой край па казках,
Якія людзі раскажуць дзецям,
Аб нашай славе партызанскай,
Што сёння ходзіць па ўсёй планеце.

*1948*

## КАМСАМОЛЬСКАЯ ВУЛІЦА

Мы помнім той час: кружылі
Драпежнікі ноччу і днём,
Жалезам цябе крышылі,
Палілі смяротным агнём.

Хацелі, каб мы твой выгляд
Забылі у пекле баёў;
Хацелі, каб мы адвыклі
Імя называць тваё.

Нам ліха хлябнуць давялося.
Ды вера жыла у людзей:
Усё, што імя гэта посіць,
Не згіне ніколі, нідзе.

Каціўся на папялішчах
Падпольных лістовак гром;
Лістовак, якіх не знішчыць
Ні полымем, ні штыком.

І кожны заклік аб помсце
Запамінаў кожны з нас,
Як вуліцы маладосці
Апазнавальны знак.

Мы назвы яе не забылі,
Мы шлях да яе знайшлі,
Драпежнікаў з неба збілі,
Дамоў з перамогай прыйшлі.

І зазвінелі рыдлёўкі
У маладых руках,
Каб адгукнуцца ў далёкіх
Гадах, а магчыма, вяках

Казкаю пра пачатак
Новага Мінска, калі
Нашы хлапцы і дзяўчаты
Вуліцу гэту ўзнялі

Такой шырыні і прасторы —
Радуга можа стаць;
Такой вышыні, што зоры
Можна рукой дастаць.

Самыя лепшыя фарбы
Найлепшыя маляры
Клалі, каб гэты бульвар быў
Святлей вясновай зары.

Найзелянейшыя дрэвы
Слалі гаі у дар,
Каб чыстым птушыным спевам
Звінеў Камсамольскі бульвар.

Тут хораша жыць будуць людзі:
І шчасце, і песня ў іх ёсць.
І вечна бульвар гэты будзе
Цвісці, як сама маладосць.

*1948*

## ЛАНЦУГІ ЗАЛАТЫЯ

Дождж прайшоў.
Я прыйшоў
Развітацца сюды.
Клён стаіць адзінокі, як я.
Папрашу: перад ёй будзь за сведку.
Калі ты малады
І цвітуць сады,
Дык і ты б, як і я, закахаўся ў суседку.
Колькі кніжак
За лета мы з ёй прачыталі,
Колькі сцежак
За лета мы з ёй пратапталі
Ў тыя слаўныя ночы,
Што вяртацца не хочуць.
На зары не сляды зіхацелі расой —
Ланцугі залатыя гарэлі красой.
А яна жартавала:
«Ты закуты цяпер!»
Кару гэткую век бы гатоў я цярпець.
І на сэрца — замкі,
І ў азёры — ключы,
Каб нікуды ад тых ланцугоў не ўцячы.
Помніш, клён, як стаялі мы з ёй пад дажджом?
«...Стань бліжэй да мяне... мусіць зараз прайсці...»
Я стараўся прыкрыць, каб не мокла, плашчом,
А яна у адказ: «Я хачу падрасці».
Падрасла...
Я кажу: «Ты даўно на прыкмеце,
Мая хата багата і маці прывеціць».
А яна ўсё смяецца, жартуе дзяўчына
І чамусьці глядзіць, як праходзяць машыны.
Я не ведаю, як і ў часіны якія
Зняла з сэрца яна ланцугі залатыя.
Хоць бы ты, клён, звінеў ва ўсё лісце трывогу,
Як выходзіла з клункам яна на дарогу.
Вунь і сонца з усмешкай
На мяне, дзівака, пазірае,
На каромысле радугі
Вёдры азёраў трымае.

Ці напіцца мне з іх?
Ці ўтапіцца мне ў іх?
Ці паехаць у Мінск
Па слядах тваіх?
Не паеду у Мінск,
Бо праслыць дзіваком не хачу я.
Хай далёка яна —
Пра мяне усё роўна пачуе.
А праз год фотаздымкі мае
У газетах убачыць,
Калі працу маю
Залатою зоркай адзначаць.
Гэта цвёрда. Зраблю.
Я, ты ж ведаеш, клён, не хвалюся.
Сум, у сэрца не стукай!
Не схілюся.
Свайго я даб'юся.
Рана, жоўтае лісце,
Са звонам журботным злятаеш,
Рана сцежкі мае —
Дарагія сляды — замятаеш!

*1948*

## ПАСЛЯ АПОШНЯЙ НАВАЛЬНІЦЫ

Прайшла апошняя, з апошнімі грымотамі,
На поўдзень па бярозавым шляху.
І стукаў дождж дажынкавы журботна
Апошні раз у кожную страху.

Прайшла прысадамі. Апошнімі маланкамі
Абпальвала кляновыя лісты...
Дзівіліся, асляпленыя, ранкам мы —
У золаце дарогі і масты.

А цішыня такая нечуваная
Апала на балоты і палі,
Што кракне качка у трысці туманным,—
За многа вёрст пачуе недзе ліст.

Такая цішыня... Здаецца, клёны слухаюць
І хочуць адгадаць, якой дарогай, дзе
З сівернымі вятрамі, з завірухамі
У ботах ледзяных зіма ідзе.

І раптам зноў грымоты пад нябёсамі.
Мо лета зноў вяртаецца да нас?
Не, то шаша грукоча пад калёсамі,
То хлеб вязе дзяржаве ў дар калгас.

*1948*

## НА ШАШЫ

Дзьмухне вецер — і лісце клёнаў
Далонямі цёмнымі стукне ў месяц,
І месяц звоніць празрыстым звонам,
Аж ходзіць рэха па цёмным лесе.

Па цёмным лесе, па ніве зжатай,
Там, дзе іржэўнік, як грэбень, чэша
Туман маўклівы, сівы, касматы,
Дзе ў росы ступіш — і апячэшся.

Пагразлі дрэвы ў малочнай багне,
Слупы зблудзілі на вёрстаў сорак.
І ўжо здаецца, што дрот нацягнут
Не між слупамі, а паміж зорак.

Шаша начная — у дзіўных фарбах,
То громам здзівіць, то ціхім звонам.
Нібы каметы, мільгаюць фары,
Змрок замятае сляды трохтонак.

І ў песню самі кладуцца словы
Пра нашу восень, пра нашы справы,
Што мы сягоння датэрмінова
Напоўнім хлебам засек дзяржавы.

Шафёры ціснуць на ўсе педалі.
І пасвятлела навокал раптам:
Напэўна, зоркі наш перадалі
Усім сузор'ям калгасны рапарт.

*1948*

## СЛОВА ДА ПАЭТАЎ

Лятуць рэпарцёры: падзея з падзей!
Сягоння вядомага судзяць паэта.
Прасторная зала паўнютка людзей,
Паэтам яшчэ не апетых.

Падсудны сядзіць за бар'ерам адзін,
Дзве музы варту нясуць.
Прабіла няўмольных дванаццаць гадзін.
І так, пачынаецца суд.

Сівы пракурор расчыняе дас'е.
Ў яго акуратна падшыты:
Вярба у слязе, зара у расе,
Пучок з васількамі жыта.

Сурова прамову пачаў пракурор.
Гартаў за падзеяй падзею
(Заезджаных вобразаў жаласны хор
Пачаў уздыхаць з падзеяй):

«Жылі жураўлі, плылі жураўлі
Пад сонцам ля воблачных вежаў,
А вы іх з нашага неба звялі —
Усіх запёрлі у вершы.

Ну раз, ну два, ну тры жураўлі,
А потым глядзі ды любуйся.
А з вашае ласкі: дрозд — інвалід
І рыфмамі спляжаны бусел.

Шмат скаргаў ад зор я маю такіх:
Вы гвалтам хапаць іх звыклі
І кідаць зусім недарэчы ў радкі,
Аж тыя страцілі выгляд.

Калі не па плану дабро раздасі,—
Артыкулы ёсць у законе.
А вы пакінеце хутка зусім
Без струн усе філармоніі:

Сасна — струна, яліна — струна,
Прамені — і тыя струны.
Вы іх нацягнулі без ліку — на нас,
На рэкі, на рэйкі, на труны.

За перамогу вялікай цаной
Плацілі найлепшыя сэрцы.
А баба Агапа у вас качаргой
Знішчыла роту немцаў.

У нашай краіне павага старым,
Няхай адпачнуць у хаце.
А вы з твора ў твор, ад зары да зары
Дзядоў без сумлення цягаеце.

У іх жа сыноў і ўнукаў — бор!
Праслаўце іх справы навекі.
А трапіць моладзь да вас у твор,—
Пачне рыдаць на жалейках.

Абознік жыцця! Ваш кожны радок
Напісан не кроўю, а плесняй.
А трэба, каб звала раней, чым гудок,
На працу, на подзвіг песня.

Мы знаем, як кветкі цвітуць за сялом
І шалясцяць трыснікі як.
Нам трэба, каб палкае слова вяло
Наперад думы людскія.

Таму патрабую, шаноўны суд,
Прыняць маё заключэнне,
Каб вызначыць кару...»
Чытач, я тут
Павінен прасіць прабачэння.

Паэтаў не судзяць у нас,
Такіх
Не мае артыкулаў кодэкс.
Я гэта пішу для вас, мастакі,
Што дрэмлюць на ціхіх водах;

Для тых, хто паэмы свае апрануў
У зношанае адзенне,

Для тых, хто ўсёй велічы не адчуў
Нашага наступлення.

Даволі дробных пачуццяў і дзей!
Даволі кніжнага браку!
Давайце песняй весці людзей
За камунізм у атаку.

*1948*

## МІНСК НАВАГОДНІ

Як цвіцеш ты сягоння, сталіца мая!
Гмахі цесна пасталі у шэрагах стройных,
Быццам месца загінуўшых у баях
Занялі маладыя адважныя воіны.

Сёння ўсюды, як сонца, зіхцяць ліхтары
І ліхтарыкаў пацеркі.
Ёлкі — у спектрах
Навагодніх агнёў,
Незгасальнай зары
Тых сцягоў, што гараць над святочным праспектам.

Віншаванняў маланкі,
Вітанняў лісты
Лістаносцы разнеслі ўсім адрасатам.
І пасталі марозы-дзяды на пасты
Каля ёлак сваіх, сустракаючы свята.

І дванаццаць прабіла...
Пад зоры ўзнялі
Мы высокія думы і светлыя вершы
За народ гераічны савецкай зямлі,
За любімай рэспублікі год трыццаць першы!

*1948*

# АБАРОНЦЫ МІРУ

Палова дваццатага веку.
Вясна
Навокал раскідала сонцаў мільёны.
Клякочуць буслы над сасной.
Сасна
Ярчэй запалала агнём зялёным.

І вярба маладая пад кожным акном
Распускае на сонцы пушыстыя коцікі.
Першы гром веснавы —
Мірны трактарны гром
Па палях і нябёсах, не моўкнучы, коціцца.

Мы ніколі не бачылі гэткай вясны.
Нам яна абяцае сягоння напэўна
Здзейсніць нашыя мары, надзеі і сны,
Вось і праца таму гарачэй закіпела.

Кожны з нас
Працы час
Да секунд разлічыў,
Толькі б болей зрабіць для любімай Радзімы!
Песня звонка гучыць,
І гурчаць цягачы,
Мы у поле ўсе выйшлі сям'ёю адзінай.

Так, я ведаю:
Зоркам герояў — гарэць
І звінець словам рапартаў
На высокіх падвоблачных струнах!
Сіл хапае стварыць,
Сіл хапае сустрэць
Дзень чаканай Камуны.

Нам бы ў добрых усмешках за працай яснець.
Але сёння сурова мы бровы нахмурым:
З-за сівых акіянаў
Пагражае вясне
і Радзіме
Амерыка вогненнай бурай.

*

Яшчэ не паспелі мёдам вятроў
Дасыта напіцца мы,
Яшчэ на вуліцах гарадоў
Не выраўняліся дамы.

Яшчэ іржавеюць у кожным бары
Танкі на выгарах чорных,
І п'ём мы з тых кубкаў, з якіх сябры,
Што сёння ў магілах, пілі учора.

І нашы дзеці як след падрасці
Яшчэ не паспелі за гэтыя леты...
Банкіры збіраюцца зноў трасці,
Жалезам крэмзаць планету.

Атлантыка б'е у глухія званы,
Спякае кроў у Эгейскае з Пінда,
І цень навісае новай вайны
Ад Грэнландыі
І да Індыі.

І бамбавозы з сакрэтных баз
Прагнуць закрыць наша сонца ў небе...
Мы ведаем вас,
Мы выкрыем вас,
Майстры правакацый і змоў ганебных!

*

Амерыка...
Свіной тушонкі рай.
Жанчына з факелам.
Дык гэта ж балаганства!
На ўсе мацерыкі лёг з краю ў край
Твой чорны цень, заакіянскі гангстэр!

Ты за вайну глынуў зашмат дабра,
І гніллю тхне з тваіх разбухлых складаў.
Ты не гарэблівы.
Ты нават падабраў
Аб'едкі Гітлера —
Майстроў пятлі і здрады.

Ты свет гатоў хлуснёю затапіць.
Агідны плашч сарваць з цябе пара нам!

...Я бачу іх, адкормленых тупіц,
На вуліцах гарачых Тэгерана.
Вунь п'яны капітан на ішаку вярхом
Імчыцць у вока фотаапарата...
Вунь рэстаран.
        Выццё аркестра.
                Гром
                        разбітых пляшак.
Дзікі пір піратаў.
Салдаты з рогатам ірвуць з кабет чадру.
(Аллах? Пляваць!
    Сумленне? К чорту чэснасць!)
Такім (аголеным!)
    не скажам слова «друг».
Сябры часоў вайны
    Спяць у магілах цесных.
А гэтыя...
Мы білі ўжо такіх,
І гора тым, хто наш урок забудзе.
А гэтыя...
Як вылушчылі з іх
Датла усё, чым ганарацца людзі.
З іх высцебалі думкі, нібы пыл
З палавікоў,
                бічом бандыцкіх фільмаў.
І вось гатоў
                слухмяны і тупы
Наёмнік уол-стрыцкіх чорных фірмаў.
Ён абнаглеў.
В'етнам ці Люксембург —
На стол з нагамі.
    Гумаваю жвачкай —
Народу ў твар.
    Ён едзе на гарбу
Еўропы —
                адурманенай жабрачкі.
Ён цешыцца!
Кладзе свой брудны след
На той зямлі, дзе не пасохла кроў шчэ,
І дзікуну далонямі газет
За акіянам плешча дрэсіроўшчык.

Фантазія крэтынаў!
Воўчы смех
Чуцён ля Сіракуз, і ў Рыме, і на Рэйне,
І прагне ўжо крывавых ён уцех —
Сусветны спекулянт —
на ўсёй зямной арэне.
Вось ён
Падсоўвае разбэшчаным рукам
Гармату, нож і перуновы атам,
Каб забурліла зноў крыві рака,
Каб свет падплыў слязьмі дзяцей і матак.
За гэтае шаленства, тлум і муць,
За душ людскіх рабунак і калецтва
Падпальшчыкаў народы праклянуць
Страшэннейшым праклёнам чалавецтва!
І выракуцца мацеры сыноў,
Амерыкі сваёй пачнуць стыдацца,
Убачыўшы з-за акіяна кроў
Сясцёр далёкіх на руках салдацкіх.
Яшчэ не позна!
Гнеў, грымі!
Пакуль
Вайна зямлю не закруціла вірам,
Ад бочкі з порахам крывавую руку!
За вамі слова, абаронцы міру!

*

Абаронцы міру!
Ваша слова
Ў сотні раз грazней сакрэтных баз.
Прыгавар бязлітасна суровы
Прагне ўся зямля пачуць ад вас.

Прыгавар — забойцам камуністаў,
Катам Барселоны і Афін;
Прыгавар, як гнеў людзей, агністы
Ад імя усіх зямных краін

Тым, хто сее здраду і паклёпы,
Тым, хто стаўку ставіць на уран,
Тым, хто зрабаваную Еўропу
Хоча бачыць мёртваю ад ран.

Вар'яцеюць гады не ад сілы,
Спапяляюць мудрасць на кастрах.
Дзьме смяротнай вільгаццю з магілы,
Твары крывіць ім жывёльны страх!

Ён капае, капітал сусветны,
Кіпцюрамі ў скарб упіўся свой.
Гэта гной вякоў, апошні сметнік
Подласці і лютасці людской.

Называйце гадаў паімённа,
Што ў дзяцей гарматы навялі.
Абаронцы міру!
Нас мільёны
На усёй разгневанай зямлі.

*1949*

## УРАДЖАЙ

Няма мілей мне гэтае пары.
Настала ў нас цяпер пара такая,
Што ў полі ад зары і да зары
Камбайнаў гул і песні не змаўкаюць.
Калгасніцам няма калі пад'есці:
— Ну, колькі ў нас? Сто восемдзесят? Дзвесце?

І толькі яшчэ першыя снапы
Пачнуць раўняць шарэнгу залатую,
А ўжо гудуць у сто басоў слупы
Усхвалёванае слова: «Рапартуем...»
Як кулямётчык, наш рахункавод
Зашчоўкаў у праўленні. Хлебны год!

Вядзе пілот над намі самалёт
І радуецца працы нашай шчыра.
І дні, і нават ночы напралёт
Машыны значаць вогненным пункцірам
Дарогі ўсе. І ясна бачыць ён,
Які ў перадавых цяпер раён.

Няма мілей пары. Я бачыць рад,
Што пачала ад коп зямля ўгінацца.
І ручаіны цёплыя зярнят
Ліюцца з ціхім шэлестам праз пальцы.
Наш фронт гарачы і з Масквы відзён.
Мы — воіны. У бой за хлеб ідзём.

І старшыня, як камандзір палка,
Калгас наш — полк, брыгада — гэта рота.
Камбайн, нібы гармата РГК,
Падтрымлівае ў наступе пяхоту.
Вайна навучыла дысцыпліне нас,
Дух наступлення ў сэрцах не пагас.

О, як бы нам хацелася забыць
І войны ўсе, і стогны, і руіны!
О, як бы нам хацелася здабыць
Навекі мір для роднае краіны!

Ды зноўку грозяць нашы нівы змяць.
Над Рурам чорным каміны дымяць.

Мы будавалі. Гангстэры граблі.
Нам пра ўраджаі, а ім пра войны сніцца.
Плывуць на акіяне караблі,
Ў пякельных топках пражыцца пшаніца.
Галодная Еўропа, не чакай:
Не прыплыве заморскі каравай!

Ды босаў пачынае хваляваць
Няўдзячнасць абрабаванай Еўропы:
Як будуць зброю іхнюю трымаць
Французскія ткачы і вуглякопы?
Куды страляць пачнуць, у бок які
З пізінаў італьянскіх батракі?

Б'е босаў ліхаманка. І гармат
Пустыя вочы за Еўропай сочаць.
Залазяць на біблейскі Арарат
Разведчыкі. Ці сапраўды мо хочуць
Яны, што трызняць новаю вайной,
Там вывучыць, як ратаваўся Ной.

Не ўратавацца ім! Патопу быць! —
Патопу гневу, ярасці працоўных...
А мы — ў палі. А нам сваё рабіць,
Каб кожны элеватар быў напоўнен,
Каб свежым хлебам пахлі скрозь вятры,
Каб дыхала багаццем ад вітрын.

Як кулі, зерні важкія у нас.
Не баімося атлантычных хмар мы!
Не страшны ні пагрозы, ні вайна
Для нашых ніў, для нашых мірных армій.
І голас твой магутны, ураджай,
Данасіцца з палёў: не пагражай!

*1949*

4 Зак. 840

## СЦЯГІ ПЕРАМОГІ

І пяты раз, і шосты, і сто пяты
Мы будзем славіць майскі дзень, калі,
Апавясціўшы свет увесь пра свята,
Па-пад Берлінам нашыя гарматы
Апошнім залпам грозна прагулі.

Свет не забудзе сцяга над рэйхстагам:
Нялёгка нам узняць было яго!
Нібы з іскры гарачай, з таго сцяга —
Прабітага — па ўсіх зямных абсягах
Забушавала полымя сцягоў.

І чым далей той момант векапомны,
Калі мы выйшлі з танкаў і траншэй,—
Той дзень, дзень Перамогі, сонцам поўны,
Узносіцца ўсё велічней, цудоўней,
Ён сэрцу ўсё бліжэй і даражэй.

Бясконца перамогі нашай слава,
Бо кожны дзень наш — пераможны дзень!
На помнікі, на залатыя лаўры
Наш кожны год свае жывыя справы,
Як цытадэлі ўзятыя, кладзе.

*1949*

## НЕЗГАСАЛЬНАЯ ВЕРА

Я слухаў не раз, як над Бугам
Калгасныя нівы шумяць,
Я бачыў не раз, як над Нёманам
Высокія трубы дымяць.
Ідзе па краіне з Гродна
Рэкордная слава ткачых,
Заворваюць кобрынцы межы,
Пружанцы карчуюць карчы.

І нават не хочацца верыць,
Што тут, на зямлі дарагой,
І братнюю працу і песню
Таптаў пан вяльможнай нагой.
Ды нельга забыць гэта...
Слова,
Схіні на хвіліну гады!

Тады тут яны царавалі.
Але і тады, і тады
Баяліся нашае песні,
Ад песні баяліся рэха.
І цені дратоў пагранічных,
Як краты, ляжалі на рэках.
Хацелася ім перасекчы
І зоры, і рэкі надвое,
З усходу ідучае сонца
Суправаджаць пад канвоем.
Ды рэкі драты прагрызалі,
А рэха пачуўшы ад песень
Азёры кіпелі у штормах,
І буры займаліся ў лесе.
Калі ж па-над Нёмнам і Бугам
Сцягоў заалела зара,
Партрэты выносілі людзі
Любімага правадыра.
Аб тым, дзе партрэты хавалі,
Не стаў у братоў я пытаць.
Я ведаў — глыбока у сэрцах,
Каб вораг не здолеў дастаць.

Навекі запала у памяць,
Як людзі казалі тады:
«Мы знаем — Расія к нам прыйдзе
І нас уратуе з бяды!»

Успомніўшы тыя сустрэчы
Сярод ваўкавыскіх бароў,
Балюча мне слухаць, што дзесьці
Катуюць ізноў змагароў.
І горка чытаць мне, што піша
З Афінаў чыясьці сястра...
У катаў падобныя рылы,
І прагнасць, і подласць, і страх.
Ім страшна, як калісь магнатам,
І нашае сонца, і спеў,
Які вызначае дарогі,
Фарбуе у полымя гнеў.

*1949*

## НА РЫНКУ

Горка плачуць дробныя гандляркі,
Валіцца гародніна з рукі:
Выраслі на рынку ў фарбах яркіх
Новыя калгасныя ларкі.

Можа, тыя цёткі і не плачуць,
Толькі ўся сталіца — бачу сам,
Хай не Мінск, паў-Мінска — сам жа бачу,
Не дае спакою прадаўцам.

Агуркі ляжаць, як дырыжаблі,
Як аэрастаты — качаны.
Высяцца Эльбрусы спелых яблык,
Бачны за кварталаў пяць яны.

Памідор — на цэлую талерку,
Ну, не памідор — планета Марс.
Бульбу вам адважаць шчодрай меркай,
З каптуром. Нясмачнае няма.

Зазірні цяпер да нарачанцаў.
Раз вугра іх тлустага з'ясі,
Пра цану не станеш больш спрачацца,
Сам рублёўку лішнюю дасі.

Ну, а масла? Што пра масла скажаш?
І не трэба, а не абмінеш.
Калі гэткім маслам рыфмы змажаш,
Нават верш няўдалы праглынеш.

І калгасаў лепшыя імёны
Помняць густы строгія кабет.
Калі ўсё закуплена ў «Будзёным»,
Значыць, будзе маршальскі абед.

*1949*

## НАВЕКІ СЛАВА

Навекі слава доблесным салдатам,
Што пераможна йшлі за свой народ
Ад легендарных камняў Сталінграда
Да Брандэнбургскіх выклятых варот!

Навекі слава нашым генералам
І пяцікутнай зорцы агнявой,
І зброі, што Радзіма гартавала,
І непарушнай дружбе франтавой!

Мы з пачуццём адным ішлі змагацца
І праслаўлялі родныя палкі —
Уральцы, масквічы і ленінградцы,
Мінчане і латышскія стралкі.

Яшчэ й па сёння ходзіць рэха ў Альпах,
Яшчэ й па сёння водбліск не пагас
Ад нашых грозных пераможных залпаў
І ад сцягоў, што ў бой вадзілі нас.

Навекі слава тым, што ў полі ратным
Загінулі за родныя палі,
За наш народ, за лёс народаў братніх,
За дзень наступны усяе зямлі.

Няпраўда, што засыпалі іх жвірам,—
Ім у стагоддзях вечна жыць і жыць.
Стаяць яны, як абаронцы міру,
На самым на пярэднім рубяжы.

Стаяць на плошчах Прагі і Варшавы,
І воблік іх відзён здалёку нам,
Стаяць на варце нашай працы, славы,
На страх заакіянскім груганам.

Бяссмертныя іх помнікі крані ты —
І цеплыню адчуеш пад рукой:
Іх высеклі не з камняў, не з граніту,—
З людской любві, з удзячнасці людской.

*1949*

## ЗАЛАТЫ РУБЕЛЬ

Было калісьці так: англійскі фунт
На біржах свету уздымаў тайфун.
Нахабны долар і вяртлявы франк
Напосілі рублю нямала ран.
Яго глынуць хацела, як гіена,
Драпежніца — японская іена.
І нават зубы скаліла ў газетах
Замызганая нейкая пезета.

Але мінулі дні навалы чорнай,
Мы распалілі пяцігодак горны.
Мы на Урале свой рубель кавалі,
У водах Днепрабуда гартавалі.
Ён акрыяў, стаў значнае вагі,
І мы яго назвалі: «Дарагі!»
Паноў браў жах: «Чаму расце Расія?
Адкуль узяў рубель такую сілу?»
А мы сакрэт той ведалі: з чырвонцаў
На свет глядзеў наш Ленін, нібы сонца.

Вайна прыйшла з заходніх к нам дарог.
Рубель нам весці бітву дапамог.
Радзіме беражэнні аддалі —
Рублі у танкі мы пералілі.
Калі гармата па Берліну біла,
Савецкага рубля гула ў ёй сіла.
І пала перад ім ад той прыпаркі
Фашысцкая разбэшчаная марка.
Вайну прайшоў рубель і падужэў,
Ссох фунт і франк, а наш — падаражэў.

Няма на ім крыві і брудных плям —
З сумленнем чыстым за яго купляем.
Дарэмна спадзяваўся тлусты долар
Нам даць маршалізаваную долю.
На бок! На бок! Хоць лопні ты ад злосці,
Мы не запросім да сябе у госці!
Не толькі не запросім — не дапусцім!
Тваё ліхвярства не ў савецкім гусце.

Свае мы раны самі залячылі,
Бо беражліва ўсе рублі лічылі.
Мы працавалі горача, каб ты
Стаў сапраўды, рубель наш, залатым!
Зароблены сумленна, ты у хаты
Нясеш усё, чым наш Саюз багаты.
Віно мы залатое п'ём за тое,
Каб і жыццё было век залатое.

*1950*

## МАЯКОЎСКАМУ

1

Здалёку сёння подзвіг ваш відаць!
І не таму, што патрабуе дата,
Так сэрца патрабуе — чэсць аддаць
Найлепшаму паэзіі салдату.

Дарогу расчышчалі вы для нас
Ад ворагаў і паэтычных трутняў,
Грамілі вы бязлітасна пралаз,
Глушылі гнеўна голас іх атрутны.

Вы ведалі: дзе друг і вораг дзе.
За вамі ўслед наш крок накіраваны.
Так ледакол у Арктыцы вядзе,
Лёд крышачы, наперад караваны.

Так, нам лягчэй, таму што вы жылі...
Хоць нашы словы не гулі, як вашы,
Мы песняю і куляй бой вялі,
Сябе лічылі вашым экіпажам.

Калі народ наш выйшаў бараніць
Радзіму, чуўся голас ваш арліны.
І надпіс «Маякоўскі» на бране
Чыталі ля рэйхстага мы ў Берліне.

І на будоўлях з намі вы, жывы,
Такі ж імклівы, смелы, грозны, бурны.
І мне здаецца, гэта першы вы
Нам абвясцілі пра Шанхай з трыбуны...

Як і пры вас, паны вяроўкі ўюць
Для шыбеніц, ад ярасці шалеюць.
І вашы вершы зноў дакладна б'юць
Па мордах розных чэрчыляў і клеяў.

Зноў мір яны імкнуцца падарваць,
Зямлю зрабіць крывавую арэнай...
Я ні сабе, ні другу даруваць
Больш не магу страфы ніводнай дрэннай.

Народ чакае палкіх слоў ад нас,
Каб здзейсніць найхутчэй свой план
вялізны.
— Раўняйцеся,— загадвае нам час,—
На першага паэта камунізма!

2

Калі я заходжу ў метро
на станцыю вашага імені,
Здаецца, нібы уваходжу
у самы найлепшы ваш верш.

Тут кожная арка высокая —
як слова у радасным гімне,
Як самая звонкая песня
аб нашай любімай Маскве.

Натоўпы людзей шматгалосыя
радамі ўліваюцца шчыльнымі,
Пабачыш усе тут прафесіі,
сыноў розных нацый і рас.

Вось гэтак і вашае сэрца
для ўсіх нас шырока расчынена,
Вось так і радкі вашы ярка
святлом азараюць наш час.

Калоны ўздымаюцца крута
са сталі неіржавеючай,
Вылётваюць з жэрлаў тунеляў
і далей ляцяць цягнікі.

І вашыя вершы такія ж
па стройнасці, сіле і велічы,
Па рэйках радкоў вашы думы
у заўтра ляцяць, у вякі.

*1950*

## ГЭТАК БУДЗЕ

Мы з народы мужнай, працавітай,
Гартавалі нас цяжкія бітвы.
І прырода наша разам з намі
Грознымі адзначана баямі.

З нас ніхто нахлебнікам прыроды
Не жадае быць.
Мы кажам так:
— Харашэй, прырода, год ад году
Пасля нашых на цябе атак!

Спапяляць даволі сухавеям
Золата жывое каласоў!
Заўтра ў стэпах скрозь зазелянеюць
Паясы зялёныя лясоў.

Мы павернем воды Енісея
З поўначы ў спякотны край пустынь.
На пясках былых мы рыс пасеем,
Выгадуем чайныя кусты.

І туды, дзе дыхаць нават нельга,
Дзе ўжо ясна полюс нам відзён,—
Сілу ўсіх расшчэпленых энергій
Мы па вечны холад павядзём.

На Чукотцы, дзе цяпер ярангі
Засыпае снегам, праз гадоў
Гэтак трыццаць — сорак добрым ранкам
Зацвіце ўся тундра ад садоў.

А ў Палессе заляцеў калі б ты
Ў гэты час, убачыць быў бы рад:
Між былых багнішчаў эўкаліпты
Узнімаюць к сонцу буслянят.

*1950*

## ПРА НАЗВЫ

Бабруйск не бабрамі і Тураў не турамі
Сягоння вядомы. Славуты яны
Героямі працы, савецкай культураю,
Адважным змаганнем у часе вайны.

Пра гэтыя назвы спрачацца не прыйдзецца,
Іх нават у вершы бяруць мастакі.
А ёсць і такія, што можна пакрыўдзіцца,
Аж сорам бывае ад назваў такіх.

Даўно пра княгіню забыла Княгініна,
Халопенічы — пра халопаў даўно.
Калгас «Княгінінскім» звацца павінен?
Прабачце, а сэнсу тут не відно.

Чаму ў нас завуць Балацянкамі, Глушамі?
Хто вета на назвы наклаў: «Не параш!»
Даўно ў Балацянцы балоты асушаны.
А Глуша? Скажыце, якая там глуш?

Не толькі што дзеці, бацькі ўжо не ведаюць
Пра страшны — з кары і імху — горкі хлеб.
Чаму ж і цяпер іх завуць Махаедамі?
«Шчаслівая доля» — для прыкладу — лепш!

Чаму гэта вёска завецца Загробняю?
Хай ворагі гробяцца, мы — будзем жыць!
Нам кожнаю назвай (вялікай і дробнаю)
Патрэбна, як імем сваім, даражыць.

Ну, можа, што-кольвек для жарту тут сказана.
І ўсё ж нашым дзецям павінны мы ўсе
Пакінуць паселішчы з добрымі назвамі,
З багаццем і шчасцем, у славе й красе.

*1950*

# ШЧАСЛІВЫ ВЕРАСЕНЬ

1

Не люблю я змрочных фарбаў,
Не люблю я шэрых тонаў.
Біце ў ноч глухую, фары
Працавітых пяцітонак!

Ноч, гары заўжды над намі
Усялякаю парою
Самалётнымі агнямі,
Электрычнаю зарою!

Дзень, праменні сей навокал,
Зіхаці ў рыбачай сетцы,
На машынах і на вокнах,
На медалях і на сэрцах!

Сёння з песняй абыду я
Уваскрослую з руінаў,
Залатую, маладую,
Нашу родную краіну.

На світанні паблукаю
Па гаях, барах сасновых,
Новых сябраў напаткаю
На раллі калгасаў новых.

Пагляджу, як па-над Нёмнам
Славу ткуць сваю ткачыхі,
Як мой даўнішні знаёмы.
Сумны некалі і ціхі —

Пінск — майструе, і рыбачыць,
І нястомна баржы грузіць.
Лепшых кветак не пабачыць,
Як на Піншчыне у лузе!

Быццам ты ідзеш не лугам,
А разлівам радуг росных...
Праплыву я сінім Бугам
Каля явараў і соснаў.

Пакланюся бастыёнам
Брэсцкай крэпасці суровай,
Гераічныя імёны
Ўспомню светлым, шчырым словам.

Раніцой прайду барамі,
Гул пачую акіянскі
Тых бароў, дзе пад зубрамі
Угінаюцца палянкі;

Там, дзе дзік ламачча трушчыць,
Дзе меладый — незлічона.
У славутай нашай пушчы —
Рай для птушак і вучоных.

Песень скрозь у нас багата,
Звон цымбал на ўсё Палессе:
У Баранавічах свята,
Трэ пабыць на свяце песні.

Ну, і так — ў дарогу час нам!
Дзень на славу — цёплы, звонкі,
Хоць бяры такі вось ясны,
Пасылай на нейкі конкурс.

Вёрсты... Вёрсты... З-за ракітаў
Па-святочнаму страчае
Нарач, поўная блакіту,
Ветразяў і белых чаек.

І гайдаецца, не тоне
Сонца ў хвалях — ціш ці бура —
Тое сонца, што і ў Доне,
Што і ў Волзе, і ў Амуры.

Срэбнай рыбы поўны лодкі.
Запяваюць песню недзе.
Вечарэе... Зор наводка...
Колер золата і медзі.

2

Запомнім усё мы: асаднікаў кніны,
І панскія здзекі, і краты Лукішак,
І сумныя песні пад ціхаю Пінай...
Пра гэта, напэўна, шчэ кнігі напішуць.

Пра годы разлукі,
Пра тое, як гойсаў
Пагромшчык і кат ад Ла-Манша да Віслы.
Еўропа часіны не ведала горшай —
Над Нёмнам і Шчарай пагроза навісла.

Загад атрымалі мы: вызваліць брата,
Што ў горы марнеў на зямлі Белавежы!
Пайшлі мы на Захад — і выйшлі з-за кратаў
І Нёман, і Буг, і падпольшчыкаў вершы.

Мы верасень гэты назвалі шчаслівым:
Вы выйшлі, браты, з-пад запораў іржавых
На нівы, з пары той — на вашыя нівы,
Пад сонца вялікай Савецкай дзяржавы.
З падвойнай адданасцю, з сілай падвойнай
За працу ўзяліся, за плуг шматлямешны...
Праклён вам навекі, драпежныя войны!
Праклён вам, падпальшчыкі войнаў драпежных!

Праклён вам за тое, што гаснулі зоры,
Што енчылі дзеці ў агні Асвянціма,
Што кожная сцежка крывавай разорай
Прайшла па зямлі здратаванай радзімы!

І можа б не здолець таго перанесці,
Каб моцна не верылі Слонім і Гродна,
Што дзесьці трывожацца, ведаюць дзесьці
Пра нас, зрабаваных ушчэнт і галодных.

Як рады народ быў наш кожнай лістоўцы
З Расіі! Як сэрцы мужнелі у пекле!
Як танкі фашыстаў палалі ля Стоўбцаў!
Як гнеўна захопнікаў кулямі секлі!

Навекі адданыя нашыя сэрцы,
Удзячнасці поўныя нашыя вочы
Братам, што народ наш ад верпае смерці
Не раз ратавалі, а двойчы і тройчы!

3

Край наднёманскіх заранак,
Край шумлівай Белавежы!
Ўжо кругом пазааралы
На тваіх палетках межы.

Аганьком самотным хутар
Рэдка дзе мільгае ўночы.
Змрок уласнасці ахутаў
Некаторым моцна вочы.

Ёсць яшчэ сляды тут папы!
Біты козыр акупантаў —
Езуітаў чорных лапы,
Засутаненыя банды!

Да чаго ж я ненавіджу
Пахавальны гул арганаў,
Служак боскіх погляд хіжы,
Шапаточак іх паганы!

Ад сухіх і чэрствых вуснаў
Так і вее боскай карай.
Уначы святоша тлусты
Сніць заморскія далары

Ды падвучвае, што Езус
Супраць кожнага калгаса,
Завугольны стрэл абрэза
Блаславуляе час ад часу...

Так і ў нас было усюды:
Трэск абрэзаў і падпалы,
Шэпат гадаў, подкуп юдаў.
Не здаліся! Не прапалі!

Ад бароў Наддзвіння звонкіх
Да палескіх ніў і пожняў
Сёння ты, мая старонка,
Як наглядны дапаможнік —

З гулам велічных камбайнаў,
І жняярак, і касілак,

З моцнай дружбай, працай дбайнай,
З залатой калгаснай сілай.

І браты з былой Заходняй
Прысягаюць: «Лёс адзіны,
Шлях адзіны ў нас сягоння,
Той, якім ідзе Радзіма.

Што было-гняло калісьці,
Не сагне ніколі болей:
Бурай змеценае лісце
Не вяртаецца на голле».

І адной сагрэты песняй,
І адною мэтай добрай
Аб'яднаны сёння Несвіж
І Капыль, Бабруйск і Кобрын.

Па размаху пазнаём мы
Вас, браты! Змятай старое!
Загараюцца над Нёманам
Зоркі першыя герояў.

4

Калісьці любілі пра нас гаварыць
Адны спачувальна, другія з насмешкай:
— Ды што там у вас! У бары камары,
Балота, ды бульба, ды вербы на сцежках.

Такіх выслаўленняў цяпер не чуваць.
Свет помніць імёны і Мінска, і Брэста.
Убачылі — ўмее народ ваяваць,
Убачылі — ўмее народ будаваць,
Адданы чырвонаму сцягу да рэшты.

І раптам... Мо з год ці то меней назад
Галёкаць пачаў дэлегат з Сальвадора.
Не знаю, які ён і чый дэлегат,
А тое, што гад ён,— я ведаю добра.

На Сесіі Нацый, глытаючы злосць,
Ён пырскаў слюной: у Еўропе ці Азіі
Мая Беларусь! І наогул ці ёсць?
Ці гэта адна камуністаў фантазія?

Я ведаю мала пра край Сальвадор,
Народ без падстаў абражаць не жадаю.
А толькі не чуў я, каб той Сальвадор,
Як мы, вынішчаў фашыстоўскую зграю.

Масква дарагая, наш брат Ленінград
Сказалі пра нас незабыўныя словы.
І побач пахаваных рускіх салдат —
Магілы Даватара і Смалячкова.

«Мы знаем адважных і верных братоў,
Мы знаем і любім такую краіну!» —
Сказалі байцы беларускіх франтоў,
Па нашых шляхах што ішлі да Берліна.

«Я знаю! — гаворыць магутны Данбас.—
У штольнях маіх — беларускія сосны».
«Мы знаем!» — гавораць, і нафту да нас
Рупліва Баку пасылае і Грозны.

Нам дорага гэта.
Мы любім сваю
Зямлю палачанскую, зоры Палесся.
Звіняць на увесь наш Савецкі Саюз
І нашы варштаты, і нашыя песні.

Мы верныя людзі савецкай зямлі,
Авеяны сцяг наш вялікаю славай,
Ідзём к камунізму ў адзінай сям'і,
Ў адзінай сваёй Беларускай дзяржаве.

*1950*

## ПЕСНЯ

Ці працавалі,
Ці піравалі,—
Пра Волгу песні
Заўжды спявалі.
І як раздольна
Звінелі песні!
А сёння Волзе
І ў песнях цесна.
Мы новыя песні
Пра Волгу створым,
Пра самыя юныя
Ў свеце моры,
Пра самыя яркія
Зоры ў свеце,
Якія будучыню
Асвецяць.
Асвеціць Волга
Яснай зарою
Бяссмерце мужных,
Горад герояў.
Паволжа стане
Садам вялізным,
Цвісці якому
Пры камунізме.

*1950*

## ТВОЙ ВОБЛІК, ІРАН

Была вайна, і лёс мяне закінуў
З прыільменскіх балот туды, дзе ўсё цвіце,
У тую падтрапічную краіну,
Дзе на пяску згарае нават цень.

На фронце мы ў гнілых акопах мерзлі,
А там на схілах — пурпуровы мак,
А там лімонаў і гранатаў безліч —
Ну проста рай паўднёвы...
Не, не так!

Я ўсё жыццё гатоў хадзіць з вінтоўкай
Па багнішчах усіх зямных балот,
Каб знішчыць рабаўласнікаў, каб толькі
Нідзе такога раю не было.

Там родную зямлю не хоча роднай
Назваць народ.
Іран, вось воблік твой:
Прыгнечаны, прыдушаны, галодны,
Ашуканы алахам і мулой.

Там сёння на таўрызскіх шэрых плошчах
На шыбеніцах — трупы змагароў.
А ў горах гулка аддаецца пошчак
Ад выстралаў і ад рыдання ўдоў.

Рай, дзе народ ад галадухі пухне
Зімой і ўвосень, летам і вясной,
Дзе янкі ў захапленні шахскай кухняй
І шахскаю лакейскаю спіной;

Дзе плачуць згвалтаваныя іранкі,
Кроў іх братоў — узор на дыванах;
Дзе паміж гор нахрапістыя янкі
Спяшаюцца вайне пракласці шлях.

Палі габлююць пад аэрадромы,
Каб сонечны Каўказ скапаў ад ран,

Каб знік Баку ад атамнага грому...
Іран, Іран, прададзены Іран,

Прададзены і шахам і панамі.
Ды твой народ пазбавіцца турмы.
Я знаю, ён за мір, за дружбу з намі!
Ён хоча жыць, ён будзе жыць, як мы!

Мы там былі...
Па сёння ходзяць казкі
У горах ля каспійскіх берагоў
Пра нашу сілу і пра нашу ласку,
Пра чырвань нашых зорак і сцягоў.

Наш голас чуюць на усёй планеце,
К іранскаму ляціць ён рыбаку.
І бачыць Тэгеран, як мірна свецяць
Агні камуністычнага Баку.

*1950*

## АСТАРА[1]

Не раз, не два я сустракаў
Дарожную зару
Вось тут, дзе напалам рака
Рассекла Астару.

Калі на поўдзень ехаў я,
Казаў: «Бывай пакуль,
Радзіма светлая мая,
Бывай, мой брат Баку!»

Заўсёды цяжка пакідаць
Той бераг, на якім
Агнём нягаснучым гарадь
На ўзмор'і маякі.

Азербайджанцы там і тут,
І мора тут і там;
Але такіх, як там, пакут
Не знаць ніколі нам.

Там не разгледзіш твар кабет
Праз чорную чадру.
Там чалавек сказаць табе
Баіцца слова «друг».

І толькі часам убаку
Шапне: «Ну, як у вас?»
Ім казкаю гучыць «Баку»,
Надзеяю — «Масква».

Калі ж вяртаўся ў Астару
Савецкую,— пытаў
Стары калгаснік, мо сястру
Яго я папаткаў.

І, пэўна, па маіх вачах
Здагадваўся стары

---

[1] Астара — гарадок на савецка-іранскай граніцы.

Пра турмы, пра галодны жах,
Пра горкі лёс сястры...

Азербайджанец, брат і друг,
Не гні у смутку плеч:
Шчэ многа будзе завірух
І радасных сустрэч.

Вось так і Беларусь была
Рассечана мяжой,
Але гісторыя змяла
Калючы дрот з іржой.

Рака клякоча і гудзе...
Чакай, чакай, стары,—
Настане свята, будзе дзень
З'яднанай Астары.

*1950*

## ЛІСТ ГОРАДУ ГАРГАН

Дзень добры, Гарган!
Як жывеш ты,
Лімонны горад Гарган?
Калісьці цябе да рэшты
Падземны растрос ураган.

Ад землетрасення рэха
Запомнілі добра мы:
Трэскаліся, як арэхі,
Слабыя твае дамы.

Руіны курыліся пылам...
І тут прыляцелі яны —
Тупыя, тлустыя рылы,
Кароценькія штаны.

Убачыўшы іх, галасіста
Завыў сукін сын мула:
«За тое, што тут камуністы,
Нас пакараў алах!»

А чым жа цябе усцешылі
Містэры Браўн і Марч?
Здымалі яны з усмешкаю
Гора тваё, твой плач.

А нам зразумелым і блізкім
Гора тваё было.
Ці чуў ты, Гарган, як над Мінскам
Сто самалётаў раўло?

За выбухам выбух шалёны...
Агонь, жалеза і кроў...
...Мы выйшлі усім батальёнам
На голас тваіх жыхароў.

Пыл горкі нам рэзаў вочы...
Ты помніш савецкіх байцоў,
Што скарб ратавалі рабочых,
Рамеснікаў і купцоў?

Мы сёння за мірнай працай —
Сціраем вайны сляды.
На мінскіх руінах — палацы,
На мінскіх руінах — сады.

А ты — я чытаў — запусцелы,
Зусім занядбаны цяпер.
Чатыры гады праляцела,
А мы не забылі цябе.

І веру хаваем у сэрцах:
Ты ўстанеш з руінаў, Гарган,
Калі над табой пранясецца
Іншы зусім ураган.

*1950*

## З НОВЫМ ГОДАМ, РАСІЯ!

Звон курантаў разносіцца
у далечы сіняй
Нам на радасць, а злыдням на страх.
З Новым годам і шчасцем, Расія,
Найслаўнейшая наша сястра!

Ад Смаленска да гораў Кітая
Дораг нам твой магутны прастор.
Беларусь цябе шчыра вітае,
Найраднейшая з родных сясцёр.

Нас фашыстаў арда не зламала,
Не спаліў нас пякельны касцёр —
Ты краіну маю ўратавала,
Найвярнейшая з верных сясцёр.

Горка бачыць было нам руіны —
Шмат захопнік з зямлі нашай сцёр.
Ты дала нам і сталь, і машыны,
Найшчадрэйшая з шчодрых сясцёр.

Сёння мы у натхнёнай працы.
Чорным сілам наперакор
Будзем разам за мір змагацца,
Наймагутнейшая з сясцёр!

*1951*

## ВЕСНАВОЕ

Гарачае сонца прымае парад:
Вясну пачынаць пара.
Прывінчаны ледзяныя штыхі
Да кожнай высокай страхі.

Іх сцюжай зіма да таго давяла:
Чакаюць умоўнага знаку,—
І рынуцца рыжыя стрэхі сяла
У штыхавую атаку.

Абрушыла сонца за дзесяць хвілін
Мільярды праменняў на снег.
І першы узвод агнявых ручаін
У наступ імкліва пабег.

Вясна пачала пераможны паход.
І толькі ля плота у садзе
Вялізны сумёт, як няскрышаны дот,
Яшчэ прытаіўся ў засадзе...

Мажліва, хто зморшчыцца: гэтакі час!
Такое харошае ранне!
А ён ізноўку частуе нас
Ваеннымі параўнаннямі.

Я сіняе неба магу параўнаць
З вачмі самай лепшай дзяўчыны,
Але я чую: гудзе вайна
Так, як гула і над нашай краінай.

Каб нам пра гэта зусім забыць
І цешыцца ручаямі,
Над ўсёю планетай павінна быць
Неба такое, як і над намі.

*1951*

## САБЕ І ДРУГІМ

Гляджу на бярозу я кожнае рапне —
А мо прыляцелі шпакі?
А недзе далёка у цёплым тумане
Зазыўна гудуць цягнікі.

Запахлі прасторы няяснай трывогай,
І зоры так дзіўна гараць.
І стукае сэрца: ў дарогу, ў дарогу —
Па лепшую песню пара!

Паходны мяшок, як на фронце, на плечы,
Дачку пацалуй — і гайда!
Ад нудных размоў, ад пракураных спрэчак
У неабдымную даль.

Хай бледны ад крыўды лірычны пакутнік
Вядзе яшчэ з крытыкам бой,
А ты не ў купэ, а пяшком, на папутных
З вясёлай дарожнай братвой.

Дарогі, дарогі — адна другой лепей!
Радзімы цудоўны прастор!
Вось тут пачынаецца песня аб хлебе,
А там вунь — паэма пра торф.

З плытамі на Прыпяці ці з эшалонам
Адборнага лесу туды —
Да стэпаў каспійскіх, да хваляў салёных,
Да волжскай шырокай вады.

Дзе хочаш пачуй — у палатцы ці ў хаце,
Над ціхім ці бурным руччом.
Дзе трэба, радком дапаможаш брыгадзе,
Дзе трэба, падставіш плячо...

Вясна камунізма ужо недалёка,
Адчуй і праслаў гэты час!
Ты ж — воін, ты знаеш, як гэта нялёгка,
Адстаўшы, дагнаць сваю часць.

*1951*

## СКАРГА ПАЛЯРНАЙ ВУЛІЦЫ

Хочаш жыць у дружбе, а пасварышся
З вамі, паважаны гарсавет!

Я не знаю прозвішча таварыша,
Ні яго узросту, ні прыкмет,

Ці ён змёрз, ці то настрой меў хмарны ён,
Ці зусім знядужаўся ад спраў...
Вуліцу, дзе мы жывём, Палярнаю
Нехта з вас, таварышы, назваў.

Скажам так: запросіш госця з Грузіі,—
Ён выццё уявіць завірух,
Нібы мы ў сумётах тут пагрузлі.
Не зважай па назву, дальні друг!

Ні мядзведзяў тут і ні таросаў,
І пурга ніколі не гудзе.
Чуем мы па радыё прагнозы
Самыя найлепшыя штодзень.

Маеце і вы таксама рацыю,
Што палярны слаўны край расце.
Толькі там духмяная акацыя,
Як у нас, пакуль што не цвіце.

Нашыя двары усе прыбраныя
Ў бэз, а з некаторае пары
Часта, як сцвярджаюць закаханыя,
Салаўі спяваюць па зары.

Тут дамы ад цеснаты не туляцца,
Кожны ў дрэвах — век не памірай!
Сонца зойдзе, а па нашай вуліцы
Хоць чытай, хоць голкі сабірай.

Перайду да доваду апошняга,
Каб далі вы назву пацяплей,—

Тут гуляе каля дома кожнага
Шмат маленькіх радасных дзяцей.

На святло, на сонца мы багатыя,
Можам і другім падараваць.
Просім, дарагія дэпутаты,
Сонечную вуліцу назваць!

*1951*

## НА БУДОЎЛІ

Толькі выклалі аснову,
Катлаван глыбокі знік,
Брыгадзір прыйшоў к нам новы —
Знатны мінскі скараснік.

Я увагі не звярнула
На яго агністы чуб
І на ордэн не зірнула...
Хлопец рыжы мне не люб.

Ну й далі нам брыгадзіра!
Гэткіх зроду не люблю.
Выхваляецца, прыдзіра:
Так рабіць, як я раблю.

І калі затрымка з кладкай,
Не чакай тады дабра,
Скажа строга: «Што ж ты, братка!»
Гэта я ўжо, значыць, брат.

Эх, хлапчына ты, хлапчына,
Дзе і хто цябе наймаў?
Для цябе, апроч рашчыны,
Больш нікога тут няма.

Працу скончым, скажа: «Хопіць!»
Усміхнецца: дом падрос.
І злятае ў змрок наш хлопец
З-пад азораных нябёс.

Пачалі мы класці трэці,
Глянуў ён тады на нас,
Нібы толькі-толькі стрэціў,
Нібы ўбачыў першы раз.

На чацвёртым запытаў ён,
Крыху гледзячы убок,
Як жыву я, што чытаю,
Скуль я — зблізку ці здалёк.

А на шостым... Ці здалося
Пад вясновым ветрам мне,—
Прашаптаў ён ціха: «Зося»,
А магчыма, што і не.

А аднойчы, пад нядзелю,
Ён сказаў, што ёсць білет
І што мае ён надзею...
Не пайшла я на балет.

Працаваў штодня ўсё злітней
Наш высотны экіпаж.
Ды на восьмым раптам з рытму
Стаў збівацца хлопец наш.

Пазавеш, а ён не чуе.
Песню нейкую завёў
Пра чыюсьці незямную
Старажытную любоў.

Ўсё вышэй, вышэй брыгада,
Кожны робіць з нас за двух.
А навокал — далягляды,
Аж захоплівае дух!

Стаў для нас усіх, паверце,
Гэты дом, як родны дом...
На дванаццатым паверсе
Мы сустрэлі першы гром.

Брыгадзір тады прызнаўся,
А у чым — не помню я.
Звонка ў сэрцы гром аддаўся
І не ціхне аніяк.

Мой ты слаўны, што ты тужыш?
Кожны дзень ты мне радней.
Пачакай да даху, дружа:
З вышыні яно відней.

Неяк страшна і трывожна,
Сэрца б'е: павер, павер...
Што нясеш ты мне, апошні
Чатырнаццаты паверх?

*1951*

## ПАШТАЛЬЁН

Закончыў хлопец інстытут,
У Мінск прыехаў наш.
Ідзе па адрасу. Вось тут
Павінна жыць яна.

Усё на месцы: клён, ліхтар...
А дзе ж падзеўся дом?
Тут экскаватар — гаспадар,
Узняў і пыл, і гром.

І так насмешліва гурчыць —
Знаць, ведае аб ёй.
Гурчыць, а пра яе маўчыць,
Набіўшы рот зямлёй.

Ідзе старэнькі паштальён.
Сустрэчы хлопец рад.
«А дзе,— пытае скромна ён,—
І дом і адрасат?»

Стары нязлосна пыл кляне,
Ідзе пад клён у цень.
«Дык гэта вы нагрузку мне
Давалі кожны дзень?»

«Напэўна, я... Яна мне, дзед...»—
«Ну што ж, дай бог, дай бог!
Будоўля гэткая ідзе —
Зусім я збіўся з ног.

Былі ў мяне свае шляхі
У кожны дом і двор,
Я і ў разводдзе быў сухім...
А тут з нядаўніх пор

Прыйшоў і ў мой участак план.
Гарачыя часы!
Палова добрая мінчан
Мяняе адрасы.

Турботы шмат. А знойдзеш іх,
Ды павіншуеш іх,
Ды як паўшклянкі праглынеш
За наваселле іх,—
Зноў пошту з радасцю нясеш,
Хоць сам не з маладых.

Ды вось вам новы адрасок,
Кватэра нумар пяць.
Вось дом дык дом — прыгож, высок,
Магу павіншаваць!

Ды толькі я не буду вам
Насіць лісты туды,
А віншавальных тэлеграм
З вяселлем — хоць пуды!»

*1951*

## КНІГА СЛАВЫ

Гляджу і гляджу
На сталіцу сваю дарагую,
Пазнаць родны горад
Пад сонцам вясны не магу я.

Прасторны і светлы,
Спавіты такой прыгажосцю,
Нібыта сабраўся
Да шчасця самога у госці.

У мудрых машынах,
Залітыя сонечным ззяннем,
Высока сядзяць машыністы,
Нібы марсіяне.

Ды што марсіяне! —
Фантазія змрочных паэтаў.
Тут кожнае сэрца
Вялікаю працай сагрэта.

І будзе напісана
Кніга падзякі і славы,
Якая імёны
Герояў будоўлі уславіць,

Майстроў моцнай кладкі
І добрыя тыя машыны,
Што звонкую цэглу
Ўздымаюць да зорных вышыняў;

Вясёлых тынкоўшчыц,
Пракладчыкаў водаправода,
І розум народа,
І подзвіг працоўны народа;

І грузчыкаў тых,
Што вагоны для Мінска грузілі,

І ўсе паравозы,
Што грузы цяжкія вазілі.

Мы ў кнігу запішам
Рабочых Масквы і Урала,
Усіх, чыя праца
Пад сонцам наш Мінск уздымала.

*1951*

## ВЯРБОЎШЧЫК

Нехта слова сказаў,
А па вуліцах пошчак,
Што прыехаў у вёску
Таварыш вярбоўшчык.

А таварыш вярбоўшчык
Звычайны хлапчына,
Невысокага росту,
Невялікага чыну.

Велізарны партфель
З парыжэлай цыраты,—
Там не бланкаў канторскіх,
А цудаў багата.

Там і спёка пустыні,
І гоман таежны,
І прасторы прыволжскія
Стэпаў бязмежных.

А пачаў выступаць
На калгасным ён сходзе,
Многа хлопцаў падумала:
«Ехаць я згодзен...»

У зялёнай тайзе
Ракаталі маторы,
Загараліся ў тундры
Электрычныя зоры.

І магутная Волга
Круціла турбіны,
І ў садах з краю ў край
Расцвітала краіна.

Пасінела ад дыму
Прасторная хата.
І зайздросцілі хлопцы
Яму і дзяўчаты:

Малады, а глядзі
Колькі знае, няйначай,
Ён Радзіму аб'ездзіў,
Цэлы свет ён пабачыў.

А таму крыху сорамна
Перад народам:
У вандроўках не быў
Далей мінскіх шыротаў.

Слава слову такому,
Што людзей узрушае!
«На будоўлі — найлепшых!» —
Праўленне рашае.

Слава планам вялікім,
Справам велічным слава,
Па якіх людзі мераць
Уласныя справы!

І вярбоўшчык рашыў:
«Збоку быць не магу я,
Вось прыеду дамоў —
Сам сябе завярбую».

*1951*

## ЖАЛУДЫ

Дубнякі зарэчныя, дубочкі,
Мы да вас у госці.
Добры дзень!
Жалуды — як залатыя бочачкі,
Стукні ў донца — кожны загудзе.
Што, дуброва, рана так пажоўкла?
Што раптоўна песня птушак змоўкла?
Запявай, спявай на ўсе лады:
Мы збіраем сёння жалуды!
«Для чаго?» —
Пытае дуб-асілак.
«Для пасылак».—
«А куды
Паедуць жалуды?» —
«Да сталінградцаў».—
«Ну, тады патрэбна пастарацца!»
Весела!
Лісцё шуршыць і звоніць.
Хмарка сонца аніяк не згоніць
З дуба.
І здаецца:
Дзеці воддаль
Не збіраюць — водзяць карагоды.
Што за крык?
Адзін хлапчук знайшоў —
Во шчаслівец! —
Пару спарышоў.
Кажа:
«Сярод тысяч іх пазнаю.
Будзь шчаслівай, паласа лясная!»
«Што, дубы, і вы, старыя, рады,—
Нечы голас весела звініць: —
Вашыя сыны пад Сталінградам
Луг і поле будуць бараніць».

*1951*

ШЭФЫ

«Абсадзіць усе дарогі ў полі
І усе пад'езды да сяла,
Каб ля кожнай маладой таполі
Яблыня ці вішня расцвіла.

З песняю жанкі у поле рушаць,
Сонцам заіграе небакрай.
Белым, белым косы зацярушыць
Ім зялёны май.

Стомлены вяртацца будзеш летам
Па дарозе той,—
Асвяжыш душу сваю ранетам,
Бэрай залатой.

Будуць ехаць хлопцы к вам на свята
Каля вішань у расе.
«Тут, відаць,— падумаюць,— дзяўчаты,
Нібы вішні ўсе».

З гэткай паэтычнаю прамовай
Выступіў на сходзе аграном.
«Згода! — ўсе гукнулі.— Пастанову!
Ды і працу хутка распачнём».

Раптам дзед Анісім:
«Не, не згода!
Я на гэта згоды не даю.
Важна насцярожанаму сходу
Выклаў прапазіцыю сваю: —

Абсадзіць патрэбна толькі дубам
Ці бярозай...—
Хвіля цішыні.—
Белыя прысады чым не люба?
Яблынямі, вішнямі — ні, ні!

Дзеці ўсё абломяць, завязь знішчаць,
Не адгоніш іх і пугавішчам,

З гэтаю сваволяю — бяда!
Працы шкода, грошаї мне шкада!»

Ад такой пякучае абразы
Спахмурнелі ўсе хлапцы адразу.
Самы смелы да стала ідзе:
«Калі ласка, адкажы нам, дзед,
Перад сходам, дзед, нам адкажы:
Хто пры камунізме будзе жыць —
Ты ці мы?
Няўжо ж свае ігрушы,
Яблыні і вішні мы парушым?»

Разгубіўся дзед.
Узняўся рогат.
Потым пальцам пагразіў ён строга:
«Ты, малы, спачатку пакланіся
За усё, што дзед зрабіў Анісім.
Рана у труну мяне лажыць,
Сам пры камунізме буду жыць!»

А малы ад імя піянераў
(Воплескі бацькоў. Ласкавы гром):
«Будуць цэлы яблыні і бэры.
Шэфства над прысадамі бяром!»

І рашылі: ўсе дарогі ў полі
І усе пад'езды да сяла
Абсадзіць, каб кожную таполю
Яблыня ці вішня абняла.

*1951*

## НАША КРАІНА

Калі адступалі палкі на усход
І лез на Маскву бранірованы зброд,—
Краіна мая,
Ты фашыстаў сустрэла
Агнём і сякерай,
Гранатай і стрэлам,
Калола іх хвояй,
Глытала дрыгвою,
На кожнай дарозе
Ўставала сцяною,
Чужынцаў нямала загнала ў магілу,
А нашых салдат мужным сэрцам прыкрыла.

Калі наступалі палкі па Берлін,
Усюды — між пушчаў, узгоркаў, нізін —
Жывыя дарогі,
Як гнеўныя рэкі,
Бурлілі, каб знесці
Няволю навекі.
І ты, Беларусь, улілася магутнай
Ракою —
Адпомсціць за кроў і пакуты.

Хто прагне сягоння крыві і руінаў,
Хай помніць пра мужнасць
І нашай краіны.
Яна аніякіх пагроз не баіцца,
Вартуе дарогу да светлай сталіцы.

*1951*

## НІЯГАРА

1

Ты жыла ў дзіцячых марах
Многа год таму назад,
Ніягара, Ніягара,
Ніягарскі вадаспад!

Велічны і прамяністы,
Пена ў іскрах, гром і звон...
Можа хрукне нейкі містэр:
«Што за права мае ён?»

Маю права, джэнтльмены:
Я начэй недасыпаў —
З Джэкам Лонданам і Твэнам
Па Амерыцы блукаў.

Я кажу аб гэтым смела:
З даўніх дзён, з дзіцячых год
Маю права на Лангфела,
На паэзію яго.

А яшчэ: нямала ў трумах
Землякоў плыло маіх.
Дзе яны? Мо сёння Трумэн
Пахаваў у турмах іх?

Можа стрэльбы даў ім Гары,
Каб страляў у брата брат?
Ніягара, Ніягара,
Ніягарскі вадаспад.

2

Ты, Амерыка, пра вольнасць
Век раўла. Цяпер скажы,
Чым ты стала? Кузняй войнаў,
Рабаўніцай хат чужых.

Ты ўскінула пад сонца
Небаскробы вышай гор,

А ў адной малой старонцы
Пала ўсіх ніжэй і горш.

Спадцішка, як звер, напала.
Хто аддаў табе загад
Ніштчыць д'ябальскім напалмам
У калысках дзіцянят?

Уяўляць інакш і нельга
Тых, хто кроўю правадоў
Маладым бязвінным неграм
Супыняе ў жылах кроў.

Не зайздрошчу страшнай долі
Тых людзей, краіны той,
На каго крывавы долар
Лёг магільнаю плітой.

Не схавацца ім ад кары:
Гнеў ёсць гнеў, а кат ёсць кат.
Ніягара, Ніягара,
Ніягарскі вадаспад.

3

Дзе ён, чэсны мужны воін:
Куля ў кулю,
Штык у штык?
Ды няўжо з чыкагскіх боень
Пазбіралі іх усіх?

Гэта ты чужыя скарбы
Спапяліць заўсёды рад!
Гэта ты здзіраеш скальпы,
Бледнатвары подлы брат!

Дзе, ў якой ты вырас хаце,
Гвалтаўнік і людаед?
І няўжо ты маеш маці?
Хто настаўнікі твае?

Найагіднейшай пачварай
Ты народжаны, салдат.
І ніякай Ніягарай
Кроў дзяцей не змыеш, кат!

Мы запоўнім спіс злачынцаў
Да канца — ад А да Я.
Уцячы не дасць злаўчыцца
Песня гнеўная мая!

Дзьме з Карэі чорнай гар'ю
І у твой далёкі штат...
Што ж маўчыш ты, Ніягара,
Ніягарскі вадаспад!

4

Мой высокі дзень сагрэты
Не брадвэеўскім агнём,
Не духмянай сігарэтай,
Не заморскім тытунём.

На усіх у нас дарогах
Будаўнічы чуцен гром.
Нас усіх вядзе эпоха
Ў камунізма светлы дом.

Наш народ сваім паглядам
Бачыць шчасце праз гады.
Робіць ён пустыню садам,
Вы ж — пустыняю сады.

Баіцёся вы, банкіры,
Што з народамі дружыць
Хочам мы, каб голуб міру
Над усёй зямлёй кружыў.

Мы за мір!
А цэліць бомбай
Не дазволім мы ў наш дом,
Не дазволім, зноў каб гром быў,
Страшны гром, смяротны гром.

Не дадзім шугаць пажару!
А парушаць цішыню —
Пагльне іх Ніягара
З гневу, сталі і агню.

*1951*

# НАД КАРТАЙ СВЕТУ

Люблю над картай пасядзець, люблю
Чытаць геаграфічныя запіскі.
І кожнаму зайздрошчу караблю
І палубам, прасоленым і хісткім.

Пазнаў я шмат краін за час вайны,
Далёкія пабачыў берагі я,
Па подзвігах людзей пазнаў адны,
Па подласці правіцеляў — другія.

Радкі набраклых гневам тэлеграм
Сягоння папаўняюць нашы веды.
Ізноў вайною пагражаюць нам,
Зямля мая, трывожная планета!

Гляджу на Грэцыю. Пакутная сястра!
Тут нашчадкаў Гамера і Сафокла
Душылі і палілі на кастрах.
Гісторыя вякоў крывёй намокла.

Нарвегія. Высокіх гораў сінь
І ветразі рыбацкія ў фіёрдах...
А мне баліць, што нейкі сукін сын
За долары прадаў народ твой горды.

Карэя... Перадранішні спакой,
Краіна ранняй свежасці і песень.
О, не, цябе я знаю не такой —
Барвовы дым твой мужны твар завесіў.

Зямля мая! Не трэба мне, павер,
Ні пальмаў Індыі, ні золата Сайгона,
Ні нафты Сірыі, ні скарбаў Кардыльер.
Нам трэба мір — табе і мне сягоння.

Прывет вам, Гімалаі! Вам прывет,
Сівыя Альпы, сонечныя Анды!
Якім бы светлым быў шырокі свет,
Каб на ланцуг прыкуць забойцаў банды!

Мы утаймуем ворагаў зямлі,
Мы здолеем у пыл іх планы сцерці!
Хто на далонях носіць мазалі,
Хто не жадае дзецям лютай смерці,

Хто страціў гэтак многа у баях,
Што трэслі ўчора ўсю планету нашу,
Хай на Маскву глядзяць, як на маяк,—
На барацьбу за мір ідзе бясстрашна!

*1951*

# КРЫХУ ПРА ШВЕЙЦАРЫЮ

Што й казаць, выдатнейшы закутак!
Сотні гор, ды гор яшчэ якіх!
Вось адно шкада: зусім захутаў
Аж да пят туман заморскі іх.

Свінабой тупы з-за акіяна
Лётае у Цюрых віскі піць
І мяркуе гордыя Манбланы
Танна для рэкламы адкупіць.

Набіваюць готэльшчыкі цэны
На прыгожы выгляд вод і гор,
З возера Жэнеўскага, з Люцэрна
Барышы здымаюць з даўніх пор.

Не было б, уласна, мне і справы,
Вытрымаў бы я нейтралітэт,
Ды плануе новыя расправы
Не адзін там чорны прайдзісвет.

Там прытулак каралёў бяздомных,
Шпікаў і забойцаў. Там яны
Каля светлых вод свой бізнес цёмны
Робяць, злосна прагнучы вайны.

Крыўдна, што балюе беглы карнік
Каля успамінаў дарагіх —
Герцэн... Эміграцыя... Друкарні...
Песні волі... Песні і сцягі.

Мне той горны край на сёння дораг
Не з-за прыгажосці, а таму,
Што Ільіч калісьці ў гэтых горах
Вызначыў народу шлях майму.

Не, мяне цікавяць не гатэлі...
Ды крыху турбуюся я, каб
Не забылі там Вільгельма Тэля —
Вольнага альпійскага стралка.

*1951*

## НЕКАТОРЫЯ ПАДЛІКІ

Колькі за вайну зглумілі сталі!
Ты прыкінь, таварыш, як і я:
Тысячу мастоў пабудавалі б
Праз любы вялікі акіян.

Колькі ў топках спапялілі хлеба!
Не спыніў у час ніхто звяруг.
І ўздымае Індыя да неба
Мільёны згаладалых рук.

Каб паток хлуслівых кніг не ліўся
І у новым свеце і ў старым,
Людзі непісьменныя зямлі ўсёй
Мець маглі даўно ўжо буквары.

Будавалі і будуюць каты
Не дамы, а турмы. Многа іх.
Тысячная частка казематаў
Іх, падлюг, магла б змясціць усіх.

Каб адным дыханнем людзі працы
«Не!» вайне сказалі на зямлі,
Мёртвыя, што спяць ў магілах брацкіх,—
Мёртвымі б ніколі не былі.

І калі яшчэ не пакаралі —
Пакараем тоїі крывавы зброд,
Тых, што чалавецтва абакралі
На мільёны год.

*1951*

## ВЕРШЫ ПРА КАРЭЮ

1

На попел перамолатыя вёскі,
У полымі крывавым гарады,
Ад выбухаў глухія адгалоскі
І стогны прадсмяротныя: «вады»;

Усеяныя трупамі дарогі,
Замучаны, распяты камуніст;
Рабаўнікоў пахабных п'яны рогат
І партызанскай кулі гнеўны свіст.

Лятуць саставы з падарваных рэек...
Народная, свяшчэнная вайна.
Сястра мая далёкая, Карэя,
Да болю ўсё знаёма гэта нам.

І мы спазналі гэткую навалу,
Твой боль — наш боль,
Твой гнеў святы — наш гнеў.
Ды недарма сыноў ты ўзгадавала,
Якіх ніхто на свеце не сагне;

Якіх ніхто не змусіць пакарыцца,
Бо ведае, Карэя, твой народ
Наш шлях ад Брэста да застаў сталіцы
І ад Масквы да Эльбы наш паход.

2

Над забітымі дзецьмі галосяць маткі,
Дым, і пыл,
І патокі бясконцых абозаў...
Сядзьце за лічыльнікі,
Вашынгтонскія матэматыкі,
Зрабіце падлікі,
Але не для босаў.
Не для тых,

Хто ўвесь свет пакарыць жадае,
Не для тых,
Хто здымае з крыві барышы,
А для тых,
Хто працуе, недаядае,
Для братоў тых салдат,
Над якімі сягоння крыжы.
Вы паклалі разлікі ўсе
Перад магнатамі:
Колькі яраснай сілы
Ў расшчэпленым атаме,
Колькі змецена будзе
Паселішчаў катамі,
Колькі знішчана будзе
Дзяцей звышгарматамі,—
А вось гэткіх падлікаў,
Відаць, не вялі —
Колькі лютай нянавісці
Сэрца да́ ворага мае,
Тое сэрца, якім
Танк варожы баец падрывае?
І ці лёгка ісці вам
Па той нешырокай зямлі,
Дзе вы сто гарадоў
Перунамі дашчэнту змялі?
А далей вы прыкіньце
На ўсю тэрыторыю,
Пакарыць
Вашы босы
Жадаюць каторую.
Ну, лічы, матэматык,
Душой не крыві!
Сталі вашай не хопіць,
Нафты вашай не хопіць,
І не хопіць
Разбойніцкай вашай крыві.
Мы не хочам вайны,
Прагнуць міру трывалага сэрцы.
...У Карэю ізноў
Выпраўляюць ліпкоры ў Амерыцы.
Мяне мала турбуюць
Па гангстарах слёзы,
Хай жалобныя маршы
Вызваньвае медзь.

Але ўспомні, Амерыка,
Покуль не позна,
Што ў свабодных народаў
Ёсць страшны і грозны,
Нібы клятва святая,
Няпавісці лозунг:
Кроў за кроў!
Смерць за смерць!

*1951*

## ПРА АГІТАЦЫЮ

Абвінавачваюць розныя гады,
Што ў Афрыцы мы павялі прапаганду
І каля Ніла на душных плантацыях
Займаемся агітацыяй.
Але скажыце:
Чые гэта кінці
Ўпіліся ў горла Ніла?
Чыя
Узбярэжжа марское ў Егіпце
Сіла запаланіла?
Хто кідае цень на канал Суэцкі —
Брытанскі флот ці савецкі?
Пытаюць адзін аднаго егіпцяне:
«Паслухай, з якой гэта ласкі
Наша багацце брытанец цягне?
Што за арабскія казкі!»
Не!
Гэта не арабскія казкі,
Гэта бялеюць захопнікаў каскі,
І сфінксы ў суровым глядзяць задуменні
На кроў, што дыміцца на жорсткім камені.
Каірскіх рабочых, што плечы век гнулі,
Загітавалі брытанскія кулі...
Захоплены гулам маланкавых дзён,
Я ў справы чужыя не лезу,
Але пасылаю гнеўны праклён,
Праклён агню і жалезу.
Агню, спапяліўшаму светлы Пхеньян,
Жалезу, што плавіцца ў Руры,
Дрэдноутам, што пеняць сівы акіян,
Каб справацыраваць буру.
Рыкаюць злосныя лорды ў Таўэры,
Ў паходныя б'юць літаўры.
А тым часам да Ніла крадзецца цішком
Вашынгтонскі гангстар з мяшком.
Ён пасткі расставіў там з даўніх гадоў,
Заве егіпцян братамі.
Ён вызваліць нават Егіпет гатоў
З ільвіных абдымкаў Брытаніі.

Пра мір крывадушна ў эфіры хрыпіць
І хваліць даларавы статут,
А сам так і прагне Егіпет схапіць
І прыкаваць да Штатаў.
Апосталы гвалту, захопу, вайны,
З Гудзона яны ці з Цемзы,
Па лютасці чорнай падобны яны,
Адной ненажэрнай сістэмы.
Далёкі таварыш, егіпецкі друг,
Ты стаў мне сягоння бліжай.
І я, як і ты, гэтых тлустых падлюг
Ад сэрца ўсяго ненавіджу.
Зямной прыгажосці з іх кожны нясе
Пагібель.
Пляваць ім па сфінксаў!
Яны б праглынулі абшары усе —
Ад аўстралійскіх да фінскіх.
Ім сніцца бляск акупанцкіх касак
На гордых горах Каўказа.
Яны ўжо дзеляць — у марах, вядома,—
Шчодрыя стэпы Дона.
Дарэмна плятуць яны змовы свае!
Глядзі — ад Янцзы да Ніла
На іхнім разбойным шляху устае
Вялікая мірная сіла.
І простыя людзі, што мірна жывуць
Ля Альпаў, Урала і Татраў,
Сягоння мой верш на змаганне завуць,
Завуць быць за мір агітатарам.
І я агітую, каб слова МІР
З'яднала Нью-Йорк і Каір
І каб не кіпелі ад атамнай буры
Ні Нёман, ні Ніл, ні Місуры.
Далёкі мой друг,
Каб Егіпта палі
Не вынішчыў атамны злыдзень,
Ты слова свяшчэннае МІР запалі
На самай крутой пірамідзе!

*1951*

## НА ВОЛГУ!

Нарэшце пуцёўка чаканая ёсць!
Дакладна усё ў ёй і строга.
І ўжо не жыхар я у Мінску, а госць,
На золаку — у дарогу.

Глыбокая ноч, а заснуць не магу,
Ужо я увесь на Волзе,
І волжскія хвалі да сэрца бягуць,
І сэрца у нейкай трывозе.

Калі пачынаюць над Волгай грымець
Машыны і выбухі грукаць,—
Гарачыя сэрцы павінны мы мець
І дужыя шчырыя рукі.

Я сэрца сваё неспакойным збярог,
Каб часу хоць крыху быць вартым,
Для дальніх паходаў, для новых дарог,
Для працы, цяжкой і упартай.

Сплывае па Свіслачы ноч пакрысе,
Пара у дарозе і мне быць...
Мы крочым па полі, па дымнай расе
Да птушкі, што просіцца ў неба.

Зямля шуганула уніз з-пад крыла,
Вясёлкамі затрапятала.
І вось паплыла, паплыла, паплыла
Каменная сетка кварталаў.

Гляджу я на ўскраіны. Ў зелені хвой —
Суровыя дымныя фарбы.
Сталіца абвіта жалезнай сцяной
Магутных заводаў і фабрык.

На варце — каб Мінск харашэў наш і рос —
Ахова надзейная гэта.

Куды я ні еду — спакойны за лёс
Дзяцей, і палацаў, і кветак.

Я хутка на Волзе сустрэну сяброў,
Прывет перадаць буду рады
Ад нашых рабочых, ад нашых майстроў
Славутым майстрам Сталінграда.

*1951*

## У КАМСАМОЛЬСКУ-НА-ВОЛЗЕ

Яшчэ цеплаход не паспеў наш прычаліць,
А ўжо мы пачулі: між сосен густых
Скуголілі пілы ў вясёлым адчаі,
Нібы не яны пілавалі, а іх.

Насустрач паціху падплыў дэбаркадэр,
І, ледзь-ледзь крануліся борта масткі,—
Як хлыне лавіна! Суцэльныя кадры:
Шафёры, манцёры, краўцы мастакі.

Вясёлай сям'ёй з чамаданамі крочым
Праз горад на голас прарэзлівы піл.
Вось толькі пылюга есць поедам вочы,
На беразе Волгі — і гэтакі пыл!

А хтось суцяшае: «Тут будзе ў нас мора,
А гэтыя хаткі — на злом!»—
«А людзей?» —
«Вышэй перасялім, пад самыя зоры,
Вы чуеце: гэта ж будоўля гудзе».

Ітак, я на дне (хай пакуль што умоўным),
Умоўны, іду, так сказаць, вадалаз
Між хат спарахнелых па бруку няроўным:
Відаць, будавалі у разінскі час.

А ў новым пасёлку нам дыхаць так лёгка,
Нібыта ўжо хвалі сюды прыплылі.
За пылам, за Волгай, далёка-далёка
У нафтавых вышках стаяць Жыгулі.

Прымай, Камсамольск, калектыў
камсамольскі!
А заўтра за працу на многія дні,
Пакуль не пачуем марскія усплёскі,
Пакуль не убачым над Волгай агні —

Агні камунізма, для ўсіх дарагія!
А потым, наш горад, зноў выправіш ты
Найлепшых сваіх жыхароў на другія
Будоўлі — на Лену, на Об, на Іртыш.

*1951*

## БУДАЎНІКІ

Не залаты пясок, не россып дыяментаў,
Не рамантычны сверб, не прага да прыгод —
Вялікая і радасная мэта
Іх прывяла да гэтых сініх вод;

Да гэтых гор, зялёных і гарачых,
Да гэтых скал, што за метал цвярдзей.
Я ў новай тытанічнай бітве бачу
Савецкіх загартаваных людзей.

Сюды найлепшых Волга пазбірала
З усіх мясцін, з усіх шырокіх рэк.
Вось мінскі самазвал вядзе уралец,
Сядзіць на экскаватары узбек.

Тут поплеч — кіяўляне, ленінградцы,
Працуе з беларусамі грузін.
Хвала і чэсць свабоднай дружнай працы
Братоў, якіх з'яднаў парыў адзін!

«Здароў, зямляк! Як поспехі? — пытаю.—
Нялёгка, мабыць, пасля слуцкіх ніў
Вам тут, дзе сонца травы спапяляе
І дрэвы сохнуць ад гарачыні?»—

«Так, цяжка працаваць, калі жалеза
Рукою не крапеш, бо апячэ,
І едкі белы пыл у вочы лезе,
І ручаямі горкі пот цячэ;

Калі рака падкідвае жарты
І інжынеры зноў вядуць разлік.
Ды партыя сказала: «Будзь упартым.
Перамагай раку. Ты — будаўнік!»

Не!
Лёгка працаваць, калі з любоўю шчырай

Данамагае кожны нам завод,
Калі так шчодра на будоўлі міра
Усё, што можа даць, дае народ;

Калі наш лёс, наш быт усіх турбуе,—
Што можа быць за гэта даражэй?
Давай, прараб, задачу нам любую!
Давай, прараб, заданне пацяжэй!»

*1951*

## СЛОВА СТАЛІНГРАДЦА

Вецер з лютасцю дзьмуў, і рака бушавала...
Грымнуць хвалі ў барты —цеплаход аж гудзе.
«Ну, дык як? — нас пытае валжанін бывалы.—
Дзе такую другую вы бачылі? Дзе?»

І ён так пераможна на нас пазірае,
Нібы сам гэту волжскую веліч стварыў,
Гэты дзіўны прастор без канца і без краю,
Дзе клякочуць і пеняцца сёння віры.

І здалося, вада тут такая цяжкая:
Ад напорыстых хваль угінаецца дно
І дрыжаць берагі, нібы Волга шукае
Выйсця сіле, а ёй і канца не відно.

«Хіба ж мог пераплыць нашу матухну вораг,
Пакуль мы тут жылі?
Нам жа вечна тут жыць!
Заўтра створым сваё Сталінградскае мора,
Па якім людаедам ніколі не плыць!»

*1951*

## ПАЧАТАК

Калі пачаўся гэты подзвіг?
У катлаване?
Ці тады,
Калі вятроў спякотны подых
Адчуў геолаг малады,

І першую пад гэтым небам
Палатку белую узвёў,
І ўзяў на пробу чэрствай глебы
Каля зялёных Жыгулёў?

Ці мо пачаткам гэтай працы
Лічыць той бессмяротны год,
Калі стаялі сталінградцы
На смерць ля дымных волжскіх вод?

Раней, калі ў Магнітцы домны
Агнём нязгасным загулі,
Раней, раней. Калі у Доне
Кадзеты бітыя плылі,
Бо наш народ тады ўжо марыў
У месцах тых прарыць канал.

Яшчэ раней! Калі ударыў
«Аўроры» гром, калі скапаў

Бацькоў лёс жудасны навекі,
Каб мы, сыны іх, праз гады
Змаглі зрадніць сягоння рэкі
І зоры выкрасаць з вады.

*1951*

# ДА ГАНЕБНАГА СЛУПА!

Сядзелі не дзень генералы над картамі
З алоўкамі вострымі, як штыхі.
Хваліліся ў злосці шалёнай макартуры
Закрыць камунізму ў Карэю шляхі.

Крышылі ўзбярэжжа лінкоры снарадамі,
Армады крылатыя засцілі свет.
На кроку на кожным пакінуты гадамі
Іх страшны, іх чорны напалмавы след.

Адвозілі лайнеры ў Штаты нябожчыкаў,
Падвозілі зброю штодзень караблі.
Гарматнае мяса скуплялі вярбоўшчыкі
Усюды у цёмных прытонах зямлі.

І Трумэн і Пій за бандытаў маліліся,
Наёмным забойцам крычалі: «Зарэж!»
Карэйскія воіны, вы не схіліліся!
Карэя, сястра, ты жыла і жывеш!

Каб знішчыць народ і зямлю непакорную,
Якую адолець не змог і метал,
Агідная поскудзь таемна ускормлена
На чэраве гнойным тваім, капітал.

Праклятыя каты!
Яны усміхаюцца,
Здымаючы з чумных бацыл барышы.
А недзе ў трызненні дзіцё задыхаецца...
Устань, гнеў людскі, сваё слова скажы!

Сягоння ў Карэі,
А заўтра у Польшчы
Ці ў Індыі...
Слухайце, міру байцы:
Кляйміце іх ганьбаю, сейбітаў пошасці!
На лаву падсудных двуногіх бацыл!

Карэя, сястра, ты не будзеш пакорана!
Ты чуеш?
                У гневе ўсе мацерыкі.
Твой подзвіг бяссмертнаю славай азорапы,
А подласць праклята людзьмі на вякі!

*1952*

## ЛЕНІНСКІЯ ГОРЫ

Пасля дарог паходных,
Пасля усіх турбот
Зайшоў у цэх я родны
Праз дзевяць доўгіх год.

Па цэху плыў ад дошак
Пах свежае смалы.
Ляцеў вясёлы дожджык
З-пад круглае пілы.

Цудоўнае спатканне!
Аж сверб адчуў рукі...
За нашымі станкамі —
Другія юнакі.

Стары знаёмы майстар
З усмешкаю сказаў:
«Вунь, бачыш,— той, чубасты,
Цябе, брат, абагнаў».

І стала сумна крышку:
Каля майго станка
Плячыстага, увішнага
Я ўбачыў юнака.

Завод яму даверыў
І ўсім яго сябрам
Заказ пачэсны — дзверы,
Так, як калісьці нам.

Рамеснік ён учора,
Сягоння — станкавы.
Ён выканаў — не сорам —
Заказ самой Масквы.

Не знаў у працы зморы,
Адно ён добра знаў:
На Ленінскія горы
Іх адвязе састаў.

А вечаровым часам
Ля завадскіх варот
Мы з ім стаялі разам,
Глядзелі на усход.

Ды задуменным нейкім
Мой друг малодшы стаў...
Па серабрыстых рэйках
Прагрукатаў састаў.

І зноў на нас павеяла
Знаёмаю сасной,
Сталярным моцным клеем,
Дарогай і вясной.

А друг мой ціха кажа:
«Закончыць бы хутчэй...
Драбніца дзверы нашы,
А марыць весялей

Пра Ленінскія горы,
Што спаць мне не даюць.
Пра Ленінскія горы
Усе хлопцы ў нас пяюць.

Высока тыя горы,
Ды вышай запавет,
Што Ленін ясназоры
Нам даў: ісці без зморы
Да нашых ясных мэт».

Я хлопцу шчыра веру:
Ён здзейсніць запавет —
Свае адчыніць дзверы
Ва універсітэт.

*1952*

## ЗДЫМАК

Я ўбачыў здымак у газеце сёння
І зноў адчуў: у небяспецы мір!
...Сышліся генералы ў Пентагоне,
Ўпіліся ў глобус мутнымі вачмі.

Відно па ўсім, з якої яны пароды,
Пагляд іх прагавіты і цяжкі.
На глобусе на ўсіх зямных шыротах
Наколаты драпежныя сцяжкі.

Ляжаць мацерыкі і акіяны...
Мяркуюць гады — дзе і што бамбіць.
І паралелі, і мерыдыяны
Ім хочацца жалезнымі зрабіць,

Каб шар зямны у краты быў закован
І ў рабстве жыў пакораны народ.
Злачынцаў спіс пад здымкам надрукован,
Тых, што плануюць атамны налёт.

Мы бачым іх цяпер усіх без маскі,
І тлустых генералаў, і худых,
І гэтага, што цэліцца указкай
На нашы залатыя гарады.

Падпальшчыкі з бычынымі ілбамі,
Пара вам знаць, што ў нас усюды шмат
Сяброў,
Што нават негры ў Алабаме
Распытваюць цяпер пра Сталінград;

Што ўвесь сумленны свет
глядзіць з надзеяй
На горад самы светлы на зямлі.
Чаго вы варты, планы ліхадзеяў,
У параўнанні з гэтым?

А калі
Падпальшчыкам народы рукі звяжуць
І лёгка уздыхне зямлі прастор,
Абвінаваўчым актам грозна ляжа
І гэты здымак на судзейскі стол.

*1952*

## ЛЯ ПОМНІКА КУПАЛУ

Я люблю гэты помнік просты
Пад высокім зялёным шатром...
І нібы не было тае растані
Пад аркестра журботны гром.

Ён такі ж задуменны і блізкі,
Быццам песню вось-вось толькі склаў
Пра будоўлі цудоўнага Мінска,
Пра красу нашых велічных спраў.

Не па сэрцу такому паэту
Цішыня.
Тут заўжды ля яго
Многа смеху дзіцячага, кветак,
А на свята — барвовых сцягоў.

Як любіў ён жыццё гэта светлае,
Палюбіць навучыў і другіх.
Пазірае з усмешкаю ветлаю
На мінчан ён,
Жывы на жывых.

Вунь юнак і дзяўчына кіруюцца
У зялёную зацень алей.
Хай сабе на здароўе мілуюцца!
Грымні, радыё, весялей.

Пра лянок, пра лянок той чысты,
Неўміручы ягоны лянок!
Вечарэе.
Зара урачыста
Ускладае на бронзу вянок.

Я гляджу на аблічча роднае,
Песню славы складаю з зарой:
— Ты заўсёды, пясняр наш,
З народам быў,
І народ будзе вечна з табой.

*1952*

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Да чаго ж дапытлівай малая
Слаўная дачка расце ў мяне.
Раніцай прыёмнік уключаю,—
Тут як тут яна. Не праміне.

Слухаю апошнія навіны —
Не сціхае па зямлі вайна,
У Пхеньяне новыя руіны...
Хмуруся —
Хмурнее і яна.

Людзі трохгадовага узросту
Самыя цікаўныя з людзей:
«Што? Чаму?»
Ёй зразумець не проста
Самую прасцейшую з падзей.

«Тата, хто амерыканцы?
Тата,
А навошта збілі самалёт?
А чаму ў Карэі паляць хаты?
Што такое бомба і налёт?»

Сам я па прафесіі настаўнік,
Знаю слоў дакладную вагу,
А дачцэ сваёй, маленькай Тані,
Растлумачыць гэта не магу.

У Карэі б'юць гарматы люта.
Што пра жах вайны сказаць малой?
Акрамя святочнага салюта,
Іншы грукат невядомы ёй;

Акрамя такога самалёта,
У якім мы з ёй ляцелі ў Крым,
Акрамя ласкавага пілота,
Што цукеркі раздаваў малым.

Недзе нехта прагне нашай смерці,
Раскажу пазней пра гэта я.

Я дачку гарну бліжэй да сэрца...
Таня, Таня, светлая мая!

Хай цябе ніколі не трывожыць
Горкі сэнс незразумелых слоў.
Знішчыць людаедскі план варожы
Абавязак наш, усіх бацькоў,

Каб ніколі не раўлі на свеце
Жэрлы уолстрытаўскіх гармат,
Нават каб не чулі нашы дзеці
Слоў праклятых — голад, бомба, кат.

*1952*

## ПЯТРОЎНА

Калі шэсць дзесяткаў грукне
Працавітых слаўных год,—
Ныюць ногі, ныюць рукі
Ад асенніх непагод.

Хоць Пятроўна і ахвоча
Да любых работ, аднак
За брыгадаю дзявочай
Ёй не ўгнацца аніяк.

Пойдзе ў поле. Толькі дзе там!
Кожны раіць: адпачні,
Ногі грэй, чытай газеты,
Нянчы ўнука ў цішыні.

Для газет не тыя годы,
Мала граматы ў старой,
Хоць сама па пераводах
Подпіс чотка ставіць свой.

Хай не трэба бабцы грошы,—
Любы клопаты сыноў.
Атрымае — шмат харошых
Пра сыноў убачыць сноў.

Ды злуе крыху бабуся:
Без работы сумна жыць.
Добра, што радыёвузел
Дзень цалюткі не маўчыць.

Не усё ж унукаў нянчыць,
І старой цікава знаць,
Як пустыню перайначаць,
Што там будуць засяваць.

Аб Маскве, аб Волга-Доне,
Пра любы далёкі кут.
Для яе у родным доме
Адчыніўся інстытут.

Можа тым, каго вучылі
З першых крокаў, з першых дзён,
Лепш вядома назва «Чылі»,
Большы свет для іх відзён.

Ды яна беспамылкова,
Мноства чуючы прамоў,
Найгалоўнейшае слова
Адбярэ з мільёна слоў...

Ўсе цяпер на концы бульбы,
Дораг зараз кожны дзень.
І не выцерпіць бабуля,
Да брыгад хутчэй ідзе.

Гляне, хто як выбірае,—
І жывей ідуць жанкі.
Там палае, там парае,
Як інспектар, ды які!

Хмары тоўпяцца густыя,
Вецер носіць лісцяў медзь...
Добра рукі, што застылі,
Бульбай печанай пагрэць.

Перапынак. І жанчыны
Да агню яе завуць:
— Як на свеце, раскажы нам,
Людзі добрыя жывуць.

І раскажа. Пра Карэю,
Пра сясцёр далёкіх лёс.
Як там нелюдзі звярэлі,
Пасылалі мор з нябёс.

І заные сэрца ў многіх,
Зноў успомняць — хто сыноў,
Хто бацькоў, што з той дарогі
Не вярнуліся дамоў,

З той салдацкае дарогі,
Дзе бацькі іх і сыны
Здабылі ім перамогу
І такім вось, як яны.

І трывожна думка коле:
А калі ізноў паны?..
І ўскіпае мімаволі
Гнеў, знаёмы ім з вайны.

І сябе дакорам самі
Упікнуць цішком жанкі:
Там залішне пачасалі
Гаваркія языкі,

Там як след недаробілі...
— Годзе, бабы, вам хмурнець!
Гітлер лез — і што? Разбілі,
Смерць і гэтых не міне...

Ну, працуйце! Мне ж дахаты.
Ломіць косці...—
І пайшла,
Уздыхнуўшы вінавата:
— Старасць, старасць падвяла.

І не ведае Пятроўна,
Што зрабілася яна
Хоць не штатным, ды цудоўным
Агітатарам у нас.

*1953*

## ПІСЬМО ЮНАКА ДА ПАЭТА

Чытаў, чытаў, чытаў, аж засопся.
Ляжаць прачытанага пуды.
Паэзію ўсю і ва ўсіх часопісах
Перачытаў за чатыры гады.

Крапулі не раз мяне тэмы узнёслыя
Пра нашыя справы, пра нашых людзей.
Прыемна чытаць, як узмахвае вёсламі
Жняярка, як трактар на полі гудзе.

Нямала ў нас вершаў пра ўсё адмысловых,
А неадмысловых — дык цэлая гаць.
Але пра каханне ні гуку, ні слова,
Ці мо перасталі паэты кахаць?

І хоць не хацеў я кранаць тэмы коўзкай,
Ды, знаць, для размовы той час падышоў.
Хто піша пра гэта? Адзін Ісакоўскі,
Ды часам, ды крыху яшчэ Куляшоў.

Прызнаюся: сняцца мне косы густыя
І хочацца вершы чытаць... А у вас
Ці жонкі раўнуюць, ці сэрцы застылі,
Ці ваш агапёк паэтычны пагас?

Бывае: асмеляцца звесці герояў —
Хлапца і дзяўчыпу — адзін на адзін
Пад свіст салаўіны вячэрняй парою,
А далей... нуда на трынаццаць гадзін.

Лірычнай прамовы вядомы кірунак:
Пра трактар інструкцыю хлопец дае.
А каб зрыфмаваць хоць адзін пацалунак,
Адвагі ў паэтаў такіх не стае.

Навошта мне бляск трапяткі бліскавіцы,
Калі ён у родных вачах не гарыць?
Я толькі з любімай магу захапіцца
Успененым морам, паводкай зары.

На сэрцы чорт ведае што! І я рады
І веру — усё да труны зберагу.
Я любай дастану з нябёсаў сто радуг,
А вершаў пра гэта дастаць не магу.

Паэты, даволі сухіх публікацый!
Прашу вас ад імя усіх юнакоў —
Калі не кахаеце, то закахацца
І скласці хоць пару гарачых радкоў.

*1953*

## СЛОВА ПРА ПАЛЕССЕ

Што ты знаеш пра Палессе?
Што балотаў шмат у нас,
Што жыла у нейкім лесе
Тут Алеся Купрына;

Што вадзіліся тут чэрці,
Малярыя ды няўрод...
Што было — сплыло, паверце,
Іншы час, другі народ.

Так, нідзе не ўбачыш большых
Ты балот, лазы гусцей —
Ад Бабруйска аж да Польшчы
І яшчэ, яшчэ далей.

Непатрэбна для балота
Пазалота. Лепш скажы:
Слаўных шмат людзей жыло тут,
І жыве, і будзе жыць.

Сціплы ў славе, ў бітве мужны
Люд наш. Тут, у хмызняках,
Акупантаў білі дружна
Мы і хлопцы Каўпака.

І шахцёр сягоння ў шахце
Смела у забой ідзе:
Стойкі нашыя на вахце —
Наш крапёж не падвядзе.

Зашумяць бары — Адэса
Адгукнецца звонам хваль,
Мачты з тураўскага лесу
Паплылі ў марскую даль.

Жураўліны, журавіны,
Край легендаў і лясоў,
Край калгасны, край машынны,
Новай свет здзіві красой!

Рады сёння Мінск і Кіеў:
Час прыйшоў, Палессе, твой!
Экскаватары цяжкія
Пачалі ўжо бой з дрыгвой.

Тут размах разумнай сіле
І наватарам. Ужо
Інжынеры пачарцілі
Мільёны чарцяжоў.

Хоць і ў нас людзей нямала,
Запрашаем мы сяброў —
З Волга-Донскага канала
Слаўных, вопытных майстроў.

Калі ты з мясцін гарачых —
Прыязджай. Ты ў самы раз.
Разам клімат перайначым,
Будзе горача і ў нас.

Прыязджай, меліяратар
І калхідскі садавод,
Дапаможаш вінаград нам
Тут расціць праз колькі год.

Край калхідскі сёння ў славе,
І палескі краявід
Зменім мы, балоты сплавім,
Тут, брат, тысячы Калхід!

Сабіраць пачнуць Алесі
Небывалы ураджай.
Неабдымнае Палессе —
Гэта будучыні край!

*1953*

# НАВАСЁЛУ

Усхвалёваны і горды,
Далікатнейшы з людзей,
Ты нясеш законны ордэр,
Два ключы і сто надзей.

Можа, скажуць: што ж такое? —
Дробны факт для нашых дзён.
Так то так... Ды тры пакоі!
Кухня. Ванная. Балкон.

Ды калі ты ў сорак пятым
Між руінаў мінскіх жыў,—
Гэта ўжо не факт, а свята,
Гэтым фактам даражы.

Каб намылак... печых, скажам,
Не зрабіў ты, буду рад
Я, жыхар са значным стажам,
Пару даць табе парад.

Помні моцна: іншы дом быў
Тут калісь, ды грымнуў гром.
Памятай пра тых, што бомбай
Цэляць зноў у новы дом.

Хай на самым светлым месцы
Век з табой жывуць сябры,
Што загінулі у Брэсце,
Пад Масквой ці на Дняпры.

І твае ацэняць справы
(Кожны крок ім твой відзён) —
Як прапісан, ці па праву,
Ты да шчасця мірных дзён...

Не забудзь, што ў цеснай хаце
Шмат гадоў жыў бацька твой,
Што хварэе часта маці,—
Падрыхтуй для іх пакой.

Шлях жыццёвы не карокі,—
Каб пражыць у чысціні,
З першых дзён ты сваркі, плёткі
Ад парога прэч гані.

Не зрабі пакоі мёртвым
Складам рэчаў.
Не заплям
Сцен:
Хаўтурных нацюрмортаў
Прапануюць многа нам.

Завядзецца лішак грошай —
Не патрацьь на барахло.
Кветак, кніг купі харошых,
Каб наўкол усё цвіло.

Добра жыць між кніг і кветак!
А яшчэ жадаю вам
Многа, многа...
Ну, пра гэта
Здагадайся, браце, сам.

*1953*

## НАПРАДВЕСНІ

Ітак, пара ізноў ісці ў дарогу.
Паседжанняў няма. Знаць, злітаваўся бог,
А то ад мудрых слоў я ўжо зусім знямог,
Ледзь позва на даклад — і сэрца б'е трывогу.

Набіўшыя руку пацэліць дзень у цень
Паэты-песняры з пяцітыднёвым стажам
Гарачых спрэчак мех на сто гадзін развяжуць,
Што сапраўды пачне цямнець і ясны дзень.

Пра што яны гудуць? А сапраўды, пра што?
Што трэба знаць жыццё,
Што вершы любяць праўду.
Прабачце, але гэтыя парады
І нам і мы дзяўблі разоў мо сто.

Ды дзе там сто! Мо дзвесце раз па дзвесце.
Ледзь выбраўся з бяздоннай балбатні...
Сябры мае, стаяць такія дні
Харошыя і ў Полацку, і ў Брэсце.

Другому цяжка кідаць кабінет,
І ён замольвае мяшчанскія грашочкі —
Пра торфаперагнойныя гаршчочкі,
Не бачыўшы іх, піша ўжо санет.

А тут зямля набракла свежай сілай,
Ёй да санетаў дохлых спраў няма.
Вясна ідзе. Сып снегу больш, зіма,
Каб поле небывала ўскаласіла.

Б'е сонца ў шыбы парнiковых рам,
Для трактараў намечаны маршруты,
І людзі ўжо ацэньваюць у лютым,
Што прынясе, што зважа восень нам.

А на Алтай цалінныя пласты
Ўздымаць і засяваць паехала ўжо моладзь.

З добраахвотных арміі камсамола
Бяры, паэт, заўсёды прыклад ты.

Ідзі ў палі, дзе пах зямлі густы,
Дзе бітва за ўраджайнасць пачалася:
Някранутай паэзіі пласты
Ляжаць на кожным полі у калгасе.

*1954*

## АНКЕТА

Ох, як не люблю запаўняць я анкеты!
І хто гэта выдумаў столькі анкет?
Дай волю анкетам — звядуць нас са свету
Дазнаннем, накшталт:
Чым займаўся твой дзед?

І дзе я народжаны, ці ўзнагароджаны...
Я сёння даю самы важны адказ:
Я вершы пішу, бо душа растрывожана
Любоўю і болем за кожнага з вас...

Адзін пра Адэсу, другі пра Смаленшчыну
Да скону ўсё піша, а трэці пра лес.
А што мне рабіць, калі мне не завешчана
З маленства ніводнай, ніводнай з Адэс?

Я ведаю: родная хата ўсім дарага —
Бярозка па ўзгорку, дзіцячы ручэй.
А хата мая была скрадзена ворагам
З калыскі, з яшчэ невідушчых вачэй.

Дзяцінства маё — ўсё цяплушкі ды прыстані.
Юнацтва — на змену раёну раён.
А дзе ён, мой кут?
І плывуць прамяністыя
Дарогі радзімы да сённяшніх дзён.

Радзіма ка мне не куточкам адмераным
Прыйшла і сказала: пішы пра мяне.
Радзіма мяне благаславіла на вернасць
І мінскім барам, і крамлёўскай сцяне.

Мне люба і ціхая вёска з ракітамі,
Дзе я ў сямігодцы вучыў дзетвару;
І Волга — Радзімы дарога блакітная,
Дзе я сустракаў з хваляваннем зару.

Пра ўсё расказаць бы з суровою ласкаю —
Пра шчасце і смутак, пра радасць і гнеў,

А слова часамі прыглушана бразгае,
І песні няма той, якой бы хацеў.

Калі мая песня каго й хвалявала,
То тая, апранутая ў шынель...
Растрачана дзён незваротных нямала
На дробязь, на глупства, на тосты, на мель.

І хоць я з дарогі ніколі не збочыў,
Не вешаў на ўласнае сэрца замок,—
Пільней углядацца маглі б мае вочы,
Зрабіць я павінен быў большае, мог.

І тут не злітуецца сорам пякучы,
І тут не прашэпчаш трусліва: «Прабач...»
Няхай сто разоў абарвуся я з кручы,
Хай крышацца косці ад розных няўдач,—

Настойліва зноў запаветнае слова
Шукацьму, каб нехта ў апошняй з анкет —
На камні магільным пад гоман сасновы
Мог выбіць адно толькі слова: паэт.

*1954*

## МІНСКІЯ САДЫ

Я многа бачыў слаўных гарадоў,
Дзе ў акіянах паркаў і садоў
Высокія зялёныя тунелі,
Вясёлыя аркады з руж і хмелю.
Я спачываў не раз у іх цішы,
А сум і боль не гаслі у душы:
Палеглі ў бітве мінскія сады,
Як адшукаць любімых дрэў сляды?
Мы адшукалі шлях у родны край,
І ў светлы бор, і ў густалісты гай.
Яны нам столькі дрэў далі сюды,
Каб зноў шумелі ў Мінску скрозь сады,
Каб кожнаму: і мне, друг, і табе
Было па клёну, ліпе і вярбе.
Сады мае! Я вас мацней люблю
За ўсё, што бачыў,
Бо запомніў дзень,
Як кінулі на гэтую зямлю
І на дзяцей маіх вы першы цень.
І на маіх дзяцей і на другіх —
На нашых яснавочак дарагіх.
Таму вось ад зары і да зары
Ва ўсіх садах так многа дзетвары.
І, можа, ланцужкі малых слядоў
Найлепшы ўбор і паркаў, і садоў.
І самыя разбойныя з малых
Не ўзнімуць рук ламаць галіны ў іх,
Бо разам з лета ў лета ім расці
І ў Будучыню разам ім ісці.

*1954*

## ПРЫЧЫНА

Пятым сыночкам усцешана маці,
Кніжак, газет стала многа у хаце.
Токар адменны, шмат зарабляе,
Кніжку ці дзве кожны дзень ён купляе.
Маці шчаслівая сынам любуецца,
Толькі ў апошні час крыху турбуецца:
Што за прычына
Гэткая ў сына —
Кніжкі купляе,
Ды мала чытае?
Ўбачыла маці пядаўна кіёск,
Сын да кіёска нібыта прырос.
Там, у кіёску, сядзела прычына —
З чорнай касой маладая дзяўчына.
Раптам чамусьці ад кніг сын адбіўся
І табакурам заўзятым зрабіўся
(А не цягнула ж да курыва змалку),
Кашляе, паліць штохвілі запалкі,
Цягне штодня пачкі тры «Беламору»,
Дома запасу ўжо цэлыя горы.
Маці маўчала, нічога не радзіла:
Можа, дзяўчына чарнявая здрадзіла?
Неяк ішла паўз ларка з папяросамі,
Глянула: тая! Яна, чарнакосая.
Сэрца трывогаю ўміг ахапіла:
Што, як яе перакінуць на піва?
Трэба ж ёй будзе выконваць планы,
Значыць, сынок кожны дзень будзе п'яны?
Хоць і вялізная матчына хата,
Покуль расселяцца, ў ёй цеснавата:
Пяць жа сыноў ды чатыры нявесткі,
Ну, а паколькі трывожныя весткі —
Хай жа нявестка з'яўляецца пятая!
Гэта ўсё ж лепш, чым гарэлка праклятая.

*1954*

## КАМАРОЎКА

Камароўка... Ох і Камароўка!
Чорная сцяна. Сатлелы дах.
Паказаць гасцям яе нялоўка:
З дапатопнай эры Камароўка
З чысцінёю яўна не ў ладах.

Рой крывенькіх хатак. Гул машынны.
Тут усё спяшыць, кіпіць, гудзе.
Пекла забягайлавак мушыных,
Штурхатня базарная людзей.

Не цвітуць тут цыніі і флоксы,
Цяжка шыны пыл гарачы мнуць.
І плануюць хітра гіды з БОКСа,
Як бы Камароўку абмінуць...

Я з праспектаў новых сам дзіўлюся,
Як ты харашэеш, горад мой.
Ў спадчыну сталіца Беларусі
Нам не дасталася вось такой.

Ды і Камароўкі мне не сорам,
Хай глядзяць, як мы раней жылі.
Яшчэ многа-многа ёсць за морам
Камаровак горшых на зямлі.

Тут жа кранаў працавіты рокат,
Светлы ўзлёт агромністых муроў.
Тут і пахаванне Камароўкі,
Тут і нараджэнне Камароўкі,
Толькі без гразі і камароў.

Я б узняў гасцей абавязкова
На будоўлю, дзе сцяна к сцяне:
— Ёсць адносна вашых камаровак
Планы адпаведныя ці не?

І не пасміхацца, а зайздросціць
Камароўцы нашай будуць госці.

*1954*

## НАШ ДОМ

Ледзь не штодня гэта ў Мінску здараецца:
— Дом засяляецца! Дом засяляецца!

Дом стокватэрны, пяціпавярховы.
Ліпы ля дома стаяць, як ахова.

Як жа чакалі і як хваляваліся,
Покуль чаргі мы сваёй дачакаліся.

Сёння, пакоі пакідаючы цесны,
Нат безгалосы мурлыкае песню.

Годзе жанчынам з-за дробязяў лаяцца!
— Дом засяляецца! Дом засяляецца!

Пераязджаюць ткачыхі, бухгалтары,
Людзі заможныя і небагатыя.

Едуць работнікі кельмы і гэбля,
З добраю мэбляй, а болей без мэблі.

Многа было ў нас турботаў і смеху,
Кожны пакой адгукаўся нам рэхам.

Болей за ўсіх нацяшаліся дзеці:
Коўзаліся па бліскучым паркеце.

Кожны як мог у той дзень весяліўся,
Нават і той, хто на пятым сяліўся,

Толькі, вядома, больш ціха і стрымана:
Высакавата кватэра атрымана.

Покуль да новых кватэраў прывыклі,
Там-сям малыя канфлікты узнiклі.

Хтосьці кагось валачэ да адказу:
«Вокны выходзяць у нас на прамбазу,

А у суседзяў глядзяць проста ў сад,
Жыць тут не буду. Вязі нас назад».

Жонцы муж тэнарам дыпламатычным
Нешта даводзіць надзвычай тактычна.

Вось каб на службе той голас пачулі —
Ціхі, разумны, прыветлівы, чулы.

Каб падначаленых так пераконваў,
Трэст бы ягоны ўсе планы выконваў.

Бо ў кабінеце, здарасцца часам,
Кідае чэрствыя словы ён басам...

Ды абжыліся... Штодня лістаносец
Трыста пятнаццаць газет нам прыносіць.

Сталі знаёміцца, сталі цікавіцца,
Хто тут праславіўся, хто шчэ праславіцца.

— Чулі? Настаўніцу з нашага дома
Узнагародзілі.
— Як жа, вядома!

— Нашы плыўцы два пабілі рэкорды.
З нашага дома! — гаворым мы горда.

— Што гэта ў сёмай ўстаюць ранавата?
— Там пражывае славуты наватар.

— Дзеці, цішэй! Не таўчыце падлогі:
Ўнізе вучоны, шкадуйце старога.

— Ох і суседка... Ка-ла-ра-ту-ра!
Толькі й цярплю я ва імя культуры...

З ранку да змроку канцэрты, канцэрты...
— Самае важнае — дом наш у цэнтры.

Кухні асобна. Няма і разведкі,
Што там гатуюць сягоння суседкі.

Плёткі не чутна і выразаў колкіх —
Ну, не жанчыны, а проста анёлкі.

Мірна і чынна.
Ды неяк пад свята
Ў дом наш вярнуўся хлапец п'янаваты.

Быў халасты ён, не вельмі адказны...
Пераглянуліся жонкі выразна.

Каб у тым жанры жыльцы не грашылі,
Халасцяка ажаніць парашылі.

Праўда, надоечы з пятай кватэры
Мы правялі ў МТС інжынера.

Жонка яго не пайшла да вакзала.
— Я застаюся ў сталіцы,— сказала.

З нас больш ніхто ў гэты нумар не стукае.
Ўсе абыходзяць. Хай будзе навука ёй.

Бо ў нашым доме такое не водзіцца,
Што сёння запішуцца, заўтра разводзяцца.

*1954*

## ЗАЎСЁДЫ ГАТОВЫ!

На гранітнай трыбуне — бяссмертны Ільіч,
Так стаяў у дваццатым ён перад байцамі...
Сэрца, сёння мінулыя годы пакліч,
Што прайшлі пад яго баявымі сцягамі.

Родны Ленін! Як дораг мне воблік яго,
За усіх ён бліжэй...
Я з таго пакалення,
Над калыскай чыёй з першых дзён,
з першых год
Клапатліва схіляўся з усмешкаю Ленін.

У той дзень, калі я ўпершыню павязаў
Гальштук юнага ленінца, яркі, барвовы,
Я на плошчу прыйшоў, і, здалося, сказаў
Мне Ільіч: будзь гатоў!
— Я заўсёды гатовы!

Камсамольцам на фронт
ў сорак першым ішоў,
Зняў пілотку ля помніка з думай суровай.
І пытаўся Ільіч: бараніць ты гатоў
Дарагую Радзіму?
— Заўсёды гатовы!

Камуністам вярнуўся з вайны я дамоў,
Мінск убачыў разбіты ушчэнт, да асновы.
Пакланіцца прыйшоў Ільічу.
— Ты гатоў
Будаваць родны горад?
— Заўсёды гатовы!

Камуністы ўпустую прысяг не даюць —
Ты і я, мы усе.
Паглядзі, правадыр наш,
На узнятую к сонцу сталіцу маю,
На шчаслівы народ наш, адважны і мірны.

Мы са шляху твайго не сышлі ні на крок,
Нас на подзвіг працоўны вяло тваё слова.
І не страшна, што недзе згушчаецца змрок,
  Наш дэвіз і сягоння:
— Заўсёды гатовы!

*1954*

## СУВОРАЎЦЫ

Дзень пагодны, і праца спорыцца.
Толькі хто там так звонка пяе?
Выйшлі ў парк на вучэнне сувораўцы —
Баявыя суседзі мае.

Я спяшу паглядзець на стройныя
Іх рады, на запал малады,
Зноў сябе адчуваючы воінам,
Як калісьці ў былыя гады.

За радзіму адважна загінулі
Іх бацькі.
Для сваіх сыноў
Не сіроцкую долю пакінулі,
А гарачую мужную кроў.

І радзіма, як маці руплівая,
Выбірайце — сказала ім — шлях,
Абы толькі былі шчаслівымі
Дзеці тых, што палеглі ў баях.

Слёзы матчыны... Сны трывожныя...
Перш чым стаць у сувораўскі строй,
Шмат разоў, пэўна, сніўся з іх кожнаму
Родны бацька, народны герой.

Я хацеў бы, каб мірна і весела
Ў добрай працы прайшлі іх гады,
Самай мірнай жадаў бы прафесіі
Ім, маім сябрам маладым.

Загадаў бы на склад здаць пагоны...
Годзе марыць! Не час. Памаўчы.
Чуеш: грукаюць палігоны
За мяжою і ўдзень і ўначы.

Напамінаюць магілы брацкія:
Будзь гатовым і пільным будзь!
Чэсць салдацкую, славу бацькаву
Не заплямяць сыны, зберагуць.

*1951*

## ПЕСНЯ

Не пайду я у бярэзнік:
Там замнога весялосці,
Шмат праменняў там гарэзных
На галіне кожнай госціць.

Каб прайшоў я гэтым гаем,
Сэрца зноўку б зашчымела:
Не забыў я, дарагая,—
Ты гуляць любіла ў белым.

Не пайду я у асіннік,
Бо асіны залепечуць,
Як вясноваю часінай
Абдымаў твае я плечы.

Цалаваў і твар і рукі,
Як шалёны, напаследак...
Што асінам да разлукі!
Не люблю я гэтых сведак.

Абыду сцяжынкі гаю,
Падыду да гордых соснаў:
Там ніхто не запытае
Пра мой смутак невыносны.

Колькі ў іх спакойнай сілы,
Колькі вытрымкі у сосен!
Пэўна, ім лісты ад мілых
Кожны дзень вятры прыносяць.

*1954*

## СПАРЫШЫ

Адгрымела ноччу навальніца,
Птушак пазванчэлі галасы,
І пяюць на сто ладоў сініцы —
Упіліся, пэўна, ад расы.

На ялінах росных зор мільярды,
Дурнап'яну гаркаваты пах.
І арэхаў налітыя ядры
Хрумстаюць так смачна на зубах...

Ён абшастаў ценісты арэшнік,
Змок увесь, але знайшоў, знайшоў —
З думкай пра яе, зусім нягрэшнай,—
Пару запаветных спарышоў.

Хоць ніколі ў прымхі ён не верыў,
Проста для забавы ўзяў, а ўсё ж,
Калі стукнуў да яе у дзверы,
Скаланула радасная дрож.

У яе пакоі — вокны насцеж,
І сама, як раніца, была.
«На, вазьмі сабе спарыш на шчасце...»
Ціха засмяялася, ўзяла.

Узяла і тут жа раскусіла:
«Дзякую, браточак, шчасце ёсць!»
На вяселле хлопца запрасіла:
«Будзеш у мяне найлепшы госць!»

Не, не быў ён госцем на вяселлі.
Па начных дарогах, без дарог
Ён хадзіў ля пожняў і аселіц,
Боль хацеў развеяць і не мог.

А праз год яна яго спаткала
Выпадкова. Ці то ён яе...
Ля вачэй — маршчынкі... Шчасця мала:
Муж — гультай, бадзяецца ды п'е.

Прызнавацца сорамна і горка.
«Як тады асленнуць я магла? —
Сумным жартам скончыла гаворку:
Шкода, што снарыш не збярагла».

Вось і ўся гісторыя... А можа
Гэта толькі першая з дарог?
Нездарма яе так устрывожыў
Ціхі сказ хлапца: «А я збярог».

*1954*

## ПАСЛЯ ВЕЧАРЫНКІ

Ноч красае маланкі,
Кажаны ловяць зоры,
Мы ідзём з вечарынкі,
Ні аб чым не гаворым.

Што маўчыш, дарагая,
Што цябе ўсхвалявала?
За шэсць год першы раз ты
Са мною танцавала.

Я да танцаў не здатны —
Мядзведжыя рухі,
Хоць былі у руках маіх
Родныя рукі.

Як хлапцы маладыя,
Мне так не злаўчыцца.
Гэтай справе складанай,
Знаць, позна вучыцца.

Калі шчыра прызнацца,
Мне крышачку шкода,
Што з табою сустрэўся
Я ў сталыя годы.

Вось калі б мне было
Так гадоў васемнаццаць,
Не саромеўся б я
Табе ў нечым прызнацца.

Ты б таксама прызналася,
Чым табе люб стаў.
І малолі б да золаку
Шчыра мы глупства...

На франтах маладыя
Гады адшумелі,
Я прыйшоў да цябе
У салдацкім шынелі.

І не кляўся ні ў чым,
Не даваў абяцанкі,
Не сядзеў над ракою
З табою да ранку...

Ты ідзеш і маўчыш.
Можа я вінаваты?
— Будзе дождж,— адказала ты,—
Пойдзем дахаты.

Мільганула маланка
І ў момант пагасла
У вачах — і тваіх, і маіх
Аднадчасна.

*1954*

7 Зак. 840

## ГОСЦІ

Хлапчанё ўляцеў, нібы каменьчык,
Пушчаны з рагаткі, у пакой.
Старшыня таропка пакамечыў
Тэзісы ўсхвалёванай рукой.

— Едуць! — крыкнуў хлопчык.
                    — Едуць! Едуць! —
Сам сабой узнік ля ганка сход:
Акружыў тры светлыя «Пабеды»
Ветлы і гасцінны наш народ.

Як хлеб-соль падносілі старыя,
Наступіла ўсюды цішыня.
А пасля ўсе так загаварылі,
Аж забыў прамову старшыня.

Абступілі цесна італьянцаў,
Першае пытанне да сяброў:
— Ці здароў, таварышы, Тальяцці?
— Дзякуем! Тальяцці зноў здароў.

Разгубіўся шустры перакладчык:
Захліснуў пытаннямі натоўп...
Хто там плача, хто там ціха плача?
Вы ж паміж сясцёр, паміж братоў.

Металіст з далёкага Мілана,
Што насіў на твары след ад ран,
У мужчын пытаўся: партызаны?
На сябе паказваў: партызан.

Што з таго, што слоўнік не багаты!
Расказала ўсё руцэ рука —
Да далоні копюха шурпатай
Мазалі прыніклі батрака.

У вачах яго быў сум затоен:
— Лёгка дыхаць тут у вас, браты,
А у нас жыццё не залатое
На зямлі лімонаў залатых.

Паказалі ўсё мы ім адкрыта:
Нашы статкі, нашы табуны,
Клуб і школу, яблыні і жыта,
Нашы душы ўбачылі яны.

Потым іх ад сэрца частавалі
І навек іх голас зберaглі:
Госці нам пра мора шмат спявалі,
Мы свае ім песні, як маглі.

І пайшла размова больш жывая,
Нехта выпіў лішак і шуміць:
— Як там папа рымскі пажывае?
А Везувій, ён яшчэ дыміць?

Усміхнуўся госць. Ён век рыбачыў
Каля скал Сіцыліі рудых.
Папу тога ў вочы ён не бачыў,
А Везувій... то для маладых.

Для яго сябры збіралі ліры
На ўзбярэжжы ўсім, каб толькі мог
Ён сказаць аб дружбе і аб міры
У краіне светлых перамог...

Спапяліў бы нехта нас ад злосці,
Ды не ўдасца! Час цяпер такі:
Едуць к нам з усіх краін у госці
Докеры, ткачы і батракі.

*1954*

## ДАЧКА

Новы дом. Агароджа.
На сцены ўзбіраецца хмель.
Грамафоннымі трубамі —
Жоўтыя кветкі настурцый.
Сытым голасам трубіць
Пад вішнямі спелымі чмель.
І стары чалавек
Пахаджае ў пацёртай тужурцы.

Спахмурнелая жонка
Журботна сядзіць над лістом,
Падазрона глядзіць,
Як на пастку, на штэмпель паштовы:
Дзе той край Кустанай,
З-за якога пакінула дом
Іх дачка,
Праспяваўшы на ростань:
«Бывайце здаровы»?

У арэхавай шафе
К вяселлю прыхаван быў шоўк,
Завяліся ў буфеце,
Як кажуць, і лыжкі і міскі.

Для дачкі на прыкмеце
У маці ўжо быў жанішок,
Не вялікіх чыноў,
Ды затое устойлівы, мінскі.

А дачцы загарэлася:
«Еду ды еду у стэп.
Што я, горшая?
Што я, гультайка ці зломак?»
Хлеба ўдосталь, а ёй,
Бачыш, трэба змагацца за хлеб.
Тут пакойчык утульны,
А ёй лепей спаць на саломе.

Піша: «Цяжка і горача,
Скрыгае пыл на зубах.
Ні ракі, ні рачулкі,
Адно толькі — сонца ды вецер.
Каб пачулі вы, родныя,
Стэпу казахскага пах,
Палыновы і хлебны,
Ну, самы найлепшы на свеце!

А якія дзяўчаты,
А хлопцы якія у іх!..»
Піша: «З гэткімі можна
Ўзараць і засеяць Сахару».
Значыць, план не прайшоў...
Твая песенька спета, жаніх!
І, як водзіцца ў матак,
Слязінка пабегла па твары.

А стары усміхаецца
Моўчкі ў сівыя вусы,
І відаць, што рыхтуецца ён
Да сур'ёзнай прамовы.
Хай вось толькі кабета
Абсохне ад горкай расы,
Хай убачыць, што бацька
Даўно ўжо з дачкою у змове.
Жанішок, жанішок...
Адсылай ў Кустанай, маці, шоўк!

*1954*

## ЛЯ ПАДНОЖЖА АЛАТАУ

— Будзе хутка Ілі,— мне сказалі...
Калі
Дзень мінуў і не ўбачыў ракі той Ілі,
Я ў казаха старога трывожна спытаў:
— Колькі ж трэба мне ехаць да гор Алатау?

— Дзень і ноч,
Дзень і ноч
Стэпам сонечным кроч,
Каб дайсці да ракі,
Шчэ спатрэбіцца ноч.
«Каб прастор Казахстана увесь абляцець,
Трэба беркута крылы магутныя мець»,—
Гэта мне расказаў магілёўскі юнак:
Навасёлу прасторы даліся у знак...
Я на крылах сталёвых над стэпам ляцеў.
Стэп здаваўся то шэрым, то ўвесь залацеў,
То, завораны, слаўся, як чорны дыван,
То зліваўся ён з небам, як сіні туман.
Раптам шлях засланілі хрыбты Алатау,
Ля падножжа — у яблынях Алма-Ата.
Я ад Мінска паклон перадаць табе рад
І народу твайму,
Горад-сад,
Горад-брат!

*

Я ніколі не бачыў такіх гарадоў,
Дзе б у кожным квартале — па сорак садоў,
Дзе галіны звісаюць аж за небакраї,
Дзе бязбожнікі нешта мармычуць пра раї.
Залатыя сады!
Разбягуцца яны
Па ўсім стэпе, дзе сёння цвітуць палыны,
Дзе гудуць трактары
Ад зары да зары.

Просіць стэп чалавека:
— Хутчэй зaары!
— Вось збяру ураджай,— зaару, не прасі,
Вунь пшаніца хвалюецца — трэба скасіць.

*

Напісаў я нямала пра гай ды пра бор,
Трэба сёння бліжэй мне падацца да гор.
Можа гэтыя горы прысніліся мне?
Пікі белых вяршынь у дымку, нібы ў сне.
Гімалайскія елкі ўзбіраюцца ўверх
На завоблачны нейкі трохсоты паверх.
І авечкі пасуцца на схілах крутых,
Як маленькае воблачка, кожная з іх.
Чабаны раскладаюць пад хмарай агні...
Цішыня навакол і няма цішыні,
Бо клякоча пагрозна у скалах рака
І разносіць свой звон па малых арыках.
І віецца дарога. Куды? — не пытай:
Зразумела і так — у Народны Кітай.

*

А назаўтра з кагортаю таварышоў
Пакланіцца магіле Джамбула прыйшоў.
У высокім шатры спіць бяссмертны акын —
Верны друг чабаноў. Іх адданейшы сын.
І гняздо на шатры маўзалея звіла
Тая ластаўка, што яго песняй была.
Ён калісьці дзяўчыну-красуню кахаў,
Тлусты бай яго ластаўку сілай забраў.
Аніколі Джамбул супакою не меў,
Гнеўны голас акына па стэпах грымеў.
І разносілі ластаўкі песні яго
Ад цянь-шаньскіх снягоў
Да марскіх берагоў.
Шчасце ў юрту прыйшло —
скінуў з плеч ён гады,
І да самай труны быў Джамбул малады...
Сіратліва вісіць у музеі дамбра,
Што звінела заўсёды званчэй серабра.
Спі, Джамбуле, пад шолах зялёных галін,
Твая песня жыве, наш вялікі акын!

*

Вось і ростані час нечакана прабіў...
Казахстан, я цябе ад душы палюбіў!
І калі я скажу, што за шум арыкоў
І за гордае ззянне тваіх леднікоў,—
Я не праўду скажу,
Не ўсю праўду скажу.
І калі я скажу: за густыя сады,
За Балхаш і за зарыва Караганды,—
Я не праўду скажу,
Не ўсю праўду скажу.
Палюбіў я цябе за сардэчны народ,
Што пачаў найвялікшы за шчасце паход.
Палюбіў і палатак паходных рады:
На іх месцы пачнуць гаманіць гарады.
Веру: працай сваёю узвысішся ты,
Як над стэпам бяскрайнім
Цянь-Шаня хрыбты.

*1954*

## КАЗАЦКАЯ ДАРОГА

«Розпрягайте, хлопці, коні
Та лягайте спочивать»,—
Песня раіць, песня звоніць,
А яны не хочуць спаць.

Хлопцы коней запрагаюць,
Песня шырыцца, расце.
Украіна дарагая,
Сустракай братоў-гасцей!

Вось дарога на Чарнігаў,
Паабапал тапалі,
Як старонкі светлай кнігі,
Разгарнуліся палі.

І не бачна той граніцы,
Той варожай паласы,
Падзялілі б што крыніцы,
Рэкі нашы і лясы.

Не, няма такой граніцы
І не будзе! Наш народ
Здолеў моцна парадніцца
З вамі ў той далёкі год,

Калі воіны Багдана
Паміж гомельскіх лясоў
Памаглі самааддана
Нам граміць шляхецкіх псоў,

Тых, хто вечна, з лета ў лета,
Беларусь знішчаў агнём.
З тых часоў дарогу гэту
Мы казацкаю завём...

Свежы вецер. Далі клічуць.
На дарозе звон і гром.
І сябе сягоння лічыць
Кожны крышку казаком.

А ў суседзяў нашых зранку
Ўсё спявае і гудзе.
Сустракае нас Дабранка
Словам дружбы: — Добры дзень!

Ваша свята — наша свята!
І выносяць залаты
Каравай нам з першай хаты
Украінскія браты.

*1954*

## УСПАМІН

Не раве, не стогне Днепр шырокі,
Зоркі ў Кіеў па рацэ плывуць.
Думаю аб той, аб чарнавокай,
Хоць не знаю, як яе завуць.

Я не к ёй прыехаў на спатканне.
З Міншчыны, з далёкага сяла,
Да магілы Кабзара у Канеў
Песня Кабзара і прывяла.

Сэрца зберагло навек той вечар:
Недзе ў стэпах дзень спякотны гас,
За Дняпро глядзеў з гары Чарнечай
З думаю суроваю Тарас.

Ні пра што ні ў кога не пытаў я,
Прагна углядаўся ў краявід.
Юная настаўніца з Палтавы
Раптам заспявала «Заповіт».

Тонкая, чарнявая, з касою —
Пра такіх Кабзар пісаў не раз,—
Светлаю дзявочаю красою
Ты тады зачаравала нас.

А мяне за ўсіх, напэўна, болей...
Пра такіх пісаў ён? Можа й так.
Ды тваю не параўнаеш долю
З доляй Кацярынінай ніяк.

Песню падхапілі мы і кручы,
З лісцяў кроплі падалі расы.
І панёс удаль Дняпро равучы
Нашы маладыя галасы...

З той пары успомню Украіну —
І ўсплывае вобраз кожны раз:
«Заповіт» пяе ў цішы дзяўчына
Над магілай слаўнай Кабзара.

*1954*

## КІЕВУ

Дзень добры, Кіеў, непаўторны Кіеў!
Я палюбіў твой воблік з даўніх дзён.
І вось ізноў таполі трапяткія
Па-нада мной рассыпалі свой звон.

Яшчэ ў Дняпры мігцелі ціха зоркі,
Дымок ледзь-ледзь бруіўся ад вады,
Я з вышыні Ўладзімірскае горкі
Зноў аглядаў праспекты і сады.

І сэрца нешта сціснула да болю:
Сустрэўся, Кіеў, сёння я з табою
Пасля разлукі доўгай і цяжкой,
Таму і стаў радней мне воблік твой.

А мо таму, што ў зямлянцы цеснай
Мне з Кіева таварыш ціха пеў
Пра ведарэчка песню. Гэтай песні
Я падпяваў, хоць голасу не меў.

Тады адзін другога саграваліі
І дружбай, і ўспамінам.
А калі
Цішэй было на фронце,— гаварылі
Аб нашай запалоненай зямлі.

Даўно разбіты вораг.
Нават каскі
Чужынцаў
Засмактаў дняпроўскі іл...
Хаджу я па світанні, як па казцы,
Па горадзе, і кожны дом мне міл.

Радзее змрок.
Зара плыве на Кіеў.
І ў гэтай урачыстай цішыні
Палаюць купал залаты Сафіі
І коннік на ўздыбленым кані.

А ўжо шуміць Крашчацік.
У праменні
Купаюцца высотныя муры,
І кідаюць карункавыя цені
Каштаны на уцеху дзетвары.

Мне люба гэта ўсё, ды не заіздрошчу
Я шчасцю кіяўлян.
Я проста рад
Хадзіць і любавацца кожнай плошчай,
Як Мінску рад мой украінскі брат.

Адна дарога ў нас і лёс адзіны,
І злучаны мы дружбаю навек,
Як злучаны Расія, Украіна
І Беларусь гаплём дняпроўскіх рэк.

*1954*

## ШАПКА ЭСТОНЦА

Ні шторму, ні буры тады не было,
Калі нарадзіўся я ў Таліне.
Звычайнае сонца звычайна ўзышло
Пасля гадзіны світальнай.

А недзе на поўдні стагнала вайна,
Мой бацька ужо па вайне быў.
Рабочы барак. У пакоі у нас
Апошні кавалачак хлеба.

І думала маці, напэўна, тады,
А як жа мяне данесці
Да роднае беднае вёскі, туды,
Дзе можна хоць бульбы пад'есці.

І плакала маці тужліва ў той час
Аб мінскай далёкай старонцы...
Пад вечар зайшлі ў пакойчык да нас
Сябры майго бацькі — эстонцы.

Сказалі: «Паслаў нас адведаць народ»,
Суровыя твары схілілі,
Адобрылі моўчкі ў жыццё мой прыход
І крышку мяне пахвалілі.

Тады быў трывожны семнаццаты год.
Запалі з нішчымніцы вочы.
«Хоць нашая праца
на верфях не мёд,—
Хай будзе сумленным рабочым».

Як маці сцвярджае, і я не маўчаў,
Зайшоўся ад радасці плачам,
Сваё нараджэнне як мог адзначаў,
Хаця што нічога не бачыў.

Не бачыў, як будаўнікі караблёў
Пакінулі шапку у хаце

Паўнюткую грошай, пацёртых рублёў,
Што ў цэху сабралі для маці...

Я славіў каханне, паходы, баі,
Гарачае роднае сонца.
Хай будзе ж праслаўлена вершам маім
І простая шапка эстонца.

*1951*

## МАСКВЕ

Калі пралятае наш мінскі цягнік
Па светлых гаях Падмаскоўя
І ззяць пачынаюць здалёку агні
Сталіцы,— хвалююся зноў я.

Зямля дарагая, знаёмая даль,
Бярозы на снежных адхонах...
І дрогне на сэрцы заўсёды медаль,
Медаль за Масквы абарону.

Далёкі, бясконцы успомніцца бой,
Магілы пры кожнай дарозе...
Не ўсім нам у тыя гады пад Масквой
Героямі стаць давялося.

Мы скромнае думкі пра справы свае —
Былі радавымі ў паходзе.
А як жа адзначыць заслугі твае?
А чым жа цябе ўзнагародзіць?

Ты, родная маці савецкай сям'і,
Дала нам нязломную сілу
І ўсё чалавецтва вялікай зямлі
Ад гібелі абараніла.

Ты — наша любоў і надзея з надзей,
Ты — яснае сонца народаў.
Заўсёды у сэрцах удзячных людзей
Жыць будзе твая ўзнагарода.

*1954*

## СТАРЫ ЗНАЁМЫ

З ім пазнаёміўся я ў Энску
За год да гэтае вайны...
Спяваў на сцэне млява Ленскі
Пра залатыя дні вясны.

А ён, укормлены, ружовы,
У асалодзе анямеў,
І выгляд крышачку маржовы
У гэты час сусед мой меў.

Калі ж заціх далоняў плёскат,
Пагардліва скрывіў губу:
— Нішто... А ўсё-ткі не Казлоўскі...—
І развітаўся: — Я бягу!

І ўжо, здавалася, не рады
Ён быў канцэрту, аж сцямнеў:
— Гарым, браток, ізноў нарада
У адзінаццаць у мяне.

І сапраўды — з яго канторы
Трохпавярховай да зары
Валіў казбечны дым угору
І словы чуліся: — Прарыў!

— Мабілізуемся і штурмам
Любыя крэпасці змяцём! —
Суседа голас гнеўны, бурны
Быў за вярсту усім чуцён.

Зжаўцела белая папера,
Завяў пракураны актыў,
А ён грымеў:
— Заўжды наперад!
— На прыступ, слаўны калектыў!

І так заўсёды і усюды
Званіў без стомы гэты друг:
Пра торф і пільнасць, пра пасуду,
Пра партвучобу і пра друк.

— Не страшны нам любыя войны!
І тут прамоўца закругляў.
І да дванаццаці спакойна
У ціхай спальні гучна спаў.

І без яго ў ягоным трэсце
Рабілі посуд і мяшкі,
Жакеты, цацкі, ложкі, крэслы
І першамайскія сцяжкі.

А слава ліпла: — От прамоўца!
Такі нідзе не падвядзе.
Мужык што трэба — свойскі, моцны.
Паможа кожнаму ў бядзе.

Ото душа! Ото начальнік! —
Так падхалімы кожны раз
Хвалілі, соладка гурчалі
І грошы мірна кралі з кас.

Калі ж з заходніх цёмных даляў
Прыйшла вайна, ён раптам знік.
Яго шукалі і гукалі,
Дабро, заводы ратавалі,
Яго ж у тыл адвёз цягнік.

Усю вайну ні то ў Уральску,
Ні то ў самой Алма-Аце
Прамовамі ён зноўку бразгаў
І на паседжаннях пацеў.

І падхалімскае майстэрства
Яго вяло. Пасля вайны
Вярнуўся ў Мінск і ў міністэрстве
Пралез у важныя чыны.

Ён слаба ў тэхніцы кумекаў,
Памылкі зразу прызнаваў.
І ашчаджалі чалавека
Ад рэзкай крытыкі і спраў.

У кабінеце быў харобры,
Крычаў, што рэжуць без нажа.
— А як рабіць?

— Рабіце добра.
— А што рабіць?
— Ды наднажаць.

Пра прэміі, пра дачу марыў,
Стагнаў, што змогся ён ад спраў,
І праўда: ліўнем цыркуляраў
Ён прадпрыемствы заліваў.

Ён сват, ён брат, ён друг твой старшы.
А сем'янін — слыло — які!
Але чамусьці сакратаршаў
Мяняў часцей, чым пінжакі.

Казаў: — Я оперы аматар.
А каб лічыліся больш з ім,
Прайсці тры крокі да тэатра
Ён не хацеў. Падайце «зім»!

Не так яго кранали спевы,
Як тое, што усім відзён,
Сачыў, калі у ложы левай
У ладкі білі,— біў і ён.

Дружыў з памочнікамі ўсімі,
Начальства звычкі добра знаў.
Артыкулы уласным імем
Падпісваў, хоць не сам пісаў...

З яго нідзе не будзе толку,
Ды нехта раз пажартаваў:
— Пасланць яго ў калгас, бо столькі
Ён сам жа ўсіх агітаваў.

І божа мой! Як ён заные,
Як заскуголіць, небарак:
— Я не магу... гіпертанія...
І падазрэнне ёсць на рак...

...Я б не патраціў столькі слоў
На верш, каб толькі цвёрда ведаў,
Што ўжо такіх вось дармаедаў
З усіх прагналі устаноў.

*1954*

## ХАЛТУРШЧЫК

Ён з пахабнага саслоўя,
Спрытны і здагадлівы,
На адных глядзіць з любоўю,
На другіх пагардліва.

Падхалімскія замашкі
Лічыць першым фактарам.
Праіграць гатоў у шашкі
Кожнаму рэдактару.

Прыйдзе да аўтарытэта,
Ў госці запрашаючы:
«Прачытайце,— скажа,— гэта...
Водгук ваш рашаючы...»

Покуль той жуе старонкі,
Хмыча: «Кепска... тлпа як!»
Аўтар-клешч — ля вуха жонкі:
«Рэдкі шоўк дастану я».

А вядома, пасля шоўку
Жонка, як шаўковая.
Муж рашае — гнаць нялоўка,
Піша: «Тэма новая».

І пайшло: урыўкі ўсюды,
Перадачы ў радыё.
Потым кніжак бачны груды,
Ды ніхто не кратае.

Покуль нехта разбярэцца,
Вызначыць крытэрыі,
Паспявае ён пагрэцца
Ў розных бухгалтэрыях...

Ён у грудзі б'е і кажа:
«Трэба быць нам з масамі...»
А напіша, што закажуць,
Абы... пахла касаю.

Сёння нарыс коксагызны,
Заўтра сказ пра воднікаў.
І глядзіш — наш свет вялізны
Выйшаў шчэрым і прылізаным
Ў гэтага нягодніка.

Род халтуршчыкаў упарты,
І таму гаворым мы:
Трэба гадаў біць пагардай
І добрымі творамі.

*1953*

## НАВАГОДНЯЕ СЛОВА

Каляндар дашчэнту абарваны,
Колькі хваляванняў і падзей!
Гэтым годам нам падаравана
Самая найлепшая з падзей.

Атамныя бомбы спяць на складах,
Вета ўсёй зямлі ляжыць на іх.
Ведаем: у гэту ноч не ўкрадуць
Сны і калыханкі у малых.

Расставацца трохі сумнавата
З гэткім слаўным годам, сапраўды.
Ды пара ўжо...
Злепленыя з ваты,
Строяцца пад ёлкамі дзяды.

Залаты народ і стол багаты,
І звіняць масніцы пад нагой...
Не хачу псаваць я людзям свята,
Ды баюся вельмі аднаго:

Каб у тлуме гутарак сяброўскіх,
Тостаў і пахвал пад гучны туш
Не пралезла ў новы год ізноўку
Гніль былая нечых дробных душ.

За гадзіну да прамоў хвалебных,
Покуль не пачаўся страў парад,
Уключыць бы нам такі патрэбны,
Самы электронны апарат.

Слухаеш, бывала...
Супраць плесні
Выступае пехта, паддае,
Як салодкі тэнар той, што песні
Неапалітанскія пяе.

Добра слухаць добрыя намеры.
Заўтра глянеш — скіснуў чалавек:

Жонка абвяла яго ў кватэры
Рысаю аседласці навек.

Вось вучоны. Ён вядучы.
Толькі
Запытацца б: ты куды вядзеш?
Сцёбае каторы год без толку
Пугаю цытатаў па вадзе.

Вось другі. Усюды цэлы пухам,
Прасвяціць бы,— што там на душы?
Можа, ён пляткар альбо хапуга,
Мо чый-небудзь талент прыдушыў?

Вось яшчэ адзін... Штогод нас вершы
Навучаў пісаць пра веліч дзён.
А пасля смяяўся з вершаў першы:
Бачыш, пуп эпохі не відзён.

Вось што, знаўца мод, калі паперу
Я псую — лупцуй мяне і лай.
Ды з народам нам ісці наперад
Не перашкаджай, дарогу дай!

Хамаў, падхалімаў і падліз мы
Выведзем на чыстую ваду,
І з-пад ёлкі і з сацыялізма
Выганім, як кажуць, на хаду.

Вынайдуць ці не калі па свеце —
Невядома — гэткі апарат...
Хай і ў новым годзе гэтай мэце
Служыць верна вастрыё пяра.

*1955*

## МАІМ ГЕРАІНЯМ

Дзяўчаты, каханыя,
Вершаў маіх гераіні,
Прабачце мне сёння,
Што я легкадумна не раз
Вадзіў за сабою
Па фронце, па снах, па краіне,
А ўсё ж не даводзіў
Да шчасця канкрэтнага вас.

А вы ж не анёлкі,
Не феі, не кволыя здані,
Трымалі сябе,
Як на працы цяжкой, на вайне.
У кірзавых ботах
Хадзілі не раз на заданні,
Нібы на спатканні,
Ды толькі куды спакайней.

Кляйміце пагардай
Таго, хто слюнявіць расказцы
Пра жонак паходных,
Хоць, можа, былі і яны.
Я кожную з вас
Сустракаў у пілотцы ці касцы
На самых крутых
І высокіх вяршынях вайны.

Вы лёгка звыкаліся
З холадам, з гулам гарматаў
І часта трывалей
Былі у паходах за нас.
Адно не змаглі вы:
Прывыкнуць да нечага мату,
Да грубасці нечай,
Да прагных вачэй і абраз.

А як бінтавалі вы раны,
Як песні спявалі
Журботна і ціха

Ў зямлянцы, у лесе густым.
Прызнацца напраўдзе —
Красою дэмаскіравалі
Вы часць,
Асабліва
Калі нас адводзілі ў тыл.

Як мала пісаў я,
Як слаба пра гэта пісаў я,
Сястра, гераіня
І наша святая любоў.
Пацвердзілі зноў
Найвялікшае вы раўнапраўе
У брацкіх магілах
Між самых адважных байцоў.

І час той прыйшоў,
Што чакалі мы і здабывалі,
Прыйшоў, загадаў вам
Рукамі каханых абвіць,
Нібы навальніцамі,
Каб пракаціліся хвалі
НЗ вашай ласкі
І вашай вялікай любві.

І рад я, што з вамі
Мне светла дружыць давялося.
Вятры успамінаў
Хвалююць мяне ў цішыні,
Як дождж тапаліны,
Як пах распілованых сосен,
Як сок спелых яблык,
Як дальніх зарніцаў агні.

*1956*

## ВЕРХАЛАЗЫ

Залаты агеньчык зваркі бліскаў
Недзе каля самых аблакоў.
Тэлемачту ўзводзілі над Мінскам
Верхалазы — зайздрасць хлапчукоў.

Мы за працу іх адчулі гордасць.
Хоць іх вочы не былі відны,
Толькі ўсе дзяўчаты зналі цвёрда:
Хлопцы ўсе прыгожыя яны.

Прадаўшчыцы ў тыя дні ў кіёсках
Менш газет і кніжак прадалі:
Папраўлялі модныя прычоскі,
Нібы зверху ўбачыць іх маглі.

А яны ў жалезныя карункі
Уплятаді сонца і блакіт.
І хапалі весела іх рукі
За сівыя грывы аблакі.

Бачна ім, як хораша і бурна
Пачала сталіца расцвітаць.
Гэта вам не ўзлезці на трыбуну
І даклад аб росце прачытаць.

Там сады, а там дымяць заводы,
Там пралегла новых рэек ніць.
Мірны подзвіг нашага народа
З вышыні лягчэй ім ацаніць...

Вось і нам такія б далягляды,
Каб спявала кожны дзень душа...
Не магу цярпець я верхаглядаў,
Верхалазам — тысяча пашан.

*1956*

## ВІЗІТНЫЯ КАРТАЧКІ

Час такі настаў — вагоны ломяцца:
Едзе ўся зямля да нас, бадай.
Кажуць, за мяжой, каб пазнаёміцца —
Картачку візітную падай.

Іншыя ў нас звычкі, з іншай доляю
Давялося нам, на шчасце, жыць...
Меўшы грошы, гэта кожны здолее
На кардоне прозвішча адбіць.

Прачытае нейкі туз ягонае
Прозвішча, запросіць можа: сядзь...
А у нас — глядзі — на Дошцы гонару
Картачкі візітныя вісяць.

І без гербаў, без пыхлівых тытулаў
Працаю сваёй заслужыш ты —
І прад'явіць картачку візітную
За цябе твой родны калектыў.

Само сонца ранкам прывітаецца
З іменем праслаўленым тваім.
Герб у нас адзін — і расчыняюцца
Дзверы ўсёй планеты перад ім.

*1956*

## ПРЫСТАСАВАНЦЫ

Станкоў не знаюць, араць не ўмеюць,
Да воза з гноем не йдуць і блізка.
Разумнае, вечнае, добрае сеюць
Між мас працоўных амаль з калыскі.

Закончаць нешта з тугой нацяжкай,
Запас прыдбаюць цытатаў розных.
Дзяцей у школе вучыць ім цяжка,
Лягчэй, выгодней вучыць дарослых.

Цытата з вока, цытата з вуха,
І зуб у роце блішчыць цытатай.
Глядзіш з сумненнем на сына-зуха —
Кім ён змайстрован? Наўрад ці татам.

Ідуць насустрач грашовай справе,
На пафас голы яны не клюнуць.
Маліцца будуць, калі ты ў славе,
Калі ты ў горы — з насмешкай плюнуць.

Разлік дакладны ды плюс удача,
Паклон начальству ды жартаў крышку —
Глядзіш — і стаўка, а там і дача,
Грунтоўны базіс ашчаднай кніжкі.

І, ўладкаваўшыся адмыслова,
Чужыя думкі прыстойна крадуць.
Зусім забылі жывое слова
І занядбалі людскую праўду.

Застылі твары кароўім лоем,
Нос падпірае тупая веліч.
Глядзяць з пагардаю на ўсё малое,
Балбочуць нешта ды ружавеюць.

У цёплых ложках хіхікаць любяць
З наіўных дурняў, што ў вёску едуць,—
Кватэры трацяць, кар'еры губяць,
Збываюць танна свае «Пабеды».

Вялікай працай заняты людзі,
Пяюць у шчасці, ў бядзе бядуюць.
Прыстасаванцы ж б'юць гулка ў грудзі,
Крычаць — «гадуем...»,
крычаць — «будуем...».

Сярод народа такіх не многа,
Ды вельмі ж хітра яны нам шкодзяць.
Нам замінае вось гэта погань,
Як пыл дарожны ў цяжкім паходзе.

Іх распазнаюць людскія вочы,
Ні ў якіх порах ім не схавацца.
Мы гэта зробім, калі не хочам
Да прыстасаванцаў прыстасавацца.

*1956*

## ВЫНАХОДЦА

Ён у цаху праводзіў вечары,
Аж дрыжыкі станок такарны бралі.
Сядзеў нярэдка дома да зары,
Чарціў проставугольнікі, спіралі.

Пад абажурам лямпачка... У акне
Ноч зоры чысціць
чорнай, чорнай замшай.

Прачнецца жонка, гляне, уздыхне
І зноў засне, нічога не сказаўшы.

І вось гатоў, гатоў яго разец,
Паспаць, а там пачаць выпрабаванне...
І першы раз турбота не грызе.
І першы раз спакойна спіць да рання.

А раніцай прынеслі пак газет,
І ў цэх яму ісці было ўжо не з чым:
Чалябінскага токара партрэт,
Тварца разца такога ж быў там змешчан.

Не, недарма сядзеў ён да зары.
Хоць крыўда глуха распірала грудзі,
Ды ён за Маякоўскім паўтарыў:
«Сочтемся славою,
ведь мы свои же
люди».

*1956*

## КАМЕННІ

Раскінуўся ціха на поўначы Міншчыны
Нічым не славуты лясісты раён.
Прайшло там, прабегла сухімі іржышчамі,
Густымі барамі маленства маё.

Нічым не славуты? Славуты каменнямі.
Ці чорт іх насыпаў там столькі, ці бог.
Калі б з глыбіні паўздзіраць іх умелі мы —
Для ўсіх беларускіх хапіла б дарог.

Нарогамі вырвеш, здаецца, з карэннямі,
Ды зноў іх, як бобу, з прыходам вясны.
І бульба была ўперамешку з каменнямі,
І нават у бохан траплялі яны.

Страшней за паводку і горай за засуху,
Яны божай карай былі для бацькоў.
Аматар трымаць чорны камень за пазухай
Тут мог бы набраць іх на дзесяць вякоў.

Год трыццаць назад таму — помню —
                                        было гэта,—
Адзін кулачына паклікаў мужчын.
«Што, сумна? —
                    пытаўся ён з дробненькім
                                                рогатам.—
А што ж вам парадзіць, пацешыць вас чым?

Ну, вось што: пазвозьце мне кручы каменныя,
А я вам гарэлкі — нап'ём да зары...»
Канюшню і свірны ён выклаў адменныя.
Зlаваліся людзі: і тут абдурыў!

І зноўку ляжала зямля, нібы хворая.
А што ты з ім зробіш, з каменнем, адзін?
Я ўспомніў старую ды злую гісторыю,
Калі праязджаў каля родных мясцін.

З палеткаў каменне калгаснікі звозілі,
Пылілі нястомныя грузавікі.

Тут клалі падмуркі і сцены выводзілі
Са смакам, грунтоўна, відаць, на вякі.

Старыя, малыя — усе завіхаліся,
І першы раз півы не лаяў народ.
«Ніхто напракнуць нас не можа,—
смяяліся,—
Што кінулі камень мы ў свой агарод».

*1956*

## БАЦЬКА

Жыў чалавек... Ды дзе там! Чалавечак.
Быў вечна нездаволены усім.
І вось аднойчы ў душны летні вечар
У чалавечка нарадзіўся сын.

І бацька ганарыўся, што з'явіўся
Нашчадак, сын, а жонку ўсё ж даймаў;
І скардзіўся на ўсё, на ўсіх крывіўся:
Нашчадак ёсць, а спадчыны няма.

А там вайна пайшла грымець па свету.
За родны край з нас гінуў не адзін...
Ці сам схацеў, ці сталася ўжо гэтак —
Застаўся ён у Мінску між руін.

Прыкінуўся тупенькаю авечкай.
Прыладзіўся. Шаптаў: «Бяру. Плачу».
І акупанты зрэдку чалавечка
Паляпвалі пальчаткай па плячу.

Нажыткі, нарабаваныя недзе
І некім, ён цішком распрадаваў.
Крыху сабраў і золата і медзі,
А свой палац усё ж не збудаваў.

Паклікалі аднойчы чалавечка
І загадалі: «Вось што, дабрадзей,
Да землякоў з Вілейкі, з Маладзечна
Ты звернешся па радыё праз дзень.

Нібыта быў ты ў партызанах доўга,
Нібыта здаўся сам — і вельмі рад...»
А з-пад Масквы ішлі па ўсіх дарогах
У наступ, аж чуцён быў гул гармат.

Ён зразумеў: ідзе, ідзе расплата,
Наважыўся схавацца, уцячы...
За горадам ля нечай чорнай хаты
Злавілі яго немцы уначы...

Хоць не зрабіў ніводнай
мужнай справы —
З людзьмі ён лёг у трасцянецкі роў.

...Мінаюць вёсны,
Зеляneюць травы,
А сын яго расце сабе, здароў.

У маці ён распытваецца часта
Пра бацьку: што ён думаў, што любіў.
І вочы хлапчука іскрацца шчасцем,
Што бацька партызанам храбрым быў...

А маці што?
Не па гадах старая,
Пакрыўджаная тым, пустым, навек,
Яму ўсё біяграфію стварае,
Каб толькі сын быў з верай чалавек.

*1956*

## ДЗІВАК

Працуе ў нас майстар, ну, проста дзівак,
Не можа хлапец ажаніцца ніяк:
І Зоя —
Не тое,
І Насця —
Не шчасце,
З дзяўчат не жадае нікога ўкрасці.
Сягоння — яму намякаем мы — танцы,
А майстар спяшыць як хутчэй развітацца.
Мы робім нядзельную вылазку ў лес,
Ды іншы у хлопца зусім інтарэс...
Ездзіць штогод ён то ў Ялту, то ў Сочы,
Там ён шукае дзявочыя вочы.
Потым пяе нам пра горы і мора,
Толькі пра справы свае не гаворыць.
Мы распыталі ў знаёмых таварышаў,
З кім там пад сонцам гарачым ты парышся...
Ходзіш, блукаеш паўднёвымі паркамі,
Часта знаёмішся з вуснамі яркімі.
П'еш, пэўна, з імі, цалуешся можа?
Ні сабе...
Нас гэта мала трывожыць...
Мы рыхтаваліся ў клубе да свята,
Майстар зайшоў,
Паглядзеў вінавата
І ні то весела, і ні то сумна
Вымавіў:
«Вось вы якія красуні!»
Быў ён узрушаны — я гэта бачыла
І, як магла, ўсё яму растлумачыла,
Што ў Насці
Ўжо шчасце,
А ў Зоі
Ўжо двое...
Што нам рабіць, шалапутны, з табою?
Будзеш век ездзіць — саб'ешся, сап'ешся...
Што ты глядзіш так?
Чаго ты смяешся?

*1956*

## ЗДАРЭННЕ Ў ГАСЦЯХ

Я ў госці запрошан да важнага чына.
Адмовіцца нельга — сусед,
Адказны таварыш, грунтоўны мужчына
І крышку, гавораць, паэт.

Пакуль за сцяною раўняліся чаркі
І дзвэнкалі ціха нажы,
Сусед паказаў, так сказаць, гаспадарку:
Карціны, крышталь, стэлажы.

Зашклёныя, моцныя шафы да столі
З радамі тамоў залатых.
Дзівіліся госці. Маўчалі прыстойна.
Хвалілі абодвух Талстых.

Я ж бачыў: ніхто кніг ніколі не кратаў,
Стаяць проста так, для красы.
Мне раптам здалося, што ўбачыў я краты
І вязняў пачуў галасы.

Забыўся аб такце, не ўспомніў аб чыне,
Крычу проста ў вочы яму:
— Які ж вы адказны?
Вы проста злачынец,
Зрабілі для кніжак турму.

І Пушкін, і Гогаль, і Горкі, і Чэхаў
Ірвуцца, як з камер, з паліц.
Вы што, смеяцёся? А ім не да смеху,
Іх сэрца аб волі баліць.

Студэнты Ясеніна том не дасталі,
Скажыце, навошта ён вам?
Вы ж вершаў ніякіх нідзе не чыталі,
Апроч двухрадковых рэклам.

Вы толькі на хвілю замкі адамкніце —
І рынуцца ў гушчу людзей
І Данко, і ў скуру апрануты віцязь,
Мяцеліца і Качубей.

Вы шчыліну толькі зрабіце — і хлыне
У сэрцы людзей «Ціхі Дон».
Як гэтыя кнігі патрэбны краіне!
А ён мне ў адказ: «Што за тон?

Ты што, можа, п'яны,
што ганьбіш мяне так?
Я грошы плаціў, брат, за іх.
Які ж будзе выгляд майго кабінета
Без шафаў дубовых, без кніг?»

...Начамі бяссоннымі сэрцы палілі
Стваральнікі сонечных кніг
Не дзеля таго, каб вы дома пылілі
Сваёй раўнадушнасцю іх.

Мірыцца з палонам дубовым не хочуць
Палкі навальнічныя слоў.
Патрэбны ім шчырыя сэрцы і вочы,
Людзей трапяткая любоў.

*1956*

## КАПІТАН ШАБЛОЎСКІ

Змагаліся і трацілі прытомнасць...
Аглушан Брэст. Разбіта цытадэль.
І белы свет для іх зрабіўся цёмным,
Як порахам задымлены шынель.

Над Мухаўцом замоўклі адгалоскі
Ад выбухаў. Нябёсы не гудуць...
Вядуць праз мост цябе ў палон,
Шаблоўскі,
Сяброў тваіх, дзяцей тваіх вядуць.

Маўчала жонка. Дочкі звалі: «Тата!»
Эх, жыць бы, жыць!
Але не скончан бой.
Бывайце!
У апошнюю атаку
Вяду байцоў.
І крыкнуў ён: «За мной,

Каго пячэ палону едкі сорам!» —
Ускочыў на парэнчы і на міг
Замёр над светам, над дзіцячым горам
І знік,
Павёўшы за сабой усіх.

Так з дочкамі Шаблоўскі развітаўся
У сорак першым годзе над ракой...
Радзіма, у вачах тваіх застаўся,
Як і ў вачах дачок, навек герой.

*1956*

## КВЕТКІ

Яшчэ трывожацца кабеты —
Ці хопіць масла — у чарзе;
Праблема добрага абеду
Шчэ многіх гаспадынь грызе;

І тої, не мае хто кватэры,
Яшчэ ўсё лае гарсавет...
А тут на вуліцах, на скверах
Запалымнеў вясновы цвет!

Хоць сёння шум быў як штодзённа,
Здалося ўсім — грыміць кругом
Чырвоны, сіні і зялёны,
Старадужны вясёлы гром.

І кожны стаў на міг паэтам,
І хваляй паплыло на нас
Такое светлае — ад кветак,
А з сэрца — цёплае ў адказ...

Умелі мы бясконца верыць,
Пакутаваць і галадаць,
Палі, шляхі і багны мераць,
І снег, і пыл, і дым глытаць,

Каб так вось ціха, чалавечна
Пасля пакут і бед усіх
Вачэй не зводзіць можа вечнасць
З мільёнаў светачаў малых.

*1956*

## РАДЗІМЕ

1

Гады падыходзяць да станцыі «Сорак»,
Мільгаюць стаптаныя пожні...
Аднымганаруся, а іншага сорам,
Радасна і трывожна.

Шумлівыя пушчы, празрыстыя воды,
Радзіма, любоў мая светлая!
Заслуга малая, што я аднагодак,
Я кропля твая непрыкметная.

Да крокаў тваіх я імкнуўся прымерацца,
Наперад не лезучы гвалтам.
Ты столькі сцярпела,
што проста не верыцца,
А колькі сыноў пахавала ты!

І гразь мясілі,
І ў бой хадзілі,
І ўладнай сіле
Радком кадзілі.

Я ведаў: жыццё — не пярына пуховая,
Ды верыў, што будзе лепей...
Нямала пачуццяў і думак пахавана
У сэрцы, нібыта ў склепе.

Не познім раскаяннем і не папрокам
Няхай прагучыць маё слова.
Нам лётаць высока, ісці нам далёка,
Вучыцца на праўдзе суровай.

Гады падыходзяць да станцыі «Сорак»,
А дзе ён, апошні мой вырай?
І сэрца адкрыта усмешкам і зорам,
І песні складаюцца шчыра.

Дзяўчына падмане —
　　　памучыцца сэрца ды сцерпіць,
Разыдзешся з другам —
　　　балюча, ды час перамеле;
А вось калі вера ў бацьку
　　　загіне у сэрцы —
На хвілю змярцвееш
　　　і чорнымі стануць прамені.
У хвілю такую
　　　слюнцяя ахопіць цявер'е,
Другога ў адчаі
　　　азызлыя п'яніцы спояць...
А восень страсае
　　　сваё залацістае пер'е
На боль, па раздум'е,
　　　на гэту маленькую споведзь.
Не страчаны мары.
　　　Хто кажа, што мы пастарэлі?
Мы сталымі сталі,
Мы проста душой падабрэлі,
Радзіма, не нам
У вялікім паходзе хіліцца,
Мы многа зрабілі,
　　　нам ёсць чым цяпер пахваліцца.
Ды толькі мы шчыра
　　　дамовімся сёння з табою —
Свае імяніны
　　　сустрэнем мы не пахвальбою.
Мы станем удвух
　　　пры дарозе ля белай бярозы,
Успомнім маленства,
　　　успомнім і радасць, і гора;
І ціха, ціхутка,
　　　каб з голля не падалі росы,
Пра нашы дарогі,
　　　пра заўтрашні дзень пагаворым.

*1956*

* *

Дзяўчына па садзе вячэрнім ідзе,
Забыўшы пра шум бармашыны.
І зоркі гараць у вачах і вадзе,
І ёсць для надзеі прычына.

Насустрач знаёмы. «Дзень добры, урач!
Не бачыў з мінулай вясны я.
Зуб мудрасці крышыцца,
                    проста хоць плач,
А гэты — глядзіце — не ные».

Гаворыць з натхненнем, нібы для ўрача
Няма больш прыемнай гаворкі.
Не бачыць, як сумна ў дзявочых вачах
Пагаслі вясновыя зоркі...

Шаноўны, дакуль жа ты будзеш лічыць,
Што гніль тая дзеўчыне люба?
Ёй хочацца зараз, павер, не лячыць,
А даць далікатна ў зубы.

У кожнага ёсць веснавыя гады
З вялікімі радасцямі і малымі.
Не лезьце у душы чужыя заўжды
З сваімі зубамі гнілымі.

*1956*

## ВЫСТАЎКА Ў ДАМАСКУ

Ноч сыпнула ў вокны зорак майскіх.
Гасне тэлевізар. Дрэмле сын.
Ну, а я увесь яшчэ ў Дамаску,
Чую ўсё арабаў галасы.

Выстаўка савецкая ў Дамаску...
Воклічы павагі і хвалы...
«Раскажы мне тоненькую казку,—
Просіць перад сном мяне малы.—

Толькі не пра тое, што у кніжках.
Быў ці не малым ты? — раскажы.
Што любіў — ірыскі ты ці «мішкі»?
Што табе куплялі, дзе ты жыў?»

Быў, сынок, малым я. А падросткам
Ля станка ў Бабруйску ўжо стаяў.
Цацкі з гліны меў я ды з бяросты.
Не, не еў тады ірысак я.

Быць галодным — хітрая нагрузка:
Спаць то спіш, ды сніш такую дрэнь,
Што пасля па вуліцах Бабруйска
Ходзіш, як пабіты, цэлы дзень.

Ходзіш, а па вуліцы галоўнай
Магазін красуецца «таргсін».
За вітрынай — рай і ежы поўна,
Толькі для гасцей з чужых краін

І для тых, хто золата і срэбра
Меў ці за марамі сваякоў.
Мы ў той час вылазілі са зрэб'я,
Племя маладых будаўнікоў.

Падмывала ўзяць у рукі камень,
Грымнуць па вітрыне пышнай той
З маслам, з залатымі ярлыкамі,
З каўбасой і белаю мукой.

Думаў, як абуцца, як адзецца.
А ўначы гулі, гулі пасы.
Марыў я: калі ж нам давядзецца
Паспытаць хоць конскай каўбасы.

Працавалі з храбрасцю юнацкай,
Формулы зубрылі на хаду,
Сёрбалі ў сталоўцы камбінацкай
Вегетарыянскую бурду.

Мы сябе абкрадвалі свядома
Ў строгія трыццатыя гады,
Каб раўлі ў Сібіры недзе домны,
Рыжай наглытаўшыся руды.

Лозунгі былі малой уцехай,
Горкі пыл аж скрыпаў на зубах...
Вось тады прыплыў да нас у цэхі
Хлебны пах, духмяны хлебны пах.

Ён прыплыў у сэрцы першай казкай,
Ён да нас без картачак зайшоў...
Выстаўка савецкая ў Дамаску!
Атамная станцыя і шоўк...

Знік даўно са слоўніка жывога
Ненавісны нам усім «таргсін».
Я гляджу ў задуме на малога,
Моцна спіць з другою казкай сын.

За акном сціхае горад. Позна.
Я ж заснуць чамусьці не магу...
А праз Мінск з машынамі у Познань
Цягнікі на выстаўку бягуць.

*1956*

* *

На пляцоўцы ў нас усё бывае,
Слухай ды за прэсаю сачы...
У студэнтаў дзевак адбіваюць
Тлустыя вучоныя сычы.

Ходзіць гэткі ў чысценькай манішцы,
Тройчы ўжо разведзены жаніх.
У яго кватэра і на кніжцы
Хітрая спакуса для дурных.

Ёй жа цяжка на Палессе ехаць,
Працаваць, падлогу мыць, раджаць.
І каханне замірае рэхам,
Сыч ідзе дзяўчыну праважаць.

Чорта з два яго ты палюбіла,
Падчапіў на іншы ён кручок.
Аблягае грудзі плацце міла,
Ды іскрыцца тонкі каблучок.

З каляіны хлопца здрада выб'е,
Ў нечым прысягне ён сам сабе,
Паўлітэрку з прыяцелем вып'е
І аб месяц чарку разаб'е.

Добра жыць, вітацца без пальчатак,
Хлеб свой есці...
Кропка. Так і быць.
Не пра вас, харошыя дзяўчаты,
Я пішу: сычам вас не адбіць.

*1956*

## СМЕЛАСЦЬ

Бязгрэшным пальцам грозна торкаць
І балбатаць пра прынцыповасць...
Пра што крычыш, вядзеш гаворку,
Каго бічуеш гнеўным словам?
Хоць фактаў ведае нямала,
Але запал адразу гіне —
Бяжыць трушком у цемру залы:
А што там я? Няхай другія!

Чытаць пра іншых фельетоны,
Чужых дзяцей за вушы дзерці,
А ад сваіх... паўсвету стогне,
Крычаць і свішчуць, нібы чэрці.
Скрозь заклікаць усіх з запалам
На цаліну, на багну ехаць.
А сам убок, а сам памалу
У цёплы кут, далей ад грэху.

Гартаць на сон аповесць сябра,
Штурхаць у бок спакойны жонкі
І абурацца: «Жвачка! Швабра!»,
Заснуць, падмяўшы тлум старонкі,
Рашыўшы ўсё сказаць адкрыта...
— Ну, як, чытаў? Давай ацэну!
— Цудоўна, друг! (Эх, я не крытык!)
Перарабляй хутчэй для сцэны.

І так: на дні збаяцца тройчы,
Разоў пятнаццаць памыліцца
І пазіраць сябрам у вочы,
Нібы на допыце ў міліцыі.
Раскаяўшыся, біць у грудзі
І спадзявацца баязліва,
Што ёсць і горш на свеце людзі,
А ён... ён проста нешчаслівы.

Куды падзелася ты, смеласць?
Не веру я, што знікла храбрасць.

Няўжо ў наш час яна здрабнела —
Твая... мая... і многіх сябраў?
Калі хто ў гэтым вінаваты,
Хай у сваіх прамовах бурных
Не ўспамінае пра салдата,
Што лёг грудзьмі на амбразуру.

*1956*

## ФУТБОЛ

Мінчан гарачэйшая палавіна
Да раніцы сніла трывожныя сны:
Заўтра, заўтра адбыцца павінна
Гульня на кубак вясны.

Зялёнае поле, грымоты авацый,
Вясёлае лета спартыўных трывог!
І ўрач, што ўсім раіў не хвалявацца,
Ад хвалявання вялікага злёг.

І вось надышла баявая нядзеля,
З міліцыі курыцца пара, як дым.
І кожны хлапчук безбілетны з надзеяй
Глядзіць, хоча сынам зрабіцца тваім.

Трыбуны запоўнены атамным гулам.
Статыстык жахнуўся б — страшэнная рэч:
Сарвалася дваццаць тысяч прагулак
І дзесяць тысяч патрэбных сустрэч.

Люблю я ў футболе юнацкую сілу,
Дакладнасць удараў, атак прыгажосць;
І нават злавесныя крыкі: «На мыла!»
І нават заядлых аматараў злосць.

Тут самы нясмелы і самы нядужы
Гукае: «Мазіла!» і стогне: «Не так!»
Сябе уяўляе ён дужым і мужным
Наперадзе смелых футбольных атак.

Скажу я сягоння насмешнікам посным:
Прыйдзіце хоць раз паглядзець на футбол.
Змятуць вашы кпіны балельшчыкі грозна
Адзіным вулканавым выбухам: «Гол!»

Захоплены ўсе разгарачаным рытмам.
Суддзя беланогі у чорных трусах,
Хоць тоўсты, а бегае хутка і спрытна,
Не ў крыўду будзь сказана, нібы рысак.

— Падножка! Падножка! —
з нястрымным запалам
Вядомы крытык, як бык, зароў.
Ён знаўца падножак. Ён сам нямала
Падножак зрабіў для сваіх сяброў.

Глядзіць нейкі дзядзька (ён тут выпадкова)
На гэтую лютасць, і рогат, і грук,—
І хоча сказаць ён прачулае слова:
— А ў нас не хапае рабочых рук.

Апошнія хвілі цякуць так марудна...
Свісток. 2—1. Мінск ад шчасця размяк.
Салідны прафесар на вуліцы люднай
Нагой падфутболіў якісьці камяк.

І толькі адны упраўдомы сумуюць,
І вокны ад страху дрыжаць да начы:
На кожным двары піянеры лупцуюць
Свае загартаваныя мячы.

*1956*

## СЛОВА

Вы бачылі змяле́лую раку?
Трывожны і нярадасны малюнак:
І рэчышча ўсё тое ж, і кірунак,
А бераг так далёка у баку

Ад трапяткой вады.
Зялёнай ціны след,
Пясок, жарства. І лозы недарэчна
Схіліліся над месцам тым спрадвечным,
Дзе бачылі свой стан, свой ліст,
свой цвет...

Васіль Гайдук, цябе мы, чорт, усе,
Гарачы палкавы наш агітатар,
Прамоў і песень баявых аматар,
Любілі ў прыфрантовай паласе.

Ты нашы думкі мог у нас узяць
І ў сэрцы зноў распаленымі кінуць.
Гатоў быў кожны з нас тады загінуць.
Каб ворага хутчэй скрышыць і змяць.

І ў час, калі, мажліва, ў соты раз
На наш рубеж каціўся вораг валам,
Салдат святое слова узнімала,
З якім звяртаўся ты тады да нас...

Мінула дзесяць год.
Цябе сустрэў
Я ў кіназале. Ты перад экранам
Паспешліва, крыкліва і туманна
Званіў пра нешта. Я не зразумеў.

Шуршэлі крэслы. Хтосьці чхнуў, і тут
Яму здароўя пажадалі дружна.
Ды да канца сваю прамову мужна
Давёў і знік кудысьці ў цёмны кут.

Я плюнуў на білет. Васіль Гайдук!
Дагнаў яго на нейкім скрыжаванні:

«З якой пары ты, браце, пры экране
Разводзіш несусветную нуду?

Ты можа захварэў крыху, браток?»
Пакрыўдзіўся: «Я лектар. Многа працы.
Праз паўгадзіны зноў. Мне трэ спяшацца.
Прывет!» — І знік у чэраве аўто.

Я болей не шукаў яго нідзе.
Хоць цень яго і мільгацеў усюды.
Бо чуў: Гайдук грабе чырвонцаў груды,
Зусім паграз у штампе і нудзе.

Шпаргалак пуд. Утульная тахта.
Званкі... Званкі... І просьбы, і заказы.
Прыемныя хвіліны каля касы...
Перакаваць? Па мордзе даць? Лухта!

Ён проста хлус. І, значыць, не яго
Мы чулі ўсе перад атакай слова,
Было гэта радзімы нашай слова,
Якое і вяло нас праз агонь.

*1956*

## ПРА ГЭТА

Зноў прыйшла ты, хвароба-разбойніца,
Б'е у скроні цяжкая кроў.
Не кладзіце мяне ў бальніцу
Да пахмураных дактароў.

Там адразу з парадамі вернымі
Чула схіляцца над табой:
— Не хвалюйцеся... Кепска з нервамі...
Зараз ваш супакоім боль.

Не ўступаючы у канфлікты,
Як давесці мне дактарам:
Нам не трэба спагады хліпкай,
Супакой не патрэбен нам.

Трэба, каб галава балела
За ўсе справы мацней у мяне,
Каб ад гневу сэрца смылела,
Калі хто раўне аб вайне.

Чытачы у мяне запытаюць:
Ты працуеш ці стаў ляны?
Як наш трактар жыве ў Кітаі,
Як там полацкія ляны?

Пад нагамі ў гісторыі круцяцца
Спекулянты, прайдохі, рвачы;
Людзі добрыя згарай труцяцца...
Тут не справіцца вам, урачы!

Тут такое штодня здараецца:
Людзі любяць, смяюцца, грашаць.
Можа з вершам маім параіцца
Пажадае чыя душа?

Тут не сунешся з кветкаю ў кадачцы.
Ім патрэбна праўда мая,
Так, як нехалі хлеб па картачцы,
Так, як дзень пераможны ў баях...

Можа кніжка мая уласная
І мяне па шчацэ сцебане.
Што ж, улічым... Тут справа ясная:
Напраўляцца натрэбна мне.

А то вунь — міністэрства культуры
Узнімае раз'юшаны гвалт,
Што рыфмаванаї макулатуры
Набліжаецца страшны абвал.

Ёсць і шэрая дрэнь — не спрачаюся,
Ды без панікі, дзеячы!
Я за нашых паэтаў ручаюся —
Заўтра песня званчэй загучыць.

А не дойдзе да сэрцаў слова,
Мы па прыкладу продкаў тады
На уцеху мужчынам гандлёвым
Самі скупім кніжак пуды.

*1956*

## БЫЎ ДЗЕНЬ ТАКІ...

Адвеялі буры ад роднага дома
Хлапца маладога.

Ляжыць ён маўкліва пад голлем сасновым,
Прыкрыты крылом груганowым.

Пяскі яго душаць,
Вятры яго сушаць,
Дажджы валасы варушаць.

Заходзіцца маці ад плачу, ад жалю:
Далёка зямля чужая.

Пайсці б пашукаць свайго сына па свету —
Не бачна і следу.

Ён спалены, след, да апошняй травінкі,
Да дробнай пясчынкі...

Не знаю, ў якім благаславёным штаце,
Ад мёртвага сына за колькі міль,
Ад гора горбіцца бедная маці,
І белы свет ёй зрабіўся не міл.

Так, бедная маці, як бедная тая,
Што ходзіць сядзібай сваёй, як у сне,
Дзе вецер попел сівы падмятае,
Дзе кожны камень прышэльца кляне...

Журботная маці заморскай зямлі,
Сачы гэтай мірнай часінай,
Каб буры ад дома не адмялі
Навекі апошняга сына.

*1956*

## ЛЯСНЫЯ ГАЛУБЫ

Вы чулі, як вуркочуць
Лясныя галубы?
Трымцяць асіны ціха,
Спакойна спяць дубы.

І ледзьве, ледзьве, ледзьве
Звініць высокі клён.
Заходзіць сонца мірна
За Несвіжскі раён.

І раптам, поўны ласкі,
Нібы малы ручэй,
Той голас галубіны
Ў душу тваю цячэ.

І ты успомніш нешта
І некага ў той час...
Фатографы на рынку
За дурняў лічаць нас.

Упруць гвалтоўна ў рукі
Вам пару галубкоў
З галінкамі, ялінкамі
І з надпісам «Любоў».

Пад галубкамі двое —
Прыгожыя ушчэнт,
Да моташнасці лютай...
Нахабны элемент!

Разбэшчаныя вусны:
Распусніца і хлюст.
Ад іх асоб падраных
Раздаўся лёгкі хруст...

Далей, далей ад рынку,
Туды, дзе спяць дубы!
Вы чулі, як вуркочуць
Лясныя галубы?

*1956*

# ЧАКАННЕ

Сады у радасным чаканні
Стаяць, пабракшы ад расы.
Хрыпяць прыглушана ў тумане
Варон сырыя галасы.

І ўся зямля, нібы прылазнік
Вясны і цёплай цішыні.
А першы шпак, як домаўласнік,
Глядзіць скептычна з вышыні...

Я многа скептыкаў пабачыў
З душой, спустошанай дatла;
У іх і нюх, і спрыт сабачы,
І боязь рэзкага святла.

Ледзь толькі што — яны адразу
Шукаюць хітра сто прычын...
Прабач мне, птушка, за абразу:
Ты тут, як кажуць, ні пры чым.

Давай удвух сустрэнем ранне
Сярод туманнай сівізны.
І я стаю, стаю ў чаканні
Празрыстай, сонечнай вясны.

*1956*

* *

Трэснула, грукнула, грымнула з покатам,
Хлынула цёплае неба на дол.
(Вось і сімфонію слухаем, покуль там
Творцы сядзяць над музычнай нудой.)

І бліскавіцы без нудных лічыльнікаў
Суткі ўсхвалёвана паляць сябе.
(Прыстасаванцы хаваюцца ў шчыліны,
Слоп кабінетны трывожна сапе.)

Травы ачысцяцца, дрэвы памыюцца,
Лівень не зломіць іх — стануць дужэй.
(Кажуць, што крытыкі больш не памыляцца,
Бог беражонага не зберажэ.)

Я навальніцы люблю ачышчальныя,
Што праціпаюць да донца душы.
(Кажуць, не прымуць больш касы ашчадныя
Ў сейфы свае махляроў барышы.)

Смолкай маланкай пупышкі палушчаны,
Свежа і зелена. Ясныя дні.
(Кажуць, што заўтра усе алілуйшчыкі
Выступяць супраць сваёй балбатні.)

*1956*

## ПІРАТ

Жыў за морам капітан заморскі,
Самы далікатнейшы пірат,
І да нашых земляў чарнаморскіх
Прыплываць штолета быў ён рад.

Сустракалі, пацiскалі рукі
І вялі з наіўнай пахвальбой
То ў музеі, то ў палац навукі,
То на стадыён зялёны свой.

І пакуль там грузчыкі грузілі
Марганец ды іншую руду,
Ён любіў хадзіць па магазінах,
Дорачы усмешкі на хаду.

Ён купляў дзяружныя кальсоны,
З пражкамі стальнымі паясы,
Плацці звышжахлівага фасону,
Цацкі ідыёцкае красы.

Каля добрых рэчаў бровы хмурыў
Гэты пазалочаны марак.
Прадаўшчыцы думалі — прыдурак:
Не бярэ ніхто ў нас гэты брак.

Капітан, вясёлы хітры вораг,
Жэр ікру ў каюце між сяброў
І адвозіў кожны раз за мора
Ганьбу шырспажываўскіх майстроў.

У яго там, дома, быў музейчык:
Абразы, матрошкі, самавар.
У яго там, дома, рогат нечы
Чуўся, як вяртаўся гаспадар.

Над вадой і сушай дні ляцелі,
І аднойчы з рэйсу не прывёз
Ён нічога.

— Што там, апусцелі
Крамы ці спаліў усё мароз?

Я не чуў ягонага адказу,
За яго я дам адказ такі:
Дзень у дзень касіршы ў нашых касах
Выбіваюць чэкі ў дзве рукі.

Дзе цяпер ён? Можа сціпла ў Бірме
Кіпці ад нянавісці грызе?
Капітан, на ўцеху нечых фірмаў
Больш мы не папоўнім ваш музей.

*1956*

* *

То з Алма-Аты, а то з Дуброўніка
Я табе, любімая, пішу.
Прымірыцца з прагаю вандроўніка
Я цябе, любімая, прашу.

«Ёсць яшчэ распусніцы прывабныя»,—
Чуеш ты суседак галасы.
«Ёсць яшчэ
з ільвінай хваткай бабнікі»,—
Мне хрыпяць прапітыя басы.

Не зважай, як я, на плёткі іхнія,
Што нам цёмны пыл той ды туман.
Паміж намі толькі рэкі ціхія
І нікога іншага няма.

Далямі навекі завярбованы,
Я спяшу пад колаў перастук
Да цябе, да вуснаў нефарбаваных,
Да тваіх ласкавых, чэсных рук.

Сэрца і тугой, і сонцам поўнае,
І жыццё — цудоўнейшая рэч!..
Цяжка б захаваць было любоў маю
Мне без расставанняў і сустрэч.

*1956*

* *

Лівень.
Мыюцца трохтонкі,
Сіні пыл — на ўсе бакі.
І сядзяць, грызуць антонаўкі
На ганку дружбакі.

Дождж прасторы паласуе,
Ручаі ажно гудуць.
Пра якуюсьці красуню
Хлопцы гутарку вядуць.

«Што за стан яе дзявочы!
Ўсё аддам, каб прыгарнуць.
Ну, а вочы... Бачыў вочы?
Так і хочацца нырнуць».

«Вось такая сэрца спаліць,
Бо на травах, далібог,
Росы белыя ўскіпаюць
Ад яе гарачых ног...»

Я падслухаў выпадкова
І жаданне, і тугу;
І забыць цяпер іх словы
Пра дзяўчыну не магу.

Прыгажуняў сустракаю,—
А у нас іх, верце, шмат —
Проста мука: ну, якая
Прыдалася ім з дзяўчат?

Можа, гэта, можа, тая...
Хоць пакліч іх на мурог,
Каб зірнуць, як ускіпаюць
Росы белыя ад ног.

*1956*

## ТОСТ ЗА ПАЛЯРНІКАЎ

Новы год скрыпіць марозным полазам,
Зорны пыл цярушыцца па снег...
Сёння ноччу на абодвух полюсах
Аніхто, напэўна, не засне.

Тут штодзень у звычным тлуме варышся
Між будзённай працы ды званкоў...
На ільдзінах плаваюць таварышы,
На хрыбтах начуюць ледніковў.

Недзе там на поўдні і на поўначы
Сёння за здароўе ўсёй зямлі
Два паўшар'і, як дзве чары поўныя,
Нашыя палярнікі ўзнялі.

Чокнуліся звонка, з добрай шчырасцю,
Аж экватар медны загудзеў...
Колькі іх народ наш здолеў вырасціць,
Смелых і няўрымслівых людзей!

Там, дзе гаснуць зоркі Шляху Млечнага,
Навучыла іх пурга цаніць.
Хлеба смак і словы чалавечыя,
Ласку цішыні і цеплыні.

Ды не ўседзець ім на цёплых месцах
Пад крылом зацішнае зары.
Жыхарамі першымі на Месяцы
Будзе нехта з вас, мае сябры!

Свет падперазаны зорным поясам,
Месяц свой заняў высокі пост.
Я за вас, таварышы на полюсах,
Падымаю сёння шчыры тост!

*1956*

* *

Недзе салавей пяе ў дуброве.
Недзе рэжа хвалі цеплаход...
Кніга вандраванняў і любові,
Я пішу цябе з юнацкіх год.

Вандраваць пачаў я над Бярозай
Пад гамонку ціхую лясоў.
Радугі стаялі ў вербалозах
Між птушыных светлых галасоў.

На капе ляжаў да зорак тварам,
Пра краіны казачныя марыў.
З той пары, з начэй тых задуменных,
Мне здаецца, зоркі пахнуць сенам.

Як даўно было ўсё гэта...
Зараз
Коцяцца клубкі дарог за мной
З тлуму тэгеранскага базара
І ад цішыні фінляндскіх хвой.

Бачыў шмат —
І Эйфелеву вежу,
Спёку Рыма і Эльбруса лёд.
Тысячы зямных дарог і сцежак
Праз мяне прабеглі навылёт.

Думаў я, малы, калісь з трывогай,
Як да рэк славутых мне дайсці.
Праплылі праз сэрца Дон і Волга,
Сена і Дняпро, Дунай і Цібр.

Я стаміўся ездзіць і здзіўляцца
(Хоць, прызнацца,
Ёсць на што глядзець).
Беларусу і ў Парыжы сняцца
Белізна бяроз і сосен медзь.

Я чужой зямлі не зычу ліха.
Гід, канчай, над вухам не трашчы!
Ліцеся сягоння ціха, ціха,
Родныя зялёныя дажджы.

Ясна ўсё.
І сам сабе кажу я:
Працаваць, пакуль хапае сіл,
Тут, дзе нерашытыя кашулі
З бацькавых плячэй малым насіў.

Салавей пяе ў маёй дуброве,
Растрывожыў песняю душу...
Кнігу вандраванняў і любові
Між лясоў я родных дапішу.

*1957*

## ЦАГЛІНА З ДОМА ПАЎЛАВА

Яе прывезлі слаўныя майстры
З вялікай Волгі, з горада герояў
Для Беларусі, роднае сястры,
Гарачай будаўнічаю парою.

Той момант сэрца кожнага крануў —
Наш добры госць,
з харошым тварам муляр,
Умураваў цагліну у сцяну,
Каб новы дом віхуры не садзьмулі.

Замоўк на міг шумлівы горад мой,
І сонца засвяціла ярка, ярка,
Калі рука злучылася з рукой
У поціску, як дружбы нашай арка...

Заселены даўно высокі дом.
У хвілю вольную ці як агорне скруха,
Вясной і восенню, і раніцай і днём
Адведаць я люблю яго, як друга.

Расхопяць вокны золата зары,
Гудкі, каго патрэбна ім, паклічуць,—
І ў гэты час выходзяць жыхары
З рабочым заклапочаным абліччам.

Прыйду пазней — другі,
больш чынны лад,
Машыны тут спыняюцца з разгону...
Жыве наш дом!
І я ад сэрца рад
Яго гамонцы, песням, смеху, звону.

І сочыць рэўнасць смешная мая,
Каб жыхары жылі тут бездакорна:
Дом Паўлава над Волгай бачыў я,
Дом Паўлава — паранены і чорны.

Хачу, каб не забылі тут яны
У тлуме быту, у турботах працы
Далёкі гул і блізкі гул вайны
І поціск рук мінчан і сталінградцаў.

Я б шыльду залатую тут прыбіў,
Каб памяць абыякасці пазбегла;
Я дзецям бы ўсе вушы пратрубіў,
Якая ў іх сцяну цагліна легла.

Хай непагадзь, хай град у твар, хай гром,
Не стоміцца мой верш
звінець і радзіць,—
Каб бераглі свой дом, свой светлы дом,
Як Паўлаў свой бярог у Сталінградзе.

*1957*

* *

Яшчэ ніводнай веснавой прыкметы,
У дрэў і птушак ледзяны настрой.
Падзьмуць вятры — і снежныя каметы
Пранясяцца над белаю зямлёй.

І толькі у адной прасторнай хаце
Зімы ні следу — тут цвіце вясна:
У бэзавых, ружовых, сініх плаццях
Дзяўчаты найслаўнейшага звяна.

А звеннявая па ільну, здаецца,
Сама з ільну з'явілася на свет:
Кужэльная каса ў яе віецца
І вочы сінія, як той ільняны цвет.

І нешта горача, і нешта навукова
Гаворыць аб ільне і аб вясне...
А ў куце хлопец, ён тут выпадкова.
Яна не-не ды ў бок той пазірне.

Хаваюць пад далонямі усмешкі
Сяброўкі...
Хлопец моліцца: «Хутчэй!»
Шукае ён не ў лён, а ў сэрца сцежку
І тоне ў сіняве яе вачэй.

*1957*

* *

Лясы нырнулі ў хмары шэрыя,
Прыкрыўшы голлем птушанят.
А ты смяялася, не верыла,
Што будзе дождж, што будзе град.

Углыб, углыб усё імчалася
І за сабой мяне вяла;
Хавала вочы і смяялася
І нейкай дзіўнаю была.

А гром рыкаў ужо раз'юшана
За кожнай елкай і сасной.
І прашаптала ты узрушана:
«Што ж нам рабіць, харошы мой?»

А елка хітрая і цёмная
У сховішча пазвала нас.
Я вочы цёмныя, бяздонныя
Так блізка ўбачыў першы раз.

Завесілі нас ліўні белыя,
Загінуў свет, дарог няма.
І да мяне, заўжды нясмелая,
Ты прыгарнулася сама.

Стагналі дрэвы мнагарукія,
Ламаўся з грукатам прастор,
І сэрцы ў лад грымотам грукалі,
І бліскавіцы seклі бор...

Забуду ўсё: сяброў і вершы я,
Ды зберагу да скону дзён
Гарачых вуснаў шчырасць першую,
Ігліцы пах і ліўня звон.

*1957*

## ДАРОГА Ў ЗАКАРПАЦЦЕ

*Петрусю Броўку*

1

Ад ціхай Прыпяці, ад Сожа
Мы па Дняпры плылі не раз
Да Днепрагэса, Запарожжа;
Не раз адведалі Данбас.

І нам да самай дробнай рыскі
Знаёмым, родным Кіеў стаў,
Дзе сам Максім Тадэіч Рыльскі
Нам вершы дзіўныя чытаў;

Дзе песні звонкія Малышкі
Краналі шчырасцю сваёй;
Дзе нам сябры дарылі кніжкі,
Што пахлі стэпам і вясной.

І мы ўжо думалі, што знаем
Зямлю цудоўную братоў,
Пакуль не ўстаў за небакраем
З высокім імем горад Львоў.

Здзівіў ён нас красою строгай,
Кіпеннем паркаў і садоў.
Тут крыжаваліся дарогі,
Тут бачна шмат чужых слядоў.

Яго ірвалі злосным біўнем
І польскі пан і Ватыкан,
Вось тут загінуў незабыўны
Наш мужны друг, наш брат Галан...

Ажыў у сэрцы з новай сілай
Бяссмертных вершаў гнеўны жар,
Калі прыйшлі мы да магілы,
Дзе спіць вялікі каменяр.

І не маглі мы не праехаць
Туды,
дзе нарадзіўся ён;
Дзе і па сёння носіць рэха
Ягоны голас,
нібы звон.

Навек Франка злілася слава,
Агонь нягаснучых радкоў
З рабочай славай Барыслава,
Са светлым лёсам землякоў.

І на яго святой сядзібе,
Дзе час аб ім легенды звіў,
Пяць груш і яблынь пасадзілі
Мы ў гонар дружбы і любві.

І пастаялі ў задуменні,
І пажадалі без прамоў,
Каб прырасло мацней карэнне,
Як наша прырасла любоў

Да гэтых ніў, да гэтай хаты,
Дзе мы ў гасцях з табой былі,
Да вольных сонечных Карпатаў,
Да украінскае зямлі.

2

За Стрыем хмары на горы леглі,
У Закарпацце дарога бегла.

Пад хмары бегла, круціла петлі,
Туман курыўся з цяснін няветлых.

Наўкол смугою лясы спавіты,
Чуцён здалёку напеў трэмбіты.

На перавале кастры гарэлі,
Нас хлебам-соллю браты сустрэлі.

Браты, што многа спазналі гора,
Што вызвалялі з няволі горы.

Нас частавалі шчыра, ад сэрца,
Печанай бульбай з брынзай і перцам.

О, Верхавіна, свеце мой мілы,
Маё ты сэрца запалаліла.

Ў палон забрала, зачаравала
У сініх горах на перавалах.

А ў Закарпацці гуляла сонца,
Сок вінаградны цёк па старонцы.

Ён цёк, гарачы, і ў нашых жылах,
І мы спявалі: свеце мой мілы!

Якія сэрцы, якія людзі!
Тут раз пабудзеш — век не забудзеш.

Сякуць хваіны — аж ходзіць рэха,
Плыты ганяюць па быстрых рэках.

А на далінах пшаніцу сеюць...
Карпаты ў далях для ўсіх сінеюць.

На Верхавіне і ў Закарпацці
У кожнай хаце цяпер багацце.

Хто ходзіць сумны з душой іржавай,—
Паедзь, паслухай песні Іршавы.

Адразу знікне настрой паганы,
Як заспяваюць чатыры Галі...

У снах так часта цяпер я бачу
Адной гуцулкі пагляд гарачы;

Карыя вочы, сінія горы,
Быстрыя рэкі, ясныя зоры.

*1957*

## РАДУГІ

Як многа сёлета цвіло над Мінскам радуг,
Яны пакінулі вясёлых шмат слядоў
На гронках арабін, на клумбах і на градах,
У вокнах і вачах, і між садоў.

А колькі сёлета прыбавілася зорак
На небе і зямлі...
Мой родны край,
За гарады свае табе не сорам,
Не сорам за нялёгкі ураджай.

Бензіну пах і яблык водар тонкі
І цёплы дождж змяшаліся кругом.
І мінскія саракатонкі
Сваім рыканнем глушаць позні гром.

І вадаспады залатога зерня
Шумяць на ўсіх таках маёй зямлі...
З дарогі шчасця мой народ не зверне,
Ён верны сын савецкае сям'і.

Нікому дружбы нашай не парушыць!
Сягоння добра знае цэлы свет,
Што над шляхамі пералётных птушак
Праклалі шлях мы для сваіх ракет.

І голас падае наш спадарожнік,
То — нашых мар высокіх — першы крок.
І спакайней стаў дыхаць свет трывожны,
І хтось не змог націснуць на курок.

Ім страшна, страшна,
атамным злачынцам.
А нам і ўвысь, і ўглыб, і ўдаль ісці...
Мы Леніна чыталі пры лучынцы,
Каб радугі маглі цяпер цвісці.

*1957*

## АДРАС ДРУГА

Паміраў у санбаце наш друг дарагі,
Ён ведаў, што памірае.
Паклікаў голасам, поўным тугі,
Сяброў з пярэдняга краю.

І перш чым сэрца замоўкнуў стук,
Аддаў ён таварышам з роты —
Аднаму партсігар, другому муштук,
А мне свой адрас і фота.

У вёску яго не хадзілі лісты:
Стаяла яна па-над Бугам...
А потым і Буг перабраўся ў тыл,
І волю трэ выканаць друга.

Лягчэй у баі цэлы месяц мне быць,
Чым сёння пастукацца ў хату,
У матчыным сэрцы надзею забіць,
Стаяць і маўчаць вінавата.

Я самую доўгую выбраў з дарог,
Ды вунь каміны ўжо дымяцца...
Вайна, вайна...
О, не дай вам бог
Прыйсці замест сына да маці.

*1957*

* *

Дым. Агонь. Руіны і гібель.
Уяві ты сабе і ўцям:
Ізраіль напаў па Егіпет,
Яўрэі бамбяць егіпцян.

Ты яўрэй.
Мы ў мястэчку з табой пражывалі,
І нашыя ціхія маткі
Нам да штаноў прышывалі
Аднолькавыя латкі.

І на фронце з табою мы разам былі,
І адною нагою стаялі ў магіле.
Мы хавалі сяброў,
Мы фашыстаў клялі
І апошні сухар напалам дзялілі.

Акупанты на танках людзей раздзіралі,
Гнілі блізкія нашы ў аднолькавай яме:
Гестапаўцы не разбіралі,
Хто іудзеі, а хто хрысціяне.

Мы аддана служылі і не варажылі,
Скосіць нас смерць ці не скосіць.
У зямлянках салдацкіх тужылі
Ты аб Фані, а я аб Зосі...

Дым. Агонь. Руіны і гібель.
Уяві сабе гэта і ўцям:
Ізраіль напаў на Егіпет,
Яўрэі бамбяць егіпцян.

Што гэта? Яўрэйскае вераломства?
Я не веру ў чарнасоценныя анекдоты.
Але за нападам прыходзіць помста,
І маткі рыдаюць потым.

Не. Там, відаць, не яўрэі
І не выхадцы з гета.
Гэта Ракфелер звярэе,
Долар звярэе гэта.

Друг мой, ты ўмееш пісаць па-яўрэйску,
Напішы братам у Ізраіль,
Як калісьці на фронце — гнеўна і рэзка,
Што ты думаеш
аб Бен-Гурыёнаўскай зграі.

*1957*

## АБЕЛІСК

І нашто ў эфір было мне лезці,
І каму пісаць цяпер пратэст?
Верш чытаў паэт над Рэйнам дзесьці
Голасам скрыпучым, як пратэз.

Захліпаўся, выў, хрыпеў і плакаў,
Што прыйшлі трагедый чорных дні:
Пралятаюць мёртвыя сабакі
Над зямлёй у зорнай цішыні.

Так і мы — сіпеў ён — будзем лётаць
У сталёвых трунах з веку ў век.
Першы пастаўшчык касмічных плётак.
Хто ён?
Не паэт, не чалавек!

Выключыў прыёмнік я са злосцю:
Змоўкні, напалоханая тля!
Да планет збіраецца у госці
Цёплая савецкая зямля.

Сёння мы герояў адзначаем.
Свет стары, нам бомбай не гразі!
Захлынайся, Далес, у адчаі,
Сталь гармат у лютасці грызі.

Болей нам не здасца прорвай чорнай
Зоркамі засеяны сусвет.
Слава інжынерам і вучоным,
Што праклалі ў космас першы след!

Слава шахтам, руднікам і домнам
І рукам тваім, рабочы клас!
Пад савецкай зоркаю цудоўнай
Падужэў і вырас кожны з нас.

Вы зрабілі мару явай блізкай,
Кожны з вас і творца, і герой.

Ваша слава ўстане абеліскам
Над Масквой і над усёй зямлёй.

Чалавецтва, грымі зорным маршам!
Будучыні шлях ясней відзён.
Веру я, што хутка кветкі з Марса
Мы да абеліска ўскладзём.

*1957*

## З ЯНКАМ КУПАЛАМ

І хвалы ў жыцці нам перапала,
І схілялі часам галаву...
На вясёлай вуліцы Купалы
У высокім доме я жыву.

Клён сваёй вяршалінай зялёнай
Да акна майго не дастае.
Кнігі зіхацяць з паліц зашклёных,
Мэбля хваліць якасці свае.

Век жыві спакойна ды разумна.
Не, не так. На сэрцы — неспакой:
Пішам пра сучаснікаў мы сумна —
Траскатня ці жвачка са слязой.

Гэта лёгка вершыкі з рыданнем
Напісаць пра смерць і лес глухі
Ці забрацца ў казкі і паданні —
Тут беспамылковыя шляхі.

Наш герой цяпер не ў цёмным лесе,
Трэба новы вобраз і настрой.
Б'ешся, б'ешся, а ў радок не лезе
Нават самы просценькі герой.

Ён-то просты, ды складанеї тэма —
У якую мы забеглі даль!
Беларускі хлопец ля мартэна
Чарадзеем ходзіць, варыць сталь.

А далей глядзі — дзяўчаткі тыя
Дваццаць вёснаў ходзяць па зямлі,
А ўжо іх рукі залатыя
Больш паловы Мінска узвялі.

Пэўна, рана мы сябе запёрлі
Паміж кніг; і з вёсак, дзе раслі,
Рана збеглі; рана атраслі
З ботаў пыл... І вязне песня ў горле.

Я жыву на вуліцы Купалы,
І яго таполя мне відна.
Ён пісаў з нягаснучым запалам
Да апошняй іскаркі, да дна.

Вечна ў руху.
Жартаваў заўсёды:
«Пад ляжачы камень не бяжыць...»
Ён з народа выйшаў, жыў з народам
І ў народзе вечна будзе жыць.

А у нас пра наступ ды пра росквіт
Вершы льюцца шэраю ракой...
Адшукаю сцежку да бярозкі,
Выцякае Прыпяць з-пад якой.

Зноў пачну адгэтуль...
Крокам сталым
Хай ідуць цяпер за днямі дні.
І са мною будзе сам Купала —
Мудры і суровы праваднік.

*1958*

* *

Нам грозяць вадародным богам
І атамнай атрутай.
А мы раскроім цёплы бохан,
Пасолім лусты крута.

Бярыце ўсе цыбулі долькі,
Гуркі ды памідоры.
Бо выпіць з толкам можна толькі
Над рэчкаю ля бора.

Ханжа заные: «Зноў аб чарцы,
Аб прадзедаўскім хлебе!
Вунь спадарожнікі імчацца
Навыперадкі ў небе».

Мы за прагрэс душой і сэрцам,
Яго мы творцы самі.
Ды хай жывуць і юшка з перцам,
Баравікі на сале!

Хвала зямлі і высям зорным
Па простай той прычыне,
Што мы не лішнія шасцёрні
У дарагой Айчыне.

Нас абавязвае эпоха
Суняць шаленцаў лютых,
Каб жыць і кроіць цёплы бохан
Без атамнай атруты.

*1958*

## ВЯСНОВЫЯ МАТЫВЫ

Змыла сонца ўсюды снег іржавы,
Рамантуюць вуды рыбакі.
Як змяніўся горад,— разважаюць
Першыя вясновыя шпакі.

А начальства звоніць: «Слаба, слаба...
На кватэрным фронце — паднажаць!»
За чубы хапаюцца прарабы,
Лаюцца, па-зімняму дрыжаць.

Толькі знае крытык адмысловы,
Дзе там тэмпы добрыя узяць:
З незашклёных вокан, як з паштовак,
На вясну тынкоўшчыцы глядзяць.

Што ім да начальніцкай праборкі!
Закаханы ўсе тут да адной.
Ноччу ходзяць парамі ўсе зоркі,
А Палярнай зоркі не відно.

Хмурань бровы грозныя дэканы,
Ім трывогу цяжка утаіць:
Зблыталі студэнты нечакана,
Дзе Белград, дзе Белгарад стаіць.

Кружацца шпакі ля тэлевышкі,
Хочацца ім выступіць хутчэй.
А за Мінскім морам у зацішку
Сонца ўжо дыван зялёны тчэ.

*1958*

* * *

Мы з Пятрасам Цвіркам
Ваеннай зімой адвячоркам
Хадзілі ў Маскве
І націху размовы вялі
Аб зводках трывожных,
Аб стратах, журботных і горкіх,
Аб катах праклятых,
Аб нашай далёкай зямлі.

— Буслы нам прыносяць
Пагоду і першыя кветкі,
Над Нёмнам дубровы
Ператвараюцца ў рай,—
Расказваў Цвірка
Пра рэкі Літвы і палеткі.
Я ж думаў, што Пятрас
Гаворыць пра родны мой край.

А я пра сваё —
Пра азёрную сінь ды суніцы,
Пра песні за рэчкай,
Пра восень, што паліць ліству,
Пра плач жураўліны,
Пра звон серабрысты крыніцы...
А Цвірка смяяўся:
— Гаворыш ты, брат, пра Літву.

А потым мы мірна,
Як водзіцца ў добрых суседзяў,
Да згоды прыйшлі,
Што у рэках адна ў нас вада;
Што нашыя маткі
Гаруюць аднолькава недзе,
Што доля адна ў нас,
І радасць, і нават бяда.

Зара адплывала у змрок,
Як падпалены ветразь.

О, як мы хацелі
Ляцець на радзіму за ёй...
У сэрца маё
Увайшоў ты з часіны той, Петрас,
З маскоўскай зарой
І з цудоўнай літоўскай зямлёй.

*1958*

* *

У акенца тваё
Я пастукаў зязюльчыным ранкам
Пасля салаўінага вечара
І перапёлчынай ночы.
Вока тваё, як зорка,
Бліснула з-за фіранкі:
Хто там?
Хто ты?
І чаго ты хочаш?

Я мог бы выдумаць,
Што я славуты наватар,
Цаліны пакарыцель
Ці майстра футбола.
Але быў салаўіны вечар,
І прытварацца не варта.
Стаю, які ёсць,
Перапоўнены радасным болем.

Магчыма, я цір,
Куды кожны
Можа забегчы і выстраліць
Куляй насмешкі
Ці шротам грубасці.
Я магу даць здачы
І ў дадатак выстраіць
Перад табою ўсе воблакі
Ад вялікай любасці.

Магчыма, гара я,
Што нярэдка горбіцца
Ад адзіноты і смутку.
Пра гэта здагадваюцца
Вельмі і вельмі нямногія.
Я хачу цябе вывесці
З-за гэтых акенцаў мутных
І светлым ручаем
Абмыць твае ногі.

Мае адбіткі ты знойдзеш
На акіянскай хвалі
І ў налітым вадою
Следзе ад капыта.
А сёння я ў вачах тваіх,
Што сто год мяне хвалявалі,
Хачу пасяліцца
І ні пра што, ні пра што не пытаць.

Ды толькі не магіла,
Не, не магіла я;
Вянкі з жалобнымі стужкамі
На мне не ляжаць.
Нават калі прагоніш,
Я цябе не пахаваю, мілая,
Толькі зоркі і травы
Ад крыўды глухой задрыжаць.

І больш ты не ўбачыш ніколі
Маёй прыгорбленай постаці.
Вось і ўсё.
Адказвай.
Не бойся: я не ўтаплюся ў стопцы...
Ты соладка пазяхнула,
Аж хруснулі маладыя костачкі.
— Гэта занадта.
Для мяне хапіла б і добрага хлопца.

*1958*

## ЗААКІЯНСКІ ЛЯМАНТ

Крычалі: Саветы адсталі,
Расія — белая пляма.
А сёння з заходніх даляў
Я чую інакшы лямант:

Што мы завалодалі небам
І адурманілі масы,
Што мы наступаем хлебам,
І малаком, і маслам.

Камуністычная гідра!
Як жа не хвалявацца:
Ойстрах падстроіў хітра
У Нью-Йорку выбух авацый.

Тут не пазбавіцца дрыжыкаў
Нават у цёплых пярынах:
Курс паніжаюць на біржы
Рускія балерыны...

У Вашынгтоне ад гневу
Шалее атамны містэр:
Бельгійская каралева
Зрабілася камуністкай.

Мы спачуваем магнатам,
Доларавым дыпламатам
З розных СЕАТА і НАТА,
Што ставілі стаўку на атам:

Нервы свае палячыце,
Нашы рады палічыце.
А не палечыце,
А не палічыце —
Смерць не на нас,
На сябе вы наклічаце.

*1958*

## ТРЫВОЖНЫЯ ЗАРНІЦЫ

Арктычныя прасторы
разбуджаны злым пошчакам,
Аж белыя мядзведзі
у трывозе зараўлі:
Лятуць бамбардзіроўшчыкі,
лятуць бамбардзіроўшчыкі
З пякельным грузам бомбаў
да нашае зямлі.
Бяруць разгон з Грэнландыі
і крадуцца з Аляскі,
Цягнуць за сабою
рэактыўныя хвасты.
Лятуць дурныя лётчыкі,
каб з нечай чорнай ласкі
Між мірам і вайною
спаліць усе масты.
Пакуль шчэ не засеклі
налётчыкаў радары
І грозна, насцярожана
стаяць страі ракет,
Пакуль у слёзах вогненных
зямля не зарыдала,—
Павінны ў звон трывожны
мы біць на цэлы свет.
О, як бы мне хацелася
ва ўсе пастукаць сэрцы —
Да фермера і клерка,
шафёра і ўрача:
То ходзіць не над Арктыкай —
над вамі прывід смерці,
Пара зямлю ад гібелі
сумесна выручаць.
Забыўшы на прыстойнасць,
хачу ўрывацца ў спальні,
Будзіць людзей ачмураных,
крычаць ім: «Годзе спаць!
Вы ўжо амаль што мёртвыя,
вы ўжо амаль што спалены,

Ільды маўклівай поўначы
і тыя не маўчаць».
І вам скажу, шаноўныя
паны інтэлігенты:
Даволі аб свабодзе вам
наіўна лепятаць.
Няўжо яшчэ вы верыце
ў хлуслівыя легенды?
Адкуль такая страшная
тупая слепата?
Трывожныя зарніцы
ўжо бліскаюць між хмарамі,
Праз дзень злічыць не здолеем
мы незваротных страт.
У параўнанні з новымі
шалёнымі пачварамі
Мізэрным хуліганам
здаецца Герастрат.
Нанятых правакатараў,
гаспадароў іх морганаў,
Пакуль яшчэ не позна —
за краты засадзіць!
А спознімся — і многія
краіны стануць моргамі;
Не будзе там каму судзіць
і тых, каго судзіць...
Лятуць бамбардзіроўшчыкі...
І проста нам не верыцца
Пры нашай добрай шчырасці,
пры ззянні мірных зор,
Што нехта з прагавітасці
у хваленай Амерыцы
Зямлі сваёй падпісвае
смяротны прыгавор.

*1958*

## ДЗЕД

Мяне набудзіў перад золакам дзед:
— Хадзем, паглядзім на зажынкі.
І вось ён з кіёчкам у поле ідзе
Перада мной па сцяжынцы.

А жыта забегла аж за небакрай,
Нібы на прасторнай Кубані.
Калгасныя хлопцы збіраць ураджай
Сюды скіравалі камбайны.

Дзед вочы прыжмурыў: — А дзе мой загон,
Цяпер не знайду і не варта...
Забыўся старэнькі, як некалі ён
Трымаўся за шнур свой упарта.

— Памру — не аддам! — ён крычаў,
ледзь не роў,
Нязрушны і цёмны, як шула.—
Ніколі са зрэбных не сшыць рызманоў
Адну на ўсе плечы кашулю.

Ён ноччу прыходзіў у цёмны свой хлеў
Каню расказаць пра свой боль, пра свой гнеў.
У цёплыя губы скарыначку пхаў
І сам уздыхаў,
І конь уздыхаў...

А сёння, на схіле натруджаных год,
Стары больш пра смерць не гаворыць.
І ліжа сумленныя рукі яго
Жытнёвае цёплае мора.

*1958*

## ПТУШЫНЫЯ ГАЛАСЫ

Птушкі маюць індывідуальныя галасы,
Пяюць і не замінаюць адна адной.
Ад іх песень і сонца аж млеюць лясы,
І пафарбаваная пад дзятла вясёлка
Выгінаецца горда дугой.

І калі не хапае якога голасу,
Пачынаюць трывожна звінець
Асін серабрыстыя грыўні.
Хочацца птушку паклікаць голасна:
Зашчабячы, заспявай, грымні!

Гэтыя шчэбеты, свісты і перазвоны
Навек пасяляюцца ў сэрцы
З вясновага першага рання.
І толькі хрып вароны,
                                        хрып чорнай вароны
Яўна немілагучны і нават амаральны.

А калі ўвосень птушкі адлятаюць,
Бывае — навек адлятаюць,
І лісты з бяроз і асін аблятаюць.
І ў самоце лясы
Не хаваюць слязы,
Бо прыгожыя галасы
Толькі птушкі сапраўдныя маюць.

*1958*

# II

* *

Хаджу і езджу па Амерыцы:
Наважылі мы з ёй памерацца

Не злом, не атамнаю бомбаю
І не упартасцю дубоваю.

Хаджу і езджу, параўноўваю,
Бывае нават прыраўноўваю.

Тут больш машын, дарогі добрыя,
У нас трывалей шчасце зроблена.

У іх больш яркае адзенне,
У нас жыццё ярчэй, надзейней.

Тут сэрца кожнае — на хутары,
Ў нас сэрца з сэрцам любіць гутарыць.

Яны ў нас праўдаю засеяны
І светлай радасцю заселены.

Тут людзі, як і ў нас, някепскія
І твары слаўныя пад кепкамі.

Ды шмат паглядаў насцярожаных
І падазрона устрывожаных.

Сабрацца б нам на канферэнцыю
На Міншчыне ці ў Арызоне

Не па пытаннях канкурэнцыі,—
Пра цень вайны на гарызонце.

Абмеркаваць ды моцна вырашыць,
Каб мы і вы былі у выйгрышы,

Каб мір быў дружбай усталёван,
А не нянавісцю сталёвай.

*1958*

# НЬЮ-ЙОРКСКІЯ МАЛЮНКІ

Як наравісты конь уздыблены,
Мільёнамі машын задымлены,
Хапун —
З прычаламі бясконцымі,
Хрыпун —
З кварталамі бяссонцымі,
З гандлярскаю рэкламнай прозаю,
Са статуяй жанчыны бронзавай
Паўстаў Нью-Йорк перада мной.
Гляджу я на цябе з Эмпайра,
І вось да сэрца падступае
Твой стогн
І гул пагрозны твой.

З чым параўнаць? Мурашнік, вулей?
Шаблон, шаблон...
У гэтым гуле
Любой метафары канец.
Касмапаліт з жыццём нялёгкім,
Банкір і докер, бос і лёкаі,
Кравец і пекар, і купец.

Ракфелер-цэнтра манументы
І уол-стрыцкія віры.
Там, як цыбатыя ракеты,
Стаяць счарнелыя муры.

Камоды, вежы, этажэркі —
Граніт і шкло, бетон і сталь.
Ты страшны горад, ненажэрны.
Зямны і незямны амаль.

Здаецца, міг — і гулка грукнеш
Касмічнай катастрофай ты...
Цямнее Бронкс, дыміцца Бруклін,
Гарацьь Манхетэна хрыбты.

Мастамі туга падпяразаны
Сівы Іст-Рывер і Гудзон,

А далей — далі невыразныя
І акіянскіх хваляў звон.

Нечалавечыя адлегласці,
Геаметрычная нуда.
Як ты стаміўся, як забегаўся,
Шкада цябе, Нью-Йорк, шкада.

Не лаюся, не праклінаю:
Тут ёсць каму цябе клясці.
Калі такі характар маеш —
Расці і ўшыр і ўверх расці.

Я бачыў Рым, Парыж і Прагу
І пакланіўся іх красе.
А па цябе гляджу са страхам
І ўжо сумую пакрысе.

Пара спускацца. Дзень канчаецца.
Агонь рэклам зару згасіў.
Сцвярджай: тут цяжка прызвычаіцца,
Але душою не хлусі.

Няхай табе зусім нямілы ён,
Капіталізму рай і морг.
І ўсё ж страшэннай нейкай сілаю
Даўно валодае Нью-Йорк.

Тут сотні звычаяў, рэлігій,
Прыплыўшых з дальніх берагоў,
Мільёны купленых рэліквій
І благаслаўленне ўсіх багоў.

Тут шмат пакутлівага роздуму,
Натхнёнага узлёту розуму —
Жалезны гімн, літаўраў медзь.
Жылі тут людзі, нараджалі
Людзей,
Пасля іх долар джаліў,
Адных ледзь-ледзь, другіх насмерць.
І некалі над акіянам
Прызнаюць словам пакаянным
Свае грахі, сваю віну
І стрыты ўсе і авеню...

Увечары ў Нью-Йорку вогненна,
Пазней амаль увесь ён спіць.
Адзін Брадвей пякельным водгуллем
Грыміць, рагоча і кіпіць.

Увесь ён у шалёным полымі
Крыўляецца, міргае вам.
Брыджыт Бардо нагамі голымі
Фарсіць з агромністых рэклам.

Бензіну пах, сасісак, кофе,
Рыкаюць медныя басы.
Не едзь сюды, мой друг Пракоф'еў,
Тут ні бяроз, ні рыбы сіг.

Адно імчыцца ў чорнай высі
Рэклама — тройка напралом.
Яшчэ вышэй арол узвіўся,
Махае вогненным крылом.

Тут жоўты д'ябал служыць месу
Нью-йоркскім босам і чынам,
З электралямпачак навесы
Нахабна слепяць вочы нам.

Пад імі ёлупы клятчастыя
Жуюць, жуюць, жуюць, жуюць.
Панель шуміць, дыміць і шастае
І хваліцца: «Вось як жывуць!»

Таймс-сквер. Натоўп.
Над ім з амбіцыяй
Гарлае нейкі кандыдат.
І трохметровая паліцыя
Дубінкамі махае ў лад.

Стары жабрак дзьме ў флейту сіплую,
Ён вольны, так сказаць, мастак.
Я цэнты кідаю, і сціпла ён
«Сэнк'ю»,— ківае мне.
Аднак
Ужо глядзяць вачмі пустымі
Юнцы з бародкамі рудымі
З пагрозай цёмнай на цябе...

Брадвей, Брадвей ў агні і дыме,
Цябе я ведаю цяпер!

Не захаплюся бляскам танным,
Не мне тут хіжа палявацъ,
І ў злосці нават я не стану
На стрыт заплёваны пляваць.

А пабываць было тут варта
Хоць ноч адну, хоць раз адзін.
Ісці па стрытах страшнавата
Пасля дванаццаці гадзін.

Ідзеш нібы у нейкім кратэры,
А гмахі ўверх — вузей, вузей.
Але цябе ужо не кратае
Чужой фантастыкі музей.

Тут кожны небаскроб адразу
Сніць дзесяць тысяч розных сноў.
Я ні насмешкай, ні абразай
Не разбуджу яго сыноў...

За дзень агледзеў гмахі, скалы,
Глухі асенні акіян.
Шкада, што ў Бруклін не пускаюць
Павандраваць такіх, як я.

З Эмпайра цяжка ўбачыць гора,
Яно глыбей, яно грубей.
Кіруй, шафёр, мой друг, за горад,
Гані хутчэй у Астэрбей!

Шыпіць дарога, пахне ветрам.
Хвала тварцам такіх дарог!
Пракласці іх між скал і нетраў
Народ вялікі толькі мог.

Я павярнуўся на імгненне,
Зірнуў назад у чорны змрок —
І сэрца ёкнула ў здзіўленні:
Нью-Йорк, прыгожы ты здалёк!

Нібы па ўзору дзецям зleплены
З янтарных кропелек смалы,
З зялёных, залатых і срэбраных
Крыштальных кубікаў малых.

Там бегаюць начныя зайкі,
Плывуць у рэках светлякі —
Гарыць святла і шкла мазаіка...
Нью-Йорк, ты ж можаш быць такім —

І прыгажэй, і чалавечней,
І казачней, і разумней,
І зблізку стаць па векі вечныя
Такім, як здаўся зараз мне.

*1958*

## ХЛОПЧЫК З ФЕРМЫ

Мы жывём пад Нью-Йоркам на дачы
На уласным кавалку зямлі
Папрацуем, дамо справаздачу,
І на ўсход адплывуць караблі.

Побач — ферма, зусім не раскошная.
І праз шчыліну ў плоце глядзеў
Хлопчык з фермы той раніцу кожную
На дзяцей, на савецкіх людзей.

Чуб, ды нос, ды вясёлыя вочы,
Ды на чубе блакітны берэт.
І яму, бачым, вельмі ўжо хочацца
Наш парушыць суверэнітэт.

Не збаяўся сенацкіх камісій
І без віз, без вярбальных нот
З яўна мірнай гандлёваю місіяй
Пералез ён адважна праз плот.

Дзелавіта абменьвае маркі,
Хваліць нашы цукеркі: о'кэй!
І звініць над алеямі парку
Міжнародная мова дзяцей.

З ясным смехам і сэрцамі чыстымі
За вавёркай бягуць па расе
І гуляюць то ў бітву з фашыстамі,
То у гангстэраў — па чарзе.

Апельсін рассыпаецца долькамі,
Што прынёс гэты хлопчык з сабой.
Для дзяцей пахнуць травы аднолькава
На Лонг-Айлапдзе і пад Масквой.

*1958*

## СЦЯГІ

Над ракою Іст-Рывер гамоняць сцягі,
Аб'яднаныя Нацыі ўзнялі сцягі,
На флагштоках —
Шматфарбная радуга свету.
Як палае чырвоны наш сцяг дарагі,
Сцяг Краіны Саветаў!
Ён жадае народы усе парадніць,
Сцяг суседні імкнецца усіх засланіць.
Той вунь сцяг я у моры, як друга, сустрэў.
Сцяг другі
мне напомніў бакінскі расстрэл...
Колькі гордых і яркіх
Зляцелася іх
Ад планеты усёй,
Ад народаў усіх.
Ад усіх?
Гэта вымавіць я паспяшыў.
Вунь стаіць афрыканец
Самотна ў цішы.
Ён з тугою глядзіць на чужыя сцягі,
Ён маўчыць,
Яго душыць каўнерык тугі.
Ды мацней пад экватарам душаць яго
Родны край
Пасланцы двух славутых сцягоў.
Ён прыехаў з петыцыяй,
Поўны надзей,
Ён прыехаў гукаць
Да сумлення людзей.
І я веру:
Пачуюць народы яго,
Новы сцяг зашуміць
Паміж гэтых сцягоў.

*1958*

## У ДАЎН-ТАЎНЕ

Ёсць цэлы раён у Даўн-таўне —
Прытулак мядзяных купцоў,
Дзе пахне жыццём старадаўнім,
Мястэчкам, бядой, селядцом.

Без песень унукаў, без пенсій
Старыя вартуюць свой хлам,
Сівыя цярэбячы пэйсы
Пад бляскам убогіх рэклам.

Збываюць з паклонам за цэнты
Плашчы, запальнічкі, штаны,
Палякі з не польскім акцэнтам,
Патомкі адэскай шпаны.

І просяць, і лезуць смалою...
О, доларавыя міражы!
Нібы дакастрычніцкі Лоеў
Ў гіганцкіх памерах ажыў.

А там, на каменных задворках,
Каб звесці з канцамі канцы,
У душных майстэрнях Нью-Йорка
Працуюць худыя краўцы.

Турыстам такіх не пакажуць,
Там беднасць глядзіць спадылба.
Там ноччу — надрывісты кашаль
Ды гангстэраў дробных пальба.

Патрэбна шмат поту і спрыту,
Каб цэнты на хлеб паскрабці.
Два крокі адтуль да Ўол-стрыта,
А хто іх адолеў прайсці?

*1958*

## РАЗМОВА З ВАШЫНГТОНАМ

Без каменя за пазухай, без злосці
Прыехаў да цябе я сёння ў госці.
На фільмах ведаў, ведаў па тамах,
І вось ён — паўнаводны Патамак!

Я помнікі з павагаю агледзеў,
З павагаю наведаў Белы Дом.
Чытаючы ўсе шыльды з цёмнай медзі,
Не спакусіўся я тваім дабром.

І я табе, як бачыш сам, не вораг,
Усё між намі можа быць прасцей.
Кармлю ў тваіх садах ручных вавёрак
І цешуся гульнёй тваіх дзяцей.

Ты, Вашынгтон, і сапраўды прыгожы
І велічны між паркаў і садоў.
Чаму ж тады душу маю трывожыў
І ў сны ўрываўся столькі ты гадоў?

Адсюль ляцелі тэлеграм маланкі
І радыё тваё штодня раўло,
І Пентагон грозіў нам кожным ранкам
Вайной, і нам спакою не было.

Гляджу на твой славуты Пентагон
З высокага зялёнага узгорка.
Не ганарыся славаю яго:
Планеце ўсёй ад гэтай славы горка.

Ты запаведзь свяшчэнную забыў:
Твае вітрыны ломяцца ад зброі.
Шкада, што зброю гэтую зрабіў
Харошы чалавек сваёй рукою.

Ты спакушаеш хлопцаў маладых.
Ты смерць ім прадаеш. З якою мэтай?
Як толькі ноч спаўе твае сады,
Размову пачынаюць пісталеты,

І ў магазінах — бачыў, не сляпы —
Ты прадаеш японцаў чарапы.
Не выдумка ўсё гэта і не сімвал:
З вітрыны пазірае Хірасіма.

Ты скажаш мне, што гэта толькі гінс,
Японскія прывезеныя цацкі?
А Хірасіма сохне ад тугі,
І спяць калекі у магілах брацкіх.

Таму, бывала, часам я не спаў
І падыходзіў да калыскі сына.
Я сёння шчыра ўсё табе сказаў...
Дык помні, Вашынгтон, пра Хірасіму!

Не будзем гаварыць пра гэта больш,
Хай знікне недавер'я час трывожны.
Ты бачыш: нада мной і над табой
Ляціць, ляціць наш мірны спадарожнік.

*1958*

## СУСТРЭЧА З «БЯРОЗКАЙ»

Пасля брадвееўскага чаду
І тлуму, што душу грызе,
З «Бярозкі» рускія дзяўчаты
Зайшлі ў праслаўлены музей.

Спяшу я з імі прывітацца,
Шапнуць паціху, як я рад...
Музей сучаснага мастацтва,
Сухой абстракцыі парад.

Здалёк глядзяць дзяўчаты, зблізку —
Незразумела, хоць ты плач.
«Мы не пілі,— гавораць,— віскі,
Што тут такое, растлумач».

Наварочана, накручана
На кожным палатне.
Фарба фарбаю атручана,
Гніллю і трызненнем тхне.

Нечая галёнка сіняя,
Паўшкілета селядца,
Вока, вуха, пляма, лінія,
Ламца-дрыца-гоца-ца!

Бярозкам гід пляце гасцінна
Лухту, а людзі ўсе, як ёсць,
Глядзяць на іх, не на карціны,
І шэпчуць: «Што за прыгажосць!»

*1958*

* *

Узняўшы факел, Статуя Свабоды
Глядзіць, як адплываюць параходы.
Ёй хочацца агнямі азарыць
Ім доўгі шлях, ды факел не гарыць.

Даносіцца з Нью-Йорка гул нядобры,
Бяссонны горад стомлена гудзе.
І, быццам палісмены, небаскробы
За статуяй стаяць і ноч і дзень.

Глядзяць з тугой яе старыя вочы
На далі акіянскіх сініх вод.
І хочацца адгэтуль ёй пакрочыць
Услед за параходамі на ўсход.

*1958*

## АМЕРЫЦЫ

Ляжыць на дне Гудзона чорны якар,
Ланцуг ад морскай солі пабялеў...
Ні просьбаў, ні прэтэнзій аніякіх
Не меў я да брытанскіх каралеў.

Ды, стомлены Амерыкай без меры,
Я вымаўляю лепшую з прамоў:
«Куін Мэры» *, каралева Мэры,
Адвязі хутчэй мяне дамоў!

Я пабываў на форуме народаў,
Краіны роднай сціплы прадстаўнік...
ААН стаіць блакітнай глыбай лёду,
Саракавы паверх у хмарах знік.

Амерыка, зямля вялікай працы,
Шмат гарадоў багатых у цябе.
Але будынку Аб'яднаных Нацый
Ў Маскве стаяць было б куды цяплей.

Амерыка, я на цябе не ў крыўдзе,
Тваёй красы я з сэрца не сатру.
Калі да нас ты ў госці з мірам прыйдзеш,
Сустрэнем мы цябе, нібы сястру.

Я ў твой народ і ў сэрца тваё веру,
Ды многа дзьме сцюдзёных тут вятроў.
Таму й прашу я каралеву Мэры,
Каб адвязла хутчэй мяне дамоў.

*1958*

---

* Англійскі акіянскі лайнер.

## НА АКІЯНСКІМ ЛАЙНЕРЫ

Учора Атлантычны
Грымотаў нарабіў,
Са злосцю фанатычнай
Ў ілюмінатар біў.

Сівы, касматы, грозны
Кіпеў, шумеў, шыпеў.
І я на тэмы розныя
Паразважаць паспеў.

Нічога невядома,
Хоць думай давідна —
І колькі міль дадому,
І колькі міль да дна.

А сёння волат сонны —
Пабушаваў дарма.
Заліта добрым сонцам
Шырокая карма.

З Нью-Йорка ганарыстага,
Не баючыся бур,
Багатыя турысты
Плывуць у порт Шэрбур.

Да дробязей распісана
Адзенне, словы, тон.
Начышчаныя лысіны,
Какетлівы нейлон.

І бары і басейны
Ужо абрыдлі ім,
У горадзе на Сене
Гульнуць, аж пойдзе дым.

З вішнёвымі губамі
Дзяўчынка вунь ляціць.
То шыяй, то клубамі
Абруч пачне круціць.

Мордачка лісіная,
Худзенькі жыватою.
Адна панчошка сіняя,
Другая, як жаўток.

А ты глядзі, не смейся —
Ім спорт гавайскі люб,
Бо сам Ракфелер Нельсан
Круціць хула-хуп.

Ну што ж, яму, Ракфелеру,
Круціць не прывыкаць.
І не яму, а фермерам
На полі прамакаць...

Дзяўчынку носяць д'яблы
З каюты ды ў вагон.
Галінка з белай яблыні
Не просіцца ў агонь.

Дзяўчынку круцяць долары
І вучаць піць, курыць.
Бяздумная, вясёлая,
Згарыць яна, згарыць.

Ну й трапіў я ў кампанію
Тузоў і тузянят.
Глядзі на ўсё без панікі,
Часовы дыпламат...

І вустрыцы, і рабчыкі
Сцюарды ўжо нясуць,
І жабіныя лапачкі,
І з чарапахі суп.

Ты любіш боршч украінскі,
Аладкі, каўбасу,
Ды не ўдавайся ў крайнасці,
Жуй з толкам, не пасуй.

Насмешак не наклікаю:
Тут я — не проста я,
За мною стаіць вялікая
Радзіма ўся мая.

З прыстойнасцю пахвальнай
Гляджу на ўсё, маўчу.
Над нёманскімі хвалямі
Яшчэ параганчу.

Бо добра мне вядома —
Дарога ўся відна —
І колькі міль дадому,
І колькі міль да дна.

*1958—1959*
*Нью-Йорк — Мінск*

## БЕЛЫЯ ЯБЛЫНІ

1

Вясной светлы сок прарывае бяросту
І рэкі сплаўляюць у мора свой панцыр.
Вясною на елчыных лапах адростваюць
Светла-зялёныя пальцы.
І гладзяць яліны свой ельнік малы
І пацеркі дораць з янтарнай смалы.

Зязюлі варожаць, і кнігаўкі жаляцца,
І глушаць усіх салаўі;
І з яблынь расцвіўшых тады нараджаюцца
Дзяўчаты на нашай зямлі.
Учора гулялі з маўклівымі лялькамі,
А сёння прыбраны каралямі яркімі.

О, белыя яблыні, белыя яблыні,
Пялёсткаў шалёны хвалюючы пах!
Дзяўчаткі пужлівыя, хлопцы нязграбныя,
І хмель веснавы на гарачых губах!
Туман іх не студзіць, і ельнік не колецца,
Адны толькі маткі за іх непакояцца.

Пасля сарамліва і горда ім несці
Свой лёгкі цяжар у нялёгкі наш свет,
Сыноў і дачок нараджаць ім і несціць,
Успамінаючы яблыняў цвет.
А іншыя ў нечым навекі зняверацца,
Убачаць цвет яблыні —
слёзы навернуцца...

2

Вякамі глядзелі жанкі з-пад рукі,
Чакалі мужоў і сыноў.
І падалі зоркі, нібы светлякі,
У прорвы бязрадасных сноў.
І самі касілі, і саміаралі,
А іх дарагія за іх паміралі.

Бялелі, як цвет тої, іх чорныя косы,
І сцежкі у сад зараслі...
І заўтра, як вырвуцца людзі у космас,
Іх гора лягчэйшым не стане.
Мы будзем усе касманаўтаў вітаць,
А маткі пякучыя слёзы глытаць..

Глядзець усю ноч ім да ранняй зары
Ў халодныя вочы сусвету
І думаць — ці зорка сягоння згарыць,
Ці з сынам любімым ракета.
Ім першым заўсёды марнець і
трывожыцца,
На сотні трывог іх чаканне памножыцца.

Няма там слупоў верставых і дарог,
Няма для прыпынку абочын.
Сусвет ачарсцвеў і дашчэнту прадрог
Без ласкі вялікай жаночай.
А сёння я небу гукаю: не хмарся!
Народжаны ў нас жыхары ўжо для Марса.

Мы ўбачым жанчын у няземнай красе іх,
Яны — наша шчасце і гора —
Планеты заселяць, любоўю засеюць
Далёкія сінія зоры.
І недзе у космасе будуць прывабліва
Цвісці, як і ў нас, іх дзявочыя яблыні.

*1958*

## ПЕРАПРАВА

Каго не краталі, каго не хвалявалі
Стракатасць і гамонка пераправ?
Рыпіць паром, булькочуць хліпка хвалі,
У твары б'е настоі мядовых трав.

Святочны дзень, усе спяшаць на рынак:
Жывём багата, што там ні кажы.
У кузавах ляжы мяхоў і скрынак
І на вазах з гароднінай кашы.

Яловых лапак воз вязуць у горад.
Каму? Чаму? Які трывожны пах!
Бо лапкі елак часам пахнуць горам,
А часам святам, аркамі ў сцягах.

Павеяў вецер, каб красу падкрэсліць
Грудзей тугіх, дзявочых стройных ног.
І пра яе ўспаміны уваскрэслі,
Якую страціў на адной з дарог.

Крыху шкада таго, што засталося
На скрыжаваннях дзён, вятроў і рэк.
А сэрца зноў такіх нябёсаў просіць,
Якім бы я спатрэбіўся навек.

На пераправе гэтай я паверыў,
Што развітаўся з пошлай драбязой.
Знікае ў цёплым дыме ціхі бераг,
Зарослы да вачэй сівой лазой.

А чым мяне сустрэне бераг новы —
Будзённым тлумам, навізною спраў?
А покуль прагна п'ю настоі мядовы
На гэтай самай лепшай з пераправ.

*1958*

## ГАРАЧЫНЯ

Гарачыня. Не за гарой зажынкі.
А тут забыла жыта смак расы:
Чатыры тыдні ні адной дажджынкі
Не выпала на нівы і лясы.

Патрэсканай зямлі журботны воблік
Трывожыць не на жарт усіх людзей.
Бязлюдным небам пара дробных воблак
Павольна, сонна некуды ідзе.

І раптам у прасторы загрымела —
Пілот увысь маланкай сігануў;
Свой самалёт, як голку з ніткай белай,
Праз воблакі імгненна працягнуў.

Гром рэактыўны, наш магутны гром
Для ворагаў не скончыцца дабром.
Ды мы не хочам бомбамі грымець,
Нам толькі б мір, ды хлеб, ды шчасце мець.

Я мару, каб пілоты баявыя
Навучыліся, забыўшы ўсе баі,
Сшываць, як ветразь, воблакі малыя
У хмары і зямлю дажджом паіць.

Дадзім мы рады засусе і граду,
Каб шар зямны, што ад стыхіі знямог,
Па нашаму высокаму загаду
Вясёлкаю падперазацца мог.

*1958*

## КАЛІ ПАДСТУПАЮЦЬ СЛЁЗЫ

Слёз нашых захопнік не бачыў,
Хоць вочы смылелі не раз.
На смерць нас вядуць — мы не плачам,
Сяброў мы хаваем — не плачам,
Не плачам ад крыўд і абраз.—
Сухія ў нас вочы у горы...

На з'ездзе прысягу прымаем
І сцяг свой высока трымаем,
Стаім мы плячо да пляча.
«Інтэрнацыянал» заспяваем —
Спадчыннікі Ільіча —
І слёзы тады падступаюць...

Пад гул барабанаў і горнаў
І лёгка, і цвёрда, і горда,
Каб кожны іх крокі пачуў,
У залу ідуць піянеры,
Што нам, камуністам, так вераць,
Як верым мы ўсе Ільічу.—
І слёзы тады падступаюць...

*1960*

# КНІГІ ЛЕНІНА

Якім ён быў жывы? — пытаю часта.
Ён леншым быў, ён іншым быць не мог.
Быць вечна з ім — якое гэта шчасце! —
І з ім ісці да новых перамог.

Ён углядаўся ў будучыню зорка,
Усё, усё ён бачыў да драбніц:
І поспехі, і дні няўдачы горкай,
І водбліскі ўсіх бур і навальніц,

І нават дробязь будучых памылак...
Тамы яго, таварыш, разгарні,
Там ёсць усё — бяскрайнасць небасхілу
І думкі акіянскай глыбіні.

І доўга нам яшчэ ў дарозе крочыць,
Каб завітаць на тыя рубяжы,
Што бачылі яго жывыя вочы,
Дзе ў светлых марах ён паспеў пажыць.

*1960*

## ДАЎГАЛЕЦЦЕ

Які мізэрны і убогі
Той недалёкі чалавек,
Што цягне да сваёй бярлогі
Набыткі розныя ўвесь век.

Сем дываноў, фарфор і срэбра,
А што за мэбля у яго!
Адгарадзіцца хоча мэбляй
Ад старасці і ад нягод.

Усюды ўласнай служыць мэце,
Ён і вучоны і пачканц.
Ён вельмі прагне даўгалецця,
І на ўвесь свет яму начхаць.

Трасецца за свой век кароткі,
Хоць сам, як бык ляны, здароў;
Падсмажваецца на курортах,
Наводзіць жах на дактароў.

Чытае, прылізаўшы патлы,
Ён медыцынскі бюлетэнь.
Пра лекі новыя, пра панты,
Пра вітаміны і жэнь-шэнь.

Сябрамі, жонкай зберажоны,
Ён раўнадушны да ўсяго.
І пах аптэкарскі баржому
Б'е ў нос ад прэсных слоў яго.

І што ж? Адмыты ў цёплай ванне,
Не пакідаючы слядоў,
Без радасці і хвалявання
Працягне лішніх пяць гадоў.

А там цішком памрэ ў пасцелі,
Праз дзень забудуць пра яго...
А колькі год было Гастэлу,
Калі яго спаліў агонь?

Жыццё прадоўжыў нашым дзецям
Ён, ахвяруючы сабой.
Ён павялічыў даўгалецце
Сваёй радзіме дарагой.

Гадамі шлях яго не мерце,
Я іх лічу — не налічу,
Ягоны лёс цяпер — бяссмерце:
Гастэла жыў па Ільічу.

*1960*

* *

Дождж ідзе праменісты і дробны,
Пахнуць мятаї мокрыя лугі.
Вось ён, свет, як сэрца, непадробны,
Да дажджынкі кожнай не глухі.

Росная зялёная айчына!
На цябе, паўнюткую святла,
Пазіраюць круглымі вачыма
Птушаняты з цёплага дупла.

З гнёздаў мы даўно павыляталі,
Ды не развучыліся глядзець,
Як па спелым полі, па атаве
Дождж грыбны па дыбачках ідзе.

Самы раз цяпер з лазовым кошыкам
Па сцяжынках рысяў і ваўкоў
Выправіцца з раніцы на пошукі
Маладых тугіх баравікоў...

Я стаю, гады свае гартаю,
І сціскае сэрца нейкі боль,
Быццам я на Месяц адлятаю,
Быццам я лугоў не ўбачу больш.

Не, не развітаюся ніколі
З родным краем, дзе так светла нам.
Проста я люблю яго да болю
І з любоўю дзецям перадам.

*1960*

* *

Руду і хлеб мы здабывалі самі.
Ракеты збудавалі. А цяпер
На месяцы высокім прапісалі
З сярпом і молатам савецкі слаўны герб.

Шасцідзесяты год, год высакосны,
Пластуюцца падзеі ўсё гусцей.
І цуда ўжо не цуда. Заўтра космас
Чакае да сябе зямных гасцей.

І юнакам той космас сніцца часта.
А я не сплю — а што, а што, калі...
Варушацца зноў лапы чорных свастык,
І чуецца трывожны гул зямлі.

Снам чалавецтва да здзяйснення блізка.
Ды нехта б'е ракетамі. І вось...
З магіл сарвацца хочуць абеліскі,
Каб тых вар'ятаў пранізаць наскрозь.

Гатоў грузіць мяшкі, араць да стомы поле,
Дзіцяці хвораму кроў пераліць сваю,
Каб толькі развязаць вайну не здолеў
Той зброд, што не дабілі мы ў баю.

*1960*

## ЛЯ КУРГАНА ДРУЖБЫ

Траву калісьці скублі
Тут коні партызан...
На стыку трох рэспублік
Насыпаны курган.

Тут біліся без страху
І рускі, і латыш.
Мы неслі разам страты,
Салдаты і браты.

Марозам і адлігай
Усе мы, як адзін,
З Вялікіх Лук і Рыгі
І з віцебскіх мясцін.

Ішлі на бой харобра
За свой народ і край.
Аб гэтым помніць добра
Стары маўклівы гай.

Ён помніць паімённа,
Каго ўзяла вайна...
Бярозкі, ліпы, клёны
Шумяць ля кургана.

Тут сёння партызаны —
Паплечнікі, сябры
Расклалі на палянах
Высокія кастры.

Чаго, чаго ты плачаш,
Харошая мая?
Мы разам зноў. Ты бачыш,
Якая ў нас сям'я!

Народ у нас адборны,
Хоць трохі пасівеў.
Прыходзіць вечар зорны,
Ды не змаўкае спеў.

З такімі кашу зварыш
І самым золкім днём.
Давай тваю, таварыш,
На ростань запяём!

*1960*

## ПАКАЛЕННІ

Ад першага слова «мама»
Пралегла многа дарог.
А нам усё мала, мала
Радасці і трывог.

Ад першага шэпату «мілы»
Да шчасця два крокі было.
А мы усё міма, міма,
Жыццё нас наперад вяло.

Вучыла, пякло, шкуматала
На хвалях суровых прыгод.
Пазналі мы цвёрдасць метала
І смак заіржаўленых вод.

Ніколі не беглі ад працы,
Умелі касіць і араць.
Пазналі, як цяжка ў юнацтве
На цёплай зямлі паміраць.

Па дымных руінах пранеслі
Сумленна сваю маладосць,
Спявалі журботныя песні,
Адчулі і гора, і злосць.

Пасля ў тайзе і пустыні
Такую любоў набылі,
Што знаем: у нашай краіне
Няма непрыгожай зямлі.

Таму і глядзім так сурова
На хліпкіх стыляг і пралаз,
Што любяць пажыць на гатовым,
Радзіму падводзяць і нас.

Таму сэрца гордасцю поўніцца
За вечна гарачую кроў,
За салігорскіх і полацкіх
Юных будаўнікоў.

Якіх апішто пе ўтрымала
Ад першых цялёгкіх дарог;
Якім, як і пам, усё мала
Радасцей і трывог.

*1960*

## МАЗУРКА ШАПЭНА

Ціхі гром шапэнаўскай мазуркі,
Папрашу: замоўкні, не трывож!
Лье і лье ў бляшаныя мензуркі
Вадасцёчных труб асенні дождж.

Грае нада мною чараўніца,
Колькі шчасця, бляску ў гуках тых!
Быццам навальніца бліскавіцай
Б'е у дах асенняй глухаты.

Грае там не фея, не прынцэса,
Я дзяўчыну гэту неўзлюбіў:
Сведкам павучальнага працэса
І ахвярай музыкі я быў.

А цяпер яна так слаўна грае.
Тры гады мінула, тры гады.
Што з таго, што зараз адабраю,
Не заглянуў ветла, не параіў,
Не памог я ёй нічым тады.

Шыбы заліло халоднай пенай.
Ну калі той дождж, той сум міне?
Лётае меладыя Шапэна,
Ды не для мяне, не для мяне.

*1960*

## ПРА СУІСНАВАННЕ

Суіснаванне — слова моднае,
Для нас яно, як клятва, моцнае,
Яно ў палітыцы патрэбнае,
Яно у гандлі ўсім выгоднае,
Яно у подласці ганебнае.

І не для слоўнай акрабатыкі
Я ўзяў такую тэму слізкую.
Суіснаваць народам Балтыкі
Патрэбна, як сям'і над міскаю;

Амерыканскім людзям з рускімі,
Французам з гордымі арабамі,
А лэдзі лонданскім з зулускамі,
І дужым трэба жыць са слабымі;

З суседзямі не вельмі добрымі,
Былое не прыпамінаючы.
І нават, нават з небаскробамі
Гатоў я зжыцца, іх не лаючы.

Вітаю дружбу гор з нізінамі,
Крыніц з гаямі салаўінымі...
А як жа вочы твае сінія
Мне спалучыць з вачмі савінымі?

Суіснуе любоў з няпавісцю,
Мяжуе гора з добрай радасцю...
Бываюць хмар асенніх навісі,
Калі не могуць сэрцы ў лад ісці.

Я жыць у дружбе век стараюся,
Але скажу вам праўду чыстую:
Суіснаваць я адмаўляюся
З падлюгамі і кар'ерыстамі,

І з плеткарамі, і з прапойцамі,
З хапугамі, што мруць ад скупасці,
І з тым рэдактарам-забойцаю,
Што рэжа добры верш ад тупасці.

*1960*

## ПЕРАД ДАЖДЖОМ

Навалілася хмара дымная,
Цёмная, неабдымная.

Зараз грукне гром, зараз хлыне дождж,
Перайнача ўсё,
Перамоча усё
І упоперак і уздоўж.

Глянуў бацька на хмару: бяда, бяда —
Не пагрэбла брыгада сена, бадай.

Маці глянула, ціха вохнула:
— Ажывуць мае грады пасохлыя!

Паглядзела дачка, стала хмурная:
Знаць, не прыйдзе ён гэткай бураю...

Самы меншы сын —
Пад струменьчыкі:
— Дождж, дожджык, секані,
Я паеду на кані...

*1960*

## НЕПАЛАДКІ

Пад нагой масніца
Рэзка скрыпае,
Капае вада
Ды ціха хліпае.

Вецер дзьме
У шчыліны аконныя,
Скразнякі гуляюць
Тут вагонныя.

Гэта не зямлянкі,
Не палаткі —
Гэта ў новым доме
Непаладкі.

Не з-за чаркі
У кватэрах сваркі —
Лаюць недаробкі
Ўсе жыхаркі.

Мы ў зямлянках
Чэрствы хлеб жавалі,
Рэўматызмы
Дружна нажывалі.

Нам дала кватэры
Наша ўлада,
Што не церпіць
Розных непаладак.

Дзе прарабы?
Дзе вы, брыгадзіры,—
Камандзіры
Шчыліпаў і дзірак?

Дзе дзяўчаты мілыя
З будтрэста?
Кепскія з вас
Выраслі нявесты.

Дзе вы ўсе начальнікі
І замы?
Як цяпер дзяўчатам
Выйсці замуж?

Іх і вас
Праслявяць кватаранты.
Дык хутчэй
Падкручвайце краны.

Што недарабілі —
Дарабляйце,
Не вымовы —
Ласку зарабляйце.

*1960*

## ПРА НЕЎМЯШАННЕ

Хабарнік, злодзей даўно не ў пашане,
Але працвітае шчэ п'яніцаў каста.
Даволі палітыкі неўмяшання
У п'янства і рознае ашуканства!

Мы б'ём перажыткі мінулага слаба,
Патураем чужым грахам.
І горад паганяць агіднаю славай
Хуліган, забулдыга і хам.

Бывае так: чалавек праходзіць
Ля брудных падзей і смяецца ў вус:
«Выходзяць са строю на параходзе
Вінты... а тут перажыткаў груз.

Мы ўсе бываем часамі грэшнымі,
Мы ўсе бываем часамі смешнымі.
Не трэба вывадаў паспешных,
Не трэба мераў непазбежных».

Спагада прытворная, словы фальшывыя!
А як бы жылося святлей і чысцей,
Каб хулігана і хама за шыварат
Мы бралі часцей.

З рашучым гневам, з напорам рабочым
Давайце ўмешвацца — бой дык бой! —
Як дождж умешваецца ў пыл абочын,
Каб яны зелянелі пад празрыстай расой.

*1960*

## НЕЗАКАПАНЫЯ ДАМАВІНЫ

«Чаму маё сэрца, сыночак, баліць?
Пайду я сыночку кашулю бяліць»,—

Спявала у вар'яцтве жанчына адна,
Ішла па разбітых дарогах вайна.

Сыночка няма,
і кашулі няма,
Жанчыну спяжком пабяліла зіма.

У ямах іржавых дарогі вайны,
Твары дзяцей васковыя.
Снег і чорныя каміны,
Снег і могільнікі вясковыя.

Адзін з іх ніколі ўжо мне не забыць...
Захопнікі люта забілі
Людзей, што умелі рабіць
ды любіць
І людзі якіх любілі.

Асіроцелыя маткі і дочкі
Збілі сасновыя дошкі,
А выкапаць родным магілы
Сіл не хапіла.

Дамавіны стаялі журботным радком,
Закаваныя сінім лядком.
Чакалі, чакалі на снезе яны
Сканчэння вайны...

— Людзі,— гукаць не стамляюся я,—
Мір зберагчы мы павінны!
У сэрцы маім стаяць і стаяць
Незакапаныя дамавіны.

*1960*

* *

Табе, з прытомленым сэрцам,
Прысыпанаму сівізной,
Хочацца зноўку сустрэцца
З далёкай сваёй вясной.

З той, што выходзіла адвячоркам
Да возера ў зараснік траў.
Яе называў ты зоркай
І горача абдымаў.

Вось і вёска, як быццам тая.
Не, не тая, зусім не тая!
А сэрца ад радасці штосьці не тае
І зорка не вылятае.

Навакола новыя хаты
І шмат незнаёмых сцежак.
І ты адчуваеш: прыехаў дарма ты
І ўжо баішся насмешак.

Усюды бялеюць жаночыя хусткі:
Хто корміць грудзьмі немаўлятак,
Хто цыбулю ірве на закуску,
Хто носіць ваду да градак.

Жанчыны дзябёлыя, немаладыя,
Твайго, сярэдняга, веку.
У іх ад сонца рукі рудыя
І зморшчыны ля павекаў.

Якая тваёй з іх была? Якая?
З няспісаным чыстым сэрцам.
Не выбежыць, не спаткае,
Не пойдзе з табой да азерца.

Заходзіў даўно ты вельмі
Ў яе спадзяванні і сны.

І стала іншаму вернай
Яна пасля пейкай вясны.

У яе свой закон у хаце,
Свае Іванкі і Галі...
Лепш не шукайце, не сустракайце
Тых, што ў юнацтве кахалі.

*1960*

## ЖАРТЫ І СКЕПТЫК

І прыйдзе час: навучымся майстэрству
Натхнёнай працы ўсе мы, як адзін.
У шахтах, на палях і ў міністэрствах
У дзень мы будзем толькі пяць гадзін.

І кветкі расцвітаць пачнуць па плану,
І салаўі па радыё спяваць.
І ў свята будзе паўпрацэнта п'яных
На ўсіх мужчын, і тыя будуць спаць.

А нашы фермы ўсе абгоняць фірмы,
Мець будзе гарсавет кватэр запас.
Халтуршчыкі здымаць не будуць фільмы,
Бо іх саміх здымаць пачнуць у нас.

І зробіцца апошні самагоншчык
Вучоным кансультантам кінадрам.
З транжырствам і нядбайнасцю пакончым,
І будзе ўсё на ўсіх паліцах крам.

Марожанае будуць на праспектах
Нам прадаваць былыя штурхачы.
І лектары, нарэшце, скрышаць секты
І апраўдаюць сытыя харчы.

Турысты палятуць да Амазонкі,
Бо ўсе куткі даўно знаёмы ім.
Пачнуць маліць прафесарскія жонкі:
«Давай пад яслі дачу аддадзім!»

І зажывуць сакратары райкомаў
Без экстранных нарад і без вымоў,
За дзень мазгі не ўправіўшы нікому,
З духмяным бэзам вернуцца дамоў.

А што тады? Тады, сябры, трымайся
За хвост каметы, адлятай на Марс!
«Але мы ў масе будзем не на Марсе,
А на Зямлі. А што для нас, для мас?

Даклады пра Шапэна і Рэмбрандта?
Экскурсіі на полюс і ў Тыбет?
Ці конкурс на касцюм густоўны франта,
На таппы вітамінавы абед?»

Я пазнаю твой голас, хцівы скептык!
Бубніш ізноў: «Пляцеш, паэт, пляцеш.
Валяюцца акуркі на праспектах —
Іх падмятуць. Душу не падмяцеш.

Табе абы фантазіі ды жарты,
Не хутка прыйдзе твой хвалёны час:
На цаліне не ўсе палеткі зжаты,
Машыны гразнуць на Палессі ў нас.

І людзям жыць яшчэ зусім нялёгка.
І ўсюды шмат балот і шмат чарцей...»
Сучаснік мой, я, твой адчуўшы локаць,
Пагавару з тым тыпам карацей.

Не замінай нам, цынік маладушны!
Цябе мы пахаваем без вянкоў.
Мы знаем, што адскрэбці цяжка душы
Ад бруднаватай спадчыны вякоў.

Ды веру я: не змізарнеюць людзі,
Не загрызе уласнасць іх ізноў,
І сэрцы не запэцкаюцца ў брудзе —
Нам сорамна не будзе за сыноў.

Не цёплыя куточкі і не дачы,
Не пачкі грошай наш народ вядуць.
І кроў, і пот, і ўзлёты, і няўдачы
У нашых жылах ярасна гудуць.

Мы будучыню к сэрцу прымяралі,
За будучыню ў бітвах паміралі
І ажывалі, зноў каб будаваць...
Не скептыкам аб людзях бедаваць!

Куды ярчэй, чым я пішу, ў нас будзе
І радасць працы, і палёт на Марс.
Таму мне не шкада ні жартаў людзям,
Ні ласкі, ні хвалы, ні светлых мар.

*1960*

* *

Ён богам не намечаны,
Той, пра каго пішу.
І злосць, і зайздрасць вечна
Пякуць яму душу.

Клянецца ўсюды сіпла,
Што ён, бач, хлебароб.
А сам падмяў усіх бы
І славу ўсіх бы зграб.

Да плётак ён ахвочы,
Дыміць кірпаты нос.
Ён шкрэбае уночы
Рыфмаваны данос.

Бясплодны да адчаю,
Пускае пыл-туман;
Усіх ён павучае
І б'е у барабан.

Ірве усіх на часткі,
Грыміць зласлівы гром...
А сам, а сам начальству
Зад ліжа ён цішком.

*1960*

## КЛЯНОВАЁ ЛІСЦЕ

Рэдка чуем размову аб лірыцы,
Больш аб космасе, аб Амерыцы...
Людзі сварацца, потым мірацца
І за працаю славай мерацца;

Патанаюць у мудрых формулах,
Засядаюць на розных форумах.
А якія цяпер адносіны
Ў іх да лірыкі і да восені?

Ціха цягнуцца хмары сонныя,
Тратуар ад дажджынак рабы.
Пешаходы пад парасонамі —
Як счарнелыя ў лесе грыбы.

Растрывожаны ўшчэнт сумненнямі,
Крочу паркам, шліфую жарству.
Раптам бачу: збіраюць жменямі
Дзеці вогненную ліству.

Дзеці з пульхнымі свежымі шчокамі —
Адкрывальнікі хараства...
Пешаход парасон зашчоўквае,
Падстаўляе пад вецер твар.

Як на нейкае дзіва дзівоснае,
На дзяцей ён глядзіць, на раку,
Ліст кляновы бярэ, нібы з восенню
Зноў вітаецца за руку...

Слаўлю домны і рыбу ў сетцы,
І касмічнай ракеты свіст.
Будзь жа, лірыка, з імі ў суседстве,
Хай у цэхі, канторы і ў сэрцы
Залятае кляновы ліст.

*1960*

## ЗАЛАТЫЯ ПЯРСЦЁНКІ

Збілі нашы ракетчыкі Паўэрса —
Гістарычны архіўны факт...

І пакуль ён у камеры парыўся,
З ім у думках
Я гутарыў так:

Ты не з лепшых маіх субяседнікаў,
Скажам проста:
Ты хлопец — дрэнь.
Толькі ведаю я без даведніка:
Меў і ты свой прыгожы дзень.

Ты нявесту сваю кахаў,
Ты па ёй, дарагой, уздыхаў.

Як жа добра было вам на шпацыры
І у лодцы на ціхай рацэ.
Любаваўся ты тонкімі пальцамі
І пярсцёнкам на мілай руцэ.

Залатыя пярсцёнкі,
Золата!
Пэўна, гонар твой
Тонкі быў
Змоладу.

А пасля ты ляцеў
Над уральскай старонкаю
І пахабна званіў
Залатымі пярсцёнкамі.

Для каго ты прыпас
Залаты свой запас,
Малады і нахрапісты ас?

Вораг мой, ты ва ўсім вінаваты,
Рос у логаве воўчым,
Як воўк.

Чорт з табой!
Каб дазволіла варта,
Я б цябе на ігрышча павёў.

Самы час:
Збажына памалочана,
Ранкам рэкі, нібыта малочныя —
То асенні вясельны туман
Для старэйшых дзяўчат.
А малодшыя
Скачуць ноч напралёт пад баян.

Паглядзеў бы на нашых дзяўчат
І адчуў бы: маніў табе гад,
Што купіць за пярсцёнкі ты можаш
Іх —
Адданых,
Разумных,
Прыгожых.

Ні адна не прадасць
 за пярсцёнкі красу,
Залатою пятлёй не завяжа касу:
Наш народ падарыў
Іх дзявочай красе
Залатыя капальні усе.

Скарбы ўсе ў гарадах, па палях і ў лясах
Ім Радзіма дае па пасаг.

Грукачыце, дзяўчаткі, абцасамі тонкімі,
Каб скрозь тоўшчу планеты
 пачулі ваш стук,
І бярыце на шчасце
Залатыя пярсцёнкі
Толькі з родных,
 сумленных і ласкавых рук.

*1960*

## ГАРЛЕМ

Зняслаўлены пісакамі бульварнымі,
Шантаў ён многім: лепш мяне аб'едзь.
А мне дык спадабалася у Гарлеме
На Афрыку нью-йоркскую глядзець.

Ад працы ў неграў рукі агрубелыя,
Але ў вачах гарыць не рабскі страх,
А толькі насцярожанасць да белага,
Як водбліск лінчавальнага кастра.

Пачуеш тут, у гарлемскай нярэстасці,
То песеньку спякотную, то джаз.
І класавыя супярэчнасці
З дзвярэй і вокан лезуць напаказ.

Уласныя тут босы ёсць і босікі,
І бары ёсць, каб спойваць там людзей.
І дзесяць тысяч негрыцяткаў босенькіх
На ганках маткі туляць да грудзей.

Яны раскажуць дзецям казку дзіўную,
Што калі-небудзь спусціцца сюды
Хрыстос
Ці чалавек з вачмі праўдзівымі,
Каб вывесці іх з чорнае бяды.

*1960*

* *

Амерыканскія музеі,
Хвалу спаўна вам аддаю!
У першых залах галерэі
Па дзве гадзіны я стаю.

А пад канец — бяжком, галопам...
Спрабуй агледзь за пару дзён
Усе шэдэўры,
што ў Еўропе
Нью-Йорк скупіў і Вашынгтон.

У кожнай зале — цуда, дзіва,
Ажно захоплівае дух.
Вунь сам Рэмбрант,
як смерць, праўдзівы,
І Рэнуар, мой даўні друг;

Тут і пакутнікі Эль-Грэка,
І Гойі жорсткія мазкі;
Бяссмерце ўсіх эпох і рэха
Трагедый і піроў людскіх;

І школы новыя кагалам
З сваёй расхлістанай красой,
І рабін віцебскі Шагала,
І пікадоры Пікасо...

Шапчу, як змоўца, я карцінам:
А хто прадаў,
бяссмертных, вас?
Якім ім золатам плацілі?
Каму вас везлі напаказ?

Не аб такой вы снілі славе.
Няўжо вам гэты міл парад?
Дзялкі у ссылку вас саслалі,
З якой няма дарог назад.

І сэрцу цесна стала ў грудзях.
Замры, туга мая, замры!
Карцінам трэба, як і людзям,
Жыць на сваёй святой зямлі.

*1960*

## У ЭКСПРЭСЕ ДЭЙТРОЙТ — ЧЫКАГА

Нас нясе экспрэсіна ў Чыкага.
Хто чытае комікс, хто жуе.
Нешта смокча фермер з добрай флягі.
Ён, відаць, нішто сабе жыве.

За акном — правінцыя глухая,
На вяроўках сушацца штаны.
Каля станцый некага чакаюць
Розпай масці аўтатабуны.

Ярка прагалёкала рэклама,
Асядлаўшы нейкі там лабаз...
Задрамаў вагон.
Уцёк ад мамы
Хлопчык і кіруецца да нас.

Добры дзень, малы джэнтльмен,
гуд монінг!
На назе у хлопчыка званок.
Ён увесь у жаўранкавым звоне,
Кучаравы пастарскі сынок.

Пастар — акулярысты і строгі,
Сочыць за малым з трывогай ён.
Падыходзь, паразмаўляем трохі,
Спадабаўся мне ты, юны Джон.

Не таму, што нагадалі вочы
Сына мне... Не думай гэтак, не!
Проста твой сярэбраны званочак
Закаціўся ў сэрца да мяне.

Я не знаю, што за ён, твой бацька,
Ну, а ты — адразу бачу — друг.
Вырастай без планаў забіяцкіх,
Не цурайся нашых чэсных рук.

Многа ў вас такіх, што вынюць псамі
І з амбонаў надрываюць нсам,—

Ад імя свяшчэннага пісання
Абяцаюць гібель нам і вам.

Б'е ў мазгі ім вадародны вецер,
Сняць яны счарнелыя палі,
Енк дзяцей апошніх на планеце,
Крык апошніх птушак на зямлі...

У калысках спяць пакуль што дзеці,
А ў ракетах дрэмлюць перуны...
Бацька твой нядрэнны — я прыкмеціў,—
Бо з табой яму не да вайны.

Я, здаецца, ў ім не памыліўся,
Гэта з-за твайго, малы, званка.
Думай, пастар, думай і маліся
Перш за мір, а потым за сынка.

*1960*

## У ЦАРСТВЕ ФОРДА

Сягоння гіды з раніцы
Вясёлыя і гордыя.
Яны ваўсю стараюцца
Праславіць царства Фордава.

Вялікі у Дзірборне
Той фордаўскі завод.
З усёй планеты зборны
Пацее тут народ.

Жуюць жалеза блюмінгі
З шыпеннем і выццём.
Гарачае і тлумнае
Скрыгоча тут жыццё.

Спяшаць, шумяць канвееры:
Рабочы, не зявай!
Праверылі, прамералі
Завод мы з краю ў край.

— Ну, як завод?
— Нішто завод.
Дакладна ўсё узважана.
А колькі з'ездзіла за год
Людзей у Сочы вашыя?

А гід сваё ўсё гне і гне,
Аж смех:
Не факты — фікцыя.
Глядзіць трывожна на мяне
Заводская паліцыя.

Чарнее копаць на траве,
Ідзём каменнай сцежачкай.
— Вось тут рабочы люд жыве.
Утульныя катэджыкі!

Гарачы душ. Халодны лёд.
А колькі год выплачваць?

Аж дваццаць год? Махлярскі ход!
А што, як праца страчана?

Не хочам мець ніколі мы
Утульнасці такой.
Мы ўсім адгрукаем дамы
Савецкай талакой.

Жывіце ў вашых вілах,
Пускайце ў вочы дым...
Паедзем у Грын-Віладж,
У Фордавы сады.

Адзін музей, другі музей,
Багата экспанацікаў!
Рабілі тысячы людзей,
А Форд — героем нацыі.

Тут ён радзіўся, тут сядзеў
З сябрамі-карпарантамі,
Тут еў, тут спаў, а тут смярдзеў...
Даволі трэсці трантамі!

Ягоны спорт, ягоны фонд...
А што мне з ім міндальнічаць?
І гэта — Форд, і тое — Форд,
Падумаеш, ударнічак!

Ну і рэкламшчык гэты род,
Зубастая дынастыя!
І Мінскі свой аўтазавод
Успамінаю часта я.

Эх, прачытаць бы мне, сябры,
Вам папулярна лекцыю!
Але не тыя тут зубры,
Не тыя тут гаспадары,
Не тая, брат, дырэкцыя.

*1960*

## СУСТРЭЧА З НІЯГАРСКІМ ВАДАСПАДАМ

І вось давялося мне пераканацца,
Што ёсць гэты гул, гэты звон, гэта сінь.
Пра свой вадаспад не хлусілі канадцы,
І янкі пра свой не манілі зусім.

Зрываешся ў бездань з адвагай гарачай,
Ты велічны ўвесь, ад чупрыны да пят.
Чаго прытварацца! І я рад пабачыць
Касматую морду тваю, вадаспад.

З вясёлаю бандай чыкагскіх піжонаў
Па коўзкіх усходцах — ад грому глухі —
Іду я у жоўтым плашчы з капюшонам,
Нібыта манах на малебен стыхіі.

Майстэрня патопаў, абвалы рыкання,
Сам бог вадзяны тут вясёлкі таўчэ.
І нельга цябе, вадаспад, заарканіць! —
Ты ў ярасці вырвешся і уцячэш.

А воддаль таксама раве і грукоча
Канадскі твой брат, нібы хмара, сівы.
Ён зрэдку шпурляе з вар'ятамі бочкі,
Што лезуць за долар на скрут галавы...

Цыбатыя дзеўкі у штоніках модных
Тут кідаюць цэнты: «Вазьмі, зберажы...»
Бацькі іх жалезабетонны наморднік
Рыхтуюць табе, каб збіраць барышы.

Яны загадаюць: круці нам турбіны,
Вадзі цягнікі і сукенкі прасуй!
І хочацца крыкнуць народам тубыльным:
Пакіньце для ўнукаў такую красу!

Ды ўсе тут глухія, не чуюць парады.
Бывай, Ніягара, да лепшых часін!
Я грыву тваю з-за павагі не кратаў
І волас сівы твой не ўзяў на ўспамін.

*1960*

## ШЭКСПІР І ПЕСНЯ

Ён не англійскі, ён канадскі Стратфард,
Але і тут жыве, жыве Шэкспір...
На сцэне клекатаў крывавы вір
І дзве сям'і цяжкія неслі страты.

А потым мы за сцэнаю між кветак
Сядзелі да світальнае пары.
Ажыўшыя Рамео і Джульета
Нам паціскалі рукі, як сябры.

Сам рэжысёр узняўся, урачысты,
Ён не на жарт усхваляваны быў:
«Як нельга ад матулі адрачыся,
Так нельга дружбу з рускімі забыць.

Я з імі жыў. І, каб не іх напевы,
Мяне б канцлагер здолеў даканаць.
Не я, а іншы рэжысёр, напэўна,
Вучыў бы вас, Джульета, паміраць».

Ён папрасіў нас заспяваць...
Не мелі
Мы выхаду, і, праглынуўшы страх,
Мы сціпла праспявалі, як умелі,
Аб родных падмаскоўных вечарах.

І доўга-доўга воплескі шугалі.
Мы ведалі: яны не нам, а тым,
Што рускай песняй смерць перамагалі
І сонца міру бачылі праз дым.

*1960*

## СВЯТА Ў ПАЛЕРМА

Хвалі цёмна-сінія, а пяскі янтарныя,
Сонца п'е азёрны халадок...
Сведчу, што ў правінцыі Антарыо
Ёсць Палерма — слаўны гарадок.

Не пяюць тут песні італьянскія,
Проста заснавальнік назву спёр.
Твары ўсё славянскія, сялянскія,
А імёны — Галя ды Рыгор.

Гора адгукаецца паданнямі,
А музей тутэйшы ўсё збярог:
Прасніцы, збаны, уборы даўнія,
І пілу, і ступлены парог.

Цяжка ім было, дзядзькам і маладзіцам,
На чужыне, на зямлі індыйцаў
Сосны траляваць, палі араць,
Нараджаць дзяцей і паміраць.

І цяпер разжыцца ім нялёгка,
Уздыхаюць аб Дняпры не раз.
Можа, і прыйшоў таму здалёку
У Палерма бронзавы Тарас.

На людзей глядзіць Кабзар у роздуме,
Што сышліся да яго на сход...
Кідае з памоста ў сэрцы простыя
Словы міру палкі Эндзікот.

Мова украінская з англійскаю
Ходзіць поплеч. Чую і сваю.
І здаюцца ўсе такімі блізкімі,
Быццам недзе ў Каневе стаю.

Свята не канадскае, а брацкае.
Пазнаю дзявочы бляск вачэй.
Звоняць каламыйкі прыкарпацкія,
Боцікі тупочуць гарачэй.

Песня расцвіла і заўладарыла,
Чуецца ў ёй сум і гнеўны гром.
І раве, і стогне ля Антарыо
Казачна далёкае Дняпро.

Злыдні ўсіх масцей і нацый, гора вам,
Калі ўмее так спяваць народ.
На чужыне сам Тарас Рыгоравіч
Сёння пазбіраў сыноў на сход.

*1960*

## ПАЛЁТ У КАНАДУ

Ляціш гадзіну, дзве ляціш
І сем ляціш над хмарамі.
Уніз глядзіш, над нос гудзіш
Пра вочы, вочы карыя.

Атлантыка! А дзе яна?
Не чутна, як гудзе яна.
Атлантыка захутана
Авечай белай футраю.

Няма прычыны каяцца,
Імчым на быстрым «боінгу».
Ён рэдка спатыкаецца
Ў паветраных выбоінках.

Сігнал! Шкада, не ведаю
Англійскай хітрай азбукі.
Ідзём уніз, наведаем
Краіну сініх айсбергаў.

Адзенне ў іх парадпае,
Рады іх незлічоныя...
Грэнландыя, Грэнландыя,
Хрыбты у снезе чорныя.

І зноў уверх, і зноў удаль,
З Грэнландыяй пакончана.
І акіянская вада
Пад хмары зноў адскочыла...

Бліжэй, бліжэй да берага,
Чарнее выспаў рой.
І вось мы над Амерыкай,
Над тундраю старой.

Канада ты, Канадзішча,
Бясконцы край балот,
Чым да сябе прынадзіла
Славянскі наш народ?

І, быццам мне пярэчачы,
Яна ўжо ў іншым вобліку:
Лясы, азёры, рэчачкі
І вострыя ельнік бобрыкам.

Канада, ты чароўная
У гэтым новым выглядзе:
Бягуць дарогі роўныя,
Лугі — нібы хто выгладзіў.

Паўзуць аўто пярэстыя,
Нібы кароўкі божыя.
Пейзажы тут не прэсныя,
Хутчэй яны трывожныя.

І хоць ты нам не блізкая,
Цябе адчуць мы здолеем.
Тут нешта ёсць сібірскае,
Магутнае, раздольнае.

Не так, як продкі бедныя,
Не за капейкай меднаю,
Не ў вырай і не з выраю —
Ляцім мы з дружбай шчыраю.

А як вы нас сустрэнеце
(Ці пабліжэе даль?),
Рака імя Лаўрэнція,
Зялёны Манрэаль?

*1960*

## РУІНЫ КАРФАГЕНА

Яго зруйнавалі антычныя варвары
Цяжкою рымскаю лапаї.
Дажджы і сонца руіны вывarвалі
Дваццаць стагоддзяў запар.

Жаўцеюць самотна каменныя соты,
Капаюцца археолагі...
Вайною стаялі на гэтых высотах
Мае і туніскія ворагі.

Сам Ромель стаяў тут,
схуднелы і стрыманы.
Наском парыжэлага бота
Гісторыю кратаў,
Зайздросціў рымлянам,
Хваліў у душы іх работу.

І, пэўна, тупой мазгаўнёй вырашаў ён:
Калі ім зямля пакарыцца,—
Пакінуць руіны Смаленска, Варшавы
І Мінска стагоддзяў на трыццаць.

І гэтак было б, каб мы іх не разбілі,
А мы іх разбілі, развеялі,
Каб людзі усюды рабілі, любілі
І ў дружбу братэрскую верылі.

Капацца я ў хламе вякоў не люблю,
Знаёмлюся з новымі фактамі:
Дзе танкамі Ромель калечыў зямлю,
Аруць нашы мінскія трактары.

Былі б толькі мір ды вось гэтая сінь,
А шчасце народам — дабавіцца!
Гляджу на Туніс з карфагенскіх вышынь,—
І мне Туніс падабаецца.

*1961*

## РАЗВІТАННЕ З КАСАБЛАНКАЙ

Мараканцы нас частуюць чаем,
З мятаю зялёнаю тоїї чаї,
Дваццаць цеплаходаў на прычале
Уласным не паверылі вачам.

Дзівяцца французы і брытанцы:
Звар'яцелі людзі ў Касабланцы,
Порт нязвыклай радасцю гудзе —
Для гасцей савецкіх — песні, танцы,
Тысяча другая ноч ідзе.

Фескі, шалі, цюбецейкі, шапкі...
Словы ад душы: «Савецкі друг».
Юныя танцоўшчыцы-арабкі
Скінулі у нашу чэсць чадру.

Строгі танец маракапскі люб нам,
Гордыя маланкі б'юць з вачэй.
На кастры музыкі грэюць бубны,
Каб яны грымелі ўсё званчэй...

Дык жыві у шчасці, Касабланка,
Беласнежны горад Касабланка,
Мне цябе ніколі не забыць!
Недзе у прасторах акіянскіх
Бубен твой у сэрцы будзе біць.

Ноч прыйшла,
І параход адчаліў.
За бартом — кудлатых хваль грызня...
У сваіх каютах англічане
І французы спяць, што пояць чаем
Іх арабы...
Покуль толькі спяць.

*1961*

## НЕДЗЕ КАЛЯ ЭКВАТАРА

Ля самага экватара
Ёсць вельмі дзіўны край.
Французы зухаватыя
Казалі: «Гэта рай».

І мы яго наведалі.
І што?
Хаджу, маўчу.
Які тут рай, не ведаю...
Лепш скроні памачу,

Бо горача да чорцікаў,
Плюнь — глеба зашыпіць.
Канторскія учотчыкі
Дзень цэлы просяць піць.

Ядуць на рынку сорга
Не з міскі, а з ліста,
Абкручаны вясёлкай
Гандляркі стройны стан.

Раслінласць тут раскошная,
Трапічны нейкі сон.
Тут кветка ледзь не кожная,
Як пляжны парасон.

Сабакі скрозь лятучыя
Ўніз галавой вісяць,
Экзотыка замучае —
Пад пальмай ціха сядзь.

Прабі арэх какосавы
І выпі малако...
А дзеці, дзеці босыя
Жабруюць навакол.

З трахомаю, з праказаю
Калекі ўсё ідуць.
Ускраіны паказваюць
Вялікую бяду.

Пара ратунак даць ім,
Пара іх выручаць!
Але не ўсюды, браце,
І нам «ура» крычаць.

Ў кафэ на белым століку —
У лёдзе ананас.
Чорныя каталікі
Глядзяць, глядзяць на нас.

Нянавісць вочы паліць ім,
Аж бліскае агонь.
Ім не кладзі ў рот палец:
Адкусяць і далонь.

Яны усе клыкастыя,
Яны не прастакі.
Чомбаўскія гангстэры
Вярбуюцца з такіх.

Прыпаяны губой яны
Да золата, да віл.
У іх закон разбойны —
Даві сваіх, даві!

Ах, нудна тут да чорцікаў,
У сэрцы гнеў кіпіць.
Банкіры і учотчыкі
Яшчэ папросяць піць!

*1961*

## ГВІНЕЙЦЫ

Тут многа на беразе пальмаў расце,
Высокіх і трохі пакрыўленых.
За іншыя дрэвы грацней і часцей
Біў шторм іх магутнымі крыллямі.

Ды, гнутыя бурай і сонцам апаленыя,
Ізноў яны высяцца, гордыя,
І самі гвінейцы, як гэтыя пальмы,
Не ўпалі на дол пад нягодамі.

Яны не стыдаюцца бедных хацінак:
Усё ў іх будуецца нанава.
Калі ты іх сябра — сустрэнуць гасцінна
І пачастуюць бананамі.

На тварах гвінейцаў такая сардэчнасць,
Такое давер'е харошае,
Нібыта савецкія людзі навечна
Ў іх сэрцы у госці запрошаны.

Хай спёка кладзецца на плечы цяжарам,
Для верных сяброў тут не душна,—
Мінчанін з гвінейцам пад чарцяжамі
Галовы схілілі дружна.

*1961*

## ГЛЫТОК АФРЫКІ

Чорная Афрыка, ты неабдымная:
То чорная, то саванная;
Ляжыш прада мной то гілеямі дымнымі,
То пустыняю адпрасаванаю.

Я не ўбачыў таго,
Што вандроўнікам бачыць належа:
Ні сланоў,
Ні жырафаў,
Ні караванаў.
Вокам адрэзаў крыху узбярэжжа,
Як кавалак гарачага караваю.

І ўсё ж я адчуў і пабачыў галоўнае:
На ўвесь велічны рост устаюць
Народы, што вечна гібелі галодныя,
І спяваюць песню сваю.

Песню пра Радзіму,
Над якою свабода зноў свеціць,
Дзе спеюць бананы,
Ананасы
І манга;
Дзе цемнаскурыя дзеці,
Як на ўсім белым свеце,
Вымаўляюць перш-наперш
Слова светлае «мама».

І ў Гвінеі, і ў Сенегале
Колькі мужных, прыгожых людзей!
Вы нічога ад нас не схавалі:
Ні усмешак,
Ні бед,
Ні надзей.

Я помню журботны расказ гвінейца:
«Яны тут жылі,
Прагна ўсё скубучы,
Трымалі ў руках сваіх моцныя лейцы
І з насарогавай скуры бічы».

Гаварыў аб мінулым
Сурова і скупа.
А ў канцы усміхнуўся:
«Зразумейце, прашу —
Мы мелі і маем толькі чорную скуру,
А яны мелі чорную надта душу».

Я разумеў, што такое каланізатары:
Народ мой
Няволі і гора нямала глытаў...
А ноччу цыкады
Трашчалі з паўднёвым азартам
І голас трывожны
Здалёку да нас далятаў.

Можа птушка прысніла,
Што пасохла раса,
Можа нечая маці
Ад тугі захлынулася вострай?
А можа гэта блукаў па лясах
Голас Лумумбы
І клікаў да помсты?

А потым сонца ўсплыло
Над трапічнымі краявідамі,
Вялізныя матылі
Пілі агнявую расу.
І крычаў, каб куплялі
Па дзяшоўцы загадкавых ідалаў,
Абарванец вясёлы
На мове су-су.

*1961*

## У ТРОПІКАХ

Забудзь пра снег, забудзь пра гаі цяністы,
Пра сіні дождж, пра свой утульны дом.
Італію мінеш, мінеш Туніс ты,
Пакінеш і Марока за бартом.

І лопне той абруч мерыдыяна,
Што аддзяляў ад тропікаў цябе,
І ў момант ноч над прорвай акіяна
Цябе ў абдымкі душныя зграбе.

Ляжыш на палубе сярод імглы трапічнай,
Гайдае акіян наш цеплаход.
Усё не так, усё тут не тыпічна:
І цемра неба, і зіхценне вод.

І парна, быццам у калгаснай лазні,
Ледзь тлее месяц у імгле сырой.
І ты ў густой і чорнай багне вязнеш
І абрастаеш ліпкаю карой.

Клякоча рухавік, скрыпяць паціху мачты...
І чую нечы я папрок здалёк:
Дзівак, дзівак, нарэшце растлумач ты:
Чаго ты падарожнічаць улёг?

А што тлумачыць?
Хіба растлумачыш
Таму, хто сонным сэрцам атлусцеў
Між дываноў і хатняга ламачча?
Ды я вам не аб тым сказаць хацеў...

Я не адзін цягнік загнаў да поту,
Каб толькі не спазніцца, каб паспець
На тую найвялікшую работу,
Дзе пыл і пот, дзе полымя і медзь.

Дзе тлумны быт і ўзлёт высокай мары,
Дзе можа павярнуцца кожны дзень
Найлепшай ласкай і найгоршай карай,
Любоўю ці пагардаю людзей.

І вось таму, што я ўсмактаў з дзяцінства
Нястомны гул жыцця маёй зямлі,
Убачыць на планеце ўсё дачыста
Мяне гукаюць сёння караблі.

Мне хочацца пабыць між афрыканцаў,
Рукой крапуць, паспрабаваць на зуб
Іх соль і хлеб, іх працу, песні, танцы,
Адведаць, дзе там ходзіць мінскі зубр.

Даведацца: каго абараняем,
Хто супраць нас, а хто супроць вайны;
Хто я — ці госць звычайны, ці радня ім,
Ці знаюць нас, ці вераць нам яны?

А можа я не ўсё кажу праўдзіва,
Хоць не схлусіў, здаецца, я ні ў чым.
А можа рэха стрэлаў разбудзіла
І нечы стогн мяне сярод начы?

Не ведаю...
Бясхітрасна і проста
Сыду на берагі чужыя я.
Хачу зрабіцца хоць маленькім мостам
Між імі і табой, зямля мая.

*1961*

# ВЕЧНЫ АГОНЬ

Кудлатая хмара над Мінскам навісла,
Счарнела у змроку асенняя Свіслач,
Пакрылася лісцем.

Вада ў жоўтых латках. А вецер халодны.
А парк абгладаны здаецца галодным.
На вуліцах — слота.

На мокрым асфальце — рыканне і клёкат.
А я ўсё гляджу, як трапеча далёка
Агонь непагасны.

Нібы партызаны на плошчы туманнай
Расклалі агонь, перавязваюць раны
І лічаць патроны.

У гэткую слоту яны галадалі,
Ірвалі блакаду і сэрцы аддалі
За шчасце Радзімы.

А сёння навекі застылі ў граніце
І бронзе.
Прашу, перуны, не грыміце
Над полымем Вечным.

Сабраны ў агні гэтым іскры пажараў,
Пякучая помста і чырвань штандараў,
Прабітых жалезам;

І белая ярасць спюдзёных маланак,
І гнеўныя вочы удоў-партызанак
Над трунамі паўшых.

І свецяць вянкі чалавечаю ласкай
Каля абеліска.
Асеннія краскі
Жалобаю пахнуць...

12 Зак. 840

Не трэба трывожыць цяжкія ўспаміны.
Хай славіцца дзень нашых подзвігаў мірных
І дзень наш наступны.

Пры Вечным агні людзі шчасце убачаць.
А полымя плешчацца сцягам гарачым
І іскрамі ўсе.

Каму заляцяць тыя іскры у сэрца,
Яно не счарсцвее ў таго аж да смерці
І не зледзянее.

*1961*

## СВІНАРЫ І ЗВАНАРЫ

Усё жыццё ён махаў рукамі,
Не крочыў, як людзі,— сігаў рыўкамі,
Хваліўся такое ў жыцці зрабіць,
Што будзе ў званы пакаленне біць.

Займаўся зарадкай, дыхаў азонам,
Вучыўся, лячыўся за кошт казённы,
Даклады трубіў, на парадах савеў,
Вырэзваў з газет цытаты — навінкі
І так непрыкметна азыз, пасівеў,
Пара падводзіць і вынікі.

А што там падводзіць, а што там лічыць —
Словы хвалы не ліюцца.
Адно ён здолеў бы: прывалачы
Праекты свае рэзалюцый.

А можа дзе ўспомняць яго ў перадоўцы,
Як ён заклікаў змагацца.
Надзея ляжыць на сардэчным донцы
Апошняю аблігацыяй.

Іншым шанцуе, іншым вязе,
У іншых інакшы вынік.
Газеты гудуць аб рэкорднай вазе
Маёрам адкормленых свінак.

Другі праславіўся па экскаватары...
А ўрэшце закончу груба я:
Кайцеся, грэшнікі лысаватыя,
Кайцеся, сівачубыя!

Не зваліцца слава на белыя скроні
(Хоць мецілі вы ў тузы):
Вы ў першым ніколі не йшлі эшалоне,
Ваш мозг не гарэў, не смылелі далоні,
А толькі смылеў язык.

Я рад, што заціхнуў агульшчыны гром:
Час наш канкрэтны і хуткі.
Лепш свінаром, чым званаром,
Падводзіць жыцця падрахункі.

*1961*

* *

Абступяць часам успаміны хмарамі
І распачнуць асенняе выццё:
О, колькі глупства,
колькі звону марнага
Зрабіў за дзень, за год, за ўсё жыццё.

Былі не тыя словы дзесьці сказаны,
І зроблена сто спраў было не так.
Перад народам
вечна абавязаны,
Ў жыцці я не заўсёды быў мастак.

На Прыпяці, на Гайне ці на Друці
Было б лягчэй мне лес на рум вазіць.
Ды я ў людзей не папрашу: даруйце!
Бо ў песнях не хлусіў. Не мог хлусіць.

Не ведаю: ці дарны, ці бяздарны я,
А знойдзенае слова не маўчыць.
І пада мной эпоха легендарная
На караблях у космасе імчыць.

Я ні ў жыцці, ні ў людзях не зняверыўся,
Людскую ласку дбайна берагу.
Вісіць над сэрцам і над сінім верасам
Мядовы пах жыцця і пчолаў гуд.

Хоць на душы бывае часам горка,
Не трызню я у роспачы пра смерць,
Не рвуся пад святло апошняй зоркі
І медзь не запрашу ў жальбе грымець.

І не зраблю заяўку перад смерцю
На славу, каб жыла яна ў вяках.
Хоць не на доўгі час
Хачу застацца ў сэрцах,
А не на злых пляткарскіх языках.

*1961*

## ДЗЕСЯЦЬ ТРАКТАРАЎ

Пахлі вуліцы восеннiю, яблычным водарам,
Калі дзеці ўцякалі ад строгіх матуляў.
Бразгаталі старымі каструлямі, вёдрамі,
Валаклі пакалечаную арматуру.

Не прасілі нічога ў дарослых, не клянчылі,
Гордыя і незалежныя змалку.
Свяціліся гальштукаў алых агеньчыкі
На цёмных задворках,
На пыльных звалках.

Адны спагадліва моўчкі пасмейваліся,
Другія сур'ёзна казалі ім: «Дзякуй!»
Стылягі іржалі, але не асмельваліся
Кпіць: яшчэ стукне пацан жалязякай.

За гэтую працу ніхто не заплаціць,
Гэты лом —
падарунак іх першы народу.
Абдзёрта рука? Перапэцкана плацце?
Пачысцім шчоткай. Памажам ёдам.

І выраслі марсіянскія горы
Са зламесным налётам чырвонай іржы.
І пераможна трубілі горны:
Добра дружыць, спаборнічаць, жыць!

...Горы сонца на асфальт накіданы.
Век жыві, працуй, не старэй!
Дзесяць трактараў, дзесяць блакітных
Робяць па праспекце ганаровы рэйс.

Не люблю я слаўцо сухаватае — «вынікі»,
Гальштукі сёння зліліся ў зару.
Сціплай гордасцю вочы гараць імяніннікаў,
Кожнаму хочацца сесці за руль.

Дзяўчынкі ў вясёлых сукенках,
Хлопчыкі ў шапках пацёртых,
Вы нядрэнна зрабілі свой галоўны урок.
І сягоння Радзіма вам ставіць пяцёркі
За ваш першы камуністычны крок.

*1961*

## ДЗЕЦІ НА ЗОРНАЙ РАСЕ

Вясна.
Вясна небывалая!
Імклівы і песенны час.
Горнымі абваламі
Падзеі засыпалі нас.

Мы ад зор не паспелі адвесці
Вочы, поўныя гордай любві,
А забойцы у нашыя песні
Плёснулі хваляй крыві.

Ад гневу счарнелі нябёсы...
Мой радасны, горкі мой год!
І трызняць драпежныя босы,
Што бомбы і матчыны слёзы
Прымусяць забыць наш «Усход».

Не бачаць — іх злосць асляпіла —
Ні земнай, ні зорнай красы.
...Абсыпаны сонечным пылам
Разлівы вясновай расы.

І тысячы басаногіх
На той расе хлапчукоў.
Іх зорныя клічуць дарогі
На старце касмічных вякоў.

І ў Кубе малыя кубінцы,
Што ўчора хавалі братоў,
Сняць сны аб касмічнай кабінцы,
З іх кожны к палёту гатоў.

Сястра мая родная Куба,
Тваёй перамозе я рад.
Але хлапчукоў белазубых
Бамбіць зноў збіраецца кат.

Спяшаецца да бамбавоза
За жменю халуйскіх манет.

Пагроза,
Пагроза,
Пагроза
Ізноў наплывае на свет.

Прывыклі да розных пагроз мы.
Ляціце вышэй, караблі!
А мы, ірвануўшыся ў космас,
Сваёй не разлюбім зямлі.

І мары дзяцей аб планетах
Ад смерці заслонім усе.

Вясна.
А наперадзе лета,
І ў космасе нашы ракеты,
І дзеці на зорнай расе.

*1961*

## СЛУХАЙ, РАДЗІМА!

Маці мая, Радзіма,
Шчыра слова сказаць дазволь.
Па цяжкіх ты дарогах хадзіла,
Праз галечу, праз бої і боль.

Пэўна б, горкаю, невыноснаю
Рэчка долі тваёй цякла,
Калі б ты найлепшых сыноў сваіх
Камуністамі не наракла.

Ты свой лёс даверыла ленінцам.
Слухай, маці, голас Крамля:
Дваццаць год міне —
Пераменіцца,
Запраменіцца шчасцем зямля.

Па натхненню і строгаму графіку
Маладзець, багацець будзеш ты...
Дэлегацкія біяграфіі —
Гэта твой жыццяпіс залаты.

Дык заходзь жа на з'езд і горда
Сядзь між лепшых сваіх дзяцей.
Паглядзі:
Камуністаў кагорта
Туліць будучыню да грудзей.

Каб змагла ты яе дачакацца,
Каб змагла Камунізм ты сустрэць,
Будзем самі сівець мы на працы,
А табе не дазволім старэць.

*1961*

## У КОСМАС!

Чэсць і слава першым зорным лётчыкам!
Лопнулі зямныя абручы...
Зоркі неспакойныя да хлопчыкаў
Стукаюць у вокны штоначы.

Сёння ўсюды ўсе гудуць аб космасе:
Мудрацы і дыназаўры коснасці,
Тыя, што пра зоркі вечна марылі
І ў народны светлы геній верылі,
Нават тыя, што праекты парылі
І на грошы справы свае мералі.

Сам я, паглытаўшыся тэорый,
Ухапіцца б рад за млечны шлейф,
Каб дазнацца, хто там метэоры
Кідае на нас, каметы шле.

Працы ў зорках — акіян бязмерны,
Важна, што мы здолелі пачаць.
Сотні новых Юрыяў і Германаў
У калысках радасна крычаць.

Хутка да смаленскіх і сібірскіх
Смельчакоў прымкне і хлопец наш.
З касманаўтаў віцебскіх і мінскіх
Створым мы надзейны экіпаж.

Столькі будзе караблёў запушчана,
Што не хопіць пальцаў іх злічыць!
Крыўдна, што
сама Зямля
запушчана,
Трэба ратаваць яе, лячыць:

Ад вайны, ад вадароднай пошасці,
Ад людское прагнасці і пошласці,
Каб вяртацца было люба з космасу
На планету чыстую і росную.

*1961*

## СЭРЦА МАЁ

Пастукала сэрца
У клетку грудную:
— Мне сумна у клетцы,
Ты чуеш?
— Чую.

Чаго, неспакойнае,
Ты захацела,
Чаго, непакорнае,
Ты затрымцела,
Сэрца маё?

— Як быць мне з пакутай,
З тугой пякучай,
Калі я прыкута
Да той, пявучай
Дзяўчыны?

Ты мне пра радасць,
Я — ва ўспаміны,
Ты — на парады,
Ты — на парады,
Я — міма, міма...

— Той колас зжаты.
То не каханне,
То зорак жарты
І калыханне
Начнога лісця.

Сябе любіла,
Сябе ляпіла,
Высокі церам
З другім купіла.

Яе сяброўства —
Нібы бяроста:
Успышка. Цемра.
Ні зор, ні церама.

Маўчы лепш, сэрца.
А будзеш гэткім —
Зламаю рэбры,
Выпушчу з клеткі.

Ідзі, бадзяйся
За ёю вечна,
Я ж застануся
Лепш бессардэчным.

Што? Жыць без сэрца?
Не маю права!
Мне не дазволяць
Людскія справы,
Людскія вочы,
Людская вернасць.

Глядзі без суму
На свет бязмерны,
Грымі ў прыбоях
Без перабояў,
Сэрца маё.

*1961*

# ВЕРШЫ ПРА ПАЛЕССЕ

1

Лётаў да Ніягары.
Бадзяўся каля экватара,
Купаўся ў Сарэнта
І пёкся
На мармуровым Акропалі,
А свайго залатога Палесся
Не выпіў пiводнай кварты,
Глынуў з той крыніцы
Ў юнацтве
Некалькі сініх кропляў.

Я вечна зайздросціў
Сівым акіянскім прасторам,
Успененым штормам,
І мачтам,
І зорным марскім маякам.
А тут жа лясы навальнічныя
Штормам шумелі ўчора
І кастры партызан
Маякамі здаваліся нам.

Што паездзіў
Па нашай планеце —
Не каюся:
Гарачэй сэрца горнецца
Зараз да роднай зямлі.
Мы, Палессе, з табой
Заўтра чаек марскіх дачакаемся,
Паплывуць праз бары
Караблі,
Караблі,
Караблі.

2

Ты спрадвеку ўсім сэрцы трывожыла
Першароднай журботнай красой.
Ты ляжыш непаўторна прыгожае
У вянках сінявых лясоў.

Салаўінае і зубрынае
Не застоілася ў цішыні,
І гарацъ над усёй краінаю
Светлагорска твайго агні.

Тут у Лельчыцах сэрцы лечацца,
І у Добрушы добра жыць.
Задушэўная песня Рэчыцы
Можа кожнага заваражыць.

Век хадзі і любуйся,
А стомішся —
Ля агню на узлессі прысядзь.
Ля былых партызанскіх стойбішчаў
Туманы на ялінах вісяць.

Ты пачуеш тут на змярканні,
На світанні пачуеш ты
Зязюль куванне,
Ласёў рыканне
І матораў голас густы.

3

Два моры рукі працягнуць з даляў
(На мачце ўспыхне зыркі агонь),
Блакітнай хваляй стукнуць у хвалю,
Нібы тугою далоняю ў далонь.

І хлынуць, хлынуць дабра патокі.
Да сініх бухтаў праз бары
Саракатонкі і кужаль тонкі,
Соль Салігорска і трактары.

З янтарнай Балтыкі і Чарнамор'я
Злятуцца чайкі і прынясуць
На крыллях водбліск марскіх сузор'яў,
Шмат новых казак і новы сум.

І будзе ўспомніць матросам люба
Пад грукат шторму ў чужых марах
Дзяўчат палескіх вочы і губы,
Бароў палескіх сунічны пах.

*1961*

# РАСКАЗ АБ ЗАГІНУЎШАЙ ДРУЖБЕ

Падвесці рысу? Калі ласка,
Давай, брат, рысу падвядзём...
З табою па дарозе гразкай
На дальні хутар мы ідзём.

Цвітуць сады. А нам па дваццаць.
Вясновы салаўіны чад.
І мы з табою закахацца
Паспелі ў хутарскіх дзяўчат.

Мы ненавідзелі той хутар,
І злосны позірк іх бацькоў,
І брэх выжлятнікаў прыкутых,
І насцярожанасць замкоў.

Ды нас даверліва чакалі,
І мы па сцежцы след у след
Ішлі туды
І абяцалі
Дзяўчатам тым шырокі свет.

Яны ў той свет з другімі выйшлі,
Вайна адбіла іх ад нас.
А салавей над белай вішняй
На фронце сніўся мне не раз...

Мы сустракаліся не часта
Пасля вайны.
Ты палысеў.
Хадзіў гадамі ў райначальстве,
Пасля ў калгасе дзесь асеў.

Пазней цябе з старшынь калгасных
Праперлі.
Стаў ты невідзён...
Падвесці рысу? Калі ласка,
Давай, брат, рысу падвядзём.

Цябе сустрэў я выпадкова,
Твой дом убачыў, хлеў і тын.

— Знайшоў шчаслівую падкову,—
Пажартаваў з ухмылкай ты.

У два паверхі дом. Камоды.
І віск у хлеве парасят.
І вепрукі, і вуллі мёду,
І фальварковы пышны сад.

Пад вокнамі ніводнай кветкі,
Часнок ды памідораў жар.
Адвозіць іх матацыклетка
Аператыўна на базар.

Такі і сірат ашукае,
Забыўшы смак сухіх пайкоў.
На сэрца прагнае сцякае
Тлушч рыжы з дымных кумпякоў.

Няўжо аб гэткім шчасці марыў,
Калі, паклаўшы на траву,
Табе Радзіма белай марляй
Забінтавала галаву?

Не ўспамінай баі, завеі
І дні юнацтва не лістай.
Ад спраў тваіх заіржавее
Неіржавеючая сталь.

Ад спекулянцкай той зарплаты
Разбагацеў, раззалацеў.
Скажы: ты з радасці заплакаў,
Калі Гагарын узляцеў?

Адкінь усё і крыкні: «Годзе!»
Інакш між нас да скону дзён
Сяброў не знойдзеш і не дойдзеш
Туды, куды мы ўсе ідзём.

Ах, жонка, пчолы, апаросы...
Усё закончана. Маўчы.
Здаві лепш глотку папяросы
І знікні ценем уначы.

*1961*

## ЯМБЫ

1

Мне надакучылі малебны
У шалашах звычайных дат,
Ружовы дым, і гул хвалебны,
І хітра скроены даклад.

Ледзь не штодня са сцэн бялеюць
Прэзідыумныя ілбы.
Занадта многа юбілеяў,
Занадта многа пахвальбы.

Асколкі сонца на вясле,
Асколкі сонца на асле...
Нібы няма ўжо спраў. Нібыта
Да зор арбіты ўсе прыбіты.

Злятаюць годы вялым лісцем,
Спрабуе бронзу хтось на зуб...
Скажу такому пару ісцін
Скрозь юбілейную слязу:

Не стаў сабе дачасна помнік
І у бяссмерце не спяшы,
Лаві не ўласнай славы промні,
А сонца кожнае душы.

Цурайся слоў пустых і сцёртых,
Як трубкі школьных турнікоў.
Дарэмна слава распасцёрта
З чарговай порцыяй вянкоў.

На капшукоў нацыянальных,
На канцылярскае дуб'ё,
На салаўёў правінцыяльных,
На паэтычных вераб'ёў.

Сябры мае, жыццё будуйце,
Гадуйце весела малых,
Усмешак людзям не шкадуйце
І не шкадуйце тым хвалы,

Хто справу любіць больш за славу.
Хвалі чысцей, хвалі прасцей
Герояў ворыва і плавак,
Хто і працуе і расце.

Калі ўжо свята, то каб свята,
Як маі у хвалях кумача.
Калі ўжо дата, то каб дата,
Як нараджэнне Ільіча.

2

Гары, агонь мой непагасны,
Звіні, радок, са сталлю ў тон.
Хоць мой уласны конь пегасны
Б'е часам глуха капытом.

Пра ўсё мы пішам так прачула:
Пра лёс і лес, пра лён і лом.
Эклектыка, ты нас крапула
Сваім запыленым крылом.

Паведамленне рве антэны,
Што лёг Цітоў між зорак спаць,—
І ўсе накінуцца на тэму
І ну пайшлі пяром кляпаць.

Я сам на подзвіг той дзівіўся,
Маліўся на той зорны след,
Але ад шчасця не давіўся
Халтурнай жменяю манет.

А тут бягуць да каравая
З наборам штампаваных слоў.
Глухая спеўка харавая,
А трэба звонкіх галасоў.

А друк і радыё развеюць
(Ты толькі вушы падрыхтуй)
І геніяльныя ідэі,
І несусветную лухту...

Мы пераконваем заўзята
Адзін другога з дня у дзень,

І перакоўваем брат брата
Пад акіянскі гул падзей.

Клянёмся зноў палотны выткаць
Выдатныя.
Ды вось бяда:
Мы маем многа перажыткаў
І нам іх крышачку шкада.

Пад шум лясоў, пад шэлест жыта
Лепш быць да смерці маладым.
Давайце скінем перажыткі
Ў адзін касцёр — на дым, на дым!

І напрацуемся да поту,
А недзе там — далей, далей,
Пасля усёй, усёй работы
Хай скромнасць справіць юбілей.

*1962*

## ЛЯ МОРА

К богу ўсе праекты і машыны!
Сонца чарнаморскае гарыць.
Трацяць розум тоўстыя мужчыны,
Вершам пачынаюць гаварыць.

Шэлест пальмы крышачку бляшаны,
Ды затое хвацкая вада.
Дзякуй прафсаюзу за пашану:
На пуцёўкі сонца даў дык даў.

Сонца з намі ладзіць, як з пасламі
Больш халаднаватай стараны.
Пазнаюць сябры сяброў па шрамах —
Агнявых аўтографах вайны.

Вось ляжаць на санцапёку двое.
Хто яны? Не знаю. Галышы.
І пад шум лянівага прыбою
Нешта ўспамінаюць ад душы:

— Помніш абгарэлыя шпакоўні?
— Помніш: ты за кашай задрамаў?
— Помніш: нейкі лысы падпалкоўнік
Нас па стойцы «смірна» век трымаў.

Успаміны іх усхвалявалі.
Б'юць ныраца. Хай мора асвяжыць.
І сябрамі ўздыбленая хваля
Да партоў турэцкіх дабяжыць.

*1962*

## У ЦЫРКУ

На вуліцы ціхаї Купалы
Пад купалам з цынка
Пражэктары паляць,
Звяры выступаюць,
Звяры перасоўнага цырка.

Матляюць галовамі тупа:
«Ах, гэта усё не к дабру...»
Узлазяць на яркія тумбы,
Праз вогненны скачуць абруч.

Вось так гадаванцы Судана
На хлебе акцёрскім жывуць...
З іртамі чырвонымі дамы
Лісіц серабрыстых жуюць.

І што ў іх за прагныя твары!
А вунь спачувальны пагляд.
Устань жа, кудлаты таварыш,
Ільвінае сэрца пагладзь.

Адзінае цешыць іх: дзеці,
Іх вочы так хораша свецяць.
Дзяцінае жорсткае племя
Аж стогне ад захаплення.

Ім заўтра усім на занятκі,
Над партай схіляй галаву.
А зараз у іх вачанятках
Варушыцца па ільвянятку
І па вялікім ільву...

Звяры, што маглі, паказалі
У нас, як нядаўна ў Казані.
Ільвы засынаюць у цемры,
Ім сняцца прыгожыя зебры.

Іх зноў павязуць,
Пакатаюць
Па Швецыі і на Кітаю.
А я цябе, цырк, пакідаю,
Надоўга цяпер пакідаю.

*1962*

## ПАДМЯТАЛЬШЧЫЦЫ

Зара дае заяўку на світанне,
Як хочацца свой сон дасніць, паспаць.
А ў гэты ранні час з мятлою танец
Жанчыны пачынаюць танцаваць.

Бялеюць фартухі. Як косы, свішчуць мётлы,
Матляецца на белых сценах цень,
Каб цокалася лёгка самым модным
Абцасікам дзявочым цэлы дзень.

Накідалі п'янчугі ці прыдуркі
Газет абрыўкі, шкло, шматкі праграм.
Падвязкі нечыя, з памадаю акуркі,
Лупінне апельсінаў каля брам.

Яны не лаюць нас, а ўсё мятуць бясконца,
Як сёстры міласэрныя зямлі.
Ім памагло закончыць працу сонца,
Вятры астаткі пылу замялі.

Хвала тварцам ракет і камбайнёрам,
Спартсменам, горнавым і маракам.
І вам, хто мые, як дзіця, наш горад,
І вашым добрым матчыным рукам.

*12.V.1962*

## ЦІШЫНЯ

1

Дні бываюць такія пакутныя:
Застаешся чамусьці без сіл.
Ты садзішся хутчэй на папутную
І ўцякаеш за небасхіл.

Па шашы па трохтонцы калоцішся..
Прыязджаеш. На ганку сядзіш.
Цішыня выплывае з калодзежа,
Туманом расплываецца ціш.

Ты даўно сюды ў госці запрошаны,
Сёстры пояць цябе малаком.
Падрастаюць гаі тут харошыя
Пад наглядам адных аблакоў.

Нацягаешся, наблукаешся
Між зялёнай густой цішыні.
Ты расчулены. Нават каешся,
Што раней не бываў у радні.

Скваркі смажацца. Смех і гамонка.
Мёд, як сонца. Чаго ж не стае?
І падпольная самагонка
Сарамліва ўстае на стале.

2

Тонкім голасам кнігаўкі жаляцца,
Асыпаюцца ў мох суніцы.
Набліжаецца, набліжаецца,
Набліжаецца навальніца.

Я ляжу на ўзлессі па пожні
Між сасноў і вярбою.
Стала ціха наўкол і трывожна,
Так бывала заўжды перад боем.

Скалапуўся ад горкае думкі:
На траве многа летаў назад
Тут з вінтоўкай ляжаў і падсумкам
Наш ці іхні забіты салдат.

Нават стогны яго я пачуў
І хрыпаты гарматны грукат...
То ідзе навальніца,
І ляпаць пачаў
Дождж мяне па плячы, быццам друга...

Не, няпраўда, што плача па мёртвых дождж.
Гэта байка паэтаў.
А плачуць ад сілы
Ну адна, можа дзве... ды хто-небудзь з удоў...
І па мне маці раз у вайну галасіла.

3

Смачна спіцца на пахкім сене...
Толькі скуль гэты жудасны гул?
Вадароднае землетрасенне!
Я усхопліваюся і бягу.

Хаты змецены. Курчацца коні.
Я бягу па агрызках дарог.
Вецер хмары барвовыя гоніць.
О зямля, я цябе не збярог.

Дзе вы, дзеці мае? Дзе ты, пожня?
Дзе ты, гай мой у сіняй расе?
Толькі кнігаўкі крык апошні
Даляцеў і сэрца рассек...

Прачынаюся. Навальніца
Ўсё бушуе і слепіць свет.
Да магілы вайна будзе сніцца
Папярэджаннем будучых бед.

Цішыня мне здалася пакутнай.
З гэтых слаўных і ціхіх дуброў
Уцякаю на першай папутнай
Да трывог, да дзяцей, да сяброў.

*1962*

## ПОЛАЦКАЯ ПРАФЕСІЯ

Тут войны жалезнымі рылі лычамі
Зямлю.
Тут гісторыі моцны настой.
Не паспелі агледзецца палачане,
А Полацку стукнула тысячу сто.

Ды ён не струхлеў за бясконцыя годы,
А плечы свае развінуў.
І вежы Сафіі
І нафтазавода
Без спрэчак глядзяць у Дзвіну.

Калісьці мы тут партызанілі ў лесе.
«Агонь!» — аж гуло па радах.
І рускі народ агнявыя прафесіі
Табе, Беларусь, перадаў.

Заволжская нафта ў зямлі яшчэ плешчацца,
У сховішчах тых,
Дзе ляжала вякамі,
А хлопцы з Бабруйска, Барысава, Плешчаніц
Сябе палічылі ўжо нафтавікамі.

Пакінулі смела куткі яны матчыны,
Не спалі па днях, па начах,
Каб стала прафесія гэтая спадчыннай
Для Полацка і палачан.

Палае на беразе дзвінскім крутым
Наш факел,
І вечар — як ранак:
Каб дружба не гасла,
Прыслалі браты
Раку спрасаваных маланак.

*1962*

## РАЗМОВА З НАШЧАДКАМІ

Неверагодна, неверагодна!
Мы ўжо для будучыні непрыгодны,
І для сучаснасці мы непрыгодны:
Нашы нашчадкі —
Люд не лагодны.

Мы кансерватары ўсе
Тупаватыя,
Вы — завадатары бур
І наватары.

Мы ўсе аўральнікі,
Культу стваральнікі,
Вы — праўдалюбцы,
Хлусні выкрывальнікі.

Вам цаліна,
І нейтроны,
І космас.
Нам — пасяджэнняў
Шаблонная поснасць.

Нам старамодныя густы
У гіпсе.
Вам — алімпійскія гульні
І ліпсі.

Вам з-пад дзявочых павейкаў
Іскрынкі.
Нам — дагрызаць
Успамінаў скарынку.
Мы — гераічныя,
Вы — іранічныя.

Змоўкніце на міг усе іронікі:
Нам гарчэй успамінаць аб кульце.
А салдацкай веры і героікі
Не чапайце і не крытыкуйце.

Нашы душы і без вас памучылі
Кар'ерысты, хамы, спекулянты,
Валакітчыкі і валютчыкі,
Аглабельшчыкі і пасквілянты.

Хоць здавіла
Праўда нас шурпатая,
Ні на міг
Не згасла вера ў партыю.

Нашы сэрцы
Не ў дагматным воцаце,
Ленінскі агонь
У нашым вопыце.

Мы яшчэ
Прыгодны да паходнага
Да жыцця пяхотнага,
Спякотнага.

І да жывёльнай
Напружнасці мускулаў,
І да магілы
Салдацкай, вузкай.

Гэта не толькі для нас прывілегія —
Гінуць
Ці век валачыцца калекамі.
Будзем, па ўсякі выпадак, калегамі.

Тут не шукайце
Ні крыўды,
Ні злосці.
Гэта не рэквіем
Па маладосці.

Гэта не двух пакаленняў
Сварка,
Гэта эпохі
Гарачая зварка.

Двум пакаленням
За працай не цесна:
Мы з аднаго
Ваяўнічага цеста.

Марым і верым,
Працуем і лаемся,
І ухмыляемся,
І захапляемся:

Ёсць каму
Верна стаяць ля ракет,
Ёсць каму
Лётаць у зорны сусвет.

Толькі і нам, пастарэўшым,
Не сорамна
Марыць пра космас
І гутарыць з зорамі:

У юнацтве мы некалі перажылі
Развітанне з зямлёй і тугу па зямлі.

У сорак першым, далёкім і горкім,
На пераправах ішлі мы ка дну,
Марачы ўбачыць чырвоную зорку,
Хоць бы адзіную, хоць бы адну,
На крыле самалёта.

*1962*

## НАЙМА

Я з мірным ранкам цябе вітаю,
Алжырскі краї мої!
Тваю дачку я успамінаю
Па імю Найма.

У Ля-Гулеце, у Ля-Гулеце,
Тунiскім порце,
Сінела мора, гулялі дзеці
Ў янтарнай спёцы.

На лагер бежанцаў з Алжыра
Глядзеў я з болем.
І размаўлялі мы там аб міры
Пад шум прыбою.

Казалі горда яны, без плачу,
Што мір настане.
Нам давялося тады пабачыць
Алжырскі танец.

Віхрыўся бубен, струна звінела,
Стагнала дудка.
Ты на памосце зашалясцела
Галінкай гнуткай.

Трапеча кожная
На Найме жылка.
Нас растрывожыла
Ты ўсіх, алжырка.

Са страсцю, гумарам
Ўсё скачаш, скачаш,
А ноччу ў нумары
Ўсё плачаш, плачаш.

У гэты вечар арабскі танец
Мы палюбілі.
І мы і хвалі аж да світання
Ў далоні білі.

Падвезлі казку мы з Ля-Гулета
На цеплаходзе...
Гукаю з даляў: «Друг Найма, дзе ты
Сягоння ходзіш?»

Ляці, мой верш, да гор Атласкіх,
Глянь Найме ў вочы.
Калі ў іх шчасце убачыш — з ласкай
Кранi званочак
На бубне Наймы.

*1962*

## ТЫСЯЧА НЕБАСХІЛАЎ

Такі наш век:
не падай у знямозе!
Жыві між бур, маланак і трывог.
Ў дарозе я,
а ўжо ў маім абозе
Тры тысячы маткоў зямных дарог.

Хоць тысячы цудоўных небасхілаў
Я перасек і ўбачу шмат другіх,
Пра небасхілы бацькаўшчыны мілай
Не мог нідзе я думаць без тугі.

Як соладка да іх мне прабівацца
Праз зараснік дажджу і бліскавіц.
Як добра
сонцам родным упівацца,
Духмяным сокам вішань і суніц.

У мора улюбляюцца,
і у горы,
І ў мёртвыя пустыні, і ў пяскі.
А я люблю
сінь неба па-над борам,
Світанняў залатыя паяскі.

Блукаў па свеце,
як па джунглях цёмных.
Быў самым светлым дзень мой там, калі
Купаўся я ў заліве з негрыцёнкам
Ля вольнае гвінейскае зямлі.

Няхай мяне пустыя снобы лаюць,
Што зноўку я ў рыторыцы паграз.
Я сто разоў пісаў і паўтараю:
Жыць чалавеку добра толькі ў нас.

І мне шкада людзей тых слепаватых,
Што вераць, быццам за марамі лепш.
Зямля мая, сама ты вінавата,
Што лёгка многім свой даеш ты хлеб.

Я твой увесь, ад сэрца да пазногцяў,
І горла сам таму перагрызу,
Хто кіне на цябе хоць кроплю дзёгцю,
На гонар твой, магутнасць і красу.

Служу табе, пакуль хапае сілы,
Скупым не стану нават і стары.
А тысячу апошніх небасхілаў
Я людзям рад сягоння раздарыць.

*1962*

# ПАТРЫЯТЫЧНАЯ ПЕСНЯ

Паэма

## I

Быў гэты дзень для нас усіх адметны!
Змывала даль начную сіняву,
А купал неба, залаты і медны,
Зваліўся у бяздонную Няву.

Гулі гудкі, лавілі рэха аркі.
І ўсё ж была такая цішыня,
Што чуўся за вярсту ад сініх паркаў
Патрабавальны голас птушанят.

Спяшаліся на працу ленінградцы,
І помнікі іскрыліся расой...
Прабачце мне, цудоўныя палацы,
Не вашай любаваўся я красой.

Я ў гэты ранак моўчкі пакланіцца
Прыйшоў табе, бяссмертны Ленінград,
Ад нашых ніў, і пушчаў, і крыніцаў:
Ты — першы рэвалюцыі салдат.

Прастор Нявы, масты, і шпіль, і Зімні,
І кожны мур, і кожны камень твой
Гучаць у сэрцы, нібы словы ў гімне,
З якім бацькі выходзілі на бой.

Я не магу адплыць у шлях далёкі,
Пакуль душой не прыпаду ізноў
Да тых крыніц, да тых святых вытокаў,
Што напаілі племя змагароў.

Не будзе мне ні праўды, ні натхнення,
Пакуль я не прайду па месцах тых,
Дзе жыў, тварыў, гарэў наш светлы Ленін,
Каб разагнаць стагоддзяў змрок густы.

Гляджу з-пад крылляў аркі я на плошчу:
Вось тут каціўся грозны вал людзей.
І ў сэрца б'е далёкі стрэлаў пошчак,
І плошчай Рэвалюцыя ідзе.

І я ўжо шчодра тым узнагароджан,
Да смерці буду гэтым даражыць,
Што быў я у Семнаццатым народжан
І ў новым свеце стаў адразу жыць.

Хваліцца гэтым права я не маю.
Даруй, Радзіма, ды ў сваім жыцці
Сябе тваёй галінкай адчуваю,
Якой на іншым дрэве не расці.

І па якіх дарогах ні паеду,
І па якіх марах ні паплыву,
І дзе ні прыпынюся,— маці, ведай:
Тваім жыццём, табой адной жыву.

І можа нейкім землям непагодным,
Забраўшы ў сэрца ўсю тваю красу,
Я з полымя Семнаццатага года
Хоць іскарку малую занясу.

II

Не з восеньскай нуды і не з адчаю,
З адкрытым сэрцам, з радаснай душой
Апоўначы на захад я адчаліў.
Бывай на час, любімы горад мой!

Апошні раз зірнуў руплівым вокам
На нас маяк кранштацкі і пагас.
Я ў гэты час адчуў, што дзесь далёка
Успомніў нехта добрым словам нас.

Прабег па сэрцы і па кожнай жылцы
Салодкі і журботны вецярок...
Я сёння не збіраюся лажыцца,
А буду піць вятроў салёных сок.

Прыладзіўся, расчулены і смешны,
Ля якара тайком ад дружбакоў...
Вось так і распачаў свой рэйс замежны
Нашчадак беларускіх батракоў.

Са мной такіх, як я, семсот ці болей
На «Грузіі».

І многім не заснуць...
Я крышачку злуюся мімаволі,
Што нас цяпер турыстамі завуць.

Я вывучаў Еўропу не турыстам,
Ратуючы яе, ішоў на смерць,
Поўз па гразі, па кручах камяністых,
Каб на зямлі сяброў сумленных мець.

Каб мірным днём краіны іх адведаць,
І ў госці запрасіць, і падружыць.
Мы не турысты.
Мы цяпер паўпрэды
Сваёй зямлі, дзе хораша так жыць.

Мы ўнукам будзем некалі расказваць,
Якой радзіма шчодраю была,
Як цеплаход з такою цёплай назвай
Для вандравання нашага дала.

Дык дзякуй вам за чэсць і падарунак,
Мая радзіма, мудры мой народ!
Шуміць заліў.
На Хельсінкі кірунак
Трымае белагруды цеплаход.

III

Ён зноў ажыў, той незабыўны вобраз:
Вакзал Фінляндскі.
Ленін.
Бранявік...
Зялёная Фінляндыя, дзень добры!
Прывет табе ад Волгі і Нявы.

Наш цеплаход да самага прычала,
Шум перакрыўшы стомленых вінтоў,
Суправаджаў эскорт крыклівых чаек.
Мы ў Хельсінкі.
На беразе — натоўп.

Хто выдумаў, што тут народ суровы?
Плячыстыя асілкі і жанкі
Сустрэлі нас сяброўскім шчырым словам
І поціскам мазолістай рукі.

Няхай там пейкі тып і глянуў коса
На нас, на наш чырвоны горды сцяг,
Мы знаді ўжо: не ён галоўны козыр
І не ў яго мы сёння у гасцях.

Адменных вуліц, плошчаў тут нямала,
І кветнікаў, і вечна свежых рос.
Змяшаліся азёры, сосны, скалы
З праспектамі і плошчамі тут скрозь.

Якія трэба мужныя мець сэрцы,
Каб, процьмаю пагардзіўшы пакут,
Мільёны скал рукамі перацерці
І загадаць садам: «Цвіціце тут!»

Я гадаваўся ў пушчах паміж багнаў,
Я помню, як нас біў калісь няўрод.
Такі ж і ў нас, як тут, да працы прагны,
Хоць з іншай, лепшай, доляю, народ.

Не мог я з гэтым краем не сустрэцца!
Зямлі я фінскай пакланіцца рад,
Бо Ленін з рэвалюцыяй у сэрцы
З Фінляндыі прыехаў ў Петраград.

Змяркалася.
Дажджу густую сетку
Накінуў вечар на муры...
Пара!
Да пабачэння, добрая суседка!
Жыві спакойна: побач Ленінград.

IV

Ад нуднай гайданкі слабейшыя скіслі.
І раптам прад намі так мірна пралёг
Канал нешырокі, па імені Кільскі:
Направа — дуброва, налева — лог.

Ён здаўся будзённым такім і звычайным
(Мы селі недзе нават на мель).
Абапал палеткі дагледжаны дбайна,
Маленькія хаткі загорнуты ў хмель.

Паважна плывуць караблі нам насустрач.
Махае дзятва з-пад нямецкіх ракіт.
То катэр замурзаны выскача шустра,
То танкер цяжкі праплыве, нібы кіт.

На ціхія сёлы глядзім і на гоні —
Зямля, нібы ў нас на Палессі, і люд,
Відаць, працавіты.
Забыўшы аб Боне,
Ён часта нам шле свой нямецкі салют.

Не хочацца кратаць нічога старога,
І я расклейваюся пакрысе...
Наперадзе ўзняўся выразна і строга
Агромністы мост у жалезнай красе.

І раптам заснежыла, замільгацела —
Віхура лістовак зляцела на нас.
Шаблонная подласць! Усё зразумела:
На фронце мы бачылі гэта не раз.

Ахоўнікі жлукцяць на беразе піва,—
Як слаба ахоўваюць немцы масты!
А з моста нягоднік крычаў нешта кпліва,
Паказваў пальцам кудысь за кусты.

Здавалася, рукі паветра пэцкалі:
Крыўляўся, як дурань, і нешта плявузгаў.
Ён блытаў англійскія словы з нямецкімі
І толькі лаяўся ўсё ж па-руску.

Адкуль узялося такое страшыдла?
Няўжо ён радзіўся на нашай зямлі?
Вось лёс адшчапенцаў,
Вось здраднікаў шыльда,
Праклён і гора нечай сям'і.

Чым здраднікам быць — лепш у муках
памерці!
Працялі наскрозь нас пагарда і гнеў.
За борт мы шпурлялі агіднае смецце,
І мутны канал яшчэ больш памутнеў.

V

Не, не для нас такі гнілы тавар!
Плывём далей каналам.
Вось і прыстань...
Мы з немцамі стаім да твару твар,
А выйсці нельга: страшныя турысты!

Ля бара грузчыкі маўкліва піва п'юць
І нешта думаюць.
А дзеці, дзеці, дзеці
Вітаюць нас, смяюцца і паюць,
На цеплаход не могуць наглядзецца.

Маскоўскія цукеркі ім даём,
Паліцыянт глядзіць галодным воўкам...
А хто там, каля бара?
Гэта ён:
Бялёсы чуб, рубец пад левым вокам.

Я тут не памыліўся: гэта ён!
Трынаццаць год прайшло... І вось
сустрэў я...
Ганс Апенкранц, я ўзяў цябе ў палон
Пад Оршаю, і ты чакаў расстрэлу.

А мы цябе не расстралялі, не,
Не з ласкаю, а ўсё-ткі накармілі.
І ты, разгублены, шаптаў: «Капут вайне»
І плакаў поччу аб радзіме мілай.

Чаму ж не сустракаеш ты мяне,
Як госця?
Хто замкнуў твой рот, твой голас?
Ну, што ж, давай маўкліва аб вайне
Пагутарым, салдат мой невясёлы.

Табе пашанцавала, што сустрэў
Тады ты нас.
Цяпер падумай смела,
Што будзе, як на твой гарматны стрэл
Сто нашых адзавецца гнеўных стрэлаў?

Тады ўжо позна будзе разважаць:
Ні на усход дарог і ні на захад.

І будуць гарады твае ляжаць,
Счарнелыя ад атамнага жаху.

Я не хачу цябе палохаць, не,
Ды недзе тут вось атамшчыкі лазяць.
Абодвум нам, гібеўшым на вайне,
На д'ябла нам вайна ізноў здалася!

Як хораша, што лён тваіх валос
Не схованы ад сонца чорнай каскай.
Не атамныя бомбы я прывёз,
У сэрца глянь — там шмат людское ласкі.

Я паглядзець хацеў твой родны край,
Аб ім — ты помніш? — плакаў і журыўся;
Я расказаць хацеў — пра рай не рай —
Пра свой народ, што з шчасцем
падружыўся.

Пра гарады, што цвёрда зноў стаяць,
Пра нашы нівы, зноўку залатыя;
Што сорак год мне стукнула, што я
Дачку і сына маю.
Ну, а ты як?

Не мне вастрыць на чалавека нож,
Мы ж крэўныя браты з табой па працы...
Чаму ж маўчыш?
Глянь: надыходзіць ноч...
Спакойнай ночы, калі будзе спацца!

VI

Паўночнае мора сустрэла нас штормам.
Наўкол пацямнела, вятры загулі.
І гэты марскі анархічны прастор мы,
Прызнацца, са смакам паціху клялі.

Мы скромна зашыліся ў нашы каюты,
І тут надышоў мемуарны настрой —
Пра ўсё ўспаміналі, спрачаліся люта,
За нейкую справу стаялі гарой.

І што гэта ў нас за шалёны характар —
Тут мора хістае, тут бура і змрок,

А мы, як на сходзе: і спрэчкі, і факты,
І порцыя крытыкі, і рагаток.

Каюта гайдалася, быццам калыска,
І нешта скрыпела, і нешта раўло...
Мы фота вымалі далёкіх ды блізкіх
І рады былі, што іх тут не было.

Нарэшце... Хвала табе, радыёвузел!
У грудзях салодкі варушыцца ком...
Пятро, то табе пад заказ «Ой, у лузе...»,
Георгі, а гэта табе «Суліко».

Ну, а вы, мае дзе, песні,
Мой палескі вецярок?
У каюце нашай цеснай
Зазвінеў мой «Чабарок».

Я гляджу ў ілюмінатар,
Там ні хваляў, ні вятроў...
Бачу поле, бачу хаты,
Чую родны шум бароў.

Залатая, дарагая,
Дай хутчэй сваю руку!
Пабяжым з табою гаем
Мы на Свіслач на раку.

Мёдам свежым пахнуць росы,
Вецер гладзіць трыснікі.
Хай Андрэйка ходзіць босы
Па-над рэчкай ля ракіт.

Чабарок мой, чабарок,
Кепска любую бярог.
Мог бы лепш у роднай хаце
Даглядаць старую маці.

Кепска слухаў гоман соснаў,
Рэдка нюхаў пах ралля,
Не паспеў з-за сходаў розных
Нахадзіцца па зямлі...

Колькі плыць нам — невядома...
Веі, мой роднага вецярок!
За здароўе тых, хто дома!
Чабарок мой, чабарок...

VII

Як хораша жыць пасля шторму і песень!
Свяці, дружа сонца, і больш не хітруй!
Як пнёў на выгарах, як сосен у лесе,
У порце антверпенскім мачтаў і труб.

Дыхнула жалезам і вугалем Бельгія,
Гандлёвы, купецкі наўкол краявід.
«Знаёмства з Бельгіяй будзе ў нас беглае»,—
Запэўніў бадзёра ў аўтобусе гід.

Ад гэтага нам не вялікая радасць.
Чаму нас баяцца, шаноўны, скажы?
Мы ж ладзіць не будзем у вас барыкады,
І факт: у зубах не трымаем нажы.

Не будзем тут весці ні спрэчак, ні гандлю.
Нам толькі б паехаць да фабрык ды сёл.
Гід хітра смяецца: «Вы ўсе — прапаганда.
Прашу вас, панове, ў наступны касцёл».

Ітак, мы паны...
Гэта сказана слушна:
Багатай сваёй мы зямлі ўладары
І будзем такімі навек, непарушна,
А панства тутэйшае так, да пары...

Нямала прыгожага ў гэтай краіне —
Я ў доме у Рубенса быў у гасцях.
Я слухаў малінавы звон у Маліне,
На Фландрыі любаваўся прасцяг.

І мне спадабаўся парадак той строгі
І крышачку пышны убор гарадоў;
Хваліў чысціню, магазіны, дарогі,
І розум вучоных, і рукі майстроў.

Здалася ты, Бельгія, сытай, памытай,
Тут выгляд музеяў і паркаў прыгож.

Як кажуць, у сэнсе парадку і быту
Тут моцна заклёпана, добра.
І ўсё ж...

Я быў у музеі Бельгійскага Конга:
Сланы, бегемоты, свінец і уран...
Ды ўдарыла ў сэрца прарэзлівым гонгам
Ты, Чорная Афрыка, ўзвыўшы ад ран.

Я, моцна ўлюбёны ў Радзіму і волю,
Хачу сёння Бельгію гнеўна спытаць:
А хто табе Конга прысвоіць дазволіў
І імя сваё, не спытаўшы, надаць?

Дванаццаць мільёнаў закованых неграў
Не маюць радзімы.
А хто адабраў?
А колькі у шахтах атрутных палегла,
Каб нейкім тузам больш прыпала дабра!

Заглушаны джунглямі выстралы карных
Атрадаў,
І трупы ляжаць там канцом...
І я зразумеў тут нянавісць Верхарна
Да прагных банкіраў і хіжных купцоў.

Бельгійцы, вы выстаўку ладзіце:
Атам
Шарамі сталёвымі ўзняўся да зор.
Прагрэс чалавецтва!
А вашы салдаты
Страляюць у неграў бяздольных ва ўпор.

Народ паднявольны узнімецца грозна:
Убачыў я ў люстры бліскучых шароў
Іх чорныя слёзы,
Іх светлую кроў...

Гандлююць уранам
Бельгійскія гранды,
Тлусцеюць да часу.
Ды кажа народ:
Жыве яшчэ Ціль Уленшпігель у Фландрыі!
Напэўна, ён чуў пра Семнаццаты год.

VIII

Мінаюць дні.
То сонечна, то хмарна.
Наперадзе ў нас Францыя, Парыж.
І я зманю, калі скажу: не марыў
Пра гэты горад з даўняе пары.

Здаецца, ён з маленства мне знаёмы,
І казачны, і велічны такі.
Яго сыны змагаліся за Нёман
І паміралі моўчкі у макі...

Я зноўку ноч не спаў ад хвалявання,
Перабіраў любімых шмат імён...
Імчыцца поезд.
Сонечнае ранне.
І вось, нарэшце, разгарнуўся Ён!

Раскінуўся ты, бэзавы і чорны,
Падпёршы вежай сіні небасхіл,
Спрадвеку трапяткі і непакорны,
І стомлены, і поўны свежых сіл.

Табе пра гэта столькі ўжо казалі
Шмат розных улюбёных дзівакоў,
Што ты зусім папросту на вакзале
Сустрэў і на бульвары нас павёў...

За трое сутак змалаціў я ногі,
Хваліў бы лепш, ды, знаць, не ўмею лепш;
Збіў туфлі аб музейныя парогі,
Ад розных цудаў ледзьве не аслеп.

Так, класікі старыя не хлусілі:
Усё на месцы — Луўр і Нотр-Дам.
Тваёй красе, тваёй чароўнай сіле
Яшчэ не раз паклон, відаць, аддам.

Мне пра цябе дачка сыграе Таня
У родным Мінску,
І, відаць, не раз
Я песні буду напяваць Мантана
І ўспамінаць, сябры мае, пра вас...

Я ездзіў ад Манмартра да Версаля,
Глядзеў, марнеў, зусім нядужым стаў.
Каб з Рэнуарам зноў пабыць у зале,
Я Мулен-руж старанна абмінаў...

Я гаварыць не буду аб Алжыры,
Дзе сцелецца забойцаў дымны след;
Я ўспамінаць не буду аб ілжывых
Старонках розных кніжак і газет;

Не буду бічаваць амерыканцаў,
Здзіўляцца бессаромнасці афіш;
Да Шпейдэля не буду дакранацца,
Каб ран тваіх не растраўляць, Парыж.

Ты сам пра ўсё, пра ўсё дакладней знаеш
І не адным агнём рэклам гарыш,
Бо імем Сталінграда называеш
І вуліцу, і плошчу, мой Парыж!

І я адчуў любоў тваю і мары,
Журбу і славу вечную тваю...
Каля Сцяны бяссмертных Камунараў,
Усклаўшы кветкі, ціха я стаю.

IX

Караблі, караблі,
Вы будзеце часта мне сніцца,
Як сняцца суніцы,
Як сняцца сініцы,
Што росы світальныя п'юць.
Паспрыялі вы мне
З прасторам марскім парадніцца
І з хвалямі падружыцца,
Што ў барты часам ярасна б'юць...

Мы плывём і плывём
Атлантычным старым акіяпам.
Адпрасованы хвалі.
Раўнюткія воды ды ціш.
На бязмежным блакіце —
Залітыя срэбрам паляны...
Карабель мой крылаты,
Куды ты, куды ты ляціш?

Нада мною аблок
Залатыя і белыя коны.
Хто іх толькі прыдумаў,
А можа, я сам іх стварыў?
Праляцела усё:
Маладосць,
Заляцанні,
Акопы...
Што са мною такое?
Няўжо я раблюся старым?

Спадзяваюся менш
І лягчэй пераношу няўдачы...
Акіян, што ты робіш са мной?
Гэта, пэўна, твой жарт.
Дзень яшчэ прыгажосці такой,
І я, пэўна, памру ці заплачу...
Стоп!
Душу раз'ядаць
Пачала сентыментаў іржа.

Што, ты вечна такі,
Як анёлак версальскі,
Рахманы?
У цябе ж шырыня! —
Нават вокам ахопіш ледзь-ледзь.
Тваё гордае імя
З разбойнай сям'і атаманы
Прышпілілі да пакта.
Як мог ты такое сцярпець?!

Ты, магчыма, забыў,
Як ірваліся чорныя міны,
Захлыпаліся людзі,
У бездань ішлі караблі?.
Ты вазьмі сабе новае імя:
Праменны ці Мірны,
Каб ні бомбы, ні міны
Не грукалі тут, не раўлі...

Перасеклі спакойны
І ціхі на дзіва
Біскайскі.
Я забыў падлічыць,

Колькі ў водах патонула дзён.
З акіянскага дна
Усплывае зямля, нібы з казкі,
Злева — бераг Еўропы,
Справа — Афрыкі бераг відзён.

Я крычу: кантыненты,
Нянавісцю воды не пеньце!
Працягніце адзін да другога
Вы рукі мастоў,
Каб ішлі да арабаў
Без танкаў, без куль еўрапейцы,
Каб арабы без крыўды
Ў Еўропу ішлі да братоў.

X

Згубіўся удалечы Афрыкі след,
Развеяўся цень Гібралтара...
Я раптам пачуў перастук кастаньет
І звон задуменны гітары.

Мо гэта трызненне світальнай пары?
Балюча мне стала і горка,
І зорка над мачтай трывожна гарыць...
Дык гэта ж адклікнуўся Лорка!

А снежныя пікі у далях гарацъ.
Вось там дзесь, за Сьера-Невадай,
Любіў Федэрыка співаць і іграць
На радасць вясёлай Гранады.

Зазнаў у жыцці ён і шчасця, і мук,
Для песні і подзвігу выспеў.
Тут сэрца здалося адпойчы яму
Забытаю ўдалечы выспай.

Нялёгка змагацца народу, калі
Ён песняй жывой не сагрэты.
Жыве яшчэ многа падлюг на зямлі,
А гінуць такія паэты.

З фашысцкае ласкі ў Іспаніі шмат
Жалеза герояў пасекла.

І турмы па сёння з байцамі брыгад
Стаяць філіяламі пекла.

Навек ты засыпан сухою зямлёй,
А песня жыве твая, Лорка,
Б'е ў сэрцы і кліча іспанцаў на бой,
Палае трывожнаю зоркай.

XI

Знік даўно у хвалях край іспанскі,
Прыплылі ў Неапаль начаваць.
Толькі песень неапалітанскіх
Штосьці над залівам не чуваць.

Пахне апельсінамі і нафтай,
Караблям сігналы шле маяк.
Крэйсеры, відаць, па плану НАТА,
Побач насцярожана стаяць.

Аганькі бягуць высока ў горы.
Вар'яцеюць радугі рэклам...
Пойдзем, хлопцы, паглядзім на горад,
Па кіно даўно знаёмы нам.

Кажуць, гэта рай для мільянераў,
Перад імі нам не пасаваць.
Раздражняць не будзем іх мы нервы,
Ёсць каму тут ім настрой псаваць...

Гарыбальдзі.
Магазінаў проза.
Шумныя натоўпы навакол.
І шалёна нейкія матросы
У таверне скачуць рок-н-рол.

Ад вітрын, ад д'ябальскага гулу,
Ад шумлівых п'яных маракоў
Скіравалі ў вузкі мы завулак,
Пахне дзе жыццём і часнаком.

Крочым, так сказаць, глыбакадумна:
Не для ўсіх прыпас Неапаль рай.
Раптам хлапчукі чародкай тлумнай
Акружылі нас і просяць: дай!

А з пад'езда нейкага з дакорам
Пазіраў стары і моршчыў лоб,
І яму было — я бачыў — сорам
За дзяцей неапальскіх трушчоб.

Мілая Італія, павер мне,
Я цябе абразіць не хацеў.
Я твой друг, спагадлівы і верны,
Разумею гонар твой і гнеў.

Па другіх турыстах нас не мерце:
Я ў маленстве сам недаядаў.
Што там ліры!
Я, здаецца б, сэрца
Па кавалку хлопчыкам раздаў.

Каб раслі вось гэтыя сеньёры
Змалку не з працягнутай рукой;
Каб трушчобы зніклі,
Каб над морам
Песні ў шчасці пеў Неапаль твой.

XII

Палюбіў я ружовы Неапаль,
Пахнуць сонцам яго сады.
Болей, чым да рымскага папы,
Пілігрымаў плыве сюды.

Колькі выла за ранак сірэн тут,
Колькі новых сцягоў прыплыло.
Ад Неапаля да Сарэнта
Мора шоўкам блакітным лягло.

Сёння ў Капры плывём на адведкі.
Як па масле, ідзе параход.
Чарнавокія нашы суседкі —
Маладыя і прыгожы народ.

Італьянскія словы вучылі,
Каб з дзяўчатамі пагаварыць.
Пелі дружна мы «Санта Лючыю»,
«Падмаскоўныя вечары».

Капры, Капры, паўднёвая казка,
Буйнавокі цяжкі вінаград.
Безлімітнаю сонечнай ласкай
Кожны камень сагрэты і сад.

Гэты слаўны куток стаў нам дораг
З той далёкай часіны, калі
У затканыя сонцам прасторы
Буравеснік глядзеў са скалы.

Вось у гэтай чырвонай віле
Голас Горкага чуўся не раз.
З Ільічом тут яны гаманілі
Мо пра будучыню і пра нас...

Абхадзілі, аблазілі Капры,
Не стаміліся надта, але
Мы «кіянці» глынулі па каплі
З рыбаком на гарачай скале.

Для рабочых бы тут санаторыі!
Усміхнуўся рыбак, націшэў:
— Тут жывуць, браце, тыя, каторыя...—
І паляпаў пустую кішэнь...

Ён не катаў чужыя сакрэты,
Гаварыў больш пра мора і рыб.
Звонка цокалі коні,
Карэты
Везлі некуды нейкіх старых.

Далікатна пра гэта мы змоўчым:
Лепш не лезці ў чужы агарод...
Рыбаковы сумленныя вочы
Схаладзелі на міг, нібы лёд.

Не забуду братэрскі я поціск
Загрубелых прасоленых рук,
Што натрудзіліся на спякоце...
Будзь здароў, італьянскі наш друг!

Хай табуніцца рыба ў сетцы,
Хай не ведае гора твой дом!
Рыбаку каля самага сэрца
Прышпіліў я значок з Ільічом.

## XIII

Да смерці прыеліся храмы, касцёлы
І нават краса чарнавокіх мадон...
І здаўся мне, Рым, ты старым, невясёлым,
Другі гаспадар, знаць, патрэбен у дом.

Такі гаспадар, што умее жалеза
Слухмяным рабіць і сады гадаваць.
Заморская шваль да яго не палезла б,
Не стаў бы радзімай такі гандляваць.

З такім мне хацелася б выйсці у мора,
І сеці закінуць, і песню запець...
Ад пышных касцёлаў зрабіўся я хворым,
Звініць у вушах езуіцкая медзь.

Саборы збудованы хітра і з толкам:
І ловяць, і страшаць, і глушаць цябе...
Я бачыў цябе, рымскі папа, ды толькі
Размовы не вёў.
Дык дазволь хоць цяпер.

Дымяць у Неапалі крэйсераў трубы,
І сцяг паласаты калышуць вятры.
Ляжаць у Пампеях каменныя трупы,
Адрытыя там ля падножжа гары.

Чаму ж ты свайму не памолішся богу
(Дый сам ты святы),
Адкажы мне: чаму
Вайне не папросіш адрэзаць дарогу
І скінуць з Італіі мулкі хамут?

Везувій маўчыць, не дыміцца: стары ён,
Яму надакучыла выбухаў муць.
А хто ж тваю паству і Рым твой адрые,
Калі з Вашынгтона віхуры падзьмуць?

...Матросы з Расіі калісьці Месіну,
Адкінуўшы страх, ратавалі з бяды.
І сёння з надзеяй глядзяць на Расію,
На нашу радзіму усе гарады.

XIV

Я не магу мінуць Элады —
Пачатак міфаў, спрэчак, дум.
І — хай нам рады ці не рады —
Я на Акропаль узыду.

Не страшны нам лінкораў жэрлы,
Што дзядзька Сэм навёў і тут.
Прастор, ад сонца парыжэлы,
Яшчэ напіша свой статут.

Цывілізацыі калыска,
Гекзаметраў густы настой!
Антычны свет — а нам ён блізкі
Сваёю мудрай прастатой.

Руіны, храмы... Белы мармур
Аж вочы слепіць яснатой.
І крыўдна мне, што часта варвар
Сюды прыходзіў на пастой.

Сцвярджаю, як бывалы дэрвіш,
Музеяў многіх змёўшы пыл:
Твае бяссмертныя шэдэўры
Хто ўкраў, хто вымаг, хто купіў.

Але гісторыю не сцерці
І горы гэтыя не зрыць!
Акропаль, як само бяссмерце,
Бялее на крутой гары.

І слава грэкаў не памерла
Ні пад пятлёй, ні пад свінцом.
І песні новаму Гамеру
Пець пра эласаўскіх байцоў.

Хоць не яны Эладай правяць,—
Іх подзвігаў не затаіць.
І на Акропалі у славе
Сцяг вольнай Грэцыі стаіць.

Мы аддаем пашану сцягу,
Што Глезас некалі узняў.

Мы сцяг свой неслі да рэйхстага,
Каб ён на цэлы свет палаў.

О, як мне непавісны тыя,
Што ўмеюць подзвіг забываць
І, растаптаўшы ўсе святыні,
Сваіх паэтаў забіваць.

Вядзі, блакітная дарога,
Хутчэй дамоў: мне душна тут!
Як на планеце нашай многа
Несправядлівасці, пакут.

Радзіма наша, песня наша,
Мой боль і сон мой залаты,
Цывілізацыі іпакшай
Калыскай стала сёння ты!

Я знаю: будзе ўсюды шчасце,
Калі праклён спрадвечны свой
Народы скінуць, каб прыпасці
Да праўды Леніна святой.

XV

Вось і ўсё. Канчаецца дарога,
Я Еўропу шчыра ўсю абняў.
Разглядаў і строга і не строга,
Як-ніяк, а з ёю мы радня.

Еўрапейцы мы і азіяты.
Людзі мы.
Зямлі працаўнікі.
Запрасілі ўсіх братоў на свята
Мы,
Хто ўчора быў нічым, нікім.

Я мацней абняць Еўропу марыў,
Ды абдзёр крыху свае бакі
Аб клыкі гармат у Гібралтары,
Аб чыесьці злосныя штыкі.

Я ўставаў усюды раным-рана,
Каб пачуць, чым дыхае зямля,

Ды мяне ахоўвалі старанна
Шпікі, як якога караля.

Я хацеў зірнуць глыбей у вочы,
Свет стары хоць крыху зразумець;
Ды, сустрэўшы нечы погляд воўчы,
Вырашыў: лепш справы з ім не мець!

Пад канец пабыў і на Басфоры —
Салдатні там густа, проста жах;
І кладзе да латкі латку гора
На крутых турэцкіх берагах...

Вось і разгарнулася прасторная
Свежая зялёная вада.
І зусім, зусім яно не Чорнае,
Наша мора — песенная даль.

Дыхаю і не магу надыхацца,
Смешна, а здаецца, далібог,
Быццам нам, як з пекла нейкім выхадцам,
На зямлю сысці дазволіў бог.

Я гляджу і не магу наглядзецца
(Што з таго, што ноч і змрок густы!)
На цябе, Вялікая Мядзведзіца,
На цябе, мой месяц залаты.

Чорным морам не магу нацешыцца
І сяброў вясёлы чую смех.
Вось па гэтай серабрыстай сцежачцы
Ўзяў бы і пабег, пабег, пабег...

Новы дзень над морам разгараецца,
Засінелі ў далях берагі.
Сэрца з клеткі проста вырываецца...
Край Савецкі, край мой дарагі!

Вочы, ад сустрэчы не размокніце!
Неба, ясных зораў не тушы!
Як мой друг адзін казаў: не моўкніце
Сёння, салаўі маёй душы!

XVI

Кветак мне трэба — белых і крыху сініх,
Лісцяў мне трэба — зялёных і трапяткіх,
Свежых вятроў, навальніц і сцежак ласіных
І добрых усмешак людскіх.

Грукату трэба мне нашых вялікіх будоўляў,
Спелых калоссяў і шолаху ціхіх каліп.
Толькі не трэба, не трэба мне іншае долі,
Іншага сонца не трэба і іншай зямлі.

Быў Калізей збудаваны калісьці рабамі,
Рымляне ім ганарацца нямала вякоў...
Сёлы свае, гарады збудавалі мы самі,
Межы па нівах разгладзілі ўласнай рукой.

Я з вандравання на зорным лячу самалёце,
Бачу, радзіма, прасторы, багацці твае.
Добра, радзіма, сябе адчуваць у палёце —
Сэрца пяе, бо ты крылы дала нам свае.

Колькі ты вымела здраднікаў і малаверцаў,
Хісткіх і слабых цярпліва, як маці, вяла.
Колькі ты сілы ўліла ў нашы простыя сэрцы
І загартоўку, і волю, і розум дала.

Сколькіх аплакала ты, дарагая радзіма,
Мужных герояў, найлепшых сыноў і дачок.
Колькі глынула агню ты і чаду і дыму
І ацалела, бо вечна была з Ільічом.

З партыяй роднай была ты заўсёды і ўсюды,
І камуністы наперадзе заўжды ішлі.
Не называем ніколі твой росквіт мы цудам,
Гэта — мы знаем — адзіная праўда зямлі.

Маці-радзіма, я рад, што жыву камуністам,
Сын твой, гатовы пайсці за цябе і на смерць.
Больш за жыццё берагчы буду
сцяг твой агністы,
Сцяг, над вякамі якому свяціць і шумець.

*1957*

## ЗМЕСТ

### I


На руінах . . . . . . . . . . 7
Пасля дэмабілізацыі . . . . . . 8
Першая цішыня . . . . . . . . . 9
Гімнасцёрка . . . . . . . . . . 17
*** Аб вясёлым цёплым доме... . . . . . . . . 18
Наша слава . . . . . . . . . . . . . . 19
Партызанская дзяляпка . . . . . . . . . . 21
Кінамеханік . . . . . . . . . . . . . . 23
Сустрэча з Вільняй . . . . . . . . . . . . 25
Вечныя словы . . . . . . . . . . . . . . 34
*** Я тэмы для вершаў старанна вышукваў... 35
*** Я стукнуў тры разы... . . . . . . . . . . 36
*** Сябры, я сягоння на сінім золаку... . . . . 37
Атам . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38
Сорак год . . . . . . . . . . . . . . . . 41
Тры моры . . . . . . . . . . . . . . . . 42
Я галасую . . . . . . . . . . . . . . . . 44
Прысяга . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
Наш новы свет . . . . . . . . . . . . . . 47
На радыятары — зубр . . . . . . . . . . . 49
Помнік . . . . . . . . . . . . . . . . . 51
Ураджай 47 года . . . . . . . . . . . . . 56
Зарачанскі музей . . . . . . . . . . . . . 58
Радзіма . . . . . . . . . . . . . . . . . 60
На Пулкаўскіх вышынях . . . . . . . . . . 62
На канцэрце хору Р. Шырмы . . . . . . . . 63
Тым, хто за акіяпам . . . . . . . . . . . 64
Урок геаграфіі . . . . . . . . . . . . . . 66
Ліст у Нью-Йорк . . . . . . . . . . . . . 67
Бітва . . . . . . . . . . . . . . . . . . 69
Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . 70
На польска-чэхаславацкай мяжы . . . . . . 71
*** Калі нельга многа... . . . . . . . . . . 72
*** Праедзь альбо прайдзі... . . . . . . . . 73
*** Над Бугам грымяць... . . . . . . . . . . 75
Свой горад . . . . . . . . . . . . . . . . 76

Афіцэры запаса . . . . . . . . . . . . . . 78
*** Палотны беляць... . . . . . . . . . 80
Камсамольская вуліца . . . . . . . . . . 81
Ланцугі залатыя . . . . . . . . . . . . 83
Пасля апошняй навальніцы . . . . . . . 85
На шашы . . . . . . . . . . . . . . . 86
Слова да паэтаў . . . . . . . . . . . . 87
Мінск навагодні . . . . . . . . . . . . 90
Абаронцы міру . . . . . . . . . . . . . 91
Ураджай . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Сцягі Перамогі . . . . . . . . . . . . . 98
Незгасальная вера . . . . . . . . . . . 99
На рынку . . . . . . . . . . . . . . . 101
Навекі слава . . . . . . . . . . . . . 102
Залаты рубель . . . . . . . . . . . . . 103
Маякоўскаму . . . . . . . . . . . . . . 105
Гэтак будзе . . . . . . . . . . . . . . 107
Пра назвы . . . . . . . . . . . . . . . 108
Шчаслівы верасень . . . . . . . . . . . 109
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . 115
Твой воблік, Іран . . . . . . . . . . . 116
Астара . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
Ліст гораду Гарган . . . . . . . . . . . 120
З Новым годам, Расія! . . . . . . . . . 122
Веснавое . . . . . . . . . . . . . . . . 123
Сабе і другім . . . . . . . . . . . . . 124
Скарга Палярнай вуліцы . . . . . . . . 125
На будоўлі . . . . . . . . . . . . . . 127
Паштальён . . . . . . . . . . . . . . . 129
Кніга Славы . . . . . . . . . . . . . . 131
Вярбоўшчык . . . . . . . . . . . . . . 133
Жалуды . . . . . . . . . . . . . . . . 135
Шэфы . . . . . . . . . . . . . . . . . 136
Наша краіна . . . . . . . . . . . . . . 138
Ніягара . . . . . . . . . . . . . . . . 139
Над картай свету . . . . . . . . . . . 142
Крыху пра Швейцарыю . . . . . . . . . 144
Некаторыя падлікі . . . . . . . . . . . 145
Вершы пра Карэю . . . . . . . . . . . . 146
Пра агітацыю . . . . . . . . . . . . . 149
На Волгу! . . . . . . . . . . . . . . . 151
У Камсамольску-на-Волзе . . . . . . . . 153
Будаўнікі . . . . . . . . . . . . . . . 154
Слова сталінградца . . . . . . . . . . . 156

Пачатак . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
Да ганебнага слупа! . . . . . . . . . . . 158
Ленінскія горы . . . . . . . . . . . . . 160
Здымак . . . . . . . . . . . . . . . . . 162
Ля помніка Купалу . . . . . . . . . . . . 164
Апошнія навіны . . . . . . . . . . . . . 165
Пятроўна . . . . . . . . . . . . . . . . 167
Пісьмо юнака да паэта . . . . . . . . . . 170
Слова пра Палессе . . . . . . . . . . . . 172
Навасёлу . . . . . . . . . . . . . . . . 174
Напрадвесні . . . . . . . . . . . . . . . 176
Анкета . . . . . . . . . . . . . . . . . 178
Мінскія сады . . . . . . . . . . . . . . 180
Прычына . . . . . . . . . . . . . . . . 181
Камароўка . . . . . . . . . . . . . . . 182
Наш дом . . . . . . . . . . . . . . . . 183
Заўсёды гатовы! . . . . . . . . . . . . . 186
Сувораўцы . . . . . . . . . . . . . . . 188
Песня . . . . . . . . . . . . . . . . . 189
Спарышы . . . . . . . . . . . . . . . . 190
Пасля вечарынкі . . . . . . . . . . . . . 192
Госці . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
Дачка . . . . . . . . . . . . . . . . . 196
Ля падножжа Алатау . . . . . . . . . . . 198
Казацкая дарога . . . . . . . . . . . . . 201
Успамін . . . . . . . . . . . . . . . . 203
Кіеву . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
Шапка эстонца . . . . . . . . . . . . . 206
Маскве . . . . . . . . . . . . . . . . . 208
Стары знаёмы . . . . . . . . . . . . . . 209
Халтуршчык . . . . . . . . . . . . . . . 212
Навагодняе слова . . . . . . . . . . . . 214
Маім гераіням . . . . . . . . . . . . . . 216
Верхалазы . . . . . . . . . . . . . . . 218
Візітныя картачкі . . . . . . . . . . . . 219
Прыстасаванцы . . . . . . . . . . . . . 220
Вынаходца . . . . . . . . . . . . . . . 222
Каменні . . . . . . . . . . . . . . . . 223
Бацька . . . . . . . . . . . . . . . . . 225
Дзівак . . . . . . . . . . . . . . . . . 227
Здарэнне ў гасцях . . . . . . . . . . . . 228
Капітан Шаблоўскі . . . . . . . . . . . . 230
Кветкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
Радзіме . . . . . . . . . . . . . . . . . 232

*** Дзяўчына па садзе... . . . . . . . . . . . . 234
Выстаўка ў Дамаску . . . . . . . . . . . . 235
*** На планеце ў нас... . . . . . . . . . . . 237
Смеласць . . . . . . . . . . . . . . . . 238
Футбол . . . . . . . . . . . . . . . . 240
Слова . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
Пра гэта . . . . . . . . . . . . . . . . 244
Быў дзень такі... . . . . . . . . . . . . . 246
Лясныя галубы . . . . . . . . . . . . . 247
Чаканне . . . . . . . . . . . . . . . . 248
*** Трэснула, грукнула... . . . . . . . . . . . 249
Пірат . . . . . . . . . . . . . . . . . 250
*** То з Алма-Аты... . . . . . . . . . . . . 252
*** Лівень... . . . . . . . . . . . . . . . 253
Тост за палярнікаў . . . . . . . . . . . . 254
*** Недзе салавей пяе... . . . . . . . . . . 255
Цагліна з дома Паўлава . . . . . . . . . . 257
*** Яшчэ ніводнай... . . . . . . . . . . . . 259
*** Лясы нырнулі... . . . . . . . . . . . . 260
Дарога ў Закарпацце . . . . . . . . . . . 261
Радугі . . . . . . . . . . . . . . . . . 264
Адрас друга . . . . . . . . . . . . . . 265
*** Дым. Агонь... . . . . . . . . . . . . . 266
Абеліск . . . . . . . . . . . . . . . . 268
З Янкам Купалам . . . . . . . . . . . . 270
*** Нам грозяць... . . . . . . . . . . . . . 272
Вясновыя матывы . . . . . . . . . . . . 273
*** Мы з Пятрасам Цвіркам... . . . . . . . . 274
*** У акенца тваё... . . . . . . . . . . . . 276
Заакіянскі лямант . . . . . . . . . . . . 278
Трывожныя зарніцы . . . . . . . . . . . 279
Дзед . . . . . . . . . . . . . . . . . 281
Птушыныя галасы . . . . . . . . . . . . 282

## II

*** Хаджу і езджу па Амерыцы... . . . . . . . 285
Нью-йоркскія малюнкі . . . . . . . . . . . 286
Хлопчык з фермы . . . . . . . . . . . . 291
Сцягі . . . . . . . . . . . . . . . . . 292
У Даўн-таўне . . . . . . . . . . . . . . 293
Размова з Вашынгтонам . . . . . . . . . . 294
Сустрэча з «Бярозкай» . . . . . . . . . . 296
*** Узняўшы факел, Статуя Свабоды... . . . . . 297

Амерыцы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 298
На акіянскім лайнеры . . . . . . . . . . . 299
Белыя яблыні . . . . . . . . . . . . . . . . 302
Пераправа . . . . . . . . . . . . . . . . . 304
Гарачыня . . . . . . . . . . . . . . . . . 305
Калі падступаюць слёзы . . . . . . . . . . 306
Кнігі Леніна . . . . . . . . . . . . . . . . 307
Даўгалецце . . . . . . . . . . . . . . . . 308
*** Дождж ідзе праменісты... . . . . . . . . . 310
*** Руду і хлеб мы здабывалі самі... . . . . . . 311
Ля кургана Дружбы . . . . . . . . . . . . 312
Пакаленні . . . . . . . . . . . . . . . . . 314
Мазурка Шапэна . . . . . . . . . . . . . 316
Пра суіснаванне . . . . . . . . . . . . . . 317
Перад дажджом . . . . . . . . . . . . . . 318
Непаладкі . . . . . . . . . . . . . . . . . 319
Пра неўмяшанне . . . . . . . . . . . . . . 321
Незакапаныя дамавіны . . . . . . . . . . . 322
*** Табе, з прытомленым сэрцам... . . . . . . 323
Жарты і скептык . . . . . . . . . . . . . 325
*** Ён богам не намечаны . . . . . . . . . . 327
Кляновае лісце . . . . . . . . . . . . . . 328
Залатыя пярсцёнкі . . . . . . . . . . . . 329
Гарлем . . . . . . . . . . . . . . . . . . 331
*** Амерыканскія музеі... . . . . . . . . . . 332
У экспрэсе Дэйтройт — Чыкага . . . . . . . . 334
У царстве Форда . . . . . . . . . . . . . 336
Сустрэча з Ніягарскім вадаспадам . . . . . 338
Шэкспір і песня . . . . . . . . . . . . . . 339
Свята ў Палерма . . . . . . . . . . . . . 340
Палёт у Канаду . . . . . . . . . . . . . . 342
Руіны Карфагена . . . . . . . . . . . . . 344
Развітанне з Касабланкай . . . . . . . . . 345
Недзе каля экватара . . . . . . . . . . . 346
Гвінейцы . . . . . . . . . . . . . . . . . 348
Глыток Афрыкі . . . . . . . . . . . . . . 349
У тропіках . . . . . . . . . . . . . . . . 351
Вечны агонь . . . . . . . . . . . . . . . 353
Свінары і звапары . . . . . . . . . . . . 355
*** Абступяць часам успаміны... . . . . . . . 357
Дзесяць трактараў . . . . . . . . . . . . 358
Дзеці на зорнай расе . . . . . . . . . . . 360
Слухай, Радзіма! . . . . . . . . . . . . . 362
У космас! . . . . . . . . . . . . . . . . 363

Сэрца маё . . . . . . . . . . . . . . . . 364
Вершы пра Палессе . . . . . . . . . . 366
Расказ аб загінуўшай дружбе . . . . . . . . . 368
Ямбы . . . . . . . . . . . . . . . . . . 370
Ля мора . . . . . . . . . . . . . . . . 373
У цырку . . . . . . . . . . . . . . . . 374
Падмятальшчыцы . . . . . . . . . . . . . 376
Цішыня . . . . . . . . . . . . . . . . 377
Полацкая прафесія . . . . . . . . . . . 379
Размова з нашчадкамі . . . . . . . . . . 380
Найма . . . . . . . . . . . . . . . . . 383
Тысяча небасхілаў . . . . . . . . . . . 385
Патрыятычная песня (паэма) . . . . . . . . 387

**Панчанка П.**

П 16 Збор твораў. У 4-х т. Том 2. Вершы. Паэма. (1946—1962 гг.).— Мн.: Маст. літ., 1981.— 414 с.

У пер.: 2 р.

Вершы пасляваеннага часу, радкі з далёкіх вандровак, а таксама паэма «Патрыятычная песня» склалі другі том Збору твораў народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі.

П $\frac{70403-031}{М\ 302(05)-81}$ падпіснос

ББК 84 Бел 7

Бел 2

ПИМЕН ЕМЕЛЬЯНОВИЧ ПАНЧЕНКО

**Собрание сочинений в 4-х томах**

Том 2

Стихи. Поэма (1946—1962 гг.)

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Р. І. Барадулін. Мастак Л. Я. Прагін. Мастацкія рэдактары А. І. Труханава, Л. Я. Прагін. Тэхнічныя рэдактары Л. М. Шлапо, Т. М. Сокал. Карэктар Л. Т. Калюжная.

ІБ № 944
Здадзена ў набор 18.07.80. Падп. да друку 16.01.81. АТ 07504. Высокі друк. Фармат 84×100¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Ум. друк. арк. 20,28. Ул. выд. арк. 16,17. Тыраж 17 000 экз. Зак. 840. Цана 2 р.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, Паркавая магістраль, 11.

Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.